

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

INSTITUT für WEISSRUTHENISCHE KULTUR
Abteilung der Humanitärwissenschaften

Проф. П. БУЗУК

СПРОБА ЛІНГВІСТЫЧНАЕ ГЕОГРАФІІ БЕЛАРУСІ

Ч. I. Вып. 1.

635846

Prof. P. BUZUK

VERSUCH EINER LINGUISTISCHEN GEOGRAPHIE VON WEISSRUTHENIEN

T. I. H. 1.

Изъ книгъ М. Г. Долобко. 1005

ВЫДАНЬНЕ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ — 1928

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

БИБЛИОТЕКА
Академии Наук БССР

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Глубокоуважаемому Милию Герасимовичу
Долобку от автора.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ.

АДДЗЕЛ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК.

ДОСЬЛЕДЫ І МАТАР'ЯЛЫ Ў ГАЛІНЕ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

№ 17.

ДЫЯЛЕКТОЛЁГІЧНАЯ КАМІСІЯ.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ИЯМ
К2292

Проф. П. БУЗУК

Старшыня Дыялектолёгічнае Камісіі

3

СПРОБА ЛІНГВІСТЫЧНАЕ ГЕОГРАФІІ БЕЛАРУСІ

Ч. І. ФОНЭТЫКА і МОРФОЛЁГІЯ

Вып. 1-ы. Гаворкі Цэнтральнае і Ўсходняе Беларусі і суседніх мясцовасьцяй Украіны і Вялікарасіі ў першай чверці XX в.

Изъ книгъ М. Г. Долобко.

КОШТАМ ІНСТЫТУТУ БЕЛАРУСКАЕ КУЛЬТУРЫ
У МЕНСКУ — 1928

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дазваляецца выпусьціць у сьвет

Неадменны Сакратар В. Ластоўскі.

Менск. Друкарня Інбелкульту. Зак. № 197—1.000 экз. Галоўлітбел № 225.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ПРЫСЬВЯЧАЕЦЦА
БЕЛАРУСКАМУ НАСТАЎНІЦТВУ
І СТУДЭНЦТВУ.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

З Ь М Е С Т

Прадмова 1 стар.

І. У В О Д З І Н Ы.

§ 1. Мэта і характар дасьледваньня (3—6). § 2. Мэтоды складаньня дыялектолёгічнага атласу (6—8). § 3. Матар'ялы для вывучэньня беларускіх дыялектаў (8—13).

ІІ. Ф О Н Э Т Ы К А.

А. Вокалізм.

§ 4. Аканьне (14—20). § 5. Дыфтонгі (20—22). § 6. Зьмена *а* на *о* (22—23). § 7. Пераход *'е* ў *'о* (23). § 8, Зьмена *ы* на *у* пасьля губных зычных (23—25). § 9. Рэфлексы прадгісторычнага славянскага *ъ* (*у*) перад ётам і ётавымі галоснымі (25—29). § 10. Іншыя больш дробныя і менш дасьледжаныя зьявы вокалізму (29—30).

Б. Консонантызм.

§ 11. Вымаўленьне *р* (31—34). § 12. Вымаўленьне зычных перад мяккімі галоснымі (34—37). § 13. Дзеканьне і цеканьне (37—38). § 14. Асыміляцыя *j* да папярэдняга зычнага (у становішчы перад наступнай галоснай) (38—39). § 15. Цьвёрдасьць шыпячых і губных. Цьвёрдасьць *ц* (39—40). § 16. Мена *ц* і *ч* (41—44). § 17. Пераход *л* у *ў* (44—48). § 18. Звонкія зычныя ў канцы складоў (48—50). § 19. Намесьнікі гуку *г* (*g*). Розныя вымаўленьні гуку *х* (50—52). § 20. Прыставачныя зычныя (і галосныя) перад пачатковымі галоснымі (52—57). § 21. Іншыя больш дробныя, а таксама менш дасьледжаныя зьявы консонантызму (а—к) (57—60). § 22. Націск (60).

ІІІ. М О Р Ф О Л Ё Г І Я.

А. Скланеньне.

§ 23. Агульныя асаблівасьці ў скланеньні назоўнікаў (61—63). § 24. Назоўны склон адзін. ліку (63). § 25. Родны склон адзін. ліку (63—64). § 26. Давальны склон адзін. л. (64). § 27. Іншыя склоны адзін. ліку (64—65). § 28. Назоўны (і вінавальны) склоны множн. ліку (65—69). § 29. Родны (і вінавальны) скл. множн. л. (69—70). § 30. Давальны і месны скл. множн. л. (70—72). § 31. Творны скл. множн. л. (72—74). § 32. Займеньнікі (74—75). § 33. Прыметнікі (75—79). § 34. Лічэбнікі (79).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Б. Спражэньне.

1. Асобыя формы дзеясловаў.

§ 35. Формы цяперашняга часу (80—86). § 36. Формы будучага часу (86—87). § 37. Формы прошлых часоў, умоўнага ладу і будучага II-га (87). § 38. Формы загаднага ладу (87—89). § 39. Канчаткі дзеясловаў зваротнага стану (89—90).

§ 40. 2. Неасабовыя формы дзеясловаў (90).

IV. ВЫВАДЫ (на беларускай мове і на нямецкай: Ergebnisse). . . . . 91—96 ст.

Дадаткі і папраўкі (Дадатак I) . . . . 97—101 ст.

Іменны паказчык (Дадатак II) . . . . 102—103 ст.

Мясцовы паказчык (Дадатак III) . . . . 104—111 ст.

Дыялектолёгічны атлас (Дадатак IV) . . . 1—20 карта

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ПРАДМОВА.

Адным з важнейшых помнікаў зьяўляецца жывая народная гаворка. Але ніводзін з помнікаў чалавечай культуры не падупадае ў такой меры зьменам, як гэта самая жывая мова, і калі-б не адбіцьцё розных момантаў яе жыцьця ў пісьменнасьці, мы нічога ня ведалі-б аб яе руху ў часе. Яшчэ больш уплываюць на жыцьцё дыялектаў сучасныя палітычна-эканомічныя і культурныя чыньнікі: перасяленьні, пераход на хутарную сыстэму, адходныя промыслы,—усё гэта выклікае бязупыннную зьмену становішча гаворак. Нямала дапамагае сьціраньню дыялектычных асаблівасьцяй і школа, ня толькі на чужой, але і на роднай мове. Як дасьціпна зазначыў у сваім дакладзе на Акадэмічнай Конфэрэнцыі С. М. Некрашэвіч, русыфікацыя Ўсходняй Беларусі і полёнізацыя Заходняй можа яшчэ ня так страшны ў гэтым сэнсе, як беларусызацыя Савецкай Беларусі.

Пералічаныя акалічнасьці прымушаюць нас сьпяшацца з зафіксаваньнем жывых гаворак. Наша спроба лінгвістычнай географіі Беларусі выклікана жаданьнем даць хоць прыблізны помнік аб становішчы беларускіх дыялектаў к 1927 г., шырэй-жа кажучы, у першай чвэрці XX-га стагодзьдзя. Праз 20—30 г. г. яно, бясспрэчна, зьменіцца.

З прычыны таго, што надрукаваныя дыялектолёгічныя і этнаграфічныя матар'ялы займаюць значна меншае месца ў шэрагу крыніц нашых ведаў аб гаворках, мы пазбаўлены магчымасьці ў даны момант дапасаваць мэтод географічнага вывучэньня дыялектаў да Заходняй Беларусі, і таму выдаем покуль што 1-ю часьціну нашай працы. Праўда, мы ўспамінаем, хоць-бы з мэтай параўнаньня, аб адпаведных зьявах у заходніх гутарках, але ад дакладнага іх ізоглёсаваньня пакуль што мы прымушаны былі адмовіцца. Спадзяемся, што ў недалёкім будучым зьявіцца магчымасьць даць працяг нашай працы.

П. Бузук.

Менск.
10 лістапада 1927 г.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Изъ книгъ М. Г. Долобко.

I.

Уводзіны.

§ I. Мэта і характар дасьледваньня.

У апошнія часы ўсё часьцей пачынаюць раздавацца ў славянскай навуцы галасы супроць тэорыі дрэва. Розныя схэматычныя клясыфікацыі слявянскіх моў, далей прадстаўленьне аб рэзкіх граніцах паміж мовамі, нарэшце падзел моў на падмовы і гутаркі,—усё гэта было магчымым толькі таму, што ня ведалі дакладна граніц моўных зьяў ці гэтак званых ізоглёсаў. У сапраўднасьці, аднак, справа стаіць іначай, значна складней, чымся гэта здаецца на першы погляд. Калі мы прасочым граніцы нават толькі дзьвюх моўных зьяў, мы пабачым, што яны не супадаюць. Пасьля такога географічнага дасьледваньня якой-небудзь часьціны славянскай тэрыторыі, магчыма, мы праканаемся ў тым, што ізоглёсы розных моўных фактаў перарэзваюць гэтую тэрыторыю ў рознастайных кірунках. Такім чынам, выйдзе, што славянскія мовы становяць ня рэзка адмежаваныя адна ад другой мовы, а мора гутарак, якія паступова зьмяняюцца; кожная з гэтых гутарак зьяўляецца, уласна кажучы, пераходнай ад аднэй суседняй гутаркі справа да другой сваёй суседняй гутаркі зьлева. Але-ж усё-ткі на гэтым моры ўзьніклі паасобныя славянскія мовы, усё-ткі бясспрэчным зьяўляецца факт існаваньня беларускай, украінскай, расійскай, польскай і іншых славянскіх моў. Як-жа гэта магло здарыцца?

Для таго, каб зразумець факт зьяўленьня паасобных славянскіх моў, мы павінны заўважыць, што гаворачы аб даных мовах, на якіх можам размаўляць, пісаць, чытаць, мы, бясспрэчна, маем на ўвазе літаратурныя славянскія мовы. Іх-жа зьяўленьне ёсьць вынік розных, даволі складаных—гістарычна-эканомічных[1]) і культурных умоў. Калі з якіх-небудзь прычын тэй ці іншай славянскай гутарцы (можа, нават, гутарцы якога-небудзь гораду) пашанцавала зрабіцца мовай літаратуры, а таксама мовай дзяржаўна-эканомічных зносін, да яе тады пачынаюць цягацець суседнія гутаркі. Такія цэнтры аб'яднаньня маглі зьяўляцца ў розных мясцох. Разыходзячыся праменьнямі, сіла гэтых аб'яднаўчых фактараў, чым далей ад цэнтру, усё больш слабне, і нарэшце ў нека-

[1]) Эканомічныя ўмовы, бязумоўна, граюць вялікую ролю. Напр., гутаркі паўночнай часьціны Невельск. пав., дзякуючы эканомічнай залежнасьці ад Ленінграду, у якім шмат мужчын з гэтага павету служылі вазьнікамі і працавалі таксама на фабрыках, зьяўляюцца зрусыфікаванымі. Вяліскі-ж павет эканомічна зьвязан з Віцебскам—бліжэйшай ад Вяліжу чыгуначнай станцыяй—і ён лепш захаваў свае спрадвечныя дыялектычныя асаблівасьці (гл. мой арт. „Да характарыстыкі паўн.-беларуск. дыялектаў. 1926)". Дзякуючы эканомічнай залежнасьці ад Масквы зьмяняюцца таксама і гутаркі. Вяземск. п.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

торым месцы гэта сіла павінна зраўняцца з сілай цягаценьня да іншага суседняга цэнтру. Вось тут і можна правесьці граніцу паміж данымі дзьвюма мовамі.

Калі-ж культурна-дзяржаўныя цэнтры ўтварыліся-б у іншых мясцох, ясна, што ў сувязі з гэтым перасунуліся-б і граніцы між мовамі. Ёсьць, напр., нямала зьяў, агульных у паўдн.-беларускіх і паўн.-украінскіх дыялектах, і калі-б чамусьці цэнтр політычнай і культурнай арганізацыі зьявіўся-б недзе ў Палесьсі, бясспрэчна, на тэрыторыі пераходных беларуска-украінскіх гутарак утварылася-б і новая палеская мова.

З усяго сказанага выцякае пакуль што адзін вывад: праводзячы граніцу між дзьвюма славянскімі мовамі на спрэчнай тэрыторыі пераходных дыялектаў, мы можам толькі базавацца на параўнаньні даных дыялектаў з літаратурнымі мовамі; адкінуўшы адзнакі, агульныя абедзьвюм мовам, мы далей павінны параўнаць колькасьць прымет данага цікавячага нас дыялекту, агульных для аднэй літаратурнай мовы, з колькасьцю рыс, існуючых у другой з гэтых дзьвюх літаратурных моў.

Іншыя спосабы азначэньня граніц зьяўляюцца менш здавальняючымі.

З вялікай асьцярожнасьцю належнасьць якой-небудзь спрэчнай гутаркі да тэй ці іншай з дзьвюх суседніх моў можна азначаць на падставе параўнаньня з народнымі дыялектамі даных моў, бо злучнасьць усіх жывых гутарак, якія адносяць да тэй ці іншай мовы, уласна кажучы, ня мае характэрных толькі для іх і агульных усім ім адзнак. Вера ў існаваньне такіх пэўных моўных крытэрыяў была, яшчэ раз паўтараю, магчымай толькі дзякуючы недасканаласьці ведаў аб географіі моўных зьяў. Можна, здавалася-б на першы погляд, прапанаваць іншы выхад, а менавіта, параўноўваць цікавячую нас гутарку з асаблівасьцямі, характэрнымі *для большасьці* дыялектаў кожнай з суседніх моў, але і гэты падыход да пытаньня нас ня можа здаволіць, бо ў ім скрыта лёгічная памылка: ён лічыць ужо вядомымі граніцы мовы і нават граніцы самых зьяў. Але адкуль мы ведаем, што, напр., зьмена *ы* на *у* пасьля губных *(мула, путаць)* зьяўляецца паўдн.-белар. зьявай, а не займае, можа, яшчэ большую часьціну паўн.-украінскіх дыялектаў. Як мы можам без дакладнага вывучэньня ўсіх беларускіх гутарак запэўняць, што формы загадн. л. *бярэце*, *нясеце* (а не *бярыце*, *нясіце*) ведае большасьць беларускіх дыялектаў? Пасьля ўсяго сказанага становіцца відавочнай неабходнасьць вывучэньня граніц паасобных зьяў мовы.

Нарэшце, часам прапануюць праводзіць граніцу мовы на падставе аднэй якой-небудзь, але вельмі важнай зьявы. Так, напр., укладчыкі „Опыта диалектологическ. карты русск. языка в Европе“ (1915, ст. 32 і наст.), указваючы на тое, што некаторыя беларускія зьявы (дзеканьне і цеканьне, захаваньне *ы* перад *і* нескладовым: *мыю*, ф. мн. л. м. р. на—*ы*, *і*: *лясы*, *берагі* і інш.) спатыкаюцца і ў пераходных гэт. званых сярэдня-велікарускіх дыялектах, галоўнай падставай для правядзеньня паўночнай граніцы беларускай мовы (гл. ст. 33) лічаць розьніцу ў вымове *г*:*г* фрыкатыўнае зьяўляецца адзнакай беларускай тэрыторыі, *г*-ж выбуховае характарызуе ўжо сяр.-влр. гутаркі. Граніцу паміж беларуск. мовай і паўдн.-велікарускай падмовай у сваёй працы „Диалектологические разыскания в области великорусских говоров. Часть I. Южно-великорусское наречие. Вып. 1 і 2“, 1917—1918, проф. Дурново паспрабаваў азначыць, выходзячы з розных тыпаў аканьня: дысыміляцыйнае аканьне і яканьне (гл. вып. 1, ст. 16 і вып. 2, ст. 36) ён абвясьціў зьявай беларускага пахаджэньня.

Бязумоўна, аднак, і апошні мэтод азначэньня граніц мае свае значныя хібы.

Калі мы возьмем пад увагу, што некаторыя моўныя процэсы, дзя-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

куючы сваёй псыхофізыолёгічнай прыродзе, могуць вельмі лёгка пашырыцца, тады мы зразумеем, што зьявы, якія былі адзнакамі ранейшай асновы данага насельніцтва, з працягам часу могуць зьмяніць сваю граніцу, перакінуўшыся на суседнія плямённыя і моўныя групы, ці, наадварот, могуць зьнікнуць у тых мясцох, дзе раней існавалі[1]). Такім чынам, пасьля дакладнага дасьледваньня граніц такой кардынальнай адзнакі мы можам пазбавіцца права праводзіць на яе падставе граніцы самой мовы. Так, паміж іншым, і здарылася з проф. Дурново, які пасьля прыблізнага вывучэньня граніц дысыміляцыйнага аканьня заблытаўся і нарэшце амаль што зусім адмовіўся ад запрапанованага ім спосабу азначэньня граніцы. Ужо ў 1-м вып. сваёй працы на 24 стар. (3-я увага) Дурново кажа, што пасьля дыялектолёгічных дасьледзін у Курскай, Арлоўскай і Варонескай губэрнях ён праканаўся ў тым, што „диссимилятивное аканье само по себе не может служить критерием при проведении границы между ю.-в. р. и б.-р. В виду этого вопрос о границе будет пересмотрен мною ниже". У 2-м вып. „Диалектологич. разыскаий" аўтар характэрнай адзнакай беларускіх дыялектаў лічыць „диссимилятивное яканье Жиздринского типа", але і тут ён павінен зазначыць існаваньне гэтага тыпу яканья і ў суседніх паўдн.-влр. гутарках з меншай колькасьцю беларускіх прымет і з большай колькасьцю влр. адзнак (ст. 33—36). Апрача таго, выбар аднэй якой-небудзь зьявы ў якасьці крытэрыя для правядзеньня граніцы па сваёй сутнасьці зьяўляецца актам умоўным і адвольным. Чаму мы пры правядзеньні граніцы з паўн.-влр. павінны базавацца якраз на вымове *г*, пры правядзеньні граніцы з паўдн.-влр. на тыпе аканьня? А што мы пакладзем у аснову пры азначэньні граніцы з польскай мовай? Адсутнасьць або прысутнасьць аканьня ці-ж асаблівасьці ў вымове *ъ*? Таксама стаіць прыблізна справа і з правядзеньнем граніцы паміж беларускай і украінскай мовамі. Найбольш важнымі зьявамі, на якіх тут можна было-б базавацца, трэба лічыць аканьне, якое перажылі беларусы, і розьніцу ў вымове зычных перад *е, і* (у ўкраінск. *и*): як вядома, у гістарычным жыцьці ўкраінскай мовы зычныя зацьвярдзелі перад *е, и*, але граніцы іх аддзяляюцца адна ад другой вялікай адлегласьцю, апрача таго і аканьне, і мяккасьць зычных перад мяккімі галоснымі—усе процэсы, якія яднаюцца пад данымі тэрмінамі, зьнікаюць паступова ў кірунку на поўдзень. Так, напр., яшчэ далёка да Прыпяці зьнікае[2]) аканьне ў апошніх складох (нічого), зьнікае да Прыпяці і яканьне, далей страчваецца аканьне ў неапошніх складох пасьля губных і заднянаднябенных, нарэшце (недалёка за Прыпяцьцю) зьнікаюць апошнія сьляды данай зьявы. Значна далей на поўдзень ад Прыпяці мяккая вымова зычных перад мяккімі зычнымі, а ў сувязі з гэтым дзеканьне і цеканьне *(небо, дзень, ціхо)* зьмяняецца на цьвёрдую *(нэбо, дэнь, тихо)*, але і ў зьнікненьні мяккасьці зычных перад *е, і* ёсьць пэўная паступовасьць: значна раней, ужо прыблізна каля Прыпяці, зьнікае мяккасьць губных *(овэчка, вэрба)*.

На чым-жа базавацца ў даным выпадку пры правядзеньні граніцы між украінскай і беларускай мовамі: на аканьні, і ўласна, на якім з момантаў данага складанага процэсу, ці на розьніцы ў вымове зычных перад *е, і (и)* і якіх зычных—зубных ці губных?

Заяўляць a priori, што няма ніякай магчымясьці азначыць граніцы

[1]) Так, здаецца, лёгка ўспрыймаецца ў большасьці гутарак дзеканьне і цеканьне, якое таму так далёка пасунулася на поўдзень ад Прыпяці і на поўнач. На паўднёв.-жа ўсходзе, наадварот. яно ў некаторых мясцох зьнікла (гл. Растаргуева „Гов. вост. уезд. Гом. губ., ст. 9—10. і А. Полевого „О яз. населения Новозыбк. у. Гом. г." ст 12). Вось дзеля таго я лічу, што граніцы моўных зьяў, якія я накрэсьліў на сваіх картах, могуць застацца нязьменнымі толькі на працягу бліжэйшых гадоў.

[2]) Слова *зьнікае* ў даным месцы ня трэба разумець у гістарычным сэнсе.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

беларускай і іншых славянскіх моў, мы, аднак, ня маем права. Мы толькі адмаўляемся ад апрыорнага правядзеньня гэтых граніц без дакладных ведаў лінгвістычнай географіі. Пасьля таго-ж, як стануць вядомымі граніцы і галоўных і другарадных моўных зьяў, гэтыя ўсе даныя, у злучанасьці з першымі з пералічаных мэтодаў (параўнаньне з літаратурнымі мовамі), дадуць нам магчымасьць хоць прыблізна накрэсьліць дыялектолёгічныя карты беларускай і іншых славянскіх моў[1]).

Такім спосабам, дыялектолёгі славянскіх моў павінны ўстрымацца ад апрыорных азначэньняў граніц моў і іх падмоў і дыялектаў, абмежаваўшы пакуль што сваю працу высьвятленьнем граніц пашырэньня паасобных дыялектычных процэсаў. Падобную мэту і паставілі перад сабой Gillieron і Edmont у сваім „Atlas linguistique de la France“,[2]) потым L. Tesniére у працы „Les formes du duel en slovéne“, XX+454 ст., з дадаткам лінгвістычнага атласу, 42+VI ст.+70 карт. Погляду на неабходнасьць такога вывучэньня славянскай дыялектолёгіі прытрымліваюцца яшчэ польскі вучоны Ніч (гл. яго „Proba ugrupowania gwar polskich“, Poradnik językowy 1910, X, „Mowa ludu polskiego“, 1911 і „Z geografji wyrazów polskich“, Roczn. Slaw. VIII, ст. 60—150), баўгарскі Младэнов (Roczn. Slawist. IV і V) і расійскі акадэмік Соболевскі (гл. Изв. отд. р. яз. и сл. Р. Ак. н. за 1914 г. і Ж. М. Н. Пр. за 1915 г. чэрвень).[3]) Гэту задачу ставім і мы перад сабой у данай працы.

§ 2. Мэтоды складаньня дыялектолёгічнага атласу.

Апошнім вынікам маёй працы зьяўляюцца карты цэлага шэрагу дыялектолёгічных зьяў беларускай мовы; самая-ж кніжка ёсьць толькі комэнтары да гэтых карт, які ў той самы час высьвятляе і шлях, якім я прышоў да гэтых вынікаў. Загаловак да майго дасьледваньня і карт звычайна нельга лічыць цалком дакладным. І таму я даў яшчэ падзагаловак маёй кніжцы „Гутаркі Беларусі і суседніх часьцін Вялікарасіі і Украіны“[4]), бо тыя зьявы, граніцы якіх мы вывучаем, часта захапляюць пэўныя часьціны ўспамянутых усходня-славянскіх пляменьняў. Некаторыя ізоглёсы ўрэзваюцца вельмі далёка ў тэрыторыі вялікарусаў і украінцаў, і калі-б у нас была магчымасьць і там разгарнуць дыялектолёгічныя дасьледзіны, мы замест беларускай дыялектолёгіі павінны былі-б тады даць дыялектычнае апісаньне ўсяго ўсходняга сла-

[1]) Такую самую перахадовасьць мы спасьцерагаем і ў іншых мясцох славянскага сьвету, напр., між украінскай і славацкай мовамі, або між польскай і чэскай (у Сілезіі), нарэшце, між баўгарскай і сербскай, сербскай і славенскай. Звычайна, значна-менш сувязі знаходзім між тымі часьцінамі славянства, якія ўжо даўно адарваліся адна ад другой, але і яны могуць захоўваць сьляды даўнейшай сувязі, як гэта мы і бачым у чэскіх і славенскіх гутарках.

[2]) Па поваду гэтай працы, гал. чын., і напісан артыкул М. Я. Немировская „Лингвистическая география и ее значение“. (Изв. Горск. Педагог. Инст., Владикавказ, 1926, ст. 235—249), які, аднак, на жаль ня ўспамінае аб адпаведных працах Зеленіна і Тэньера. З замежных прац, прысьвечаных лінгвістычнай географіі, здаецца лепшай зьяўляецца „La geographie linguistique“ A. Доза.

[3]) Вядуць працу па географічным вывучэньні гаворак і нямецкія вучоныя: яшчэ ў 1895 г. Фішэр выдаў атлас да географіі „der Schwäbischen Mundart“ у 1913 г. ў Jahrb. der Bayer. Akad. der Wissensch. паведамляецца аб пачатай працы ў гэтым кірунку, у 1916-жа годзе выйшла кніжка Крэчмэра „Wortgeographie der hochdeutschen Umgangssprache“. У апошні час працуе над высьвятленьнем граніцы паміж ніжня-і верхнянямецк. мовамі проф. Фрынгс. У Марбургу тымі-ж пытаньнямі займаецца Врэдэ. Дакладней аб нямецкай дыялектографіі гл. у артык. Жырмунская ў № 1 часоп. „Этнография“ за 1927 г. Ёсьць лінгвістычныя атласы Даніі (Бэнніке і Крыштэнштэйна, дако-румынскіх гаворак (Вейганда) Нарэшце ўспомнім аб „Atlas linguistique et ethnograhique de l'Italie et de la Suisse Méridionale“ Ябэрга і Юда.

[4]) Я, звычайна, у даным выпадку словы „Вялікарасія“ і „Украіна“ разумею ў этнографічным сэнсе.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

вянства. А калі-б у нашу задачу мы ўнесьлі і вывучэньне дыялектаў Заходняй Беларусі, тады задачы нашы яшчэ больш пашырыліся-б. Даючы карту дзеканьня і цеканьня або шыпячай вымовы памякчаных сычачых, трэба было-б заносіць на яе, апрача пэўных часьцін беларускіх дыялектаў, яшчэ значныя часьціны тэрыторыі польскае мовы.

А як далёка сягае на поўнач тое самае дзеканьне і цеканьне! Некаторыя-ж карты (напр., карта пашырэньня *мыю*), калі-б яны былі поўнымі, павінны былі-б захапіць амаль усё славянства. Вось дзеля спрашчэньня працы мы ў такіх выпадках, калі якая-небудзь зьява далёка ўваходзіць у тэрыторыю суседніх з беларускімі гутарак, мы тады на нашых картах пачынаем яе ад самага краю чатырохкутніка—краю паўднёвага або ўсходняга і гэт. далей. Гэтым мы паказваем, што даная зьява цягнецца і далей. А самы разьмер гэтага чатырохкутніка мы ўмоўна выбралі, прыблізна ў межах пераходных блр.-влр. і блр.-укр. гутарак, адносна якіх і ідуць спрэчкі [1]).

Далі мы карты ня ўсіх фактаў, вядомых на тэрыторыі беларускіх і суседніх дыялектаў, а толькі іх часьціны. Здарылася гэта ў выніку некалькіх прычын. Папершае, складаньне аднэй якой-небудзь карты вымагае ўжо шмат працы (параўн. карту да дасьледваньня проф. Зеленіна „Великорусские говоры с неорганич. и непереходн. смягчен. задненебн. согласных), падругое, вельмі цяжка сачыць за граніцамі зьяў, якія праходзяць па-за тэрыторыяй БССР (напр., дзеканьне), нарэшце, ня ўсе факты мовы прадстаўляюць аднолькавы інтарэс і значэньне.

Што-ж датычыцца тых карт, якія мы зьмясьцілі ў сваім атласе, то ня ўсе яны накрэсьлены з аднолькавай дакладнасьцю. Залежыць даны факт ат таго, што зазначэньне некаторых больш тонкіх зьяў (напр., дыфтонгічнай вымовы, адрозьніваньне адценьняў аканьня) вымагае пэўнай лінгвістычнай падрыхтоўкі, і таму іх часта не адзначалі папярэднія зьбіральнікі фольклёрных матар'ялаў. Не заўсёды наконт падобных пытаньняў могуць даць здавальняючы адказ і цяперашнія нашы памоцнікі—вясковыя настаўнікі і студэнты. Бываюць нават такія выпадкі, калі пэўная асоба зазначае адсутнасьць дыфтонгаў (замест *е*, *о* ў зачыненых складох) у гутарцы яе вёскі, не памячаючы, што гэтыя самыя дыфтонгі існуюць і ў яе ўласнай вымове.

Калі тая ці іншая моўная зьява паступова зьнікае ці замяняецца адпаведнай іншай, тады гэту паступовасьць мы адзначаем на карце штрыхоўкай таго самага колеру [2]).

У сярэднім крэсьлілі мы карты з дакладнасьцю да дзесяці вёрст. Мы па магчымасьці імкнуліся знайсьці два рады вёсак—першы рад—гэта бліжэйшыя ад граніцы вёскі, якія яшчэ ведаюць цікавячую нас зьяву, і другі рад—гэта вёскі, у гутарках якіх ужо ня існуе даная зьява. Між гэтымі двума радамі мы і праводзілі граніцу. Калі, нарэшце, немагчыма было ізоглёсаваць тую ці іншую зьяву ў некаторых мясцох і з такой нават дакладнасьцю, там мы крэсьлілі прыблізную граніцу, а іменна давалі ломаную лінію замест крывой, зьвязваючы гэтай ломанай лініяй пункты, адносна якіх у нас ёсьць веды.

Як відаць з атласу, некаторыя моўныя факты распаўсюджаны астравамі. Прычын пахадженьня падобных астраўных зьяў можа быць дзьве: або даўнейшая зьява ўсьцяжнага характару пачала зьнікаць мя-

---

[1]) Трохі іншыя мясцовасьці папалі толькі на карту дысымілятыўнага аканьня, бо тут мы выходзілі з карты проф. Голанова, даючы да яе папраўкі (гл. карту № 2).

[2]) Азначаючы належнасьць данай мясцовасьці і нават данай вёскі да тэй ці іншай паласы, даводзілася часта рабіць шырокія абагульненьні, бо хістаньні магчымы ў тэй самай вёсцы і нават у тэй самай сям'і.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сцамі, і таму і ўтварыліся астравы, ці наадварот, можа, гэта здарылася ў выніку самастойнага зараджэньня данага процэсу ў розных мясцох тэрыторыі, якая нас цікавіць.

Усе карты, апроч аднэй (№ 1, аканьня), даюць усьцяжныя поласы, зафарбаваныя тэй ці іншай фарбай. На карце-ж № 1 накрэсьлены дзьве граніцы—паўночная граніца зьмернага аканьня і паўднёвая самага аканьня.

Разьмер карт, параўнаўча, невялікі, але гэта тлумачыцца тым, што мы не хацелі друкаваць атлас паасобна ад кніжкі; надрукованы ён як працяг працы на аркушох таго самага разьмеру.

§ 3. Матар'ялы для вывучэньня беларускіх дыялектаў.

Карыстаўся я самымі рознастайнымі матар'ялами. Апрача друкаваных этнографічных зборнікаў Раманава, Шэйна, Сержпутоўскага, Добравольскага і інш. і ненадрукаваных таго-ж Раманава (вып. X—XIV), А Шлюбскага і інш., якія знаходзяцца ў распараджэньні Дыялектолёгічна-Фольклёрнай Камісіі Інбелкульту, потым надрукаваных адказаў на акадэмічныя програмы і манографій па беларускай дыялектолёгіі, я карыстаўся, галоўным чынам, адказамі на нашы програмы, поўныя і скарочаныя, апытваньнямі студэнтаў і іншых асоб і вынікамі дасьледзін на мясцох. Скажу дакладней аб кожнай з пералічаных крыніц.

Прыводжу сьпіс галоўнейшых з надрукаваных этнографічных зборнікаў і іншых матар'ялаў, якія маюць адносіны да Ўсходняй Беларусі.

П. Бессонов „Белорусские песни, с подробными об'яснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта", Москва, 1871.

А. С. Дэмбовецкі „Опыт описания Могилевской губернии", Могилев, 1882.

Зінаіда Радчэнко „Гомельские народные песни (белорусские и малорусские)", Петербург, 1888.

„Два заговора из Чериковского уезда" (Могилевск. Губернские Ведомости за 1889 г., № 2").

Е. Р. Раманаў „Белорусский сборник", Вып. I—IX, Киев-Вильна-Витебск, 1886—1912.

П. В. Шэйн „Белорусские песни", 1874.

Яго-ж „Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края", Отд. р. яз. и сл. Р. А. н., т. т. I—III, 1887—1903.

В. Н. Добравольскі „Смоленский этнографический сборник", вып. I—IV, Спб-Москва, 1891—1903.

Н. Я. Нікіфароўскі „Очерки простонародного жытья-бытья в Витебской Белорусии", 1895 (з „Витебск. Губ. Ведом." за 1894—95г. г.).

Яго-ж „Очерки Витебской Белоруссии", I—VIII (з „Этнограф. Обозрен." за 1892—99 г. г.).

Яго-ж „Простонародные приметы и поверья", 1897, Витебск.

Яго-ж „Белорусские песни-частушки", 1911.

Ляцкі „Матер. для изучен. творчества и быта блр. Борисовского уезда, Минской г. (Чтен. в Общ. Ист. и Древн. Росс., 1898).

А. Розенфельд „Белорусские народные песни", Сборн. отд. р. яз. и сл. Р. А. н., т. 77, № 3, 1904.

А. К. Сержпутоўскі „Сказки и рассказы белоруссов-полещуков", Спб., 1911.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Яго-ж „Казкі і апавяданьні беларусаў з Слуцкага пав", Менск, 1926 [1]).

Розныя матар'ялы (Доўнар-Запольскага, М. П. Косіч і інш.), надрукованыя ў „Живой старине".

Бязумоўна, ня ўсе пералічаныя крыніцы маюць аднолькавую вартасьць. Больш докладнымі можна лічыць запісы Нікіфароўскага і Сержпутоўскага, менш каштоўнымі зьяўляюцца дадзеныя ў зборніках Раманава і Добравольскага. Раманаў, напр., ня вызначае дыфтонгаў, хоць значную часьціну сваіх матар'ялаў ён сабраў у паўднёвай Беларусі, гутаркі якой характарызуюцца дыфтонгамі на мейсцы *е, о, ѣ* [2]). Яшчэ менш значэньня для вывучэньня дыялектаў маюць матар'ялы Шэйна, які, як вядома, карыстаўся дапамогай гімназістаў, сэмінарыстаў, валасных пісароў. Апроч таго, як зазначыў А. Шлюбскі (журн. „Крывіч", 1925, № 10 (2), ст. 19—26), Шэйн сьвядома зьніштажаў беларускія дыялектычныя рысы, прычынай чаго былі ня зусім прыхільныя яго адносіны да беларусоў і іхняга руху. І таму можна лічыць, што акад. Карскі (Ж. М. Н. Пр. за 1887. окт., 1890, ноябрь и 1794, апр., потым, отчет о присужд. прем. им. Батюшкова, 1899), а за ім С. М. Некрашэвіч (журн. „Полымя" за 1926 г., № 6, ст. 122 і наст.) трохі пераацанілі значэньне запісаў Шэйна для беларускай дыялектолёгіі. Ня гледзячы, аднак, на ўспамянутыя хібы пералічаных матар'ялаў, пры пэўнай асьцярожнасьці можна імі карыстацца. А менавіта, у той час як адсутнасьць тэй ці іншай зьявы ў запісах данага этнографа яшчэ ня сьведчыць аб тым, што гэтая зьява ня існуе ў тэй мясьцовасьці, дзе зроблен запіс, адбіцьцё дыялектычных зьяў у этнографічных зборніках, асабліва, калі яго знаходзім у некалькіх мясцох, значна больш заслугоўвае давер'я.

Вельмі добра адбіваюць асаблівасьці народных гутарак запісы А. Шлюбскага (сакратара Фольклёрна-Дыялектолёгічнай камісіі Інстытуту Беларускае Культуры) з Віцебшчыны і Полаччыны. Гэтыя матар'ялы ўжо друкуюцца пад загалоўкам „Матар'ялы па вывучэньні фольклёру і мовы Віцебшчыны".

З крытычнай ацэнкай трэба падыходзіць і да адказаў на дыялектолёгічныя програмы Расійскай Акадэміі Навук, якія пад загалоўкамі „Материалы для изучения белорусских говоров", „Материалы для изучения великор. говоров" і „Материалы для изучения сев.-млр. говоров, а также переходных от белор. к малорусск", друкаваліся ў „Известиях" и „Сборниках" Отд. р. яз. и сл. Р. А. м., бо ня ўсе асобы, якія браліся за складаньне адказаў на акадэмічныя програмы, уладалі адпаведнай да тэй справы падрыхтоўкай. Тое самае можна сказаць і адносна адказаў на програму Маскоўскай Дыялектолёгічнай Камісіі, якія зьмяшчаліся ў яе „Трудах", большасьць якіх друкавал. у Русск. Филолог. Вестн. [3]). Апроч таго, у сувязі з тым, што з працягам часу граніцы зьяў могуць зьмяняцца, для нас, жадаючых даць апісанье блр. дыялектаў па магчымасьці к 1926—27 г. г., як адказы, так і этнографічныя матар'ялы, тым больш утрачваюць значэньне, чым раней яны былі надрукаваны. Вось таму даводзілася часам правяраць зазначаныя крыніцы. Нарэшце, паскольк магчыма было, скарысталіся мы і нека-

[1]) Матар'ялы Дыбоўскага, Кліха і Федароўскага мы ня прыводзілі, бо яны датычацца Заходняй Беларусі. Кніжку-ж Тышкевіча „Opisanie powiatu Borysowskiego (1847) мы лічым вельмі застарэлай дзеля таго, каб можна было-б вывучаць па ёй сучаснае становішча гаворак; тое самае трэба сказаць і адносна матар'ялаў Шпілеўскага.

[2]) Аб гэтым гл. рэцэнзію акад. Карскага ў Ж. М. Н. Пр. ч. 333.

[3]) Нядаўна выданьнем Акад. СССР вышаў 9 выпуск пад загалоўкам „Труды постоянной комиссии по изучению диалектологии русского языка".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сцамі, і таму і ўтварыліся астравы, ці наадварот, можа, гэта здарылася ў выніку самастойнага зараджэньня данага процэсу ў розных мясцох тэрыторыі, якая нас цікавіць.

Усе карты, апроч аднэй (№ 1, аканьня), даюць усьцяжныя поласы, зафарбаваныя тэй ці іншай фарбай. На карце-ж № 1 накрэсьлены дзьве граніцы—паўночная граніца зьмернага аканьня і паўднёвая самага аканьня.

Разьмер карт, параўнаўча, невялікі, але гэта тлумачыцца тым, што мы не хацелі друкаваць атлас паасобна ад кніжкі; надрукованы ён як працяг працы на аркушох таго самага разьмеру.

§ 3. Матар'ялы для вывучэньня беларускіх дыялектаў.

Карыстаўся я самымі рознастайнымі матар'ялямі. Апрача друкаваных этнографічных зборнікаў Раманава, Шэйна, Сержпутоўскага, Добравольскага і інш. і ненадрукаваных таго-ж Раманава (вып. X—XIV), А Шлюбскага і інш., якія знаходзяцца ў распараджэньні Дыялектолёгічна-Фольклёрнай Камісіі Інбелкульту, потым надрукаваных адказаў на акадэмічныя програмы і манографій па беларускай дыялектолёгіі, я карыстаўся, галоўным чынам, адказамі на нашы програмы, поўныя і скарочаныя, апытваньнямі студэнтаў і іншых асоб і вынікамі дасьледзін на мясцох. Скажу дакладней аб кожнай з пералічаных крыніц.

Прыводжу сьпіс галоўнейшых з надрукаваных этнографічных зборнікаў і іншых матар'ялаў, якія маюць адносіны да Ўсходняй Беларусі.

П. Бессонов „Белорусские песни, с подробными об'ясненіями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта", Москва, 1871.

А. С. Дэмбовецкі „Опыт описания Могилевской губернии", Могилев, 1882.

Зінаіда Радчэнко „Гомельские народные песни (белорусские и малорусские)", Петербург, 1888.

„Два заговора из Чериковского уезда" (Могилевск. Губернские Ведомости за 1889 г., № 2").

Е. Р. Раманаў „Белорусский сборник", Вып. I—IX, Киев-Вильна-Витебск, 1886—1912.

П. В. Шэйн „Белорусские песни", 1874.

Яго-ж „Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края", Отд. р. яз. и сл. Р. А. н., т. т. I—III, 1887—1903.

В. Н. Добравольскі „Смоленский этнографический сборник", вып. I—IV, Спб-Москва, 1891—1903.

Н. Я. Нікіфароўскі „Очерки простонародного жытья-бытья в Витебской Белорусии", 1895 (з „Витебск. Губ. Ведом." за 1894—95г. г.).

Яго-ж „Очерки Витебской Белоруссии", I—VIII (з „Этнограф. Обозрен." за 1892—99 г. г.).

Яго-ж „Простонародные приметы и поверья", 1897, Витебск.

Яго-ж „Белорусские песни-частушки", 1911.

Ляцкі „Матер. для изучен. творчества и быта блр. Борисовского уезда, Минской г. (Чтен. в Общ. Ист. и Древн. Росс., 1898).

А. Розенфельд „Белорусские народные песни", Сборн. отд. р. яз. и сл. Р. А. н., т. 77, № 3, 1904.

А. К. Сержпутоўскі „Сказки и рассказы белоруссов-полещуков", Спб., 1911.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Яго-ж „Казкі і апавяданьні беларусаў з Слуцкага пав", Менск, 1926 [1]).

Розныя матар'ялы (Доўнар-Запольскага, М. П. Косіч і інш.), надрукованыя ў „Живой старине".

Бязумоўна, ня ўсе пералічаныя крыніцы маюць аднолькавую вартасьць. Больш докладнымі можна лічыць запісы Нікіфароўскага і Сержпутоўскага, менш каштоўнымі зьяўляюцца дадзеныя ў зборніках Раманава і Добравольскага. Раманаў, напр., ня вызначае дыфтонгаў, хоць значную часьціну сваіх матар'ялаў ён сабраў у паўднёвай Беларусі, гутаркі якой характарызуюцца дыфтонгамі на мейсцы *е, о,* ѣ [2]). Яшчэ менш значэньня для вывучэньня дыялектаў маюць матар'ялы Шэйна, які, як вядома, карыстаўся дапамогай гімназістаў, сэмінарыстаў, валасных пісароў. Апроч таго, як зазначыў А. Шлюбскі (журн. „Крывіч", 1925, № 10 (2), ст. 19—26), Шэйн сьвядома зьніштажаў беларускія дыялектычныя рысы, прычынай чаго былі ня зусім прыхільныя яго адносіны да беларусоў і іхняга руху. І таму можна лічыць, што акад. Карскі (Ж. М. Н. Пр. за 1887. окт., 1890, ноябрь и 1794, апр., потым, отчет о присужд. прем. им. Батюшкова, 1899), а за ім С. М. Некрашэвіч (журн. „Полымя" за 1926 г., № 6, ст. 122 і наст.) трохі пераацанілі значэньне запісаў Шэйна для беларускай дыялектолёгіі. Ня гледзячы, аднак, на ўспамянутыя хібы пералічаных матар'ялаў, пры пэўнай асьцярожнасьці можна імі карыстацца. А менавіта, у той час як адсутнасьць тэй ці іншай зьявы ў запісах данага этнографа яшчэ ня сьведчыць аб тым, што гэтая зьява ня існуе ў тэй мясьцовасьці, дзе зроблен запіс, адбіцьцё дыялектычных зьяў у этнографічных зборніках, асабліва, калі яго знаходзім у некалькіх мясцох, значна больш заслугоўвае давер'я.

Вельмі добра адбіваюць асаблівасьці народных гутарак запісы А. Шлюбскага (сакратара Фольклёрна-Дыялектолёгічнай камісіі Інстытуту Беларускае Культуры) з Віцебшчыны і Полаччыны. Гэтыя матар'ялы ўжо друкуюцца пад загалоўкам „Матар'ялы па вывучэньні фольклёру і мовы Віцебшчыны".

З крытычнай ацэнкай трэба падыходзіць і да адказаў на дыялектолёгічныя програмы Расійскай Акадэміі Навук, якія пад загалоўкамі „Материалы для изучения белорусских говоров", „Материалы для изучения великор. говоров" і „Материалы для изучения сев.-млр. говоров, а также переходных от белор. к малорусск", друкаваліся ў „Известиях" и „Сборниках" Отд. р. яз. и сл. Р. А. м., бо ня ўсе асобы, якія браліся за складаньне адказаў на акадэмічныя програмы, уладалі адпаведнай да тэй справы падрыхтоўкай. Тое самае можна сказаць і адносна адказаў на програму Маскоўскай Дыялектолёгічнай Камісіі, якія зьмяшчаліся ў яе „Трудах", большасьць якіх друкавал. у Русск. Филолог. Вестн. [3]). Апроч таго, у сувязі з тым, што з працягам часу граніцы зьяў могуць зьмяняцца, для нас, жадаючых даць апісанье блр. дыялектаў па магчымасьці к 1926—27 г. г., як адказы, так і этнографічныя матар'ялы, тым больш утрачваюць значэньне, чым раней яны былі надрукаваны. Вось таму даводзілася часам правяраць зазначаныя крыніцы. Нарэшце, паскольки магчыма было, скарысталіся мы і нека-

---

[1]) Матар'ялы Дыбоўскага, Кліха і Федароўскага мы ня прыводзілі, бо яны датычацца Заходняй Беларусі. Кніжку-ж Тышкевіча „Opisanie powiatu Borysowskiego (1847) мы лічым вельмі застарэлай дзеля таго, каб можна было-б вывучаць па ёй сучаснае становішча гаворак; тое самае трэба сказаць і адносна матар'ялаў Шпілеўскага.

[2]) Аб гэтым гл. рэцэнзію акад. Карскага ў Ж. М. Н. Пр. ч. 333.

[3]) Нядаўна выданьнем Акад. СССР вышаў 9 выпуск пад загалоўкам „Труды постоянной комиссии по изучению диалектологии русского языка".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

торымі адказамі на програмы і з Мазыршчыны, зьмешчанымі ў 7-м т. Тр. Этн.-стат. экспед. в Зап.-русск. край (а так-жа і сам. артыкулам Міхальчука аб укр. гутарках у тым самым томе).

Калі мы возьмем пад увагу зазначаную вышэй акалічнасьць, мы таксама павінны будзем вызнаць большую вартасьць пазьнейшых прац па беларускай дыялектолёгіі. Не спыняючыся на ранейшых манографіях па даным пытаньні, сьпіс якіх можна знайсьці хоць-бы ў акад. Карскага (гл. яго „Белоруссы" I, р. VII), я скажу некалькі слоў аб працах па блр. дыялектолёгіі, якія зьявіліся пасьля выхаду ў сьвет „Белоруссов" акад. Карскага. Некаторыя з іх (Голанова „О диссимилятивном аканьне" і інш., Соколова і інш.) друкаваліся ў „Трудах Моск. Диал. Ком.". Трэба ўспомніць і аб артыкулах Попова „Замеч. о сев.-смол. и ржевск. говорах" (Изв. Отд. р. яз. и сл. Р. А. н. за 1913 г., III; з поглядамі аўтара нельга, аднак, цалкам згадзіцца) і Н. Грінковай (Изв. Отд. р. яз. и сл. Р. А. Н., т. XXXI[1]).

У 1915 г. даволі дакладнае апісаньне гутаркі б. Жыцінскай воласьці (якая цяпер знаходзіцца ў паўн.-ўсходняй часьціне Слуцкай акр.) зрабіў І. Сербаў у сваёй працы аб сакунох (гл. Сборник отделен. р. яз. и сл. Р. А. н., т. XCIV, № 1, ст. 50—128).

Аб значэньні працы Дурново „Диалектологич. разыскания в области великорусск. говоров" для беларускай дыялектолёгіі нам ужо даводзілася гаварыць.

У апошні час вышлі яшчэ чатыры манографіі, прысьвечаныя белар. гутаркам: 1) О. Курило „Фонетичні та деякі морфологічні особливості говірки села Хоробричів", 1924; 2) Ант. Полевой „О языке населения Новозыбковского уезда, Гомельской губернии", Выд. Інст. Бел. Культ., 1926, 47 стар., 3) П. Бузук „Да характарыстыкі паўн.-беларускіх дыялектаў. Гутаркі Невельскага і Вяліскага паветаў", Выд. Інст. Бел. Культ., 1926, 15 стар. і 4) Н. Зорін, Вопр. об этнограф. сост. насел. Невельск. у., в связи с диалектическ. особенностями местного говора, с данными истории местного края и экономическими центрами его тяготения, Зборн. „Познай свой край", III Пскоў, 1927, ст. 33—63[2]).

Нарэшце ў нас была магчымасьць (у апошні час) пазнаёміцца з вялікай працай проф. П. Растаргуева „Северско-белорусский говор" (аб Старадубскім, Новазыбкаўск. і суседніх паветах). Пакуль яна друкавалася, вышла скарачэньне яе пад назвай „Говоры восточных уездов Гомельской губерн. в их современном состоянии", Менск, 1927.

Аб беларускіх гутарках можна знайсьці дадзеныя і ў некалькіх працах агульнага характару апошняга дзесяцігодзьдзя: 1) ва ўпамянутым ужо „Опыте диалектологической карты русского языка в Европе" (1915) Дурново, Соколова и Ушакова,[3]) потым у 2) „Белорусской речи в ее современном и прошлом состоянии" проф. Растаргуева (Курс Белоруссоведения, Москва, 1918—1920, ст. 185—257), на рэшце ў працы акад. Карскага: 3) Русская диалектология, Ленинград, 1924.

Імкнучыся скласьці па магчымасьці прадстаўленьне аб сучасных

---

[1]) Больш дакладныя ўвагі аб літаратуры па белар. дыялектол. да 1915 г. можна знайсьці ў „Опыте диалектологич. карты русск. яз. в Европе", ст. 101—104.

[2]) Хоць вывады Н. Зорына трохі адрозьніваюцца ад маіх, але ў самых назіраньнях, якія мы зрабілі незалежна друг ад друга (калі Н. Зорін чытаў свой даклад, ён яшчэ ня ведаў аб маім артыкуле), ёсьць шмат супадзеньняў.

[3]) З рэцэнзій на „Опыт" асаблівую цікавасьць мае для нас рэцэнзія акад. Соболевского (гл. Ж. М. Н. Пр. за 1915, июнь, ст. 398—402), які кажа, што ўражаньне ад карты „получилось-бы более сильное", калі-б укладчыкі яе замест граніц падмоў „попробовали-б отметить на ней особенно яркие черты говоров".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

граніцах моўных зьяў, мы, звычайна, найбольшае значэньне павінны былі прыдаць нашым уласным назіраньням. Папершае, неабходна было правяраць больш старыя і ня зусім пэўныя матар'ялы, падругое, даводзілася накіроўваць сваю ўвагу ў мясцовасьці, у якія не даведаліся яшчэ ні этнографы ні дыялектолёгі. Зьдзейсьнівалі мы сваю задачу рознымі спосабамі. Шмат дапамаглі нам нашы студэнты—слухачы (а таксама і іншыя знаёмыя асобы), ад якіх я запісаў дыялектычныя асаблівасьці іх родных вёсак. Далей мы скарысталіся цэлым шэрагам адказаў на нашы програмы. Ведаючы добра аб тым, што вясковыя настаўнікі і без таго абцяжаны працай, а між тым спасьцярогі над гутаркай вымагаюць, апроч падрыхтоўкі, яшчэ пільнага вывучэньня самой програмы, мы складалі скарочаныя програмы для пэўных часьцін усходняй Беларусі. Напр., зусім лішнім зьяўляецца для Віцебшчыны пытаньне аб тым, ці існуе там саканьне, і наадварот, можна не запытваць аб цоканьні настаўнікаў Мазыршчыны. Праўда, і на поўначы мог знайсьціся востраў якой-небудзь зьявы, характэрнай для паўдн.-блр. дыялектаў, і наадварот, у паўднёвых гутарках можна адшукаць паўн.-блр. дыялектычную адзнаку (так, напр., ф. творн. скл. мн. л. на—*ам* існуе ня толькі ў паўн.-блр. гутарках, гл. А. Полевого „О яз. насел. Новозыбк. у. Гом. г., ст. 19—20), але калі гэты востраў невялікі (напр., адна, дзьве вёскі перасяленцаў з іншых месц Беларусі), гэта акалічнасьць ня будзе мець вялікага значэньня для нашага атласу, калі-ж востраў даволі значны, мы аб ім так ці іначай даведаліся-б, асабліва, калі данай зьяве прысьвечана ў нашым атласе карта.

Усьпелі мы скарыстацца і некалькімі адказамі на поўную дыялектолёгічную програму, выдадзеную Інбелкультам[1]) („Програма для зьбіраньня асаблівасьцяй беларускіх гаворак і гаворак пераходных да суседніх моў. Апрацавалі С. Некрашэвіч і П. Бузук", 1927, 80 стар.).

Нарэшце ў працягу 1926 і 1927 гадоў[2]) я прадпрыняў з мэтай вывучэньня дыялектаў шмат паездак па БССР і за яе межамі. Быў я амаль што ва ўсіх раёнах Менскай акругі, у двух раёнах Барысаўск. акр., у вёсках пад Віцебскам, дакладна дасьледжваў я Асіпавіцкі[3]) і Сьвіслацкі раёны Бабруйшчыны, у верасьні-ж праехаў на падводах ад Бабруйску на Мазыр цераз Брожу, Карпілаўку, Капаткевічы, Скрыгайлава (ужо за Прыпяцьцю), Асавец, Раманаўку, Казянькі. Нарэшце ўжо ў сьнежні я пабываў у Ельскім раёне Мазырск. акр. З гутарак па-за межамі БССР у нас была магчымасьць вывучаць дыялекты Невельскага і Вяліскага паветаў, аб чым мы ўжо ўспаміналі раней. Сёлета (у 1927 г.) мы пабывалі вясной у Будзе Кашалёўскай, летам у Рослаўскім пав. Смаленшчыны, у паўночнай Чарнігаўшчыне, праехалі далей па Дняпры ад Лукаед да Рэчыцы (з астаноўкамі), адведалі (са студэнтамі разам) Тураўскі р., нарэшцэ былі ў Жыткавіцк., а также недалёка ад Оўруча, цяпер-жа восеньню былі ў Вяземскім пав. Смал. губ. Але шляхам распытваньняў, размоў з сялянамі на рынках і з вуч-

---

[1]) Адказы, якія мы у будучым атрымаем, даўшы магчымасьць ізоглёсаваць новыя зьявы, ня будуць, аднак, спадзяемся мы, пярэчыць прыведзеным ізоглёсам, бо ад значнай колькасьці тых асоб, якія могуць прыслаць адказы, мы ўжо атрымалі вусныя паведамленьні.

[2]) Пачаўшы працу па даследваньні беларускіх дыялектаў у студзені мінул. г. (у м. Каленкавічы Мазырск. акр.) мы прадаўжалі яе на працягу 2 гадоў; не спынялі яе і ў часе заняткаў у Бел. Дзярж. Універс., які даў нам магчымасьць прадаўжаць пачатую працу тым, што ўсе мае лекцыі былі сконцэнтраваны ў тры дні.

[3]) Дыялектолёгічнае апісаньне Асіпавіцк. і сусёдняга раёнаў я даю ў сваім артыкуле „Да харэктарыстыкі цэнтральных беларускіх дыялектаў. Гутаркі Асіпавіцкага і суседніх раёну", які я падрыхтаваў да друку.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нямі-навакамі ў школах (асабліва ў раённых сямігодках, у якіх вучацца дзеці са ўсяго раёну), нарэшце, дзякуючы размовам з настаўнікамі на настаўніцкіх конфэрэнцыях і курсах у Менску, Віцебску, Полацку, Рэчыцы і Мазыры, мне ўдавалася дабіцца пашырэньня паласы сваіх дыялектолёгічных назіраньняў. Нярэдка дапамагаюць тут сяляне сваімі кпінамі над моўнымі асаблівасьцямі суседніх вёсак. Па поваду ўжываньня такіх форм назоўн.-вінав. скл. мн. л., як ваўке, лясэ ў гутарцы в. Касьцяшы (на беразе Нёману) Узьдзенск. р. Менск. акр. жыхары сусудніх вёсак склалі такую песьню: „Касьцяшэ-галышэ, на пясочку сядзяць, на Пясочну[1]) глядзяць". На падставе гэтай самай асаблівасьці, а таксама і саканьня, насельнікаў крайніх паўн.-ўсходніх вёсак Случчыны жыхары бліжэйшай часьціны Асіпавіцк. р. называюць *„сакунэ"*.

З усяго сказанага становіцца зразумелым, чаму мы прымушаны былі пакуль што абмежавацца дасьледваньнем ізоглёс толькі на тэрыторыі Ўсходняй Беларусі; літаратурныя матар'ялы, па якіх можна было-б скласьці некаторае прадстаўленьне аб граніцах пашырэньня тэй ці іншай зьявы на захадзе Беларусі, займаюць у нашай працы другараднае значэньне. Відавочнай павінна зрабіцца і неабходнасьць разьмясьціць здабыты намі матар'ял не па дыялектычных апрыорных адзінках, а па адпаведных зьявах фонэтыкі і морфолёгіі.

Цяпер некалькі слоў аб скарачэньнях:

Карскі, Блр.=Акад. Карский „Белоруссы", т. I і II (у 2-х выпусках).

Рам. Блр. Сб.=Романов, „Белорусский Сборник", вып. I—IX (надруков.) і X—XIV (яшчэ не надруков., захоўв. ў Інбелкульце).

Шэйн, Мат.=Шэйн „Материалы для изучения быта и языка русского населения сев.-западн. края", т. т. I—III.

Оп.=„Опыт диалектологичегкой карты русского яз. в Европе" Дурново, Соколова и Ушакова.

Добр., См. Сб.=Добровольский „Смоленский Этнографический Сборник", ч. I—IV.

Мат. блр.=Карский „Материалы для изучения белорусских говоров", вып. 1—6.

Тр. М. К.=„Труды Московской Диалектологической Комиссии", вып. 1—8.

РФВ.=Русский Филологический Вестник.

в. п.=Вуснае паведамленьне, запісанае ад такой-та асобы.

Адк. №...=Адказ №... на нашы скарочаныя програмы, а таксама і на нашы лісты па поваду паасобных зьяў.

Падр. адк. №...=Адказ на падрабязную „Праграму для зьбіраньня асаблівасьцяй беларускіх гаворак і гаворак пераходных да суседніх моваў. Апрацавалі С. Некрашэвіч і П. Бузук".

н. з.=Нашы ўласныя запісы на мясцох.

Усе адказы на нашы програмы і лісты па дыялектолёгічных пытаньнях, занумараваныя, па выкарыстаньні будуць пераданы да архіву Інстытуту Беларускае Культуры.

Яшчэ некалькі слоў адносна прынятага намі правапісу ўласных і географічных імён. Пытаньне аб іх яшчэ застаецца для беларускай ортографіі адчыненым, і таму нам давялося кіравацца прыкладам праекту, прынятага на Украінскай Правапіснай Конфэрэнцыі. Уласныя імёны мы стараемся перадаць з захаваньнем асаблівасьцяй вымаў-

[1]) Пясочна—мястэчка. якое знаходзіцца на другім беразе Нёману, супроць Касьцяшоў.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

леньня мовы таго народу, якому належыць даная асоба; дазвалялі мы толькі зьмену канчаткаў гэтага імя згодна з правіламі блр. мовы Што-ж датычыцца географічных назваў, мы для посьлядоўнасьці прынялі такі прынцып: мы перадаем яе згодна з духам блр. м. (Смаленск, Вялікія Лукі, Бранск). Гэта мы робім умоўна, бо ня лічым магчымым а ргіогі вырашыць дакладна, да якой этнографічнай краіны належыць той ці іншы географічны пункт або тая ці іншая рака.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

II.

Фонэтыка

А. Вокалізм.

§ 4. Аканьне. Пад гэтай назвай яднаецца цэлы шэраг разнастайных зьмен, якім падупадаюць ненаціскныя галосныя. Ні высьвятленьне прычын гэтых зьяў, ані іх пахаджэньне, не ўваходзіць у нашу задачу.

Перш за ўсё адносна аканьня беларускую мову падзяляюць, як вядома, на паласу моцнага аканьня і на паласу аканьня памернага. Ад апошняга адрозьніваюць часам аканьне слабае, асаблівасьцямі якога зьяўляецца захаваньне нязьменных галосных і ў праднаціскных складох. Такі падзел прыблізны і ўмоўны: аканьне паступова зьнікае ў паўдн.-заходнім кірунку, г. зн. у кірунку да граніц з польскай і ўкраінскай мовамі.[1]). „Калі, кажа акад. Карскі (Белоруссы, I, ст. 193--194), ад м. Прапойску Магілеўскай губ. правесьці крыху ломаную лінію на захад да Дняпра, а потым па гэтай рацэ падняцца амаль што да Магілева, далей у паўночна-заходнім кірунку да граніцы Сеньненск. пав. з Менскай губ, і тады ісьці на захад, з поўдня ад Барысава і далей, захапляючы часткай нават Менскі павет, потым падняцца на поўнач к г. Докшыцам, а адсюль у кірунку на Сьвянцяны да беларускай граніцы, то з поўдня і захаду мы акрэсьлім краіну, паўночна-усходняя граніца якой намі ўжо праведзена раней, а паўночна-заходняя супадае з граніцай беларускага племя,—краіну, якая становіць гутаркі найбольш акаючыя: *о* і *е* ненацісканыя тут пераходзяць ва ўсякім становічшы ў *а* і *я*".

Досьледы над жывымі гутаркамі Ўсходняй Беларусі прымушаюць нас праводзіць паасобна граніцы ў адносінах да *о* і ў адносінах да *е* ў ненаціскных складох, як у першым, так і ў другім складох перад націскам. Складанасьць пытаньня аб аканьні, дзякуючы якой мы павінны будзем даць некалькі граніц, зьяўляецца ў той самы час прычынай таго, што ў кожным паасобным выпадку тая ці іншая граніца ня зусім, можа, будзе дакладнай. Такім чынам, азначэньне граніц розных адценьняў аканьня ў супроцьлежнасьць азначэньню граніц іншых фактаў

[1]) З гэтымі тыпамі аканьня нельга ставіць у шэраг дысыміляцыйнае адценьне і іншыя яго адмены, якія адзначаюцца па характары рэфлексаў ненаціскных галосных, (напр., уканьне ў мужука); як пабачым далей. моцнае аканьне можа быць у той самы час і дысыміляцыйным.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

блр. м. зьяўляецца больш прыблізным і гіпотэтычным. Складанасьць пытаньня прымушае нас таксама ў адносінах да аканьня ў большай меры карыстацца вынікамі папярэдніх дасьледчыкаў. Так, напр., пры азначэньні граніц дысымілятыўнага аканьня і яканьня можна выходзіць з вынікаў дасьледзін проф. Дурново, якія ён падае ў успамянутай працы „Диалектологические разыскания в области великорусск. говоров“ і проф. Голанова ў III в. Тр. М. Д. К. Як мы бачым, гэтыя граніцы не супадаюць.

Не супадаюць, як у гэтым мы праканаліся ўжо на падставе ўласных назіраньняў, таксама і паўднёвыя і заходнія граніцы дысымілятыўнага аканьня і яканьня, ці іначай ыканьня і іканьня. Граніца дысымілятыўнага яканьня, бязумоўна, праходзіць значна ніжэй ад граніцы дысымілятыўнага аканьня.

Пачнем з азначэньня граніцы апошняй зьявы [1]).

Папершае, некалькі слоў аб дысыміляцыйн. аканьні ў другім складзе перад націскам.

Перасекшы політычную граніцу з Польшчай прыблізна на поўначы ад Заслаўя, яна накіроўваецца далей на ўсход (з невялікім адхіленьнем на поўдзень); у паўночных часьцінах Заслаўскага і Астрашыцка-Гарадзецкага раёну (Камянец, Лысая Гара і суседн. вёскі) можна часам пачуць гук блізкі да *ы* замест *а* перад складам з націскным *а*, але значна часьцей тут захоўваецца вымова *а*. У другім-жа складзе перад націскам тут зьяўляецца ўжо гук, значна бліжэйшы да *ы* (вызначым яго з тых-жа тэхнічных прычын праз *ы*). Падаю некалькі прыкладаў запісаў з успамянутых вёсак: п*ы*мàлу, в*ы*дá побач з п*а*мáлу, в*а*дá і інш.; але затое ў другім складзе заўсёды гук блізкі да *ы* зам. *а*: п*ы*кажы, в*ы*ласы, б*ы*радà, ня пр*ы*разàй (=рас. не прорезай), д*ы* сястр*ы*, з к*і*шалькý, с*ы*магýнка, пр*ы*з нагý, п*ы*нсакý і інш. Той-жа тып і на поўн. ад Астрашыцка-Гарадзецк. р.—у б. Гайнаўск. вол. Барысаўск. пав. (цяп. Лагойскага р.); чалав*ы*к, бар*ы*дá, але вадá, бадáй, гл. Лященка „Мат. для из. яз. и творч. блр.“, Чт. в Общ. ист. и др. Росс. при Моск. ун., 1898, III. Зьяўленьне гэтага *ы* замест *а* стаіць у сувязі з дысымілюючым уплывам *а* ў наступным складзе, як на гэта могуць паказваць запісаныя побач з наведзенымі і такія прыклады, як п*а*душыліся, п*а*сьпевáць і інш.

Зварочваюся да граніцы дысыміляцыйнага аканьня ў першым перад націскам складзе. (гл. карту № 2). Бязумоўна, яна праходзіць на поўдні і на зах. ад Барысава. У вёсках каля Барысава (Неманіца, Пагадзіца, Бычча і ў Зембінск р.) я чуў ня толькі в*ы*ласы, х*ы*ладбý, г*ы*варыла, з*ы*латбýка, але і б*ы*льшáя, п*ы*дняўся, п*ы*лянскі (=палянскі, г. зн. з вёскі Паляны) , х*ы*дзяйка, тр*ы*вá, в*ы*йнá і нават пасьля націску: з гóр*ы*да, тáм*ы*ка, за лéс*ы*м. Гэткім чынам, значна далей на захад, у параўнаньні з тым, што дае проф. Голанов, праходзіць граніца дысымілятыўнага аканьня. Захапляе яна і Лепель, прынамсі Камень (в. п. студ. Кляшторнага). Трохі менш трэба адсунуць яе на захад каля Полацку: у Арлоўцы (гл. Шлюбскага, Мат. па выв. фолькл. і м. Віцебшч.), якая знаходзіцца ў некалькіх вярстах на паўдн.-ўсход ад Полацку, пануе дысымілятыўны тып аканьня. Найбольш паўднёвы пункт на гэтай дзялянцы граніцы, да якога, здаецца, даходзіць дысыміляцыйнае аканьне, гэта Дамавіцкае. Ад быўшых яго жыхарак я чуў

[1]) Маючы на ўвазе артыкул І. Г. Голанова аб тым самым пытаньні ў III т. Тр. М. К., мы, аднак, ня можам цалкам скарыстацца вынікамі гэтай працы: аўтар яе памылкова адсунуў на ўсход заходнюю граніцу данай зьявы; ёсьць памылкі і на іншых дзялянках граніцы.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

цырá, пірыгá, хыдзяін і нават з брáтым. Але магчыма, што Дамавіцкае, зьяўляецца ў даных адносінах востравам.

З другога боку граніца праходзіць на поўначы ад Бабруйскай акругі, не захапляючы трох яго паўночных раёнаў—Асіпавіцкага, Сьвіслацкага[1]) і Клічаўскага, далей за Клічаўскім раёнам не захапляе яна таксама і Доўгага (гл. Карскага „Мат. для изуч. блр. гов.“, ст. 114-118), якое цяпер адносіцца да Магілеўск. акр.

Дняпро гэтай граніцай перасякецца вышэй ад в. Мокрае (у 3 в. на поўн. ад ст. Быхава), г. зн. прыблізна там, дзе перасек Дняпро ізоглёсай дысымілятыўнага аканьня Голанов. Адсюль мяжа паварачвае ў паўдн.-ўсходнім кірунку, вышэй Кармы, Навасёлак і нават ад Гайшына (аб адсутнасьці дысымілятыўнага аканьня ў зазначных пунктах сьведчаць запісы ў Белор. Сборн. Раманава, гл. т. III), але далей Краснапольскі раён цяпер Калінінскай акругі яна агібае з паўднёвага боку[2]).

Ідучы і далей у ўсходнім кірунку, граніца праходзіць на поўначы ад Новазыбкава. Аб адсутнасьці дысыміляцыйнага аканьня ў Новазыбкаўскім павеце, большая часьць якога ляжыць на поўдзень ад свайго павятовага гораду, сьведчыць А. Полевой у сваёй працы „О языке населения Новозыбковск. у. Гомельск. губ.“ (ст. 7-8), які дысымілятыўнае аканьне ў даным павеце знайшоў толькі ў аднэй вёсцы Васільеўцы. Тое самае пацьвярджае і П. А. Растаргуеў (Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 4)[3]).

Далей даныя для азначэньня адносін Старадубскага і іншых суседніх пав. да дысыміляцыйнага тыпу аканьня дае нам новая праца проф. Растаргуева аб паўночна-северскіх гутарках. З яго дасьледзін відаць, што ня толькі ў Старадубскім, але амаль што ва ўсім Мглінскім і Сураскім паветах аканьне недысыміляцыйнага тыпу[4]).

Мы дайшлі да крайняга паўдн.-ўсходняга пункту граніцы дысымілятыўнага аканьня. Ён знаходзіцца недалёка ад Трубчаўску. Адсюль граніца паварачвае ў паўн.-ўсходнім кірунку.

На падставе новага дасьледваньня М. В. Ушакова аб гутарках Гжацкага і Мажайск. паветаў (у Труд. постоянн. Ком. по диалектол. русск. яз., б. Моск. Диал. К., вып. 9, ст. 137—138) можна выправіць у адным мейсцы ўсходнюю граніцу дысымілятыўнага аканьня. А іменна, паўн.-ўсходнюю дзялянку яе мы павінны адцягнуць на ўсход за Гжацк,

---

[1]) У Сьвіслацкім р. Я. В. Воўк-Левановіч быццам знайшоў, праўда, вёску з дысымілятыўным аканьнем (Касьсё у 10 в. на поўдзень ад. м. Сьвіслачы), але з прыкладаў (прыдналòг, застрыхавалі пры пітнацаць відаць. што гэта такі тып, як у Астрашыцка-Гарадз. і Лагойскім р. р.; трэйці прыклад (жындáрма) менш верыгодны; даклад Воўк-Левановіча друк. у I т. Зб. Аддз. М і Л. ІБК.

[2]) На існаваньне дысымілятыўнага аканьня (і яканьня) у апошнім раёне паказваюць запісы А. Шашалевіча, якія знаходзяцца ў распараджэньні Фолькл.-Дыялектол. Кам. Інбелкульту, а таксама яго падр. адк. (№ 1). Зразумела, што больш паўночны Чэрыкаўскі раён тым болей павінен знаходзіцца на тэрыторыі дысымілят. аканьня; параўн. І. Г. Голанова „Заметка о гов. Чериковск. у. Могилевск. губ., Тр. М. К., VIII. ст. 1—2. Між інш., даволі блізкі да *ы* гук, які зьяўляецца зам. *о*, *а* перад складам з *а*, *я*, яшчэ і ў Будзе Кашалёўскай, але магчыма, што гэта востраў на паласе недысымілятыўнага аканьня (н. з.).

[3]) Недалёка на поўн. ад Новазыбкава праводзіць граніцу дысымілят. аканьня і Голанов у сваім артыкуле аб дысымілят. аканьні, Тр. М. К., III.

[4]) У Мглінск пав. дысыміляцыйн. аканьне толькі ў Старапочэп'і і ў Юськавай слабадзе, у Сураскім—у Казарычах Гордзееўск. вол. і ў Стодоле Голубоўск. вол., гл. Гов. вост. уездов Гомельск. губ. в их современ. состоянии, 1927, ст. 4. Мы тут вынікі дасьледзінП. А. Растаргуева цытуем па яго скарочаным дакладзе. Між інш., з апошніх даных мы бачым, што і ў гэтым раёне І. Г. Голанов памылкова правёў граніцу дысыміляцыйнага аканьня, якая на яго карце праходзіць на поўдні ад Старадуба. Зрабіў гэта маскоўскі дыялектолёг на падставе аднаго беглага заўважэньня Н. Соколова ў справаздачы аб паездцы па Беларусі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

бо, па словах успамянёнага М. В. Ушакова, на ўсходзе ад Гжацку вядуць барацьбу аканьне звычайнае і дысыміляцыйнае, на зах.-ж (у Матаеве), на поўначы (у Панаве, Клушынскай і Кармашэўскай валасьцях), і на поўдні ад Гжацку (у Варанцоўск. вол.) пануе дысыміляцыйнае аканьне.

Можна трошкі падняць уверх ад Невеля і паўночную граніцу дысыміляцыйнага аканьня. У Голанава (гл. Р. Ф. В., LXXI, в. 2, ст. 415) не хапала неабходных матар'ялаў. У часе нашай падарожы па Нев. пав. мы чулі дысыміляц. тып аканьня і ў паўночнай часьціне гэтага пав. (гл. наш артык. „Да характарыст. паўн.-блр. дыялектаў, ст. 5); але, праўда, чым далей на поўнач, тым часьцей у гэтым пав., побач з дысымілятыўным, зьяўляецца і недысымілятыўн. аканьне, як зазначыў гэта і Н. Зорін, гл. яго арт. у зборн. „Познай свой край", III, ст. 36.

З аканьнем у сувязі стаіць, між інш., гэтак званае „уканьня", пашыранае, галоўным чынам, у краіне дысыміляцыйнага аканьня (гл. Голанова, Тр. М. К., в. 3, РФВ, LXXI, в. 2, ст. 388—389). Замена ненаціскных галосных (пасьля цьвёрдых зычных) праз *у* выклікаецца па большасьці, як зазначыў яшчэ акад. Карскі (Блр., II, 1, ст. 113—114), суседствам з губнымі зычнымі і з *ў*: пумага́й, паéхуў.

Зусім іншага пахаджэньня, мусіць, *у*—зам. *о* ў зачыненых складох у паўдн.-блр. дыялектах у месн. скл. м. і н. р. р., а таксама ў дав.-месн. жан. р.: у новум, у старуй. Цалкам магчыма, што гэта *у*, зьяўляючыся заўсёды ў зачыненых складох, знаходзіцца ў генэтычнай сувязі з „дыфтонгамі". Таго-ж пахаджэньня і *у* ў прыназоўніку под: пуд акном. Адносна апошняга пытаньня пар. акад. Карскага, Блр., II, 1, ст. 115 і наст.

Што-ж датычыцца дысыміляцыйнага яканьня, пры якім у складох побач з *а (я)* зьяўляецца замест *е, я—і* акад. Карскі (Белор., II, 1, ст. 214) гаворыць, што „область его распространения та-же, что и для *ы* из *о*". Нам здаецца, што паўднёвая граніца гэтай зьявы праходзіць ніжэй ад граніцы дысыміляцыйнага аканьня, а таксама трошкі далей на захад; так, напр., у б. Гайнаўск. вол. Барысаўск. пав., аб якой мы ы
ўспаміналі, пры барада́ маем, аднак, біда́, ніха́й, гл. Чт. в общ. ист. и др., 1898, III; пар. яшчэ запісы Розэнфэльда з Радашкаўск. вол. б. Вілейск. п. каля цяперашняй граніцы з Польшчай (гл. Сб. ОРЯСРАН., т. LXXVII). Ніжэй праходзіць і граніца дысымілятыўнага яканьня ў другім складзе перад націскам, чымсі граніца гэтага тыпу - аканьня ў тым-жа скл. Такую залежнасьць зьмены *е* ў 2-м перад націскам складзе ад характару галоснай у наступным складзе мы знайшлі ў Сьмілавіцк. р. (у Дукарцы), амаль што ва ўсім Асіпавіцк. р., потым на поўдні ад Брожы [1]): дзесяціна (у 1-х скл. тут, уласна кажучы, гук, сярэдні паміж *е* і *і*; вызначу яго я праз *е*), зьвекава́ла, перста́лі, дзераве́нські, серада́, але побач з гэтым пявуно́ў, сядзіцё, сядзімо́, бяз рукі́, з Пятрыко́м. Прыкладаў нам, праўда, удалося ня шмат сабраць, бо вельмі мала слоў, у якіх было-бы *е* ў другім перад націскам складзе пры *ы, і, у* ў першым (*е* і *о* ў даным складзе зьменяцца на *а*), але і гэта невялікая колькасьць прыкладаў, калі яшчэ ўзяць пад увагу падобныя зьявы і са зьменамі *а* ў другім перад націскам складзе, прымушае нас аднесьціся з асьцярожнасьцю экспэрымэнтатара да пытаньня аб яканьні ў другім перад націскам складзе. Вось таму мы ня можам прыдаваць асаблівага значэньня адказам на програмы (напр., № 7 з Гатава, № 8 з Шацка), на якія пасылаецца

[1]) У Сьмілав. і ў Асіпавіцкім р. р., а таксама ў Брожы аканьне, ў другім складзе перад націскам, здаецца, не залежыць ад характару галоснага ў наступным складзе.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

акад. Карскі (Блр., II, 1, ст. 207—208), бо на магчымасьць залежнасьці зьмены *е* ў другім перад націскам складзе ад характару наступнага складу іх увага ня была зьвернута.[1])

І толькі ў залежнасьці ад апошняга пытаньня мы зможам азначыць паласу сапраўднага зьмернага яканьня, адзнакай якога зьяўляецца захаваньне нязьменным *е* ў другім перад націскам складзе незалежна ад характару галоснага ў наступным складзе.

Перасоўваючыся на поўдзень да Прыпяці, мы заўважаем, як у гутарках зьнікае яканьне і аканьне. Паўднёвая граніца яканьня праходзіць прыблізна ніжэй ад Слуцку[2]), Глуску, (Славані каля Яўтушкевічаў Азарыцк. р. (н. з.) і Горваля (пры вусьці Бярозы)[3]). Дакладна мы яе не адзначаем; зазначым толькі, што яканьня мы ўжо не знаходзім у Мазалёх (в. на 15 на паўдн. зах. ад Слуцку), у Камаровічах і Запольлі (прыбл. в. 35 на поўдзень ад Глуску)[4]). Ня чулі мы яканьня і ў м. Капаткевічах (на поўначы ад Прыпяці, цяпер Мазырскай акр.), нарэшце ў вёсках каля Рэчыцы (у Дзяражні і ў Бронным). Тут ужо пануе еканьне[5]). Назіраньне над мясцовасьцямі, дзе яканьне ўжо ня існуе, яшчэ раз падкрэсьлівае неабходнасьць паасобнага вывучэньня аканьня і яканьня ў беларускіх гутарках, бо ў некаторых з дыялектаў, дзе няма зусім яканьня, аканьне, аднак, існуе. Напр., у мясцовасьцях, якія адбіліся ў запісах Сержпутоўскага (Ск. и р. блр.-полеш.), побач з поўнай адсутнасьцю яканьня мы знаходзім аканьне ва ўсіх складох, апроч пасьлянаціскных, канчатковых. Тое-ж датычыцца і рэчыцкіх гутарак.

Пры высьвятленьні пытаньня аб *о* ў пасьлянаціскным складзе даводзіцца перш за ўсё прымаць пад увагу, якім зьяўляецца гэты склад—зачыненым ці адчыненым[6]): трапляюцца гутаркі, у якіх побач з *мáло* можна пачуць *вётрам* і, наадварот, ёсьць дыялекты, дзе пры *вётром* існуе *мáла*[7]).

Але наогул, па большасьці захоўваецца нязьменным канчатковае *о* ў гутарках паўдн.-слуцкіх (напр., у Старобінскім раёне, гл. адк. № 10, а таксама н. з. з Пагоста, ў Мазалёх, гл. Ск. Сержпут.), у паўдн.-бабруйскіх у Парэччы каля Слаўкавічаў, в. п. Адзінца, у Ляскавічах

[1]) Запісы Сербава (гл. Белор.-сакуны, ст. 57—61) не даюць зусім пэўны матар'ял для высьвятленьня пытаньня аб яканьні ў праднаціскных складох: *целятка, весяло, дзесятку, цецярук, серабро*, але побач *бяда, зямля, зеляноваты*.

[2]) У вёсках Чырвонаслаб. (Вызьненскага) р. Слуцкай акр. (у Малышэвічах, Гулевічах), якія знаходзяцца на зах. ад Слуцка, яшчэ, здаецца, пануе моцнае яканьне, калі верыць запісам (гл. Матар'ялы Фолькл.-Дыял. Кам. ІБК, па інв. №№ 195—209). Мы не даём граніц яканьня з прычыны меншай выразнасьці гукаў, якія зьяўляюцца зам. ненаціскнога *е*: да якой паласы, напр., трэба было-б аднесьці гаворку Харобрычаў (гл. працу О. Курило), у якой зам. *е* зьяўляецца гук ä?

[3]) Мы тут маем на ўвазе зьмену ненаціскнога *е*, а ня *э*, г. зн. зьмену ненаціскнога *э* пасьля мяккіх зычных. Зьмена-ж *э* (пасля цьвёрдых зычных) пашырана значна далей на поўдзень. У некаторых мясцох яе знаходзім нават на поўдзень ад Прыпяці, пар. м. інш., наступную ўвагу.

[4]) Гл. запісы А. К. Сержпутоўскага ў яго „Сказках и рассказах белоруссов-полещуков"; адносна Камаровічаў і Запольля параўн. яшчэ Карскага, Мат. блр, ст 56. Аўтар гэтага адказу піша: „*Е* без ударения, за исключением следующих случаев, остается без перемены: после звуков *ж, ч, ш, щ, ц, р* вместо *е* слышится *а*: шастак, начаваць, жаваць, разщадрыўся, царкоўны, перайшоў".

[5]) Еканьне, г. зн зьмену ненаціскн. *я* на *е* побач з захаваньнем нязьменным старога *е*, у розных складох—прад—і пасьля націскных (пескі, целя, его, пеці, будзе, поле, месец) мы чулі, зразумела, і далей на поўдзень ад Рэчыцы—каля Лоева, Ст. Ёлчы і інш., пар. яшчэ Мат. блр., №№ 17 і 30.

[6]) Тое самае датычыцца і *е*: ёсьць шмат гутарак, у якіх побач з *будзя, поля* (наз. скл.) пачуем *будзіш, полім*.

[7]) Гл. Сербава, Белор.-сакуны, сб. ОРЯСРАН, 94 т., ст. 54. „Но во флекс. твор. п. существит., кажа ён, безударное *о* сохраняется". З зазначанай прычыны мы ня ўнесьлі Жыцінск. вол. у поласу зьмернага аканьня.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(в. п. Позьняка), у Капаткевічах, (н. з.), нарэшце ў зах. часьціне рэчыцкіх гутарак [1]); у ўсходняй-жа часьціне (у Бронным, Лоеве, Ст. Ёлчы), падобна паўдн.-слуцкім і паўдн.-бабруйскім, захоўваючым нязьменным *е*, у апошніх складох *о*, аднак, зьмяняецца: сі́л*на*, мало́г*а*, бу́д*ам*, за са́д*ам* (н. з.). Тое-ж і ў чарнігаўскіх (у Неданчычах і Плёхаве, н. з.)

Цяпер застаецца сказаць некалькі слоў аб паўднёвай граніцы самога аканьня [2]), г. зн. азначыць тую лінію, на поўдзень ад якой ляжаць гутаркі, ня ведаючыя ніякага аканьня. Крайні яе заходні пункт на тэрыторыі БССР ляжыць вышэй ад Прыпяці, недзе на захадзе ад Князь-Возера. У часе сёлеташняй экспэдыцыі мы адзначылі адсутнасьць аканьня ў шэрагу вёсак на поўначы ад Прыпяці—у Барку Тураўск. р., у Жыткавічах, Кажановічах (пад Жыткавічамі) і нават у Ляхавічах, якія знаходзяцца на паўдн.-зах. беразе Кн.-Возера [3]): *о*вэ́чкі, *о*дзі́н, у чо́бо́цех, во́ро́та, ко́сіць, бо́ло́то, до́чка́, ходзі́ў, ста́ло́со і шмат інш. Ад Князь-Возера граніца аканьня ў паўдн.-ўсходнім кірунку спускаецца к Прыпяці, да якой даходзіць недалёка на захадзе ад Петрыкава. Аб існаваньні зьмернага аканьня ў гэтым мястэчку і ў большасьці Петрыкоўск. р. (на поўн. ад Прыпяці) сьведчыць як адказ на прогр. ў VII т. Тр. Этн.-Ст. Эксп. в з.-р. кр., № 58, так і в. п. настаўнікаў на Мазырскай Конфэрэнцыі.

Далей на працягу значнай адлегласьці ізоглёса аканьня ідзе па Прыпяці, на поўн. ад якой, з аднаго боку, знаходзім зьмернае аканьне (у Капаткевічах, у Каленкавічах, н. з., у Юравічах, Мат. блр., № 30), на поўдзень-жа (у Тураўск. р., н. з. і досьледы студэнцк. экспэдыцыі, у Лельчыцкім, гл. адк. № 2 і 17; у Слабадзкім, б. Мазырскім р., н. з., ва ўсім Ельск. р., н. з. з Ельску, Багучычаў, Ст.-Высокага, з Добрыні, у Нараўлянск. р.) аканьне амаль што зусім адсутнічае. Кажам „амаль што", бо, паперш., у Скрыгалаве і ў Казянькох (5 в. на поўдз. ад Мазыра) аканьне прабіваецца ў мове мужчын, падруг., у Асаўцы і ў Раманаўцы Слабадзк. р. мы заўважылі аканьне пасьля зубных зычных і *р* (да́ро́га, да́мы, та́ва́р, та́бѣ, ра́бі́ць, на́га́), у той час як пасьля губных, задняпаднябенных і з пачатку слоў захоўваецца *о*: колѣна, Бо́ры́с, бо́ля́ць, вода́, гора́, по́гбда, бога́то, голо́дны, о́вэчка, оўёс (гл. наш арт. „Да характ. паўдн.-блр. дыялектаў").

Не дайшоўшы да вусьця Прыпяці, ізоглёса з гэтай ракі зварачвае на ўсход, і вось тут у куту, які ўтварае Дняпро з Прыпяцьцю, яна скрыжоўваецца з ізоглёсай мяккага вымаўленьня зычных перад *е, і*, а можа на некаторай адлегласьці і супадае з апошняй. Так, у Лукаедах (5 в. на поўдзень ад Камарына), у якім пачынаецца ўжо вымаўленьне дэнь, тихо, амаль зусім адсутнічае і аканьне, але апошняя зьява ўсе-ткі тут прабіваецца, асабліва ў мове мужчын (та́ды, часта ў займ. та́бѣ, са́бѣ).

Пасьля Дняпра ізоглёсы разыходзяцца рознымі шляхамі, акрэсьліваючы сабой паласу гутарак, якая характарызуецца аканьнем пры цьвёрдым вымаўленьні ўсіх зычных перад *е, і*, у той час як на захадзе ад Дняпра (дакладней, на захадзе ад месца крыжаваньня ізоглёс)

---

[1]) У Юравічах і ў Мікулічах *о* ў апошнім складзе не зьмяняецца, гл. Мат. блр., № 17 і 30. Здаецца, тое-ж і ў Васілевічах, гл. адк. № 13. Паўночную граніцу зьмернага аканьня гл. на карце № 1. Правялі мы яе (прыблізна) ніжэй ад Слуцку (у Агародніках, 5 в. на поўдз. ад Слуцку, *мала, нічога*, н. з.) і ад Асіпавіцкага раёну. У Карпілаўцы, якая знаходзіцца прыблізна пасярэдзіне паміж Брожай і Капаткевічамі, хістаньне. Гадаем, што зьмернае аканьне ў Зубарэвічах (в. п. Адзінца) і ў Камаровічах і Запольлі. Тут больш трэба верыць запісам Сержпутоўскага, чымся адк. № 10 у Мат. блр.

[2]) Гл. карту № 1. На пэўным працягу паўднёвая граніца наогул аканьня супадае з паўднёвай граніцай зьмернага аканьня.

[3]) З нашымі назіраньнямі над мовай Ляхавічаў супадаюць запісы І. А. Сербава (ненадруков. яшчэ) з Пухавічаў—суседняй вёскі на тым самым Князь-Возеры.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

мы маем дыялектычную краіну з мяккім вымаўленьнем зычных (зубных) перад *е, і* пры адсутнасьці аканьня. Дзе-ж пройдзе граніца аканьня? Перарэзаўшы Дняпро паміж Лукаедамі і Камарыным (у апошнім памячаецца, праўда, барацьба між аканьнем і оканьнем нават у мове паасобных людзей), граніца аканьня, здаецца, і далей не зварочвае ў бок і ў такім усходнім кірунку даходзіць да Дзясны[1]). Гэткім чын. у паласе аканьня аказваюцца Неданчычы і Плёхава (н. з.), магчыма нават, што яшчэ і Навоз (калі адна жанчына ў Ст. Ёлчы з Навоза захавала асаблівасьці сваёй роднай гутаркі, а не навучылася „акаць" ужо ў Ст. Ёлчы).

Далей у шмат мясцох ізоглёса аканьня прытрымліваецца Дзясны. Яшчэ ў VII т. Тр. Этн.-ст. Эксп. (адказ на прогр. № 59) чытаем, што ў Рудькаўцы (Остэрск. пав. Чарніг. г.) аканьне мае выпадковы характар, больш пасьлядоўна-ж гэтая зьява пашырана „в говорах за-Десенских" [2]). Самі мы сёлета чулі аканьне ў вёсках каля Чарнігава. У Седневе мы запісалі *табѣ, сабѣ, гавару*. З уваг і прыкладаў у артыкуле О. Курило, прысьвечаным другому пытаньню (гл. „Україна" за 1925 г., кн. 5), можна зрабіць вывад аб існаваньні аканьня ў Бярэзным, у Стольным (у О. Курило з „Стільного" знаходзім прыклады kasarüu (родн. скл. мн. л.) wałüöй, l. c., ст. 24), далей у Зметневе (ст. 24—25), можа яшчэ і ў Мене (у О. Курило толькі адзін прыклад з аканьнем: swaji̯ü̯, ст. 23). У Шабелінаве, якое знаходзіцца на левым беразе Дзясны (у некалькіх вярстах на поўдзень ад Зметнева), гутарка ўжо окаючая [3]) (ibid, ст. 19—20). Аднак, мусіць, хутка пасьля Зметнева, аканьне з правага берагу Дзясны пераходзіць усё-ткі на левы, спускаючыся далей у паўдн.-ўсходнім кірунку ў Пуцівельскі пав. Курск. губ., часьціна якога ведае аканьне (гл. Халанскага, Нар. гов. Курск. губ., ст. 27, а таксама артык. П. Попова, Дыялектол. спостер. на півн.-сх. корд. Укр., Зап. Іст.-Ф. В. УАН., т. VII—VIII, паас. адб., ст. 9). Адзначана аканьне і ў Лятучэўцы таго-ж пав., якая знаходзіцца ў 4 в. ад ст. Варажба (гл. Тр. М. К,, в. 8, ст. 46).

На поўначы ад апошняй лініі аканьне, трэба думаць, пашырана амаль што ўсьцяжнай паласой (гл. даныя адносна Гараднянск., Ноўг.-Северск. і Глухаўскага пав. у IX в. Тр. Пост. Ком. по диал. р. яз., (б. Моск. Диал. Ком.), Ленінгр., 1927, а таксама П. А. Растаргуева, Северска-белор. гов., ст. 186—188).

Між інш., нічога агульнага з аканьнем ня мае першае *а* ў слове багато пашыранае ў окаючых мазырскіх і рэчыцкіх гутарках (звычайна, як і ў шмат іншых). Прысутнасьць гэтага слова з першым *а* ў такіх глухіх куткох яшчэ раз даводзіць правільнасьць погляду украінскіх мовазнаўцаў на гэта *а* (гл. дакладней па гэтым пытаньні ў маім Нар. іст. укр. м.", ст. 52—53)

§ 5. Дыфтонгі.

У паўднёва-беларускіх дыялектах замест галосных *ѣ*, а также *е, о* ў зачыненых складох, калі зазначаныя галосныя знаходзяцца пад націскам, зьяўляюцца нейкія новыя фонэмы, адрозныя ад звычайных монофтонгаў *е, о*. Фонэтычную прыроду гэтых дыфтонгаў, якія пры такіх самых умовах захоўваюцца ў паўночна-украінскіх гутарках, добра высьветліў у сваіх працах В. Ганцов („Ха-

[1]) На поўдзень ад гэтай дзялянкі граніцы акажуцца, аднак, астравы, паперш., Рудькаўка Остэрск. пав. (гл. ніжэй), потым Лутава (5 в, на паўдн.-зах. ад Остра), гл. арт. О. Курило ў „Україні", 1925, кн 5, стр. 20).

[2]) Пар. таксама характарыстыку „Северскаго поднаречия" ў артык. Міхальчука ў тым самым томе „Трудов", ст. 490.

[3]) Окаюць таксама і ў Бабе, хоць яна знаходзіцца на правым бер. Дзясны, (паміж Менай і Сосьніцай) ibid., ст. 22, а таксама ў Загребельлі. 1½ в. ад Сосьніцы, гл. 9 вып. Тр. Пост. К. по диал. р. яз. б. М. Д. К.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

рактеристика поліських дифтонгів і шляхи іх фонетичного развитку" Зап. Іст.-Філол. Відд. Укр. Ак. Н., т. II-III і „Діялектолог. класифікація украінськ. говорів", Зап. Іст.—Ф. В. У. А. н. т. IV). Ён паказаў, што украінскія дыфтонгі зьяўляюцца несапраўднымі дыфтонгамі ў звычайным сэнсе гэтага слова (г. зн. злучэньнем двух галосных фонэм у адным складзе), а становяць паступовы і бязупынны пераход ад *і* да *е* ці ад *у* да *о*. Вось з гэтай прычыны проф. Долобко ўважае лепшым замест „дыфтонгі" ўжываць тэрмін „поліфтонгі" (гл. Zeitschr. f. slav. Philol., III, 1—2, ст. 94 і інш.).

Пытаньне аб граніцы пашырэньня „дыфтонгаў" дакладна разгледжана акад. Карскім (Белоруссы, II, I, ст. 120 і наст.). Праверыўшы паказаньні папярэдніх дасьледчыкаў, ён устанаўляе, што паўночная граніца данай зьявы праходзіць прыблізна цераз Гародню, Ліду, на поўдзень ад Менску, далей цераз Ігумен і Бабруйск (op. cit., ст. 133).

У некаторых мясцох зазначаная граніца не адпавядае рачавіснасьці. Папершае, поліфтонгічную вымову *о* ў зачыненых складох мы знаходзім на поўначы ад Менску. У вёсках Астрашыцка-Гарадзецкага раёну (у Лыс. Гары, Камянцы) мы чулі ад некалькіх старыкоў самагɤ̆нка (праз ɤ̆ я і вызначаю поліфтонг раду *у-о)*, гɤ̆т (=год), пɤ̆йдзеця, але побач з гэтым амаль што заўсёды зьяўляецца монофтонгічная вымова, як *ѣ, е*, так і таго-ж *о*, і таму можна лічыць, што даная зьява тут ужо, уласна кажучы, амаль што цалкам зьнікла. Значна лепш захаваліся поліфтонгі на поўначы ад Бабруйску ў Сьвіслацкім раёне. Я чуў іх ад старых людзей у Сьвіслачы, у Віркаве, Холуі (прыгɤ̆н, мɤ̆х (=мог), снѣх, ваўкѣ [1]) і некатор. інш.). Адзначыў „дыфтонгі" ў вымове трох старыкоў таксама і Воўк-Леванoвіч у вёсках паўднёвай часьціны Сьвіслацкага раёну (у Татарқавічах, Колпчы).

Пытаньне аб граніцах дыфтонгаў на тэрыторыі б. Магілеўскай губ. можна высьветліць толькі прыблізна, бо Раманаў, які даў нямала матар'ялаў, дыфтонгаў якраз не адзначыў у сваіх зборніках, хоць у паўднёвай часьціне гэтай губэрні яны, бязумоўна, існуюць. Граніца „дыфтонгаў", перарэзаўшы Дняпро прыблізна крыху вышэй ад Рагачэву, накіроўваецца далей на ўсход [2]). На поўдні ад Чэрыкава яна захапляе нават Краснапольскі раён. З вуснага паведамленьня А. Шашалевіча мы ведаем, што ў гэтым раёне „дыфтонгі" яшчэ захоўваюцца ў вымове старых (гл. таксама падр. адк. № 1). Адсюль граніца, здаецца, крыху адхіляецца на поўдзень, але ўсё-ткі ёсьць даныя, якія сьведчаць за тое, што граніца цікавячай нас зьявы праходзіць на поўначы ад Суражу і Мгліну. А іменна ў запісах А. Сержпутоўскага з вёсак каля Суражу (у Дубінаўцы, Глухаўцы, Красновічах і інш., гл. Отчет о поездке в Гомельск. губ. в 1926 г., ст. 9—14), а таксама з вёсак блізкіх да Мгліну (op. cit., ст. 4—9) мы бачым, што на месцы *ѣ*, а также *е, о* ў націскных зачыненых складох у даных мясцовасьцях зьяўляюцца „дыфтонгі". Вось некалькі прыкладаў з запісаў Сержпутоўскага: дзі͡евачка, мні͡е, ту͡олькі, ры͡эдкі, бу͡ог, гары͡элачку, ну͡ожкі, ду͡ом, гу͡оркаю, мі͡ерачку, пі͡есня і інш. Справа з пытаньнем аб існаваньні „дыфтонгаў" у ўсходняй часьціне Гомельшчыны ўскладняецца, аднак, супярэчнасьцю паміж запісамі Сержпутоўскага і, з аднаго боку, і вынікамі дасьледзін П. А. Растаргуева (гл. яго „Говоры восточных уездов Гомельской губерн.") і Ант. Полевого

[1]) Праз ѣ вызначаю поліфт. раду і...е.

[2]) Політфонг ɤ̆ замест *о* ў зачыненых складох *(бɤ̆х*=бог, *двɤ̆р, кɤ̆лькі, дɤ̆м)* чулі мы з А. Шашалевічам (супрацоўнікам Інбелкульту) у Буда-Кашалёўскім раёне; і Стрэшынскім-жа р. тэй-жа Бабруйск. акр. т. Шашалевіч знайшоў поліфтонгі і замест *ѣ, е: лѣс, пѣч.*

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(гл. „О яз. населен. Новозыбк. у Гом. губ."), з другога боку. Гэтая нязгода і зьявілася, бязумоўна, з прычыны няправільнага разуменьня сутнасьці прыроды „поліфтонгаў". Мы ня маем падставы ня верыць дакладнаму заўсёды ў сваіх запісах А. К. Сержпутоўскаму, уладаючаму вельмі добрым слухам. У тым, што памыліўся ў даным выпадку не А. К. Сержпутоўскі, а проф. Растаргуеў, мы і мелі магчымасьць праканацца ў часе Акадэмічнай Конфэрэнцыі, а таксама ў часе пасяджэньня Аддз. Мовы і Літаратуры 23-га люг. г. г. Проф. Растаргуеў ня вызнаў „дыфтонгамі" звычайных і бясспрэчных поліфтонгаў *ѳ, ѣ* у вымаўленьні Яз. Лёсіка і А. Сержпутоўскага, бо, відавочна, чакаў пачуць выразныя дыфтонгі *у-о* і *і-е*.

Паўднёвай граніцы „дыфтонгаў" мы не адзначаем, бо беспасрэдна мяжуючыя з беларускімі паўн.-укр. дыялекты ў гэтых адносінах нічым не адрозьніваюцца. „Дыфтонгі" пакрываюць паўн.-укр. падмову ўсьцяжнай паласой, калі ня лічыць астравоў з монофтонгічнай вымовай, якую знаходзім замест „дифтонгічних звуків" у мястэчках і блізкіх да іх вёсках (гл. Ол. Курило „До характерист. і проц. монофтонгізац. Чернігівськ. дифтонгічн. звуків", Україна за 1925 г., кн. 5).[1]).

§ 6. Зьмена *а* на *о*.

Пакідаючы ўбаку ты выпадкі зьмены *а* на *о*, якія выкліканы хібнай аналёгіяй (напр., *со́дзім, утóйваць, трóвы, запрóх, знóйдзем, зóйдзем)* або хібнай этымолёгіяй *(абодва*, гл. Карскага, Блр., II, I, ст. 89), нарэшце, такія нялічныя прыклады няяснага пахаджэньня, як *шукоць, ко́жуць, лумоецца* (Карскі, ibid, ст. 85), мы дакладна спынімся на зьмене *а* на *о* прад *ў (шукоў, чытоў, проўда)*, якая па сваёй прыродзе становіць процэс частковай рэгрэсыўнай асыміляцыі (гл. мае „Асноўн. пытаньні моваznаўства, 1926, ст. 48). Азначаючы географічнае пашырэньне данай зьявы, Карскі (ibid, ст. 85) гаворыць, што яна знаходзіцца ў паўдн.-заходн. часьціне блр. м.; прыблізную граніцу гэтай зьявы мы атрымаем, па яго словах, калі мы правядзем лінію ад м. Вілейкі да Менску, ад апошняга-ж да Сьвіслачы Ваўкавыск. пав., нарэшце адсюль праз Масты да Вілейкі. У рачавіснасьці, аднак, зьмена *а* на *о* перад *ў* пашырана значна далей на ўсход ад Менску (гл. карту № 3).

На паўднёвым усходзе ад Менску мы ўжо знаходзім яе ў Гатаве (гл. Карскі „Мат. блр." вып. 2, ст. 29); далей у раёнах Сьмілавіцкім, Пухавіцкім і ў Ігуменскім (цяпер—Чэрвенскім). Паўднёвая граніца данай зьявы на тэрыторыі Усходн. Беларусі праходзіць на поўдні ад Койданаўскага і Самахвалавіцкага раёнаў (у абодвых раёнах нашы зап.), але на поўначы ад Узды (в. п. студ. Срэценскага і Атраховіча-Крапівы) і Шацка (аб адсутнасьці зьмены *а* на *о* прад *ў* гл. Карскі „Мат. блр.", ст. 34 і наст.; гэты адказ на праграму пацьвярджаецца вусным павед. настаўн. С. Гурыновіча); але за Шацкам граніца паварачвае на поўдзень; абагнаўшы б. Жыцінскую воласьць (паўн.-ўсх. куток цяперашняй Слуцкай акругі[2]), яна далей зноў накіроўваецца на поўнач, так што большасьць Асіпавіцкага раёну, за выключэньнем паўночнай яго часьціны (на левым беразе Сьвіслачы) зьмены *а* на *о* перад *ў* ня ведае[3]). Нарэшце спатыкаем мы гэтую зьяву яшчэ і ў Сьвіслацкім р. і нават за Бярозай напр., у Віркаве, н.з.).

---

[1]) Правільнасьць назіраньня О. Курило адносна таго, што больш хуткі тэмп жыцьця ў мястэчках выклікае монофтонгізацыю, мы маглі праверыць і ў адносінах да мястэчковых гутарак на тэрыторыі паўднёвай Беларусі.

[2]) Аб існаваньні данага процэсу ў апошняй мясцовасьці гл. Сербава „Бело руссы-сакуны", ст. 50.

[3]) Дакладней аб асіпавіцкіх гутарках у маім артык. „Да характарыстыкі цэнтральна-беларускіх дыялектаў. Гутаркі Асіпавіцкага раёну".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

З паўночнага боку тэрыторыя разгледжанай асаблівасьці не даходзіць да Лагойску (В. п. студ. Сяўбаі Красуцкага, гл. таксама Ляцкага, Матер., у Чтен. в общ. ист. и др. за 1898, III), Смалявічаў (в. п. настаўн. У. Апацкага) і Бярэзыні (адк. № 8).

За межамі зазначанай усьцяжнай тэрыторыі даную зьяву ведаюць толькі паасобныя вёскі (напр., Каралі Высочанск. р. Віцебск. акр., в. п. настаўн. Цярэшчанкі, або Ляды, Атруб і Забродзьдзе Стрэшынск. раёну Бабруйск. акр., потым Пакалічы Парыцк. р. (в. п. С. М. Некрашэвіча) нарэшце, некалькі вёсак каля Васілевічаў, гл. адк. № 13, але пры невялікім маштабе нашых карт мы маглі адзначыць толькі другі востраў на карце пашырэньня зьмены *а* на *о*[1]).

Скончыўшы агляд цікавячай нас дыялектычнай асаблівасьці, трэба яшчэ дадаць аб тым, што блізка ад граніцы гэтай зьявы можна спаткаць гутаркі, у якіх *а* прад *ў* зьмяняецца на гук сярэдні паміж *а* і *о*, які можна вызначыць праз *а̊*. *Чыта̊ў, пра̊ўда* мы чулі, напр., у некаторых вёсках Асіпавіцкага раёну. Наадварот, далей ад пэрыфэрыі ў мясцох найбольшага выяўленьня разгледжанай асаблівасьці *о* замест *а* перад *ў* можна пачуць нават у тых выпадках, калі гэта *а* не зьяўляецца націскным: падзякаво̆ў, паклікоў і інш.

§ 7. Пераход *'е* ў *'о*.

Згодна з большасьцю паўдн.-влр. гутарак лабіялізацыя *е* ў большасьці блр. дыялектаў абумоўліваецца націскам, прычым назіраецца яна (у процілежнасьць укр. мове) ня толькі пасьля старых памякчоных *(ж, ч, ш),* але і пасьля новых памякчоных зычных (зубных і губных), якія раней былі паўмяккімі. Але ў першы момант узьнікненьня гэтага процэсу на ўсходня-славянскай глебе ён залежаў ад іншых прычын (а менавіта, апроч мяккасьці папярэдняга зычнага яшчэ ад цьвёрдасьці наступнага); сьляды гэтых ранейшых прычын зазначанага пераходу выяўляюцца, напр., у такіх пашыраных прыкладах, як вядзеш, пячэш, бярэш, у якіх *е (э)* захоўваецца нязьменным перад *ш*, якое і было раней мяккім. Дзеля таго, захоўваецца ў пэўных прыкладах у часьціне дыялектаў і *е* ў апошнім адчыненым складзе: усе (=усё, наз. скл. адз. л.), ужэ і нават у літарат. мове: цябе, мяне, яшчэ. Крыжаваньне прычын рознага пахаджэньня ўскладняе пытаньне аб лабіялізацыі *е*, і таму мы не картографавалі гэтай зьявы. Мы зазначым толькі больш характэрныя дыялектычныя адхіленьні ад норм літаратурнай мовы. Асабліва пашырана ужэ, крыху менш усе, але і апошні прыклад мы знаходзім ужо ў Случыне і на поўдзень ад Бабруйску (напр., у Брожы). Крыху далей на поўдзень (у Карпілаўцы, н. зап.) зьяўляецца *гальлé, харашэ*. За Прыпяцьцю-ж чулі мы далекі, веселы; кажуць у шмат мясцох дзешава. Паўдн.-блр. гутаркі, ў процілежнасьць большасьці іншых дыялектаў, ужываюць формы дзеясл. ёсьць (і ёсь) і *е*, а не ёсьць (ёсь), *ё*. Гэтк. чынам, відаць, што паўднёвыя дыялекты лепш адбіваюць ранейшую стадыю разгледжанага пераходу. Вельмі пашырана ў блр. гутарках *елка* зам. чаканага *ёлка*.

§ 8. Зьмена *ы* на *у* пасьля губных зычных.

Гэты пераход *ы* ў *у*, на які першы зьвярнуў увагу Янчук (яшчэ ў 1886 г.), зьяўляецца ў выніку лабіялізуючага ўплыву зазначаных зыч-

[1]) Карскі, Блр. II, 1, ст. 85, пасылаецца яшчэ на прыклады Раманава (III, ст. 27, 88 і інш.) з Азяран і Станькава Рагачэўск. пав., але ў апошніх гутарках наогул мяняецца *а* на *о* (і *о* на *у*), ня толькі ў становішчы перад *ў*. Разгледжаная зьмена *а* на *о* трохі напамінае, між. інш., адну зьяву польскіх гаворак, а іменна, пераход *а* ў *о* перад *ł* у пазнанскіх дыялектах, гл. Флорінскі, Лекц. по слав. языкозн., т. II, ст. 421.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ных. Ад прыкладаў *мула* зам. *мыла*, *путай* зам. *пытай*, *му*, *ву* (займ-кі) трэба адрозьніваць даволі пашыраныя ў блр. дыял. формы *буў*, *була*, *буваць*, якія маглі зьявіцца і нефонэтычным шляхам. Вось граніца пашырэньня гэтай зьявы на тэрыторыі даступнай нашым назіраньням Ўсходняй Беларусі (гл. карту № 4).

Паўночная граніца данай дыялектычнай асаблівасьці перарэзвае граніцу з Польшчай крыху ніжэй Старобіна Слуцк. акр.[1]) Адсюль граніца з невялікім адхіленьнем на поўнач накіроўваецца на ўсход, захапіўшы значную часьціну Любаньскага раёну Слуцкай акр., а менавіта, вёскі Асавец (в. п. студ. БДУ З а б е л ы), Ст.-Юркавічы[2]) (в. п. загадчыка сямігодкі ў Будзе-Кашалёўскай т. Адзярыхі), потым (ужо на тэрыторыі Бабруйск. акр.) Слаўкавічы Глуск. р., якія знаходзяцца на паўдн. зах. ад Глуску (н. з., а таксама в. п. ад некалькіх студэнтаў). Дайшоўшы да Глуску, граніца крыху адхіляецца на поўдзень. У такім паўдн.-ўсх. кірунку граніца праходзіць на поўдні ад Брожы (н. з.)[3]) і Глебавай Рудні (в. п.), але на поўначы ад Зубарэвічаў (гл. адк. № 4) і суседніх вёсак (Глуск. р.); далей граніца на поўначы ад вёсак Слабодка, Раманішчы і Качай-Балота (в. п. С. М. Н е к р а ш э в і ч а) перарэзвае Парыцкі раён, даходзячы да Бярозы; у Казлоўцы каля Парычаў *ы* таксама зьмяняецца на *у*. Такім чынам, бязумоўна ведаюць цікавячую нас асаблівасьць мясцовасьці, якія ляжаць на поўдні ад праведзенай лініі, напр., Кузьмічы і Ніжын (в. п. т. Адзярыхі), Камаровічы і Запольле цяпер Петрыкаўск. раёну (гл. Мат. блр., ст. 57), Карпілаўка Глуск. р., Капаткевіцкі раён (н. з.; дакладней аб мове Карпілаўкі, Капаткевічаў і інш. паўдн.-блр. мясцовасьцяй у нашым артыкуле „Да характарыстыкі дыялектаў паўднёвай Беларусі", які друкуецца ва ўсеславянскім зборніку ў Загребе), далей Азарыцкі раён Мазырск. акр. (в. п. сакратара Азар. р. т. К у л а к о в а, адк.-ліст № 16 настаўніцы Яўтушкавіцкай школы), нарэшце, б. Дудзіцкая вол. (гл. зап. Д о ў н а р - З а п о л ь с к а г а ў Жыв. Стар. за 1894 г., кн. 1-я[4]).

Такім чынам, тэрыторыя, якую ахапляе даная зьява, як пабачым далей, не супадае з тэрыторыямі іншых паўдн.-блр. зьяў—саканьня, ф. ф., як буд*ам*, ід*ом*. У той час як паўн.-ўсходняя дзялянка граніцы разгледжанай асаблівасьці (на тэрыторыі Случчыны) праходзіць далёка на поўдні ад граніцы саканьня, на ўсходзе, наадварот, граніца зьмены *ы* на *у* выходзіць за межы саканьня, якога амаль зусім не знаходзім у Парыцк. і Азарыцк. раёнах.

Усходняя граніца, прайшоўшы недалёка ад Васілевічаў (в. п. настаўнікаў на Рэчыцкай конфэрэнцыі), накіроўваецца на Лоеў; адсюль яна па Дняпры даходзіць да Камарына (н. з.). Усходняй-жа мяжой саканьня, як пабачым далей, служыць Прыпяць[5]).

Паўднёвая граніца зьмены *ы* на *у* пасьля губных, павярнуўшы на

---

[1]) Аб адсутнасьці данага процэсу ў Старобіне мы ведаем з запісаў В а л ч у к а, зробленых для слоўнікавай камісіі (адк. № 10), а таксама з вуснага паведамленьня студэнта С к а л а б а н а.

[2]) У паўн.-ўсходн. часьціне цяпер. Слуцкай акр. гэтай зьявы ўжо не знаходзім, гл. С е р б а в а, Блр.-сак., ст. 62. Няма яе нават у Язылі, які знаходзіцца недалёка ад ст. Урэчча, гл. зап. Я н ч у к а ў IX кл. Тр. Этногр. Отд. Общ. Люб. естеств., антроп. и этногр. (По Минской губерн.).

[3]) Дзеля таго, што граніца праходзіць недалёка ад Брожы, у ёй і ў суседн. вёсцы Ласі часам можна пачуць *мула*, *путай*; такое-ж хістаньне і ў Калюзе, якая знаходзіцца ў 7—8 в. на поўнач ад Глуску (в. п. студ. БДУ К е р н а ж ы ц к а г а).

[4]) У зазначаных запісах памылкова надруков. Дубицкой вол. зам. Дудицкой.

[5]) Трэба таму лічыць, што з непаразуменьня зьявілася паведамл. аб адсутнасьці данай асаблівасьці ў Мікулічах, якія знаходзяцца ў 5 в. на паўн. захад ад Брагіна (гл. Мат. блр., ст. 123 і наст.) Бязумоўна, аднак, што нельга чакаць гэтай зьявы на ўсходзе ад Дняпра; яе не адбіваюць ні запісы З. Радчэнко з Дзятлавіцк. вол. Гом. пав., ні запісы О. К у р ы л о з Харобрычаў.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

захад ад Камарына, мейсцамі праходзіць недалёка ад граніцы БССР з УССР. Мы знаходзім гэтую зьяву нават у паўднёвай часьціне Нараўлянск. раёну, а менавіта ў вёсках Дзернавічы і Мухаеды (якія належалі раней да Рэчыцк. пав. (гл. запісы Доўнар-Запольскага ў Жив. Стар. за 1894, № 1, а таксама яшчэ нявыдан. яго запісы, акія захоўваюцца ў Фолькл.-Дыялектол. Кам. Інбелкульту, нарэшце, Шэйна, Мат. II, № 182). Але далей ізоглёса цікавячай нас асаблівасьці крыху адыходзіць ад граніцы УССР. У Кузьмічах (н. з.) і ў Скародным (гл. Тр. Этн.-стат. Эксп. в зап.-р. кр., VII, ст. 595) яе не знаходзім. Але ў Кармe і Валоўску (б. Скарадн. вол., на паўн. захад ад Кузьмічоў і Скароднага) яна, здаецца, існуе (гл. Мат. для изуч. сев.-млр. гов., а также переходн. от блр. к млр., Сборн. отд. р. яз. и сл. Р. Ак. н., т. 75, ст. 27). Далей граніца зьмены *ы* на *у* пасьля губных зноў падыходзіць к політычн. граніцы; яна існуе ў Мілашэвікавічах і Глушкавічах Лельчыцк. р. (гл. адк. 2 і 17—Шаўковіча і М. Гнедчыка).

І ад паўднёвай граніцы даная зьява пашыраецца ў паўночны бок усьцяжнай паласой. Мы ведаем аб яе існаваньні ў Тонежы (адк. № 1) Тураўск. р., у самым Тураве (зап. Доўнар-Запольскага, а таксама сшыткі фольклёрных матар'ялаў, прысланыя ў Фолькл.-Дыялект. Кам. ІБК Мазырскім Акруговым Краязнаўчым Т-вам, гл., напр., сшытак № 1, песьні №№ 60—72, далей адк. ў „Мат. для из. с.-млр. гов.", у Сб. ОРЯСРАН, 75, нарэшце н. з.), у Скрыгайлаве (Тр. Этн.-ст. Эксп. в з-р. кр., VII, а таксама н. з.), у Асаўцы, Раманаўцы, Казянькох, Міхалкох (н. з., а таксама Тр. Этн.-Ст. Эксп., VII), нарэшце ў Ельск. р. (н. з., дакладна ў нашым артык. „Да характарыстыкі дыял. паўдн. Белар.") і ў Нараўлянскім (гл. адк. № 7 загадч. Цешкаўск. школы т. Прыката).

Пераходу *ы* ў *у* пасьля губных не прашкаджае, м. інш., гук *л*: у Тураўскім р., у Казянькох сёлета мы чулі плуты (=плыты, рас. плоты), плусьці (=плысьць, р. плыть); пар. артык. Карскага „Из русск. диалектол.", Изборн. Киевск., прысьвеч. Флорінскаму, ст. 83—90.

Яшчэ адна ўвага. На пэрыфэрыі тэрыторыі зьмены *ы* на *у* (напр., у Крупейках каля Лоева) часта на месцы *ы* пасьля губнога можна пачуць ня гук *у*, а нейкі дыфтонг уы: муыла, вуыпіла і інш. Пахаджэньне гэтай зьявы вельмі лёгка вытлумачыць. Дзеяньне лабіялізацыі, выкліканай папярэднім губным зычным, спыняецца раней ад канца вымаўленьня галоснага *ы*.

§ 9. Рэфлексы прадгістарычнага славянскага *ъ (у)* перад ётам і ётавымі галоснымі.

Не закранаючы дакладна пытаньня аб генэалёгіі формаў м*ыю*-мэю--м*ою* і зл*ы*(й)-зл*эй*-зл*ой* (аб ім гл. хоць-бы Шахматова, Оч. др. п. ист. р. яз., ст. 349 і наст.), мы скажам толькі, што згодна з поглядамі шэрагу мовазнаўцаў (Шахматова, Ляпунова, Шчэпкіна і інш.), старэйшымі стадыямі трэба вызнаць формы з *ы*: м*ыю*, зл*ый* [1]). Такім чынам, важней было-б азначыць граніцу паміж м*ыю*, зл*ый* і м*ою*, мэю, зл*ой*, зл*эй*, згрупаваўшы выпадкі з *э* і *о*, як розныя зьмены першапачатковага *ы*. Але з другога боку, узяўшы пад увагу тую акалічнасьць,

[1]) Такога-ж нахаджэньня *ы* ў такіх прыкладах, як падыйшоў абыймаць і інш., як дасьціпна давёў нябожчык Л. Васільев (РФВ, за 1907 № 3 і 4, ст. 241 і наст.). Такую-ж думку адносна зазначаных блр. прыкладаў і адпаведных украінскіх (незалежна ад артыкулу Васільева, бо аб ім няма успамін.) выказаў нядаўна В. Ганцов (Зап. Іст.-Ф. В. УАН. т. VII—VIII, До іст. зв. в укр. м.).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

што вымаўленьне мэю, злэй, галоўным чынам, пашырана ў мясцовасьцях, суседніх з тымі, якія ведаюць мыю, злый, і гэткім чынам, гутаркі з даным вымаўленьнем (мэю, злэй) зьяўляюцца пераходнымі ўжо да дыялектаў, захоўваючых першапачатковую стадыю (мыю, злый), можна было-б гутаркі з мыю, злый аб'яднаць з дыялектамі з мэю, злэй; гэта часам і робяць дыялектолёгі (пар., напр., хоць-бы Д у р н о в о, Диал. к. Кал. г., Сб. ОРЯСРАН., 76, ст. 17, або Диал. разыск. в обл. влр. гов., I, 1, ст. 19). З сказанага відаць, што для поўнага ізоглёсаваньня рэфлексаў *о* перад ётам трэба будзе азначыць чатыры мяжы: 1) паміж гутаркамі з мою і гутаркамі з мэю, 2) паміж мэю і мыю, 3) паміж злой і злэй і 4) паміж злэй і злы(й) [1]).

Граніца паміж дыялектамі з мою і дыялектамі з мэю выходзіць за рамкі нашых карт. Таму азначэньне яе мы дамо толькі тут у тэксце [2]).

Прайшоўшы вышэй ад Апочкі, ізоглёса мэю ідзе ў паўн.-ўсходняўсходнім кірунку, так што з аднаго (паўночна-заходняга) боку яе аказваюцца паўн.-ўсходняя часьціна Апоцкага пав. (вёскі Веча, Ботава, Маслава, Усы, Шубкі, Цецерына (Тетеріно), Храпіна (Хряпіно), Богава і інш. вёскі Варанецк. вол.), потым усходняя часьць Астровенск. павет, (а іменна, большасьць Прокшынскай вол.); ведаючыя *о* (гл. Тр. М, К., LXI, вып. 1, ст. 16—17, 18—19 і 24, 25), з другога боку, воласьці, блізкія да Апочкі (на паўдн. ўсход) Глубокаўская і Жадрынская (у апошняй Чэрніцкі пагост), далей Сушчава і інш. вёскі Бежаніцк. вол. Новаржэўск. п. (гл. Тр. М. К., Р. Ф. в. LXI, В. 1); зазначаныя мясцовасьці ведаюць *э, е*. Прайшоўшы па паўднёвай часьціне Порхаўск. пав., недалёка ад ст. Дзедавічы, каля якой і ідзе барацьба паміж мэю і мою (пар., з адн. боку, Тр. М. К., Р. Ф. В. LXI, 6, 1, ст. 18—19, 20—21, з др. б., Тр. М. К. в. 8, ст. 46), а таксама па паўднёвай часьціне Холмск. пав. [3]), ізоглёса ўваходзіць у Таропецкі пав., з якога, здаецца, на карысьць тэрыторыі з мою вылучаецца толькі паўночна-ўсходні яго куток, а іменна, Турская воласьць, гл. Тр. М. К., Р. Ф. В., LXI, в. 1, ст. 20—21) [4]).

Далей у нас, на працягу даволі значнай адлегласьці, адсутнічаюць матар'ялы для азначэньня граніц паміж мэю і мою (як і іншых некаторых граніц). Мы ведаем з запісаў Д о б р а в о л ь с к а г а (См. Сб.), а таксама з адказаў на прогр. Моск. Дыял. Кам. (гл. РФВ., LXII, 198—199 і 202—203) аб тым, што ў Бельск. пав., нават у паўночн. яго часьціне, (напр., у Драгачэве, Мяшкох, Косьціне—каля ст. Земцы) пануе *ы*; знаходзім *ы* таксама ў Селішне Ржэўск. пав., і іншых суседніх мясцовасьцях тэй-жа заходн. часьціны Ржэўск. пав., апісаных Н. Г р і н к о в а й (ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 306—307). Гэта дае нам права правесьці граніцу мыю (у даным разе і для мэю) па тэрыторыі Бельскага і Ржэўскага паветаў на поўначы ад чыгункі. Ці даходзіць тэрыторыя дыялектаў з мыю—мэю да Асташкаўск. пав. Цьвярск. губ., мы ня можам з дакладнасьцю сказаць; з існуючых матар'ялаў аб гэтым павеце (Р. Ф.

---

[1]) У значнай (паўдн.) часьціне блр. гутарак-*ый,-ій* у гэтай ф. прыметн. скарачаецца на-*ы*, *-і*. Тое-ж і ў паўн.-укр. дыялектах (гл. Г а н ц о в а, Діял. класиф. укр. говорів).

[2]) Жадаючыя могуць знайсьці ўспамянёныя ніжэй пункты на картах „Картограф. отд. корпуса военных топографов".

[3]) У мясцовасьцях, якія знаходзяцца прыблізна ў 40—45 в.в. на паўдн. зах. ад Холма (у Галібіцкай і Зуеўск. валасьцях, гл. Тр. М. К., Р. Ф. В., LXVIII, ст. 5—6) яшчэ пануе мыюць, крыюць, у вёсках-жа Ельна-Ровенскай вол. (30 в. на поўдзень ад Холма, гл. Тр. М. К., в. 8, ст. 39—40), відавочна, чуваць ужо мою, крою.

[4]) Адказ № 233, прысьвеч. ўсяму Таропецк. пав. (Мат. для изуч. влр. гов., XI, Сб. ОРЯСРАН., XCIX, 1922), не дае пэўнага матар'ялу для ізоглёсаваньня цікавячай нас зьявы на тэрыторыі данага пав.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

В., LXVIII, 2, ст. 21—22) мы можам даведацца толькі аб тым, што да Таліцк. вол. (каля Селіжарава) *мыю* або *мэю* не даходзіць.

Не дайшоўшы да Ржэвы, граніца паміж *мыю* і *мою* [1]) паварачвае на паўднёвы ўсход. Здаецца, у даным мейсцы, як і ў некаторых інш., *мыю* беспасрэдна мяжуе з *мою*; іх не аддзяляюць пераходныя гутаркі з *мэю*. Апошняе вымаўленьне *зноў* зьяўляецца ў Калужаскай губ., а іменна ў Мілееўск. і Цереб. валасьцях Жыздр. пав. (гл. Н і к о л ь с к а г а, Нар. гов. Жиздр. у Кал. г., Р. Ф. В., XLVI, ст. 245), у некаторых вёсках Козельскага пав. (напр., у Хоцені, Клёсаве і Кулешэўцы каля ст. Сухінічы [2]), гл. Тр. М. К., в. 8, ст. 36—37).

Вымаўленьне *мэю* трапляецца ў Курскай губ. (гл. Мат. для из. влр. гов., XI, ст. 66).

Цяпер азначым паўн.-ўсходнюю граніцу *мыю*, якое часам мяжуе з *мэю*, а часам беспасрэдна з *мою* (гл. карту № 5). Паўднёвая-ж і заходняя граніца *мыю* супадае з межамі ўсяго славянства.

Ня ўсе, м. інш., дзялянкі граніцы паміж *мыю* і *мэю*—*мою* пападуць на нашу схэматычную карту, але мы ня лічым мажлівым павялічваць разьмер карт для аднэй, другой паасобнай зьявы.

Граніца *мыю* праходзіць прыблізна па граніцы Себеск. пав. з Апоцкім: у Чарнэі, потым у Магільнянск. вол. (Магільна каля чыгункі недалёка ад Векшына, прыбл. пасярэдз. паміж Себежам і Маевым) пануе *мыю* (гл. Мат. блр., №№ 26 і 28), у Пагосьце-ж Чарнецкім, які знаходзіцца ў паўднёв. ч. Апоцк. пав. (у 15 в. на поўнач ад ст. Ідрыцы), ужываецца ўжо *мэю* [3]) (Тр. М. К., в. 2, Р. Ф. В., LXI, ст. 16—17 24 і.). Ідучы ў усходнім кірунку, крыху вышэй ад чыгункі Себеж—Нова-Сакольнікі [4]), цікавячая нас ізоглёса перарэзвае чыгунку Н.-Сакольнікі—Дно—Ленінград недалёка на поўначы ад Н.-Сакольнікаў, так што Гвоздава, каля Горак (10 в. ад Н.-Сакольн., 15 в. ад Вял. Лук, н. з.) і нават Прыскуха (в. 20 на поўначы ад Н.-Сакольн., гл. Тр. М. К., в. 2, РФВ., LXI, в. 1, ст. 16—17) аказваюцца на тэрыторыі *мыю*. Цалкам зразумела, што і ў Ліпецк. вол., якая ляжыць на поўдз. ад Вял. Лук, таксама знойдзем *мыю* (Тр. М. К., в. 2, ib.). Трэба думаць, што *мыю* (можа і ў перамешку з *мэю*) пакрывае амаль што ўвесь Вялікалуцкі пав., бо *мыю*, кр*ыю*, як мы бачылі, можна знайсьці нават у паўднёва-заходняй часьціне Холмск. пав. (у Галібіцкай і Зуеўскай вол.). Ф. ф. *мыю*, кр*ыю* трапляюцца, нарэшце, у Таропецк. п., але толькі ў паўднёв. яго часьціне (ва Ўсьцеселаве), на поўначы-ж у Баран.-Азярэцк. вол. і інш., ужо *мэю* аб *мою* (напр., у Турск. вол.), гл. РФВ, LXI, в. 1 ст. 20—21 і 28—29.

Далей, дзякуючы адсутнасьці ведаў аб пераходнай дыялектычнай паласе з *мэю*, мы правядзем граніцу (прыблізную) для *мыю* па накрэсьленай вышэй граніцы *мэю*, г. зн. на поўначы ад чыгуначных станцый Земцы—Нелідава—Маставая—Аленіна (гл. РФВ LXII, 198—199 і 202, потым запісы Ш э й н а з Панікольск. вол., Мат., II, ст. 521 і наст. і інш.).

Пасьля Моладатудскай воласьці Ржэўск. пав., ведаючай *мыю*, ізоглёса поварачвае на паўдн. ўсход. Большасьць Сычэўск. пав. здаецца,

---

[1]) Зразумела, што *мыю* мы тым больш ня знойдзем у Старыцкім і Зубцоўск. паветах (гл. Тр. М. К., в. 8, ст. 28—29 і Мат. для из. влр. гов., VIII, ст. 174).

[2]) Каля гэтай ст. *мою*, здаецца, вядзе барацьбу з *мыю*, пар. Тр. М. К., в. 8, адк. № 37-а

[3]) Я думаю, што паведамленьне Н. С о к о л о в а (Гов. Пск. г., Тр. М. К. в 8., ст. 7) аб *мыю* ў Зачэрэньні Пскоўск. п. зьявілася ў выніку непаразумленьня; ён пасылаецца на Тр. М. К., але ў адпаведн. мейсцы гэтых „Трудов“ (РФВ., LXI, I, ст. 20—21) мы не знаходзім успамінаньня аб *ы* ў данай мясцовасьці.

[4]) У Бурцаве, 7 в. на поўнач ад Маева, в*ыець*, м*ыю*, н. з.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ведае мыю. У запісах з Хоцькава (Добр., См. Сб., IV, ст. 457—458) мы чытаем забрыють, крыимъ.[1]) Мыю захапляе значную часьціну Вяземск. пав.—Іэьдзешкаўскую вол. (н. з.), Хмеліцкую (н. з.), Вяземска-Прыгародную (на поўн. і паўн. зах. ад Вязьмы—вёскі Усевалодзкае, Патапава, Жэкуліна і інш., в. п. наст. П. А. Дуброўскага), і толькі, як зазначыў той самы Дуброўскі, на ўсходзе ад Вязьмы—у Туманаўск. і часьціне Ісакаўск. вол. чуваць ужо мою.

Аднак, мыю ўжо ня знойдзем у больш усходнім Юхнаўск. пав. У запісах з Пабітага, якое знаходзіцца ў 15 в. на паўн.-паўн.-зах. ад Юхнава (гл. Добр., См. Сб., II. 256) маем раскройся, няма мыю і ў блізкай к Пабітаму парахвіі Ізвольска (каля ст. Ізноскі, 15 в. на поўнач ад Пабітага, гл. Тр. М. К., в. 8, адк. № 38).

Заходняя часьціна Калужаск. губ. ужывае мыю; апошняе вымаўленьне можна пачуць у большасьці Мяцальск. пав., дасьледжанага яшчэ нябожчыкам А. А. Шахматовым, пазьней Карауловым, Нікольскім і О. Брокам, (пар. таксама адк. адносна Жэрэлеўск. вол., Тр. М. К., в. 8, ст. 32), у Жыздрынск. пав. (апроч. Мілееўск. і Цереб. вол., у якіх мэю, гл. Нікольскага, Нар. гов. Жиздр. у. Кал. г., РФВ., XLVI, ст. 245; адносна Жыздр. пав. гл. яшчэ адк. аб гутарцы Бутчына, якое знаходз. ў 50 в. на паўн. зах. ад Жыздры, Тр. М. К., в. 8, ст. 8, потым адк. 18-а аб Зімніцах на Драгашанцы (на паўн.-паўн. ўсход. ад Жыздры; Дурново, Диал. к. Кал. г., Сб. ОРЯСРАН. т. 76); нарэшце, мыю знойдзем у значнай часьціне Мешчоўск. пав. „Сведения о Мещовск. гов." В. І. Чэрнышова (гл. Мат. для из. влр. гов. V, выцяг з III т. ИОРЯСРАН., потым Сб. ОРЯСРАН., 68 т.) у нашай справе не дапамогуць нам. Як заўсёды, больш карысьці тут прынясуць адказы на програмы. З Мат. для из. влр. гов. (в. XI, ст. 54) мы даведаемся аб існаваньні мыю, крыю ў вёсках Бедрыцы, Гарадзішча, Карцава, Збунова (паміж Мешчоўскам і ст. Сухінічамі). На падставе гэтага гадаем, што мыю ня толькі існавала 100 гадоў назад на захадзе ад Мешчоўска, каля гор. Серпейска, як гэта даводзіць у сваёй вельмі каштоўнай кніжцы Д. К. Зеленін (Великор. гов. с неорган. и непереходн. смягч. заднен. согл., ст. 254—255), але існуе там і цяпер.

Успамянёныя вёскі паміж Мешчоўскам і Сухінічамі трэба лічыць крайнім усходнім пунктам дыялектычнай краіны з мыю. Вёскі Кіпець і Косьціна каля самай ст. Сухінічы, здаецца, ўжо ня маюць гэтай асаблівасьці (Тр. М. К., в. 8, ст. 34—35). Па другі бок аказваюцца і Бышкавічы Уцешэўск. вол. (40 в. на паўн.-ўсход. ад Мешчоўска, гл. Тр. М. К., в. 8, ст. 15—17), і Пакроў з вёскамі (на Угры), што на паўдн.-паўдн. захад. ад Медыні (гл. Мат. для из. влр. гов., XI, ст. 42).

Яшчэ больш адхіляецца на ўсход цікавячая нас ізоглёса па тэрыторыі Арлоўскай губ. Мы маем мыю, рыю на поўначы ад Болхова (з невялікім адхіленьнем на зах.) у шэрагу вёсак—Алешні, Бабінцы і інш., гл. Тр. М. К., в. 3., РФВ., LXXI, в. 2, ст. 346, і з другога боку, і на поўдні ад Арла, напр., у Дубавіку (15 в. ад Арла), ib., ст. 349.

Для вывучэньня паўднёв. часьціны Арлоўск. пав. няма дыялектолёгічных даных (пар. Зеленіна, Влр. гов. с неорг. и непер. смягч. заднен. согл., ст. 213). Можна думаць, што граніца, адхіляючыся крыху на захад, уваходзіць у Курскую губ. Мусіць, граніца наша пройдзе недалёка ад Льгова. Вёска Іваноўская (у в. 20 на зах. ад Льгова) ведае мыю, крыю (Мат. для из. влр. гов., VIII, 229).

На захадзе ад праведзенай мяжы Алешня-Болхоў-Арол-Дубавік-Льгоў мыю вельмі пашырана. Звычайна, знойдзем тут і выключэньні—

[1]) У Гжацк. пав. ужо няма мыю. У запісах са Скугарова гэтага пав. (См. Сб., IV, 454) чытаем: сашьеть.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

астравы па абодвых бакох лініі, што тут тлумачыцца вялікай колькасьцю стараверaў у Арлоўск. губ.[1]), але ў вёсках гэтак званых „палех", аб якіх так дакладна говорыць у цытаванай ужо працы проф. Зеленін, мыю пануе. Яго мы пачуем і ў Рабінскай (=Рябінскай) вол. Болхаўск. пав. (50 в. на паўдн. зах. ад Болхава, гл. Тр. М. К., в. 3, РФВ. LXXI, 2, 347) і ў Самаўск. вол. Карачэўск. пав., якая знаходзіцца ў 30 в. на поўдз. ад свайго павятовага гораду (ibid.), у Сомаве Кромскага пав. (гл. РФВ., LXXI, в. 2, ст. 347), далей у Бранскім пав. (гл, артык. А. В. Пруссак у X в. Мат. для из. влр. гов., ст. 20, потым запісы проф. Буддэ з Полпіна (на ўсх. ад Бранска), гл. яго працу „О гов. Тульск. и Орловск. г.," Сб. ОРЯСРАН., 76, ст. 79 і наст., запісы Голанова (Тр. М. К., в. 3) з Чайкавічаў (15 в. на поўнач), запісы і дасьледв. Карскага (Нов. Сборн. в честь Ламанскага) і Буддэ [op. cit] з Акулавіцк. вол.[2]], у цэлым шэрагу пунктаў з Трубчаўск. пав. [аб усіх іх гл. Дурново, Диал. раз. в обл. влр., гов. I, 2, ст. 33—35], нарэшце ў Сеўскім [у Гаўрылавай Гуце Крупецк. вол., гл. Тр. М. К., в. 3, РФВ., LXXI, в. 2, ст. 350] і Глухаўскім пав. [гл. Тр. пост. Ком. по диал. р. яз., в 9, Св. Мат. по Черниг. губ.].

Што-ж датычыцца Курск. губ., дык тут мыю, бязумоўна, трэба ўперш чакаць у Рыльск. пав., у якім проф. Зеленін [op. cit]. ст. 123—124] і зазначае моцнае „малорусское влияние".

У Курскай губ. мы пакідаем граніцу паміж мыю, мою [мэю]. А цяпер скажам яшчэ некалькі слоў аб пашырэньні варыянтаў злы[й]—злэй—злой. Паласа з пераходным злэй, у параўнаньні з мэю, зьяўляецца значна шырэйшай; форма злэй пашырыла сваю тэрыторыю як за лік злы[й], так і за лік злой. Аб розных выпадках э зам. чаканага о і аб тэрыторыі пашырэньня гэтай зьявы гл. Карскага, Блр., II, 1 ст. 165 і наст.[3]].

§ 10 Іншыя больш дробныя і менш дасьледжаныя зьявы вокалізму.

а) Паперш., адносна супадзеньня ы і і. Мы ня будзем тут спыняцца на пытаньні аб агульным супадзеньні гэтых галосных, якое адзначае укр. гутаркі, скажам толькі некалькі слоў аб дыялектычным супадзеньні ы і і пасьля губных, а часам і пасьля шыпячых, якое можна знайсьці ў паўдн.-блр. і паўн.-укр. гутарках (гл. напр., Растаргуеў, Гов. вост. уездов Гом. г. в их соврем. сост., ст. 7 і Сев.-белор. гов., ст. 59—60).

Супадаюць ы і і ў адным сярэднім гуку и: бик, питай, мило, рòбиць, (жито, шиць, чисты), а часам нават у гуку і: бік, пітай і г.д.; на значнай адлегласьці тэрыторыя бик або бік мяжуе з тэрыторыяй зьмены ы на у. Так, напр., у Камарыне на Дняпры знаходзім бук, у Лукаедах-жа (5 в. на поўдзень) чуваць ужо бик[4]).

б) Вельмі пашыраным зьяўляецца ў паўдн.-блр. гутарках шэраг

---

[1]) Чем западнее, кажа Буддэ (Сб. ОРЯСРАН., 76 т., № 9, ст. 3), тем чаще мы встречаем в Орловск. г, произношен. мыю, крыю.

[2]) Аб Бранскай гутарцы гл. яшчэ артыкул Тіханова. Сбор. ОРЯСРАН. т. 76, ст. 28.

[3]) Яшчэ большай зьяўляецца тэрыторыя пашырэньня ы ў прыназойніках къ, въ, съ, (кы, вы, сы); зьявіўшыся раней у становішчы перад наступным j, яно пашырылася і на іншыя прыклады; вы даму, сы рубашкамі і г. д. знаходзім у тых влр. акаючых дыялектах, у якіх пры іншых умовах зам. ы зьяўляецца ўжо о: слепой, мою. Аб гэтым дакладней гл. ў артык. Л. Васільева. К характерист. сильно акающ. говор., РФВ. за 1907 г., № 3 і 4, ст. 241 і наст.

[4]) Пасьля зубных, аднак, тут ы і і ня зусім супалі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

зьяў, зьвязваючых іх з укр. дыялектамі [1]). Маю на ўвазе зьнікненьне і ў дзеяслоўных і прыметнікавых формах (чыт*аэ*, чыт*аэм*, так*аа*, так*оэ*, маладуу і г. д.), што ўтварае глебу для розных далейшых зьмен—асыміляцыі (чыт*аа*, чыт*аам*, так*еэ*) і сьцягненьня (ён чыт*а*, так*а*, так*э*, маладу*)*. Граніцы комплексу гэтых зьяў ня зусім выразныя; апроч таго, у шмат мясцовасьцях заўсёды, нават у мове паасобнага чалавека, можна знайсьці хістаньне паміж гэтымі ўсімі формамі: у значнай меры залежыць гэта хістаньне ад тэмпу размовы.

в) У паўночных гутарках можна пачуць *ы* на мейсцы ненаціскнога *у* ў шэрагу слоў. Да прыкладаў акад. Карскага (зам*ы*ж, кор*ш*ын, скін*ы*ць, гл. Белоруссы, II, I, ст. 293), які зусім дарма адмаўляў фонэтычнае пахаджэньне зьмены *у* на *ы* ў гэтых прыкладах, можна дадаць яшчэ некалькі слоў: вóзд*ы*х, пáз*ы*ха, выр*ы*чка (=выручка), адзначаныя намі ў Невельскім пав. (гл. наш арт. „Да характар. паўн.-блр. дыялектаў“, ст. 6). Ня ведаем, якога пахаджэньня *у* ў ф. ф. прыметн. і займеньн. жан. р. (усяк*ы*ю). Зусім паасобна стаіць, між інш., слова с*ы*бóта, вельмі пашыранае па ўсёй Беларусі. З гукам *ы* яго можна пачуць нават у Менску.

г, д) Вельмі важнымі адзнакамі блр. гутарак (агульнымі і для украінскіх) зьяўляецца, паперш., скарачэньне пачатковага *і* пасьля папярэдняй галоснай (аб скарачэньні пачатковага *у* мы ўспамінаем у іншым мейсцы), падругое, *ры*, *лы*, адпаведна влр. *ро*, *ло*, з ранейшых злучэньняў *ръ, лъ, рь, ль*. Вывучэньне географіі гэтых зьяў, бясспрэчна, магло-б адыграць нямалую ролю пры азначэньні граніц блр. м., але на жаль дыялектолёгі на іх зварочвалі мала ўвагі. Напр., у адказах на прогр. М. Д. К. адсутнічае пункт аб кр*ы*вавый (гл. РФВ, LVIII, в. I, ст. 193). Праўда, высьвятленьне гэтага пункту ў мясцовасьцях, пераходных да влр. краіны, сустрэла-б некаторыя цяжкасьці. У гэтых (паўн.-ўсх.) гутарках, як вядома, пануе якраз дысыміляцыйнае аканьне, і гэткім чынам, цяжка было-б зьбіральніку разабрацца ў прыродзе *ы* ў такіх прыкладах, як кр*ы*вавы(й), др*ы*жаць, др*ы*ва, гл*ы*таць. Вельмі мала такіх прыкладаў, як кр*ы*ві, кр*ы*вёй, якія маглі-б даць зьбіральніку матар'ял для пэўнага вываду аб захаваньні злучэньняў *ры, лы* з *ръ, лъ* і г. д. у данай мясцовасьці. Можна толькі сказаць, што *ры, лы* даволі далёка ідзе на ўсход, гл. Дурново, Диал. разыск., в. 1, ст. 18-20, а также Шахматова, Звук. особ. Ельн. и Мос. гов., РФВ., т. 36, ст. 70-71.

Канчаючы размову аб *ры, лы*, я хацеў-бы навесьці два цікавыя прыклады з *ры* разгледжанага пахаджэньня. Гэта, паперш., формы ад такіх імёнаў, як Пятрок, Зьмітрок (у якіх *ок-*<-ъкъ): Пятр*ы*ка, Зьмітр*ы*ком і г. д.; падруг., ускосныя склоны ад сьвякроў: сьвякр*ы*ві і г. д.

е) Калі ў пачатку слоў было злучэньне плаўн. з *ъ, ь,* разьвілася перад плаўным пасьля зьнікненьня глухога прыставачная галосная: *і*рваць, *і*льну, *а*ржан*ы*.

---

[1] Яны пашыраны і ў паўн.-влр. дыялектах і ў пераходных ад „сяр.-влр.“ да блр., гл. Оп. д. к. р. яз., ст. 18 і 37.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Б. Консонантызм.

§ 11. Вымаўленьне р.

У адносінах да *р* блр. дыялекты падзяляюцца, як вядома, на дзьве групы—заходнюю цьвёрдаэрую і меншую па велічыні—мяккаэрую. У апошняй адрозьніваецца этымолёгічнае *р* мяккае (бярі, бярэ́ць, грязь, бярёза, гыварю і гаварю) ад *р* цьвёрдага.

Граніцу паміж гэтымі дзьвюма дыялектычнымі паласамі акад. Карскі (Блр. I, ст. 193 и II, 1, ст. 382, гл. таксама этнографічн. карту блр. плем. у I т.) азначае даволі правільна, так што асаблівых папраўак не даводзіцца рабіць да гэтага пункту (гл. нашу карту № 6). Граніца паміж цьвёрдаэрымі і мяккаэрымі гутаркамі, кажа Карскі, праходзіць, пачынаючы ад Карсоўкі (ст. Пецерб.-Варш. чыгункі) на паўдн. ўсход—каля Себежу, Гарадка, Віцебска, Горак, Чавус, Прапоўску, цераз р. Бесядзь да граніцы Чарнігаўск. губ., тут амаль што па граніцы Гомельскага пав. да Новазыбкава і далей на паўдн. ўсход да граніцы блр. краіны.

Праверыць гэтыя даныя ў нас ёсьць магчымасьць, пачынаючы ад Себежу. З запісаў Грыневіча і Сербава ведаем, што сапраўды каля самага Себежу (напр., у вёсцы Гарбуны, 5 в. ад Себежу) адрозьніваецца мяккае *р* ад цьвёрдага (пар., таксама Мат. блр., ст. 213), але ў Глембочыне (прыблізна ўжо ў 15 в. на поўдз. ад таго самага гораду) заўсёды зьяўляецца ўжо *р* цьвёрдае[1]). Скора пасьля Себежу Карскі павярнуў граніцу на поўдзень, у кірунку на Клясьціцы, але з запісаў А. Шлюбскага ў яго „Мат. па вывуч. ф. і м. Віцебшч." мы ведаем, што цьвёрдае *р* заўсёды зьяўляецца і ў гутарцы Забулдычына (Альбрэхтава, на паўднёвым беразе возера Расона), якое прыблізна знаходзіцца ў 20 в. на ўсход ад Клясьціц. Адсюль граніца ідзе прыблізна ў тым-жа паўдн.-ўсх. кірунку, так што ўвесь Езерышчанскі раён (гл. Адк. № 3 настаўніцы М. Юндзіл), потым паўн. часьц. Сіроцінск. р.[1]) і увесь Гарадоцкі раён[2]) аказваюцца ўжо на тэрыторыі мяккага *р*. У такім кірунку пагранічная паласа вымаўленьня *р* даходзіць прыблізна праз Сіроціна, Ужляціну[3]) да паўночнай граніцы быўшай Магілеўскай губ.

---

[1]) У бліжэйшым да Себежу Асьвейскім раёне Полацкай акр. заўсёды *р* цьвёрдае (н. з.).

[2]) Напр., у Казянох Сіроцінск. р. і ў Выроўлі Гарадоцк. р., гл. Рам., Блр. Сб., VI, ст. 150 і наст., 163 і нест.

[3]) Хістаньне ў перадачы *р* у запісах А. Шлюбскага (грязь, споруць, гывары́ла, але побач з гэтым на гаре, спориця, з літарамі *е*, *и*, якімі аўтар „Мат. ф. і м. Віц." вызна-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Галоўнай крыніцай пры вывучэньні пытаньня аб вымаўленьні *р* у гутарках быўш. Магілеўскай губ. зьяўляюцца запісы Е. Р а м а н а в а ў яго „Белорусском Сборніке". На падставе гэтых запісаў нябожчык склаў у 1918 г. дакладны артыкул (з дадаткам карты) аб гутарках данай губэрні[1]). Усю яе тэрыторыю ён і падзяляе на цьвёрдаэрую і мяккаэрую падмовы. Граніца паміж гэтымі часьцінамі праходзіць упершае на тэрыторыі Сеньненскага пав., большасьць якой мае цьвёрдае *р*; адрозьніваецца мяккае *р* ад цьвёрдага толькі ў невялікай паўн.-ўсходн. часьціне данага павету, а менавіта ў валасьцях Астровенскай (з Сорыцай, Тамошонкамі і інш.) і Латыгоўскай (з вёскамі Машчоны[2]), Сапегі, Кішкі і інш.).

Не дайшоўшы за некалькі вёрст да Сянна, граніца зноў паварачвае (крыху крывой лініяй) на паўднёвы ўсход. Быўшая Расьнянская вол., на поўдзень і паўдн. ўсход ад Сянна, адносіцца ўжо да цьвёрдаэрай падмовы. У цьвёрдаэрую паласу пападае і паўн.-заходні куток цяперашняга Аршанскага раёну з вёскамі Вежава, Мошкава, Грабянёва, Гразіна, Лагі і інш. (В. п. настаўніка Аршанскага Рабфаку Рыжыкава). Далей граніцу мы павінны адхіліць на захад ад тэй лініі, па якой прайшла яна на карце акад. К а р с к а г а. Бліжэй да ісьціны тут будуць паказаньні Е. Р а м а н а в а. Ідучы ў паўднёвым кірунку, граніца пройдзе на захадзе ад Воршы, магчыма, што на захадзе і ад Копыся (але на ўсходзе ад Плешчыц), так што Горкі аказваюцца далёка на ўсходзе ад яе[3]).

Параўнаўшыся з Магілевам, граніца, ці лепш сказаць пагранічная пераходная паласа, паварачае крыху на ўсход у кірунку да Чавус, але не дайшоўшы да яго, зноў паварачвае на поўдзень, прыблізна паміж быўшымі Рагачэўскім і Чэрыкаўскім паветамі. Калі не пападаюць ў гэтую пагранічную паласу, дык ва ўсякім разе аказваюцца недалёка ад яе Прапойск, Гайшын[4]). Большасьць запісаў з Чэрыкаўскага пав. (напр., Д э м б о в е ц к а г а ў „Опыте описан. Могилевской губ", Голанова ў апісаньні гутаркі Горак і Мірагошч (якія знаходзяцца ў некалькіх вярстах на паўдн. захад ад Чэрыкава), якое надрукована ў

чае сярэднюю мяккасьць *р*) з Ужляціны, потым *р* цьвёрд. у запісах з Бабінічаў (гл., напр., № 87, 174) і, наадварот, вусн. пав. М. К а с ь п я р о в і ч а аб тым, што мяккае *р* пераважае і ў Сіроціне Віцебск. акр.: відавочна, і тут хістаньне) прымушае нас на данай дзялянцы штрыхоўкай адзначыць пераходную паласу. У прыкладах у „Віцебскім краёвым слоўніку" (1926) таго-ж К а с ь п я р о в і ч а знаходзім адбіцьцё *р* мяккага ў Запрудзьдзі Кузняцоўск. р. (на поўн. зах. ад Віцебску) і ў Купіне Віцебск. р.

[1]) Гэты артыкул, які становіць 10 вып. яго „Белор. Сборн.", друкуецца ў I т. Зборн. Аддз. Мовы і Літаратуры Інбелкульту.

[2]) Належнасьць Машчонаў да мяккаэрай паласы пацьвердзіў і М. К а с ь п я р о в і ч.

[3]) У запісах Васіля К а в а л ё в а з. в. Савы Аршанск. акр. Горацкага раёну Шарынскага с.-сав. (якая знаходзіцца на паўночн. захадзе ад Горак), заўсёды адрозьніваецца мяккае *р* ад цьвёрдага. Мяккае *р* знаходзілі таксама і на поўнач ад Горак у вёсках Шышава, Піліпава (В. п. М і х а л ё в а; па яго словах, у Горках, аднак, *р* цьвёрдае). Што-ж датычыцца Копыся, дык у нас ёсьць некалькі запісаў, зробленых самім Ш э й н а м у 1 ч. I т. яго „Материалов". Зрабіць з іх вывад, аднак, цяжка, бо ў іх шмат хістаньняў (горя, говоряць, трёх, але зорушка, піраволачы вала, прымай) і невядома, чым яны абумоўлены—нядбаласьцю запісчыка або належнасьцю Копыся да пераходнай паласы. Адносна належнасьці Плешчыц да цьвёрдаэр. паласы гл. арт. П. А. Р а с т а р г у е в а „Да характ. блр. гут.," які друк. у I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК.

[4]) На падставе адказу на праграму (Мат. блр., 3, ст. 119) К а р с к і робіць, аднак, вывад аб існаваньні *р* мяккага ў гутарцы Гайшына. Пераважае *р* мяккае і ў запісах Е. Р а м а н а в а. На тое, што Прапойск трэба адносіць да мяккаэрай паласы, паказваюць запісы С е р б а в а з Кульшычаў, якія знаходзяцца ў 10-12 в. на зах. ад Прапойска (захоўв. ў Інбелкульце). У Кулікоўцы-ж, якая знаходзіцца ў некальк. вв. на паўд. зах. ад Кульшычаў, ужо заўсёды *р* цьвёрдае (в. п. і зап. С е р б а в а). Цьвёрд. *р* і ў Дарагунску, 15 в. на паўдн. зах. ад Кулікоўкі (зап. С е р б а в а).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

8 вып. Тр. Моск. Диалект. Ком.[1]), сьведчыць аб тым, што тут *р* не заўсёды цьвёрдае.

Праводзячы далей граніцу між цьвёрдым і мяккім *р*, мы павінны заўважыць, што цяпер пытаньне ўскладняецца новай акалічнасьцю, а менавіта вось чым: на поўдні цьвёрдаэрая і мяккаэрая падмовы не беспасрэдна мяжуюць адна з другой; прыблізна на поўдні ад Чэрыкава пачынаецца пераходная паласа, якую мы лічым магчымым назваць падмовай дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р*[2]); яна азначаецца тым, што ў ёй цьвёрда вымаўляецца заўсёды *р* перад *е, ы* (з *і*): бярэ (*бярэць*), бяры, у той час як перад іншымі галоснымі *р* можа быць мяккім: гыварю (і *гаварю*), цьвярёзы, грязь, буря. Да такой пераходнай паласы належыць большасьць гутарак Краснапольск. р. (Клімавіцк. акр.). З падр. адк. № 1 і з запісаў А. Шашалевіча мы ведаем, што ў розных вёсках гэтага раёну (у Маластоўцы, Ельні, Гарадцы, Лютым, Пачэпах, Клясіне, Палужы і інш.) пры бярёза, буря, гарю вымаўляецца, з другога боку тры, бяры (ці три, бяри[3]), бярэ, рэчка.

Да падмовы дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р* адносяцца і вёскі Палесьсе (в. п. Хайкова, загадчыка ў справах беларусізацыі ў Неўлі) і Верхлічы (в. п. студ. Б. Д. У. Цімашэнкі) быўш. Сураск. пав., цяпер Гомельскай акр.; абедзьве яны знаходзяцца на поўдні ад Краснапольскага раёну.

Граніцу паміж паласой дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р* і падмовай з мяккім *р* перад усімі мяккімі галоснымі нельга дакладна азначыць. Мы ведаем толькі, што да паласы дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р*, апроч успамянёных мясцовасьцяй, адносяцца гутаркі ўсходн. паветаў быўш. Гомельск. губ., галоўн. чынам, Новазыбкаўскага і Старадубскага[4]) (гл. П. А. Растаргуева „Гов. вост. уездов. Гомельск. губ.“, ст. 9, Сев.-блр. гов., ст. 42 ін. і Ант. Полевого „О яз. насел. Новозыбк. у. Гом. г.“, ст. 13-14). У паласе-ж поўнага зьмякчэньня аказваюцца Клімавіцкі, Касьцюковіцкі[5]) і Бялынкавіцкі раёны.

Цяпер пераходзім да азначэньня граніцы паміж цьвёрдаэрай падмовай і падмовай дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р*. Ад таго прыблізна пункту, адкуль пачалася пераходная паласа дысыміляцыйнага ацьвярдзеньня *р*, граніца цьвёрдаэрай падмовы прадаўжае ісьці ў паўдн.-

---

[1]) Менш верыгодным зьяўляецца паведамленьне таго-ж І. Г. Голанова (на падставе размоў з аднэй жанчынай, якая служыла ў маёнтку Горкі) аб тым, што ў мяст. Расьне б. Чавуск. пав. *р* цьвёрдае, што быццам і пацьвярджае паказаньні карты Карскага. Граніца цьвёрдага *р* не даходзіць так далёка на ўсход. Магчыма толькі, што Расна прадстаўляе востраў з нейкім хістаньнем у вымове *р* (гл. ніжэй). Сам-жа І. Голанов (гл. Тр. М. К., 8, ст. 6) зазначае, што ў адным сказе (бяри што хочъш) ад успамянутай жанчыны ён чуў *р* мяккае. Данымі Дэмбовецкага і Голанова скарыстаўся, між інш., і проф. Растаргуеў у 2 часьціне сваёй працы аб северскабеларускіх гутарках. (Сев.—бел. гов., ст. 159 і наст.).

[2]) Як свайго роду пераходную паласу, мы і яе таксама адзначылі на карце штрыхоўкай.

[3]) Ацьвярдзеўшы прад *і*, папярэдняе *р* далей, як і ў бельшасьці іншых блр. дыялектаў выклікала зьмену артыкуляцыі наступнага галоснага *і* на *ы*; але ў некаторых мясцох *і* зьмянялася на гук сярэдні паміж *і* і *ы*, падобны да *и* ва ўкр. м., які мы таму і вызначаем літарай *и*. М. інш., у тым-жа раёне, што і пералічаныя вёскі, знаходзіцца Маластоўка. Належнасьць яе гутаркі да паласы дысыміляцыйн. ацьвярдзеньня *р* можна было-б пацьвярдзіць запісамі Е. Раманава (гл., напр., Блр. Сб. III, 254-259: упяряду, черяз, пакряпчэй, упярёд і інш.), калі-б ён ня ўжываў-бы ў такіх выпадках як при, бярець этымолёгічнага правапісу: ри, ре ў яго знаходзім і ў запісах з цьвёрдаэрай падмовы.

[4]) У самым Старадубе, аднак, *р* цьвёрдае (Растарг., ibid); пар. такую самую розьніцу паміж гутаркай Горак і гутаркамі суседніх вёсак. У меншай меры гэта рыса выяўляецца ў г.г. Погар, Мглін і Сураж.

[5]) А. Шашалевіч зазначыў, што ў Відуйцах і Самацэвічах (у паўдн.-заходнім кутку Касьцюковіцк. р.) заўсёды чуваць перад мяккімі галоснымі мяккае *р*.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ўсходн. кірунку, так што ня толькі Навасёлкі, Карма быўш. Рагачэўскага пав., але нават Чачэрск і Нісімкавічы таго-ж пав. аказваюцца ў цьвёрдаэрай паласе (гл. Раманава Бел. Сб.). Далей граніца цьвёрдага *р* прыблізна супадае з усходняй граніцай б. Гомельскага пав.; на карысьць цьвёрдаэрай падмовы яна адрэзвае наступныя вёскі ў заходняй і паўднёвай часьцінах суседняга Новазыбкаўск. пав.—Азарычы, Сераўку, Кожанаўку, Баранаўку, Іванаўку, Н. і Ст. Юркавічы і Новы Ропс (гл. Ант. Полевого, О яз, насел. Новозыбк. у. Гом. губ., ст. 13).

Нарэшце, прайшоўшы вышэй ад Ноўг.-Северска (гл. матар., апрацав. П. А. Растаргуевым, Тр. М, К., в. 9, ст. 167-168), мяжа мяккага *р* хутка паварачвае на паўдн. ўсход, так што м. Воронеж[1]) (і, здаецца, самы Глухаў) акажуцца ў цьвёрдаэрай паласе, Уланаўская-ж вол. у мяккаэрай паласе (ibid., ст. 158-159).

Мы не азначаем паўднёвай граніцы цьвёрдага *р*, таму што тут пераход да мяккага *р* украінскага тыпу зьяўляецца паступовым. У Харобрычах О. Курило (Фонет. та деякі морфолог. особлив. гов. с. Хоробричів, ст. 64-66) знайшла паўмяккае *р* перад мяккімі галоснымі; знайшлі такое вымаўленьне і мы ў паўднёвых гутарках Мазыршчыны і ў Рэчыцк. пав., прычым гэта сярэдняе па мяккасьці *р* там зьяўляецца толькі перад галосным *и* (блізкім да укр. *и*), які зьявіўся як з *і*, так і з *ы* (а ў іншых выпадках заўсёды *р* цьвёрдае). Частковую цьвёрдасьць *р* (галоўн. чынам, у канчатках) адзначыў у паўн.-укр. падмове і В. Ганцов (гл. Діялектолог. класифік. укр. говор., ст. 28)[2]). Прыблізна тое самае (бу́р*а*, благода*р*у́ пры гар*я*чка, т*ре*йчи) адзначылі мы сёлета ў Лукаедах б. Рэчыцк. пав.

Апроч Старадуба і Горак, астравамі з цьвёрдым *р* на мяккаэрай паласе зьяўляюцца яшчэ мяшчанскія гаворкі ў некаторых мястэчках (в. п. інспэктара Рэчыцкага Аддз. Нар. Асьв. т. Прудніка), а таксама шляхоцкія вёскі ў Невельск. пав., гл. арт. Зоріна ў пскоўскім зборн. „Познай свой край“, III, ст. 38. Да пералічаных Зоріным шляхоцкіх вёсак дадам яшчэ вёскі шляхтаў паміж Ст.-Сакольнікамі, Трыхалёвым і Ізочай: Машарына, Тоўставухава, Самулкава, Нядзелькіна, Іванцава, Савіна, Якушкава, Панава, у якіх, згодна з в. п. настаўніка Колесова (у Н.-Сакольніках), заўсёды *р* цьвёрдае. Такіх вёсак, аднак, значная меншасьць, і таму мы іх не адзначылі на карце.

Значна радзей трапляюцца мяккаэрыя астравы на цьвёрдаэрай паласе; такім востравам зьяўляецца, напр., Сямёнавічы б. Ігуменск. пав. (каля Узды), з якіх ёсьць запісы (ненадруков.) І. А. Сербава.

§ 12. Вымаўленьне зычных перад мяккімі галоснымі.

Беларускія гутаркі, разам з расійскімі, у процілегласьць украінскім, адзначаюцца зьмякчэньнем зычных перад мяккімі галоснымі—*е*[3]), *і*. Зазначаная асаблівасьць зьяўляецца даволі важнай адзнакай беларускіх дыялектаў, і на ёй, як мы гаварылі ў уводзінах, можна было-б базавацца пры азначэньні паўднёвай граніцы беларуск. м., калі-б граніцы паміж цьвёрдым і мяккім вымаўленьнем зычных супадалі для розных катэгорый гэтых гукаў. У рачавіснасьці, аднак, гэтага няма, і таму замест аднэй ізоглёсы даводзіцца гаварыць аб некалькіх, прынамсі аб трох.

---

[1]) З Варонежа ёсьць яшчэ запісы І. Абрамова (Черниг. малороссы. 1905), але, здаецца, няпэўныя.

[2]) Пар. таксама розныя месцы аб паўночных „разноречиях“ усіх трох украінскіх „наречий“ у працы Міхальчука ў VII т. Труд. Этногр.—Стат. Эксп. в зап.-русск. кр.

[3]) Звычайна, тут ідзе размова аб *е* з спрадвечнага *е*, бо мяккасьць зычных перад *е* з *ѣ* у беларускіх дыялектах не становіць чагосьці адрознага ад украінскай мовы.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Яшчэ ў 1904 г. (гл. Изборник Киевский, посвящ. Флоринскому, ст. 86-87) акад. Карскі паказаў на тое, што ёсьць паўдн.-блр. гутаркі, у якіх пры мяккасьці іншых зычных перад *е, і*, знаходзім, аднак, цьвёрдае вымаўленьне губных перад гэтымі самымі галоснымі. Граніца паміж мяккім і цьвёрдым вымаўленьнем губных зычных, бязумоўна аддзелена значнай адлегласьцю ад ізоглёсы мяккага вымаўленьня зубных зычных; праходзіць яна на поўначы ад Прыпяці, але ў большасьці месц недалёка ад яе. У Капаткевічах мы запісалі *вэльмі* [1]), *вэрбы*, *кў-бэл*, у Каленкавічах—*рўбэль*, на *пэчы*, перад *і* (*и*): па*ми*раа (праз *и* я вызначаю няпоўную цьвёрдасьць *м*), за*би*раць і інш. Ёсьць яна, здаецца, у Петрыкаве, гл. Шэйна, Мат., II, № 83. У быўш. Рэчыцк. пав. у паўднёвай яго частцы (на поўдзень ад Лоева, напр., у Стар. Ёлчы), далей у паўночнай частцы быўш. Чарнігаўск. губ. (напр., у Суслаўцы, на лев. беразе Дняпра, в. 7 ад Лоева, у Плёхаве—у 25 в. на ўсход ад Ст. Ёлчы) чулі мы амаль зусім цьвёрдыя губныя перад *е, і*: *вэсь*, *земэль*, *вэдзе́*, *бэ*рэгом, пры*вэзли*. Пачынаючы-ж ад Лоева прыблізна (напр., у Крупейках, 5 в. ад Лоева) і да Рэчыцы (каля Рэчыцы запісы я рабіў у Бронным, 8 в. на поўдзень ад Рэчыцы і ў Дзяржні, 7 в. на паўн. захад) часам прабіваецца сярэдняе (г. зн. паўцьвёрдае ці паўмяккае) вымаўленьне губных: пам*ир*а́ць, авєчкі, пєршы, бєрўць і інш. (праз є вызначаю сярэдн. вымаўленьне) [2]).

Нарэшце, паўмяккую вымову губных перад зазначанымі мяккімі галоснымі знайшла і О. Курило ў Харобрычах (Фонет. та деякі морфолог. особлив. гов. с. Хоробричів, ст. 63-63).

У сувязі з ацьвярдзеньнем губных перад *е* на глебе паўдн.-блр. дыялектаў, якія захоўваюць часткова аканьне (а менавіта, зьмяняюць *э* на *а* пасьля цьвёрдых зычных), у выніку комбінацыі гэтых абедзьвюх фонэтычных прычын утварыліся такія цікавыя прыклады, як *вадро́*, *вал*і́кі, *ман*е́, *ва*роўка і нават *па*сок (тут *а* замест *е* з *ѣ*; такія выпадкі трапляюцца часьцей там, дзе наогул цьвярдзеюць губныя перад рэфлексам *ѣ*: *бэ*гчы). Існаваньне гэтай зьмены ненацізкн. *бэ, пэ, вэ, мэ* ў *ба, па, ва, ма* вядома нам у наступных масцовасьцях: у Казянькох, у Міцькох, у Ельску, Дабрыні, Кузьмічах (н. з.), у Буйнавічах Лельчыцк. р. (в. п. Крукоўскага), на лев. бер. Прыпяці—у Юравічах (гл. Мат. блр., ст. 255) [3]).

Цяпер накрэсьлім граніцу мяккага вымаўленьня зубных перад *е, і* (гл. карту № 7). Амаль што ва ўсім Тураўскім р. можна пачуць дзень, ціхо, небо (зап. Доўнар-Запольскага з Турава, адказ № 1 з Тонежа, вынікі сёлеташняй студэнцкай экспэдыцыі, зафіксаван. ў падр. адк. № 2, н. з.); зьяўляюцца цьвёрдыя зубныя зычныя перад зазначанымі галоснымі толькі ў Радзівілавічах, якія знаходзяцца ў паўдн.-заходн. часьціне раёну, каля граніцы. Тут удзельнікі студэнцкай экспэдыцыі Адзінец і Юрашкевіч запісалі дэнь, будэ, дэржи, мэнэ, тэпэра, дэсетэро, шчитати[4]); гл. падр. адк. № 2, §§ 67 і 77.

Адрэзаўшы ад Тураўск. р. Радзівілавічы, цікавячая нас ізоглёса спускаецца ў паўдн.-ўсх. кірунку, так што самыя паўднёвыя вёскі Лельчыцкага р.—Глушкавічы і Мілашэвічы (гл. адк. №№ 2 і 17) аказваюцца на поўначы ад гэтай ізоглёсы. Ідучы і далей прыблізна па гра-

---

[1]) Цьвёрдае *в* у гэтым слове можна знайсьці часам і далей на поўначы

[2]) Нашы назіраньні ў даным пункце супадаюць з назіраннямі Н. Соколова, які зазначыў, што іменна ў паўднёв. часьціне б. Рэчыцк. пав. можна пачуць вымаўленьне „вмэръ", гл. РФВ., LXII, Поездка в Белоруссию, ст. 269.

[3]) У выніку таго самага ацьвярдзеньня губных у зазначаных вёсках можна пачуць р*о́ба*ць, л*о́ва*ць зам. робяць, ловяць (н. з.).

[4]) Перад *і* (и) тут, праўда, хістаньні; у іх запісах знайшлі і одзін, робіцімэ. Матар'ялы зазначанай краязнаўчай экспэдыцыі рыхтуюцца, м. інш., да друку.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ніцы Б. С. С. Р. з У. С. С. Р. (на поўдні ад Кармы, Валоўска і Скароднага цяп. Ельскага (Каралінскага) раёну, гл. Мат. для изуч. сев.-млр. гов., Сб. ОРЯСРАН., т. 75, і Тр. Этн.-Ст. Эксп. в з.-р, кр., т. VII, ст. 595, а таксама на поўдні ад іншых вёсак гэтага раёну, н. з.) ізоглёса перарэзвае чыгунку Каленкавічы—Оўруч—Коростэнь паміж станцыямі Славечна і Беражэст. У вёсках каля апошняй станцыі (у Ласкаўцах, Лычманох, Калосьніках, Расошы, н. з.) мы знайшлі ўжо цьвёрдае вымаўленьне зычных зубных перад *е, и (<і)*; у вёсках-жа каля Славечны (у Кузьмічах, у Новай Рудні і інш.) мы чулі яшчэ дзень, небо, ціхо. Пасьля чыгункі ізоглёса адхіляецца трохі ад граніцы з У. С. С. Р., (у Ясянцы і ў хут. Дуброве цьвёрдыя зубныя, гл. адк. №№ 26 і 27 А. Круковскага), але Мухаеды і Дзернавічы аказваюцца на поўначы ад мяжы.

Перарэзаўшы Прыпяць трохі на поўначы ад граніцы Б. С. С. Р. з У. С. С. Р., ізоглёса і далей ідзе ў такім паўдн.-зах.-зах. кірунку і, як мы казалі, недзе ў кутку між Прыпяццю і Дняпром перасякаецца з граніцай аканьня, а на некаторай адлегласьці можа нават і супадае з ёй.

Дасьледваючы дыялекты ў паўднёв. часьціне б. Рэчыцкага пав., мы знайшлі даволі выразную граніцу паміж дзень і дэнь. У Ст. Ёлчы і ў м. Камарыне яшчэ чуваць *дзень, не, хо́дзіць*, у той час як у Лукаедах, якія знаходзяцца ў 5 в. на поўдзень ад апошняга мястэчка, пануе ўжо *дэнь, нэ, хо́дить* [1]). Зразумела, што *дэнь* і г. д. і ў В. Жарах.

Пасьля Дняпра цікавячая нас ізоглёса крыху падымаецца ўверх. В. Навоз акажацца на поўдзень ад яе, але ў Няданчычах (на левым беразе Дняпра) і ў Плёхаве (20 в. на ўсх. ад Дняпра) мы чулі селó, несé, дзень, цепéр, рóдзіць і інш.

Прайшоўшы на поўн. ад Чарнігава, прыблізна недалёка ад Рэпак [2]), наша ізоглёса перасякаецца з чыгункай Гомель—Бахмач між станцыямі Гарадня і Сноўск. У першай з іх сёлета мы запісалі *нема, будзе, ніва* і г. д., у другой—*дэсеть, бэрѣтэ, клубника*. У вёсках, што каля Сноўску (Гвазьдзікоўка і Насоўка) таксама цьвёрдыя зубныя, гл. Тр. М. К., в. 9, ст 159 [3]).

Ідучы далей у ўсходнім кірунку (з вельмі нязначным адхіленьнем на поўнач [4]), цікавячая нас ізоглёса праходзіць недалёка на поўначы ад Н. і Ст. Баровічаў (у паўн.-ўсх. кутку б. Гараднянск. пав.), гл. Растаргуева, Сев.-блр. гов., ст. 186—188, потым на поўначы ад Ноўгарад-Северска. Захоўваецца цьвёрдасьць зычных (відавочна, ня толькі губных, але і зубных), як у вёсках на поўдні ад зазначанага горада (напр., у Абражэеўцы), так і ў вёсках на захадзе (у Жадаве, Фаеўцы, Фарастовічах) і на ўсходзе (у Юрынаўцы, Дуплінаўцы і Каменцы) і нават на паўн. ўсх. (у Стар. Гуце Протапоп. вол., 50 в. ад Н.-Сев. і 20 в. ад Сяредз. Буды).

Аб гэтым можна даведацца з новай працы П. А. Растаргуева („Северско-белорусский говор", 1927, ст. 186—188), які базаваўся ў даным мейсцы на адказах на дыялектолёгічныя програмы (яны на-

---

[1]) Паміж Камарыным і Лукаедамі, як мы бачылі, праходзіць і ізоглёса зьмены *ы* на *у* пасьлі губных,

[2]) У Каменцы, што знаходзіцца на лев. бер. Дняпра, супроць Лоева, зубныя зычныя ўжо зьмякчаюцца перад *е, і* (н. з.).

[3]) У Седневе (н. з.), якое знаходзіцца ў 25 в. на поўдзень ад Чарнігава, сёлета мы чулі нэ будэ, пóйти і інш.; у Харобрычах (гл. О. Курило, Фон. особл...) і ў Дабранцы (н. з.)—зубныя мяккія.

[4]) Звычайна не на ўсім працягу можа быць праведзена выразная мяжа, бо на поўначы ад мяжы можна знайсьці укр. астравы з цьвёрд. зычнымі (напр., Каталіна, 25 в. ад Мгліна, 80 в. ад Рослаўля, РФВ., LXII, ст. 208), з другога боку, на поўдзень ад яе блр. астравы; пар. яшчэ Оп. диал. к. р. яз., ст. 119.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

друк. у 9 в. Тр. Пост. К. по диал. р. яз.), а таксама на працы Б. Грінчэнка „Из уст народа".

Хутка пасьля Старай Гуты і Каменкі (у некалькіх вярстах на паўн. захад ад ст. Міхайлаўскі Хутар) граніца паміж мяккім і цьвёрдым вымаўленьнем зубных зычных паварачвае на паўдн. ўсход. Ведаў адносна паўдн.-зах. часьц. Сеўск. пав. ў нас, праўда, не хапае (Зеленін, Влр. гов., ст. 213—215), і таму далей даводзіцца абмежавацца ўмоўным правядзеньнем ізоглёсы. З большай пэўнасьцю можна толькі гадаць аб цьвёрдасьці зычных у Рыльскім пав. з моцным „малорусским влиянием" (id., ст. 123-124).

З астравоў па-за гэтай усьцяжнай паласой заслугоўвае ўвагі мясцовасьць на паўдн.-ўсх. ад Жыздры, а таксама дзьве вёскі ў Ліхвінск. пав. (Дурново, Диал. к. Кал. г., ст. 20—22).

§ 13. Дзеканьне і цеканьне.

Дзеканьне і цеканьне нельга ставіць у абавязковую сувязь з мяккім вымаўленьнем зубных зычных перад мяккімі галоснымі. Мы лічым з лёгічнага боку цалкам магчымым ня толькі існаваньне гутарак з мяккімі *д, т,* перад *е, і,* ня ведаючых, аднак, дзеканьня і цеканьня, але таксама існаваньне дыялектаў украінскага тыпу з цьвёрдымі *д, т* перад *е, і* (*э, и:* дэнь, тихо), у якіх, аднак, зьяўляюцца афрыкаты *д͡з, ц* перад рэфлексамі *ѣ* (д͡зѣўка, цѣсто). Гэта наша апрыорнае меркаваньне сёлета нам удалося пацьвердзіць назіраньнямі над гутаркамі паўночнай Чарнігаўшчыны. У Седневе прабіваецца часам *дзѣти* (=дзеці). Больш пасьлядоўна дзеканьне-цеканьне перад *ѣ* пры цьвёрдасьці зычных перад *е, і (э, и)* заўважваецца ў запісах студэнцкай экспэдыцыі, зробленых у Радзівілавічах Тураўскага р.: о̂дзѣлі д͡зѣток, нават д͡зьвѣ, але будэ, дэржи, гл. падр. адк. № 2.

Хоць дзеканьне-цеканьне лічаць аднэй з важных адзнак блр. м., але мы з шэрагу прычын ня можам прыдаць яму такое значэньне. Па-першае, мы бачым, як яно далёка пасунулася ў некаторых мясцох на поўнач і на поўдзень. Дзеканьне-цеканьне ўласьціва як гутаркам Пскоўскай губ. (гл. арт. Н. Соколова ў VIII в. Тр. М. К., ст. 7—8), так, з другога боку, гутаркам, ляжачым далёка на поўдні ад Прыпяці, уздоўж граніцы з У. С. С. Р.—Радзівілавічам (гл. вышэй), Глушкавічам (адк. № 17), Мілашэвічам (адк. № 2), быўш. Скародненскай воласьці (Тр. Этн.-Ст. Эксп. в з.-р. кр., VII, № 55, а таксама Мат. для изуч. с.-млр. гов., а также переходн. от б. к м., Сб. ОРЯСРАН., т. 75), нарэшце вёскам каля ст. Славечны (н. з.) [1]). На паўдн. ўсходзе дзеканьне-цеканьне сустракаецца ў Курск. губ. Але ў той час як у некаторых мясцох даная асаблівасьць беларускага консонантызму мае тэндэнцыю да пашырэньня, у шэрагу іншых мясцовасьцяў мы бачым адваротнае. Так, напр., на паўночным усходзе, у Аленінскай, Моладатудзкай і інш. валасьцях дзеканьне-цеканьне, якое тут раней існавала, цяпер амаль зусім зьнікла. „Намеком на существование этого можно считать сильную палатализованность *т*, а также отмеченное мною произношение *д'* с очень слабым свистящим призвуком, как-бы редуцированное дзе-

[1]) Дзекаючыя астравы можна знайсьці і на влр. тэрыторыі, напр., у Яраслаўск. губ. (гл. Зеленін, Влр. гов., ст 453), у Ўладзімірскай і Ніжагародзкай (гл. Соболевскага, Опыт р. диал., ст. 57 і 58), у Рязанск. і Цьвярской (гл. яшчэ Богородіцкі, Кр. оч. диал. и ист. р. яз., ст. 312). Нарэшце, разьвіваецца фрыкатыўны элемэнт пасьля *д'*, *т'* і ў расійск. літаратурнай мове, гл. хоць-бы ліст акад. Ляпунова ў Прац. Акад. Конфэр. на рэф. блр. прав. і азб., ст. 139.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

каньне" (ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 309—310). Таксама і проф. П. А. Растаргуеў констатуе зьнікненьне дзеканьня-цеканьня ў усходніх паветах Гомельск. губ., якое, аднак, 30—40 гадоў назад яшчэ існавала тут (Гов. вост. уездов Гом. г. в их совр. сост., ст. 9—10). Азначаючы граніцу паміж дзекаючымі і нядзекаючымі гутаркамі на тэрыторыі Новазыбк. пав., А. Полевой зазначае, што і ў нядзекаючай часьціне данага пав. старыя людзі, аднак, яшчэ захоўваюць гэтую асаблівасьць у сваёй мове (О яз. насел. Новозыбк. у. Гом. губ., ст. 11—12). Але галоўная прычына, якая прымушае нас устрымацца ад ізоглёсаваньня дзеканьня-цеканьня,—гэта паступовасьць яго зьнікненьня, асабліва ў кірунку на ўсход. Сьвісьцячы элемэнт у смаленскіх гутарках зьяўляецца ўжо вельмі слабым, што і ўтварыла повад для спрэчак аб тым, ці існуе ў гэтых (і ў іншых) гутарках дзеканьне і цеканьне. Аб гэтых спрэчках гл. Карскага, Блр. II, 1, ст. 439 і наст. [1]).

Гэтую паступовасьць зьнікненьня дзеканьня і цеканьня можна была-б навочна перадаць толькі паступовым аслабленьнем фарбы. Падрыхтоўка такой карты, бязумоўна, зьвязана была-б з цэлым шэрагам цяжкасьцяй.

§ 14. Асыміляцыя j да папярэдняга зычнага (у становішчы перад наступнай галоснай).

Гэтая асыміляцыя, у выніку якой зьяўляюцца падвойныя (уласна кажучы, доўгія) зьмякчоныя зычныя (вясельле, жыцьце; далей у гутарках яны могуць спрошчвацца ў простыя зычныя: вяселе, жыцё) характарызуе злучнасьць укр. і блр. дыялектаў. І гэтую зьяву мы яшчэ адмаўляемся дакладна ізоглёсаваць, і таму толькі прыблізна адзначаем яе граніцу, пасылаючыся на адпаведныя крыніцы.

У Пскоўшчыне даную асаблівасьць ведаюць гутаркі, паўзьмежныя з Віцебск. і Смаленскай губ. (арт. Н. Соколова аб пскоўскіх гутарках, Тр. М. К., в. 8, ст. 8) [2]), ведае яе і Бельскі пав. Смаленск. губ. (зап. Добравольскага, а таксама РФВ., LXII, ст. 198-199 і 202-203), адкуль цікавячая нас асаблівасьць пераходзіць у вядомыя нам ржэўскія гутаркі (гл. арт. Грінковай у ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 310-311). Павярнуўшы на паўднёвы ўсход, граніца паміж—*ньне* і *нье* захапляе і Сычэўскі пав.; у запісах Добравольскага з Хоцькава гэтага пав., праўда, хістаньне (напр., нявис*е*л*ья* і виш*и*н*ья* на 466 і 467 стар. IV т. См. Сб., але пераважаюць прыклады з доўгімі (падвойнымі) зычнымі: васкрисе*нн*я, ib., ст. 466, удивле*нн*я, раза*лл*ю, раздо*лл*и См. Сб., II, ст. 261, 262, 272. Прыблізна ў такім самым паўдн.-ўсходнім кірунку (паміж Вязьмай [3]) і Гжацкам) граніца пераходзіць у Юхнаўскі пав., у якім Ізвольск (каля станц. Ізноскі) ведае судьдя, платьтя (Тр. М. К., в. 8, ст. 37).

Далей граніца ідзе прыблізна ў паўднёвым кірунку, трошкі адыходзячы к захаду ад ізоглёсы *мыю*. Трэба думаць, што яна пройдзе на захадзе ад Мяшчоўска, ад групы вёсак між Мяшчоўскам і ст. Су-

[1]) З тэй самай прычыны слабасьці дзеканьня гэтая фонэтычная рыса не адзначана ў запісах з Вяліск. пав. ў „Матар'ялах па вывуч. фолькл. і мовы Віцебшчыны" А. Шлюбскага. Цеканьне, аднак, ён вызначае, і гэта выклікае цалкам зразумелае сумненьне ў тым, ці магчыма няроўнамернае разьвіцьцё фрыкатыўнага элемэнту пасьля звонкага і пасьля глухога выбуховага зубнога зычнага. Зазначае, праўда, цеканьне бяз дзеканьня і Зорін у Невельскіх гаворках, Познай свой край, III, ст. 40.

[2]) У Себеск. пав. надвойныя зычныя, Мат блр., 214. Няведама, як стаіць справа ў Магільнянск вол., гл. Мат. блр., 203. У Невельск. таксама мы ня чулі злучэньняў влр. тыпу.

[3]) На паўн. зах. (в. п. П. А. Дуброўскага) і на зах. ад. Вязьмы (н. з.) чуваць доўгія зычныя.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

хінічы (Збунова, Бедрыцы, Карцава, Мат. для изуч. влр. гов., XI, ст. 52 і наст.)[1]), нарэшце на захадзе ад самай станцыі Сухінічы (гл. Тр. М. К., в. 8, №№ 37а і 37б). Мабыць, і ў Жыздрынск. пав. граніца падвойных зычных адхіляецца трохі на захад ад граніцы *мыю*. Яшчэ А. Нікольскі ў сваім артыкуле аб гутарках гэтага пав. (гл. РФВ., XLVII, ст. 183) заўважыў, што „в значительно меньших размерах подобная ассимиляция наблюдается в жиздринских говорах".

Далей граніца праходзіць на ўсходзе ад паветаў Бранскага (гл. Мат. для изуч. влр. гов., X, ст. 15) і Трубчаўскага (гл. Дурново, Диал. раз., в. 2, ст. 33-34). Павінна яна, ўласна кажучы, прайсьці па тэрыторыі Карачэўскага і Кромскага, але (як і граніца мыю) яна тут вельмі крывая, з шэрагам астравоў па той і па другі бок лініі, што тлумачыцца зьмяшэньнем палех з стараверамі ў гэтых паветах (гл. Зеленін, Влр. гов., ст. 193—195). З матар'ялаў, якія, м. інш., не заўсёды даюць адказ на цікавячае нас пытаньне, можна даведацца толькі аб падвойных зычных у Сомаве (30 в. на поўдзень ад Кром, гл. РФВ., LXXI, в. 2, 347) Кромск. пав. і ў Лаўроўск. вол. Арлоўск. губ. (гл. дасьледв. Буддэ ў 76 т. Сб. ОРЯСРАН., ст. 41). Трохі адхіліўшыся к захаду, граніца праз Дмітраўскі і Сеўскі паветы накіроўваецца ў Льгоўскі. У Іванаўскім гэтага пав. чуваць падвойныя зычныя (Мат. для из. влр. гов., VIII, ст 230). Нарэшце падвойныя зычныя знойдзем і ў Пуцівельск. пав. Курск. г. (Халанскі, Нар. гов. Курск. г., Сб. ОРЯСРАН., LXXVI, № 5, ст. 27)[2]).

Губныя зычныя, у сувязі з іх ацьвярдзеньнем у блр. гутарках не выклікаюць асыміляцыю наступнага *j*; амаль ва ўсіх блр. дыялектах захоўваюцца такім чынам злучэньні губнога з *j*, прычым між імі яшчэ чуваць галосны ірацыянальны гук, блізкі да *ъ*: б'ю, п'ю (=бъju, пъju), гл. Карскага, Блр. II, 1, ст. 367 і наст., а таксама наш „Нарис іст. укр. м.", ст. 58-59.

Што датычыцца злучэньня *р* з наступнымі *j*, дык у блр. дыялектах, ведаючых *р* мяккое (як і ў украінскіх) сустракаецца часам доўгае (падвойнае) *р:* пе*рьр*я, зьвя*рьр*ё.

§ 15. Цьвёрдасьць шыпячых і губных.

Цьвёрдасьць *ц*.

Што датычыцца шыпячых, дык у блр. гутарках шмат агульнага з влр. і укр. Адрозьніваюцца блр. дыялекты ад влр., галоўным чынам, вымаўленьнем *ч*. У працы аб пскоўскіх гутарках (Тр. М. К., в. 8, ст. 7) Н. Соколов зазначае мяккасьць *ч* у Апоцкім пав. Да гэтага магу дадаць, што ёсьць пераходная паласа ня толькі ў паўдн. часьцінах б. Пскоўскай губ., але і ў паўночных мясцовасьцях Віцебскай. Перад мяккімі галоснымі зьяўляецца тут паўмяккае *ч*, вынікам чаго будзе і адпаведная зьмена самага галоснага пасьля гэтага зычнага. У сваім артыкуле аб невельск. і вяліскіх гутарках мы ўжылі вызначэньне *чи*, *че* (Да характар. паўн.-блр. дыял., ст. 7). З нашым спосабам прыблізна супадае спосаб А. Шлюбскага (*чи, чє)*, ужыты ў яго „Мат. па выв.

---

[1]) Беспасрэднага адказу тут, праўда, не знаходзім, але вывад аб адсутнасьці падвойных зычных можна зрабіць на падставе прыкладаў к іншым пунктам праграмы: Стрѣчи*нья*, страже*нья* на 56 ст., дура*чьё*, лоша*дьё*, ст. 58. У гэтых вёсках, аднак, зазначана існаваньне форм *мыю*, *крыю*, гл. ст. 54.

[2]) Ёсьць астравы з падвойнымі зычнымі на влр. тэрыторыі, гл. Селішчева, Диалект. оч. Сибири, ст. 78 і 221-222.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ф. і м. Віцебшч". З гэтай прычыны мы ня лічым, між інш., магчымым складьці карту цьвёрдага *ч* [1]).

Бясспрэчна, што цьвёрдасьць *ч* асаблівага значэньня ня можа мець пры вызначэньні граніц блр. м., бо на паўн. усходзе і на ўсходзе застаецца даволі значная паласа бязумоўна блр. гутарак, ня ведаючых цьвёрдага *ч* (гл. свод. матар. М. Д. К. па Смаленск. г., РФВ., LXII, ст. 198 і наст., адносна ржэўскіх дыялектаў гл. ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 309, адносна мяккіх шыпячых палескіх гутарак Калужаск. губ. гл. Дурново, Диал. к. Кал. г., Сб. ОРЯСРАН., т. 76, а таксама Зеленіна, Влр. гов., ст. 231—233 і інш., аб мяккасьці *ч* у часьціне Бранскага і ў Трубчаўск. пав. Арлоўск. губ. сведчаць запісы проф. Буддэ ў 76 т. Сб. ОРЯСРАН., потым Мат. для из. влр. гов., X, ст. 15, Дурново, Диал. раз. в обл. влр. гов., в. 2, ст. 33—35, нарэшце, адказы з Арлоўск. губ. ў РФВ., LXXI, в. 2, ст. 346 і наст., а таксама „Зам. о гов. некот. селений Брянск. у. Орл. г." Голанова ў тэй самай кніжцы РФВ.). Пасьля сказанага робіцца зразумелай увага ўкладчыкаў Оп. диал. к. р. яз. в Евр. (ст. 103) аб тым, што „мягкость и твердость *ч* не может служить принципом деления блр. говоров на чистые и переходные".

Ацьвярдзеньне губных, вядомае і украінскім дыялектам, знаходзім у блр. мове, прычым частковае ацьвярдзеньне гэтых зычных (а іменна, у канцы слоў: голуб, сем, сып) пашыраецца, здаецца, на ўсю блр. тэрыторыю, пераходзячы нават і на суседнія влр. гутаркі (гл., напр., Мат. для из. влр. гов., XI, ст. 55). Значна меншую часьціну (і іменна паўднёвую) адрэзвае вымаўленьне п'яць, в'язаць, м'ясо (пъjаць, въjазаць, мъjасо), зьвязанае з ацьвярдзеньнем губных у сярэдзіне слоў. Вось прыблізная мяжа гэтай зьявы: на поўначы ад Слуцкай акругі (шэраг н. з.), у тым ліку і на поўн. ад б. Жыцінскай вол. (Сербаў, Белор.-сакуны ст. 67), далей на поўдні ад Асіпавіцкага р. [2]) і ад Бабруйска [3]).

Спусьціўшыся ў паўдн.-ўсходнім кірунку, ізоглёса захапляе б. Рэчыцкі пав. (з Джяражні, 7 в. ад Рэчыцы, н. з., адказ з Мікулічаў, каля Брагіна, Мат. блр., 124), Гомельскі пав. (гл. Раманава, Блр. Сб., IV), нарэшце, Новазыбк., Старадубскі і Сураскі паветы б. Гомельск. губ. (гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 10) [4]).

Што датычыцца вымаўленьня старага *ц*, дык тут граніцу паміж цьвёрдым і мяккім *ц* трэба шукаць ужо на поўдні: як вядома, значная большасьць усх.-укр. дыялектаў ведае *ц* мяккое.

Ізоглёсы гэтай зьявы мы недаем, бо амаль уся яна выходзіць з поля нашага зроку. Магу толькі зазначыць, што на самым поўдні дасьледжанага намі раёну (а іменна, ў Тураўскім, у Нараўлянскім р. р., у Лукаедах б. Рэчыцк. пав., у Няданчычах і Плёхаве б. Чарнігаўск. губ.) вымаўленьня хло́пе(э)*ць*, хло́п*ця* мы ня чулі.

---

[1]) Тут, як і ў усёй працы, мы ўжываем спрошчаную транскрыпцыю з чыста тэхнічных прычын; „ненавуковага" тут асабліва нічога няма: пакольк літары *а, я, у, ю* і г. д. ужываюцца таксама і для вызначэньня цьвёрдасьці ці мяккасьці папярэдняга зычнага, пастолькі мы лічым магчымым ужыць новыя літары для наступнай галоснай, каб вызначыць новае адценьне папярэдняга зычнага.

[2]) З гэтага раёну зазначаную асабліваясьць ведае толькі паўдн.-ўсходні куток (Ст. Тарасавічы, н. з.).

[3]) У Брожы, Карпілаўцы, г. зн. на поўдзень ад Бабруйска, пануе ўжо пъяць, мъясо.

[4]) У большасьці тых самых гутарак, калі перад губным стаіць яшчэ зычны, гэты губны проста зьмяняецца на цьвёрды, чым усуваецца злучэньне двух зычных з наступным *j*: чацьв*о*рты; цьв*о*рды; дзьв*о*м. Апошні прыкл. запісаў С. М. Некрашэвіч у Слабодцы-Парыцк. р.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

§ 16. Мена *ц* і *ч*.

Ізоглёса *ц* і *ч*, ці гэтак званага цоканьня і чоканьня, хоць яно раней займала і большую тэрыторыю [1]), усё-ткі бо́льшай сваёй часткай ляжыць у краіне паўночных вялікарусаў. Гэтая акалічнасьць дала нават Шахматову падставу лічыць даную асаблівасьць вынікам уплыву паўн.-влр. падмовы (Оч. др. п. ист. р. яз., ст. 318). Ізоглёса цікавячай нас адзнакі паўн.-блр. гутарак і цяпе́р прадаўжае перасувацца на поўнач, бо ў большасьці мясцовасьцяй паўночнай Віцебшчыны і Смаленшчыны яна зьнікае ў мове малодшых пакаленьняў жыхарства.

Граніца цоканьня [2]) (*ц*орт, ні*ц*ога) праходзіць (гл. карту № 8) недалёка ад Себежу з паўднёвага боку (в. п. Грыневіча). Зусім не знаходзім яго зразумела і ў бліжэйшым да Себежу Асьвейскім раёне Полацкай акругі (в. п. настаўніцы в. Стрэлкі з гэтага раёну [3]). Адсюль, г. зн. прыблізна ад Себежу граніца ідзе (на поўн. ад Забулдычына, гл. зап. Шлюбскага) на ўсход, потым, увайшоўшы ў Невельскі павет, паварачвае на поўнач [4]). Такім чынам, апошні павет амаль зусім ня ведае цоканьня; ён як клінам урэзваецца ў цокаючую краіну. Магчыма, што раней цоканьне ў гэтым павеце было больш пашырана, але, дзякуючы эканомічнай сувязі з Ленінградам, якая ўплынула на гутаркі Невельск. пав., мы ў большай па разьмерах цэнтральнай часьціне ня бачым ужо гэтай зьявы. Толькі зноў мы яе зможам знайсьці ў паўдн.-ўсходнім кутку. Пералічу шэраг вёсак (у кірунку на Вяліж), у якіх зьяўляецца зноў цоканьне і чоканьне: Будніца, Лёхава, Фралы, Макаркі, Гарадзец, Задняе Сяло, Захлеўнікі, Бубаніна, Альшуціна, Цурылава, Рындзіна, Пахомавічы, Барнавалова. Апошнія некалькі вёсак належаць ужо да Вяліскага пав. [5]) (Усьвяцк. вол.), які цоканьне (і чоканьне) пакрывае усьцяжнай паласой. Адзначу яшчэ некаторыя пункты з гэтага пав., у жыхароў якіх я адзначыў цікавячую нас зьяву—Сярцея, Цэпля і Пагарэльле Селязьнёўск. вол.; Пузанова (2 в. ад Жыгулей) і Доўгавіцы Крастоўскай вол.; Прыхабы Усьмынск. вол.; з Усьвяцк. вол. яшчэ Царковішчы; нарэшце Каракі, Круты, Пацікі, Белагузава Вяліскай вол. У Белагузаве, якое ляжыць на Дзьвіне, на 10 в. ніжэй Вяліжу, цоканьне-чоканьне я адзначыў нават у вымове аднаго прызыўніка.

Цоканьне-чоканьне захапляе трохі і паўночныя часьціны двох паўночна-ўсходніх раёнаў Віцебшчыны—Мяжанскага і Сураскага і то ў мове старых. Раней яно тут было больш пашырана (гл. хоць-бы Д. К. Зеленіна „Описан. рукоп. Учен. Арх. Русск. Геогр. Об-ва", вып. 1, 1914, Віцебск. губ., № 6, П. Пороменский, Этнограф. Сведен. о жителях г. Суража и его уезда).

Зьніканьне цоканьня і чоканьня, галоўн. чын., у мове маладых пакаленьняў, ускладняе справу ізоглёсаваньня данай асаблівасьці, Па які бок граніцы адносіць вёскі, у якіх цокае цяпер толькі некалькі

[1]) Яно адбіваецца ўжо ў ранейшых помніках, напісаных у Смаленску, Віцебску і Полацку.

[2]) Чоканьне (чэрква) на сваёй мяжы не заўсёды супадае з цоканьнем.

[3]) У значнай часьціне Себеск. пав. даная асаблівасьць існуе, гл. Мат. блр., ст. 203 і 214; цоканьне (і чоканьне) цягнецца далей у Пскоўск. губ. (гл. арт. Н. Соколова „Гов. Псковск. губ.," Тр. М. К., в. 8, ст. 6 і 10) і заходзіць нават у Ленінградзкую; гл. арт. Н. Грінковай у XXX т. Изв. отд. р. яз. и сл. РАН., ст. 259-260 і 265.

[4]) У песьнях, запісаных І. А. Сербавым у Усьць-Далысе Нев. пав. (у зах. ч.), цоканьне і чоканьне адбіваюцца.

[5]) Гл. аб гэтым яшчэ ў маім артыкуле „Да характарыстыкі паўночна-блр дыял.", ст. 12; пар. таксама ў артык. Н. Зорына, зборн. „Познай свой край", ст. 41.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

старых; такія пераходныя мясцовасьці мы пакрываем на карце штрыхоўкай, але выкананьне гэтага зьяўляецца вельмі цяжкім.

На падставе даных, якія ёсьць у нашым распараджэньні, далейшая граніца павінна прыблізна прайсьці ў наступным кірунку. Перарэзаўшы З. Дзьвіну прыблізна пасярэдзіне між Вяліжам і Суражам, ізоглёса накіроўваецца далей на поўдзень да р. Касплі, адсюль паварачвае на захад і ідзе прыблізна па гэтай рэчцы. Такім чынам, цоканьне і чоканьне агібае Сураж з суседняю мясцовасьцю. Студэнт Б. Д. У. Іваноў з вёскі Стрыгі (у 10 в. ад Суража, на граніцы Б. С. С. Р. з Р. С. Ф. С. Р.) засьведчыў адсутнасьць цоканьня ў данай вёсцы [1]); пачынаецца яно за Каспляй, тое-ж пацьвердзіў і настаўнік з Пудаці Сураск. р. Арбузоў.

Аб прысутнасьці цоканьня на поўдні ад Касплі (як на тэрыторыі Парэцкага пав. Смаленск. губ., а іменна ў Кашавіцкай воласьці, так і на захадзе ад гэтай мясцовасьці, напр., у Янавіцкім с.-сав. Сураск. р.) мы можам даведацца з розных крыніц. Папершае, мы знаходзім паказаньне на гэта ў „Мат. па вывуч. фолькл. і м. Віцебш." А. Шлюбскага (рецка, прыклюцаіцца ў Кашавічах, цырнабыльніцык, на ўстрецу ў Янавічах). Падругое, у дыялектолёгічным апісаньні мясцовасьці на ўсход ад Віцебску, якое даў нябожчык Нікіфароўскі (у Мат. блр., ст. 137) чытаем: „На сев.-вост. окраине района, где так близко соседство „цокунов", заметно изредка цоканье: цúстый, циловѣк, сѣцка і пр. (сýцка)". Магчыма, што Нікіфароўскі не памыліўся: Янавічы з шэрагам суседніх вёсак (Котава, Красыні, Півавары і інш.) якраз і знаходзяцца ў паўн.-ўсходняй часьціне дасьледжанага ім раёну, але ёсьць даныя аб існаваньні цікавячай нас гукавой асаблівасьці і ў некаторых паўднёвых пунктах зазначанага ў Нікіфароўскага раёну. А менавіта з аднаго з адказаў на влр. дыялектолёгічную програму М. Д. К., апрацаванага П. А. Растаргуевым у артыкуле „Да характарыстыкі беларуск. гаворак" (друкуецца ў I т. Зборн. Аддз. Мовы і Літар.), мы бачым, што цоканьне вядома нават Вялішкавічам (у 12 в. на поўн. ад ст. Лёзна): цай, дацка, цыстый. Ня ведаю, ці адпавядае гэта паведамленьне рачавіснасьці, бо ў тым самым адказе знаходзім некаторыя іншыя, яшчэ менш верыгодныя паказаньні (напр., аб заўсёўдным *р* цьвёрдым, нават аб саканьні).

Што-ж датычыцца лініі Выдрэя-Лёзна (супадае з чыгункай), дык бясспрэчным зьяўляецца, што цоканьне-чоканьне да яе не даходзіць (в. п. загадч. Віцебск. Буд. Прац. Асьв. т. Ратамскага). Але як сьведчыць той самы т. Ратамскі, на ўсходзе ад Лёзны (напр., у Мікуліне Парэцк. пав., у 22 в. ад Лёзны) цоканьне зноў пачынае сустракацца.

Крыніцамі для вывучэньня цоканьня-чоканьня на тэрыторыі Смаленшчыны могуць служыць, папершае запісы Добравольскага ў „Смоленск. этногр. сборн.", далей артыкул Попова, Изв. отд. р. яз. и сл. Р. А. Н. за 1913 г., III, потым адказы на дыялектолёгічныя програмы, нарэшце, вынікі апошняй экспэдыцыі ў Смаленшчыну (у складзе А. А. Шлюбскага і І. А. Сербава). Гэтыя вынікі, праўда, яшчэ рыхтуюцца да друку, але для нашай справы мы будзем карыстацца выпісамі, якія А. А. Шлюбскі ветла зрабіў для нас (захоўваюцца ў Дыялектол. Каміс. ІБК пад № 18).

У зазначаным артыкуле Попов (ст. 266) гаворыць наступнае: „Цокание идет к северу от Духовщины к Бельск. у. и к Поречскому, между которыми врезается клин, протянувшийся на десятки верст к

[1]) Між інш., „цыкуноў" з-за Касплі жыхары Стрыгі называюць „сякамі".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Псковской губ. (между проч., сюда входит и большой округ Щучья озера, где по Добровольскому цоканье только „ослабевает"), совершенно не знающий ни цеканья, ни чеканья. Следует объяснить это родственн. близостью с Великолуцкими говорами, с которыми данный говор принадлежит к общей групе аканьня. Этот клин граничит с юга около с. Кирякина, Бердяева с так величаемыми „волозьськими цекунами (Духовщ. у.)".

Справа, аднак, стаіць ня зусім так. Кліна паміж Парэцк. і Бельск. паветамі няма. Няма перашкод к таму, каб зьвязаць цоканьне ў Парэцк. і ў Духаўшчынск. паветах усьцяжнай паласой, паўднёвая граніца якой пройдзе трошкі вышэй ад Інкава (знаходз. прыблізна ў 15 в. на паўдн.-ўсх. усход ад Мікуліна, аб адсутнасьці цоканьня ў Інкаве гл. Добр., См. Сб., IV, ст. 399, 444 і інш.), але трошкі ніжэй ад Парэчча, цяп. Дзямідава. Згодна з назіраньнямі А. Шлюбскага цоканьня амаль няма на шляху з Смаленска на Парэчча (напр., няма ў Ілаўцы, у Акатаве), пачынаецца яно толькі за некалькі вёрст да Парэчча—у Бабаеўцы і Сямёнаўцы.

Ідучы далей прыблізна ў усходнім кірунку, цікавячая нас ізоглёса праходзіць, мабыць, недалёка на поўначы ад Духаўшчыны.

Пытаньне аб усходняй граніцы зазначанай паласы вырашаем прыблізна; гадаем, што цоканьне недалёка ідзе на ўсход ад Духаўшчыны. Больш высьветлена паўночная граніца апошняй паласы. Калі, запраўды, на поўначы ад Вяліск. пав., г. зн. ў Вялікалуцк. пав. таксама няма цоканьня, тады паўночная граніца смаленскай паласы цоканьня будзе ўласна пряцагам граніцы паміж цокаючымі вяліскімі і няцокаючымі вялікалуцкімі і таропецкімі дыялектамі [1]). Перасякае гэтая граніца цоканьня прыблізна пасярэдзіне лінію Вяліж-Шчуч'е возера. У Петрачатах (в. 15 на зах. ад Шчуч'я), у суседней вёсцы Ельшы, нарэшце ў Шчуч'ім (на возеры таго-ж імя)—цоканьня няма (зап. А. Шлюбскага). І па шляху адсюль на Белы—у Храставе, —в. 10 на паўдн. ўсх. ад Шчуч'я возера (і ў суседніх вёсках—Балі-хіне, Падвязьзі), Чычатах (в. 20 на ўсх. ад Шчуч'я возера) цоканьня няма. На поўдзень ад гэтай лініі даная асаблівасьць скрозь пашырана —на поўначы ад Парэчча (гл. зап. Шлюбскага ў часе экспэдыц., а таксама ў яго „Мат. па вывуч. фолькл. і м. Віцебшч.", напр., зап. з Крутога; у Бародзінск. вол., гл. Тр. М. К., РФВ., LXII ст. 200—201), у Рыпшынск. вол., гл. Шэйна, Мат., т. 1, вып. 1, ст. 490, у Нізе (7—8 в. на паўдн. зах. ад Петрачат, зап. А. Шлюбскага пад № 18), далей у Каракіне, Бярдзяеве, у Ст. і Нов. Вёртцы, у Шаболтаве і Трунаеве—усе яны ў некалькіх вярстах на поўдз. ад Баліхіна і Падвязьзя, і ў іншых пунктах паўночн. часьціны Духаўшчынск. пав.—у раёне Прачыстага (у Добравольскага, См. Сб. I, ст. 713: асирцали, але большасьць запісаў з Прачыстага ў II і IV т. т. не адбівае ўжо цоканьня [2]); аб належнасьці Прачыстага да цокаючых дыялектаў гл. Тр. М. К., РФВ., LXII, 198—199 і 206), у Берасьнёве (гл. Добр., См. Сб. IV, ст. 99, 125, 136, 164, 212, 263 і інш.), у Шылавічах (на паўн.-ўсх. усх. ад Берасьнёва, гл. Добр., См. Сб. IV, ст. 391, 406 і інш., а таксама РФВ., LXII, 198—199 і 206).

На поўначы ад гэтай лініі цоканьне амаль што зусім ня існуе.

---

[1]) Аб рэдкасьці зьмяшэньня *ц* і *ч* у вялікалуцк. гутарках і аб адсутнасьці гэтага зьмяшэньня ў таропецкіх гл. Тр. М. К., РФВ, LXI, ст. 16—17 і 20—21. Няма зьмяшэньня *ц* і *ч*, напр., у Ўсьцесёлавае Тароп. пав. (на зах. ад воз. Дзьвіньня), а таксама ў Марыпчэлках Вялікал. п., гл. *Дурново* і *Ушакова*, Хр. по влр. диал., ст. 141—143.

[2]) Мусіць, хістаньнем у запісах Добравольскага выклікана супярэчнасьць у акад. Соболевскага, Опыт. р. диал., ст. 76.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Няма яго ў шэрагу вёсак Гарадзкой воласьці—у Несьцераве, Панаве, Вышагор'і, Пушкарох, Аўдзееве, Пятрушыне (гл. РФВ., LXII, ст. 198—199 і 202), у Анціпіне (в. 25 на паўн.-ўсх. усход ад Белага, зап. А. Шлюбскага), далей у Шопатаве (гл. Добр., См. Сб., розныя тамы; на паўн.-ўсх. поўн. ад Белага), нарэшце ў шэрагу вёсак (Мяшкі, Драгачэва, Косьціна) каля станц. Земцы, на паўн. зах. ад Белага (гл. РФВ., LXII, ст. 198—199 і 202), у Барысёнках (пасярэдз. між Земцамі і Шчуч'ім, н. з.) і далей у кірунку на Таропец і Вялкія Лукі.

Перарэзаўшы разгледжаную Вялікалуцка-Таропецка-Бельскую паласу ня цокаючых дыялектаў, мы ў паўн.-ўсходн. часьціне Бельскага пав. зноў пападзем у паласу цоканьня, у якую ўваходзіць, паперш., Мастоўская [1]) і Панікольск. (Шэйн, Мат.) воласьці Бельск. п., падруг., сумежныя воласьці Ржэўск. пав. (Аленінская і інш., гл. арт. Н. П. Грінковай у ИОРЯСРАН, XXXI, ст. 308—309). Адносна самай крайняй паўночнай часьціны Бельск. пав. ў нас няма, як мы ўжо казалі, дакладных ведаў. Ведаем, што цоканьне і чоканьне там павінны існаваць, пераходзячы на суседні Асташкаўскі пав., гл. РФВ. LXXI, в. 2, ст. 339. Граніца паміж няцокаючымі бельскімі гутаркамі і цокаючымі бельска-ржэўскімі праходзіць з паўночн. кутка Бельск. пав. ў паўдн.-усходнім кірунку, захапляючы ляжачы на поўдзень ад Ржэвы Сычэўскі пав.; у ім, калі ня цяпер, дык прынамсі гадоў 30 таму назад цоканьне існавала (гл. запісы з Хоцькава ў Добраволькага, См. Сб. II, ст. 263, перадруков. ў Хрестом. по влр. диал. Дурн. і Ушак. ст. 144).

Па-за межамі разгледжаных астравоў цоканьня, здаецца, ёсьць яшчэ невялікі цокаючы астравок у Красьненск. пав., на поўдні ад чыгункі Ворша-Смаленск. На гэта ёсьць, паперш., паказаньні ў лісьце Добраволькага да акад. Соболевскага (гл. працу апошняга, Опыт русск. диалектол., 1897 ст. 78—79, ув.); засьведчыў існаваньне данай асаблівасьці ў Зьверавіцк. вол. і т. Караль (у Смаленску).

У некаторых цокаючых гутарках узьнікае гэт. званае соканьне: замена *ц* праз *с*: *с*ар, купе*с*, гл. Зеленіна, Влр. гов., ст. 218—221.

Вельмі абмежаванымі зьяўляюцца дыялектычныя тэрыторыі, у якіх зьмешваюцца *з* і *ж*, *с* і *ш*.

§ 17. Пераход *л* у *ў*.

Пераход *л* у *ў* [2]), які ў беларускіх і украінскіх гутарках зьяўляецца ў тых выпадках, калі за *л* справедку ішла зычная *(вълкъ > воўк)*, а таксама ў формах прошлага часу, мог-бы разам з іншымі моўнымі адзнакамі, служыць падставай для азначэньня граніцы паміж блр. і влр. мовамі, калі-б зноў справа не ўскладнялася нясупадзеньнем ізоглёсаў зьяў, якія адрозьніваюць блр. гутаркі ад вялікарускіх. Калі мы возьмем, напр., хоць-бы граніцу пашырэньня *мыю* (або *мэю*), мы пабачым, што тэрыторыя гутарак, ведаючых даную асаблівасьць, значна шырэй ад тэрыторыі пашырэньня воўк, пашоў. Пераходзім да адзначэньня ізоглёсы апошняй зьявы (гл. карту № 9).

Паўн.-заходні пункт цікавячай нас ізоглёсы знаходзіцца прыблізна на паўночным захадзе ад Себежа. Можна думаць, што тэрыторыя пашырэньня *воўк* (на працягу Себеск. пав.) нідзе не ўваходзіць у паўднёв. паветы быўш. Пскоўск. губэрні. Наадварот, калі верыць адказу № 26 (Мат. блр., 201—207, пар. таксама Карскага, Блр., II, I, ст. 401)

[1]) У ёй кажуць: „пастаў сьвецку на верхнюю раскарэцку", зап. А. Шлюбскага, гл. адк. № 18.

[2]) Фонэмаю *ў* мы аб'ядналі два розных гукавых адценьні, якія могуць зьяўляцца ў гутарках, а ўласна, *у* нескладовае (*u̯*) і *в* двухгубнае (*w*).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

і калі гэты адказ не ўстарэў, данай гукавой асаблівасьці ня ведае нават часьціна самага Себеск. пав. (а іменна быўш. Магільнянская вол.) [1]).

Таксама тэрыторыя пашырэньня воўк, пашоў не захапляе і паўночнай часьціны Невельскага пав. Волк, жолтый, дóлга, далжон, хадзіл, пашол я чуў ужо ў вёсках каля станц. Маева (у Мікуліне, 7 в. на поўдзень ад Маева, у Спасьцеры—2 в. на поўдз. ад тэй-жа станц., у самым Маеве, далей у Бурцаве—7 в. на поўнач ад Маева), прычым ня толькі ад мужчын, мова якіх значна зрусыфікавалася, дзякуючы эканомічнай залежнасьці Невельскага пав. ад Ленінграда (гл. наш артыкул „Да характарыст. паўн.-блр. дыялектаў. Гутаркі Невельск. і Вяліск. паветаў, 1926), але таксама ад жанчын і дзяўчат [2]).

Далей ізоглёса воўк пройдзе недалёка ад Нова-Сакольнікаў. У вёсках на поўнач ад гэтай станц. (у Смалёве—5 в. ад Н.-Сакольн., н. з., у Гвоздаве—каля Горак—10 в. на поўнач ад Н.-Сакольн. і 15 в. ад Вялікіх Лук. н. з., далей у Бародзіне—12 в. ад Н.-Сакольн., в. п. настаўніка К а р н а у х а в а), бязумоўна, пануе вымаўленьне волк, пашол, у Старых-жа Сакольніках, потым у Барыскаве (на гран. Ст. Сакольн. і Трыхалёўск. вол., в. п. наст. К о л е с о в а), у Малінкіне (7 в. на поўдз. ад Н.-Сакольн., в. п. настаўн. К а р н а у х а в а), а тым больш зразумела ў Ізочы і ў Ізочанскай вол. Невельск. пав. (н. з., гл. „Да характар. паўн.-блр. дыялектаў. Гут. Невельск. і Вяліск. пав.) зьяўляецца ўжо воўк, пашоў.

У сваім артыкуле аб гутарках Пскоўскай губ., складзенай на падставе „Материалов для изучен. влр. говоров", а таксама адказаў на праграму М. Д. К. і інш. матар'ялаў (гл. Тр. М. К., вып. 8) Н. С о к о л о в заяўляе, што ў пскоўскіх гутарках „л твердый всюду сохраняется и никогда не переходит в ў или в" [3]). Але дакладна азначаючы граніцу паміж воўк і волк, мы бачым, што апошняе вымаўленьне захапляе ня толькі б. Пскоўск. губ., але і паўночныя часьціны Себеск. і Невельск. паветаў, якія раней належалі да Віцебск. губ.

Далей на пэўным працягу ў нас няма неабходных матар'ялаў, і таму мы тут дамо прыблізную мяжу.

Папершае, гэтая мяжа павінна прайсьці вышэй ад паўночнай граніцы Вяліскага пав.: ва ўсіх воласьцях гэтага пав. мы чулі воўк, пашоў (гл. Да характ. паўн.-блр. дыял.). Аднак, воўк не пашыраецца далей на поўнач ад Вялікіх Лук. Ужо ў 1898 г. ў Марыпчэлках, якія знаходзяцца ў 25-30 в. на паўн. ўсход ад данага горада, чуваць было талкую, купіл (гл. Жив. Стар., 1898, в. 1, а таксама „Хрестомат. по влр. диалект." Д у р н о в о и У ш а к о в а, 1910, ст. 141-143). Тое-ж і ў Баранецка-Азярэцкай вол. Тароп. пав. (на паўдн. ўсх. ад Марыпчэлак), гл. РФВ LXI, в. 1, ст. 28-29.

Азначаючы далей цікавячую нас ізоглёсу, мы бачым, што яна пройдзе вышэй б. Парэцк. п. (цяпер Дзямідаўскага) Смаленскай губ. Воўк, пашоў мы чулі ў Вяліжы ад сплаўшчыкаў лесу з Прохарына (Шчучай воласьці), якое знаходзіцца на паўн. зах. ад г. Белага, у тым мейсцы, дзе Обша ўцякае ў Мяжу. Існаваньне воўк, пашоў у Бельскім

[1]) У вёсцы-ж Чарнея таго-ж пав. (4 в. ад Себежу) мы знаходзім ўжо даў, быў, поўный і інш. (Мат. блр., ст. 213).

[2]) У больш паўднёвым Трыхалёве (в. 22-23 на поўдзень ад Маева) у мове жанчын пераважае ўжо воўк, хадзіў.

[3]) Як ілюстрацыю пскоўскіх гутарак гл., напр., № 40а (з Ельна-Ровенск. вол. Холмск. пав.) і № 43 із Тарапацецкай вол. таго-ж павету, у 30-40 в. в. ад ст. Таропец), надр. ў РФВ. за 1916 г., № 4, а таксама ў Тр. М. К., в. 8, або адказы з Галібіцк. і Зуеўск. валасьцей Холмск. пав. (прыблізна ў 40 в. на паўдн. зах. ад Холма), гл. Тр. М. К., Р. Ф. В. т. LXVIII, ст. 5-7.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пав. даводзіцца, папершае, запісамі Добравольскага ў яго „Смоленск. Этнограф. Сборн." [1]), падруг., адказамі на дыялект. прогр., патрэц., некаторымі запісамі Шэйна, нарэшце паказаньнямі В. М. Попова ў артык. „Замечания о северно-смоленских и ржевских говорах" (Изв. Отд. Р. Яз. и сл. Р. А. Н., 1913, т. XVIII, кн. 3-ая ст. 220, 235-236, 251 і інш.); аўтар яго праехаў Бельскі пав. да ст. Земцы (б. Рыга-Маск. чыгункі) [2]). Але ў нас няма даных адносна таго, ці сустракаецца цікавячая нас асаблівасьць і на поўначы ад зазначанай чыгункі, г. зн. у самай поўночнай часьціне Бельскага пав. Ведаем толькі, што яна ёсьць каля ст. Земцы (у вёсках Мяшкі, Драгачэва, Косьціна, гл. Тр. М. К., РФВ., LXII, 198) і можа захавалася і на поўн. ад ст. Маставая ў Панікольск. вол., гл. Шэйна, Мат. для из. б. и яз. р. нас. с.-з. кр., I, ст. 118-120, II, ст. 521-522 і інш.

Трохі лепш стаіць справа з высьвятленьнем паўн.-ўсходн. дзялянкі нашай ізоглёсы. Гутарцы аднаго з пунктаў Ржэўск. пав. [3]) прысьвечаны адказ № 33 на прогр. М. Д. К. (гл. Тр. М. К., в. 8, ст. 26). З слоў гэтага адказу („только иногда: вовк или воўк") можна зрабіць такі вывад: калі не праз самую Селішну, то ва ўсякім разе недзе недалёка ад яе і праходзіць граніца пашырэньня воўк. Але асабліва карыснай у справе вывучэньня ржэўскіх гутарак можа быць новая праца Н. П. Грінковай „Говор тудовлян Ржевского уезда" (ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 303 і наст.). Дасьледжаны Грінковай раён (вёсак б. б. Моладатудзкай, Бурцаўскай, Замошынскай і Пыжэўскай валасьцей) знаходзіцца недалёка (прыбл. на ўсход і трошкі на поўнач) ад успамянёнай Селішны. Гаворачы аб адносінах даных мясцовасьцяй да зьмены *л* у *ў*, дасьледчыца заяўляе: „весьма сомнительным является указание В. М. Попова на распространение ụ в данном положении в этом говоре. Вернее, что указанный переход *л* в *ў* относится скорее к смоленским говорам, а к ржевским—приведенные им случаи сохранения *л* в данном положении". (ст. 308). Цікава, аднак, што матар'ялы 50-х г. г. прошлага стагодзьдзя сьведчаць аб тым, што ў тыя часы зазначаныя ржэўскія гутаркі ведалі яшчэ *ў* замест *л* (ibid) [4]).

Не дашоўшы да Ржэвы, ізоглёса воўк паварачвае на паўдн. ўсход, потым на поўдзень [5]).

Ідучы ў такім кірунку, граніца паміж воўк і волк адхіляецца паступова ад чыгункі Ржэва-Вязьма. У запісах з Хоцькава Сычэўск. пав. (гл. Добр., См. Сб., II, ст. 261 і наст. і IV, ст. 455-460, 465-466) і з Цёсава таго-ж пав. (гл. См. Сб. IV, ст. 14, 439, 460 і 262-63), мы чытаем купил, шолкам, шалкоў і інш. [6]); выбралъ, ударилъ і ў Навасельлі Вяземск. пав. (См. Сб. IV, 214). Прыблізна на некаторай адлегласьці далей граніца праходзіць недалёка ад Дняпра. На паўн. зах. ад Вязьмы—

---

[1]) Шопатава, Белякова і інш. пункты. у якіх зроблены Добравольскім запісы, знаходзяцца на поўдзень ад быўш. Рыга-Маск. чыгункі. У Шопатаве, м. інш., знаходзім ужо хістаньне паміж *л* і *ў* (пар., хоць-бы См. Сб. I, 331 і наст., 348 і наст.).

[2]) Цалкам, аднак, паказаньням В. М. Попова, як мы пабачым далей, нельга давяраць.

[3]) А іменна, в. Селішны, 12 в. на поўн. ад ст Аленіна чыгункі і 50-60 в. на захад ад Ржэвы.

[4]) У разгледжаных ржэўскіх гутарках (гл. ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 307-307), як і ў вышэй успамянёных Себеск., Невельск., Вялікалуцк. і Таропецк.паветах, побач з волк пашол, захоўваецца, аднак, крыю, мыю.

[5]) У запісах саміх песень А. Шлюбскага з Макарава *л* пераважае (19 прыкл. на 9 прыкладаў з *ў*, прычым яшчэ некаторыя з гэтых 9 прыкл. трэба аднесьці за рахунак самога запісчыка), у той час як у песьнях з Анціпіна мы знайшлі 2 прыкл з *л* пры 40 з *ў*.

[6]) Цёсаўская вол. знаходзіцца на паўдн. ўсход ад Сычэўкі, на ўсход ад чыгункі Ржэва-Вязьма.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ў Прыгарадн. вол. (у вёсках Усевалодзкае, Паршукі, Обухава і інш.) і ў Хмеліцкай (в. п. П. А. Дуброўскага, загадчыка Вяземск. музэю) і на зах.—ў Ізьдзешкаўск. вол. (н. з.) *л* на *ў* не зьмяняецца. Як мы даведаліся ў Ізьдзешкаве, ізоглёса праходзіць недзе паміж гэтай вёскай і Дарагабужам [1]).

Амаль што ўвесь Ельнінскі пав. ведае *ў* з *л* (гл. запісы з розных мейсц у Добравольскага, а таксама Тр. М. К., Р. Ф. В. т. LXII., ст. 200 і 206-7).

У Леташніках Рослаўск. пав. (якое знаходзіцца на паўн. ўсход. ад Радзічаў, недалёка ад граніцы з б. Арлоўск. губ.), здаецца, *л* ужо не пераходзіць у нескладов. *у*. У запісах Добравольскага хістаньне знаходзім часам у аднэй песьні (гл. напр., № 53 на 209 ст.), але пераважаюць прыклады з *л* (гл. хоць-бы См. Сб. IV, ст. 24, 25, 59, 74, 150-151, 210, 261, 262, 264, і наст., 312, 437, 463-464 і інш., ч. II, ст. 191 і наст.).

На ўсходзе-ж ад Ельнінск. пав.—у Жэралеўск. вол. Масальск. пав. (гл. Тр. М. К., 8, № 36), якая знаходз. ў 70 в. ад Рослаўля і ў 40 в. ад ст. Спас-Дзямянск, потым у раёне самага Спас-Дзямянска (гл. О. Брока, Гов. к зап. от Масальска, ст. 108, а таксама Дурново, Диалект. к. Калужск. г., сб. ОРЯСРАН., т. 76, ст. 18) зьмены *л* на *ў* не знаходзім [2]).

Няма воўк, пашоў і ў Бутчыне Жыздрынск. пав. (якое знаходзіцца ў 55 в. на паўн. зах. ад Жыздры). Трохі падазроным таму здаецца нам паведамленьне паўдн.-влр. прогр. М. Д. К. 18а (гл. Дурново, Диал. раз., I, 2, ст. 34) аб існаваньні воўк у Зімніцах на Драгашанцы (прыбл. ў 20 в. на поўн. ад Жыздры). Але магчыма, што гутарка Зімн. на Драгаш. становіць у даных адносінах востраў,—такі самы, як некаторыя вёскі на паўдн. ўсход ад Жыздры па дарозе к Даліне Церабеньскай (гл. артыкул Нікольскага „Народн. говоры Жиздринск. у., Калужск. губ.", Р. Ф. В. т. XLVII, ст. 177—178, а таксама Дурново, Диал. карта Калужск. губ., Сб. ОРЯСРАН, 76, ст. 21). Абодвы востравы на нашу карту не папалі.

У часе экспэдыцыі гэтага году мы былі ў Цюнінскай і Сешчанск. (у Радзічах, Коханаве) валасьцях Рослаўск. пав. І там таксама мы не знайшлі зьмены *л* на *ў*. Але граніца данай зьявы, як мы там даведаліся, праходзіць недалёка ад гэтых мясцовасьцяй. У вёсках Максімкаве, Разанове, Высокім, Гарохаве, Валконшчыне, Кошкіне, Баранаве (Прыгор'еўск. і Рослаўск. валасьцей) вымаўляюць ужо воўк, шоўк, быў. Значная часьціна Якімавіцкай вол. (на поўнач ад Цюнінскай) таксама ведае ўжо воўк. У было калісьці і ў Красназабор'і Росл. п., гл. зап. Костылёва ў РФВ за 1884 г., № 3.

Зрабіўшы невялікую дугу на паўднёвым усходзе ад Рослаўля, ізоглёса далей трохі адхіляецца к усходу, так што Акулічы (у заходн. часьціне Бранск. пав.) аказваюцца ўжо ў сфэры пашырэньня воўк (гл. артык. Карскага „К вопр. о народн. говоре Брянск. у. Орловск. губ.", Нов. Сборн. стат. по славяновед., составл. и изданн. ученик. В. И. Ламанскага, 1905) [3]). Але да самага Бранску вымаўленьне воўк, пашоў не даходзіць. Так, у Чайкавічах, якія знаходзяцца ў 17 в. на поўн. ад Бранску, воўк, пашоў, ужо ня чуваць (Голанов, Тр. М. К., в. 3 ст. 160, а также Дурново, Диалект. разыск., вып. 1, ст. 20 і в. 2,

---

[1]) Павярнуўшы ад Дняпра на паўдн. ўсход, ізоглёса, захапляе можа паўднёва-зах. часьціну Вяземск. пав., адкуль, магчыма, і паходзяць тыя „богомолкі", над якімі рабіў назіраньні проф. Дурново, гл. РФВ., LXII, ст. 203.

[2]) Далей-жа на зах., каля мяжы Масальск. пав. з Ельнінскім, зазначаная зьява ўжо пачынаецца. М. інш., раней зьмена *л* на *ў* была вядома і сп.-дзямянскім гутаркам.

[3]) Адносна супярэчнасьці паміж паказаньнямі Карскага і запісамі Буддэ з Мужылава тэй-жа Акулівіцк. вол. гл. Зеленіна, Влр. гов., ст. 187—188, а таксама Растаргуева Сев.-блр. гов., ст. 184.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ст. 35)[1]). Па словах А. В. Пруссак, адпаведныя зьмены *л* пашыраны не далей паўн.-зах. часьціны Княвіцкай і не далей захаду Аўстугскай і Фошнянск. валасьцей (гл. Мат. для из. влр. гов., X, Сб. ОРЯС-РАН., XCIX, 2, ст. 21).

Ідучы далей у паўдн.-ўсходнім кірунку, цікавячая нас ізоглёса перарэзвае Трубчаўскі пав. на ўсходзе ад Семца і Уручча, і нават Кокарэўкі і Радуціна, але на захадзе ад Голалобава, якое знаходзіцца ў 17—18 в. на паўн. ўсход ад Уручча, (гл. Дурново, Диалектолог. разыскан., вып. 2, ст. 33—34, а таксама А. К. Сержпутоўскага, Отчет о поездке в Гомельск. губ. в 1926 г., ст. 3-4); прайшоўшы нарэшце на ўсходзе ад Чарніг. губ., яна ўваходзіць у Пуцівельскі пав. Курск. губ., часьціна насельніцтва якога (г. зв. „Горюны" або „егуны с малорусско-белорусскими примесями") [2]), у ліку іншых „малорусско-белоруских" асаблівасьцяй, ведае таксама і *ў<л* у форме прошл. ч. [3]).

Мову гэтых „горюнських" вёсак (Лінова, Нов. Слабады, Колішч і Козіна), якія ў Пуцівельск. пав. займаюць правабярэжжа Сэйму, новы украінскі дасьледчык П. Попов лічыць м. інш., па аснове беларускай (гл. Діялектол. спостереженія на півн.-сходн. кордоні Украіни, Зап. Іст.-ф. Відд. Укр. Ак. Н., т. VII—VIII, паасобн. адб. ст. 3). На левым-жа беразе Сэйму, па думцы зазначанага вучонага, жывуць ужо украінцы.

На гэтым месцы мы пакідаем ізоглёсу зьмены *л* на *ў*, бо ўласна кажучы тут (і нават раней, ужо пасьля Трубчаўск. прыблізна пав.) азначэньне гэтай ізоглёсы пераходзіць ужо ў сфэру пытаньня аб украінска-расійскіх моўных узаемаадносінах.

Па-за межамі ўсьцяжнай паласы дыялектаў з *ў<л* мы знаходзім астравы з такой-жа асаблівасьцю ў Кастрамской (гл. артык. Н. Соколова „Акающие гов. Костр. губ." у 8 вып. Тр. М. К., ст. 19) і ў Валагодзк. і Алонецк. губ. (гл. Опыт. диал. к. р. яз., ст. 21 і 24, а таксама Соболевск., Лекц. по ист. р. яз., 4 выд., ст. 124). Ведаюць нескладовае *ў* з *л* і сібірскія гаворкі, гл. Селішчева, Диал. оч. Сибири, 1921, ст. 46—47.

§ 18. Звонкія зычныя ў канцы складоў.

Згодна з большасьцю украінскіх дыялектаў значная часьціна паўднёва-беларускіх гутарак адрозьніваецца захаваньнем звонкіх зычных у канцы складоў пры розных умовах, г. зн. ня толькі перад наступнымі звонкімі, але таксама ў канцы і ў сярэдзіне слоў прад наступнымі глухімі зычнымі, нарэшце, у абсолютным канцы сказу.

Зусім дарма таму проф. Растаргуеў па поваду захаваньня звонкіх зычных у ўсходн. паветах нядаўняй Гомельск. губ. заўважвае: „Говоры восточных уездов Гомельск. губ. представляют таким образом неизвестное другим белорусским говорам, кроме соседних с украинскими, диалектическое явление" (Гов. восточн. уездов Гом. губ. в их современном состоянии, 1927, ст. 9; пар. увагу редакцыі). Гэта „суседзтва" з украінскімі гутаркамі [4]), як мы пабачым, распаўсюджваецца даволі далёка на поўнач.

---

[1]) Цікава, што і на ўсходзе тэрыторыя воўк менш ад тэрыторыі мыю; апошняя зьява вядома ўжо і дасьледжанаму намі кутку Рослаўск. пав. і Жэралеўск. вол. Масальск. пав., а таксама Чайкавічам Бранск. і Голалобаву Трубч. пав. і інш.

[2]) Гл. Халанскага „Народн. говоры Курской губ.", Сборн. отд. р. яз. и сл. РАН., т. *LXXVI*, № 5, ст. 25—29, а таксама ўзоры мовы.

[3]) Але ў каранёх у адпаведных прыкладах *л* захоўваецца тут, аднак, нязьменным: шалкавый, жолтый і інш., гл. песьні з вёскі Козіна, ibid., ст. 152 і наст. Падобная зьява траплялася нам і ў іншых мясцох, напр., у Валконшчыне Рослаўскага пав.

[4]) Пар. также „Опыт диал. к. р. яз.", ст. 55: „в говорах, непосредств. соприкасающихся с м.-р."

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Пры вырашэньні цікавячага нас пытаньня, м. інш., трэба, адрозьлёс выбуховых звонкіх зычных ад лёсу працяжных звонкіх (а іменна, з, д͡з, ж): мы можам знайсьці во*з*, но*ж* там, дзе побач з гэтым скажуць ду*п*, дзе*т* (зам. дуб, дзед) [1]). Нарэшце, магчыма, што ў некаторых мясцох вымаўленьне звонкіх у сярэдзіне слова не супадае з лёсам звонкіх у канцы сказу [2]).

Паўночная граніца вымаўленьня звонкіх выбуховых у канцы складоў (ду*б*, дзе*д*), як відаць з запісаў А. К. Сержпутоўскага (гл. яго „Сказки и рассказы белоруссов-полещуков", 1911), захапляе паўднёв. часьціну Слуцкай акругі; але да самага Слуцку яна, аднак, не даходзіць; гл. Мат. блр., ст. 19 і 88 [3]). Аб адсутнасьці пераходу звонкіх зычных у глухія ў вёсках Квасынічы, Белічы і Цароўцы (у некалькіх в. на поўдзень ад Слуцку) мы даведаліся і ад нашага быўшага слухача (які цяпер скончыў ужо Б. Д. У.)—т. Бародзіча.

Ня ведаю, ці захапляе ізоглёса цікавячай нас зьявы б. Жыцінскую воласьць, апісаную І. А. Сербавым. Асьцярожны і няпэўны адказ яго на данае пытаньне (Белор.-сакуны, ст. 69—70) выклікае сумненьне. „За исключением свистящих „д̣"* и „т̣"*, шипящего „*дж*" [4]) і полугласного „у" (в),—все согласные произносятся правильно. Прыклад а*п*часáть, побач з боб, дед, а таксама далейшая ўвага аб тым, што „предлог „съ" перед согласными—„б, в, г, ж, з, л, м, н, р, с, т" [5])—обращается в „зъ" заблытваюць трохі справу.

Не даходзіць, бязумоўна, тэрыторыя захаваньня звонкіх зычных у канцы складоў і да Асіпавіцкага р. У шэрагу вёсак гэтага раёну—Карытне, у Ст. Тарасовічах, у самых Асіпавічах, у Замошшы, у Лучыцах, у Смыку-Слабадзе, у Лапічах і інш. мы запісалі гóра*т* (=р. город), гȣ*т* (=год), вȣ*т*ка (=водка), завȣ*т*, ры͡э*т*кі, хлѣ*п*, на расьцярó*п*, пара*п*кі, бȣ*х* (=бог), Пецебý*х* (=Пецербург), бе*х*чы, лы́*ш*ка (=лыжка), нȣ*ш*кі (=ножкі), прывё*с*, але побач з гэтым нам давялося чуць у Лапічах нȣ*ж*, украд*зь*, ня е*дзь* [6]). Прабіваецца часам звонкае вымаўленьне канцовых працяжных звонкіх і ў суседнім Сьмілавіцкім р. (у Дукарцы).

У суседнім з Асіпавіцкім Сьвіслацкім раёне таксама мы назіралі ўсюды зьмену звонкіх зычных на глухія пры зазначаных вышэй умовах. І наогул на поўнач ад Бабруйску нельга знайсьці гэтай зьмены, і таму ў Доўгім (б. Ігуменск. пав.) і ў Гайшыне (б. Быхаўск. пав.), гадаем мы, няма гэтай зьмены. Але, дзякуючы некаторай цяжкасьці дасьледваньня данага пункту фонэтыкі, аўтары адказаў аб гутарках успамянёных вёсак абмежаваліся тым, што яны толькі падкрэсьлілі словы будка, дзѣдъ і наст. (гл. Мат. блр., 115 і 119).

На поўдзень-жа ад Бабруйску (у Брожы, у Карпілаўцы) звонкія ўжо захоўваюцца ў канцы складоў (н. з.). Тое самае і ў Парэччы каля Слаўкавічаў (в п. студ. Адзінца) [7]).

Далей ізоглёса цікавячай нас фонэтычнай рысы праходзіць на поўдні ад Буды Кашалёўскай, але на поўначы ад Рэчыцы. У першай

---

[1]) Пар. Карскага, Белор. II, 1, ст. 356.

[2]) Параўн Карскага, ib., ст 335 і наст. і 354 і наст., а таксама Шахматова, Курс ист. р. яз., літогр. выд. 1911—12, II, 2, ст. 41.

[3]) Зразумела, што тым больш яна ня дойдзе да Узды, гл. Шэйна, Мат. для из. быта и яз. р. нас. с.-з. кр., II, ст. 89—91.

[4]) Гэтымі знакамі І. А Сербаў вызначае афрыкаты д͡з, т͡с (ц) і д͡ж.

[5]) Дзеля таго, што *съ* і *из* даўно ўжо супалі ў беларускіх (і украінскіх) гутарках у *з*, трэба было-б, наадварот, гаварыць аб зьмене *з* на *с* перад наступнымі глухімі зычнымі.

[6]) Гл. наш арт. „Да характарыст. цэнтр.-блр. дыялектаў".

[7]) Няпэўнасьць і ў адказе з Камаровічаў і Запольля (бутка, опцѣсáць, але дзѣдъ, бобъ); пар., аднак, зап. Сержпутоўскага з гэтых вёсак.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

мы запісалі бѣх (=бог), навёс; у вёсках-жа, блізкіх к Рэчыцы (у Бронным, у Дзяражні) мы чулі нізка, пуд, гѣд, з зуб сваіх, лѣжка (=рас. постель) і інш. І зноў выклікае вялікае сумненьне паведомленьне аўтара адк. № 17 (гл. Мат. блр. ст. 124) аб тым, што ў Мікулічах б. Рэчыцк. пав. (вёска гэта знаходзіцца ў 5 в. ад Брагіна, г. зн. далёка на поўдзень ад Рэчыцы) чуецца вымаўленьне бутка, дзет і г. д.; мы скрозь на поўдзень ад Рэчыцы (ў Крупейках пад Лоевым, у самым Лоеве, у Ст. Ёлчы) адзначалі захаваньне звонкіх зычных у канцы складоў: гразка, гѣд, вязка і інш.

Адсутнасьць пераходу звонкіх зычных у глухія характарызуе, як мы бачылі, і „ўсходнія паветы" нядаўняй Гомельск. губ., а іменна Новазыбкаўскі, Старадубскі, Сураскі і часьць Мглінскага,—якія раней належалі да Чарнігаўск. губ. (гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. Гом. г., ст. 8-9., Сев.-бел. гов., ст. 39 і н., Ант. Полевого, О яз. населен. Новозыбковск. у. Гом. губ., ст. 13). Нарэшце, захоўваюцца звонкія зычныя ў канцы складоў і ў гутарках пуцівельскіх „горюнов", ці іначай „егунов с малор.-блр. примесями", якія жывуць на правым пабярэжжы Сэйма (гл. Халанскага „Нар. гов. Курск. губ.", Сб. ОРЯСРАН., т. LXXVI, № 5, ст. 27).

З прычыны таго, што надрукованыя адказы на програмы ў адносінах да цікавячага нас пункту фонэтыкі даюць няпэўны матар'ял, падругое, з прычыны таго, што не дасьледжана і паўночная граніца данай зьявы на працягу ўсходніх паветаў нядаўняй Гомельск. губ., нарэшце, з прычыны, таго, што магчыма пераходовая стадыя ў зьмене звонкіх на глухія [1]), мы даем прыблізную толькі ізоглёсу данай асаблівасьці, пакідаючы будучым дасьледчыкам перапрацоўку ломанай яе лініі ў крывую. Але ня зусім поўная дакладнасьць гэтай мяжы ня можа ўплынуць на вывады. Мы бачым, што і гэта ізоглёса не супадае з межамі іншых паўдн.-блр. зьяў. Калі яшчэ на захадзе даступнай нашым назіраньням усходняй Беларусі яна можа недалёка праходзіць ад граніцы мула, путай, то затое на ўсходзе яна далёка адыходзіць ад Дняпра (да якога даходзіць зьмена *ы* на *у*), а тым больш ад Прыпяці—ўсходняй мяжы саканьня.

Нельга ізоглёсу данай зьявы параўнаць і з ізоглёсамі „дыфтонгаў" і форм 1 ас. мн. л., як будам, ідом; дзьве апошнія ізоглёсы значна больш пашыраны на поўнач. Вывучэньне географіі гэтай зьявы (як і ўсякай іншай) дапаможа нам таксама разблытаць тыя супярэчнасьці, якія знаходзім у Карскага. Сказаўшы на 354-355 ст. успамянёнай кніжкі аб тым, што „белорусские согласные изглашения не столь слабы, как в великорусском или других славянских языках (кроме, конечно, малорусского и сербского); в некоторых местностях они очень близки к звучным, составляя, так сказать, середину между теми и другими", ён, аднак, крыху далей (на 356 ст.), разабраўшы прыклады з розных матар'ялаў, заяўляе, што „в абсолютном изглашении во всем белорусском наречии существует переход голосовых в безголосые". А ў сапраўднасьці лёс звонкіх зычных, як мы бачылі, залежыць ад мясцовасьці.

§ 19. Намесьнікі гуку г (*g*). Розныя вымаўленьні гуку *х*.

Нядаўна Лер-Сплавінскі (R. SL. IX) запрапанаваў падзяляць усх.-слав. гутаркі не на тры групы, а на дзьве—большую паўднёвую

[1]) У ўспамянён. „Курсе ист. р. яз." Шахматов зазначае звонкія „неполного образования" у становішчы перад глухімі ў гаворцы Барысаўскага пав. (ст. 41).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

і меншую—паўночную [1]). Аднэй з адзнак першай групы, якая ахапляе беларускую і украінскую мовы і падмову паўдн.-вялікарускую, зьяўляецца пераход выбуховага гуку g (будзем вызначаць яго літарай г [2])) у фрыкатыўны (заднянёбны γ або гартанны прыдыховы h). Розьніцу ў вымаўленьні г укладчыкі „Опыта диалектолог. карты русск. яз. в Европе" (гл. ст. 33) і ўзялі, як мы казалі, за аснову пры правядзеньні граніцы паміж блр. мовай і паўн.-влр. падмовай.

Робячы гэтак, аўтары, мабыць, ішлі чыста дэдуктыўным шляхам: яны шукалі зьяву, граніца якой падыходзіла-б блізка к прынятай у навуцы граніцы між блр. і паўн.-влр. Звычайна, базавацца на аднэй асаблівасьці мы ня можам, бо гэта будзе чысьцейшай умоўнасьцю.

Мы ў прыблізных рысах накрэсьлім граніцу паміж выбуховым і фрыкатыўным г. Яна не супадае ні з ізоглёсай мыю, ані з ізоглёсамі такіх зьяў, як цоканьне-чоканьне, якія разам з г (г выбуховым) лічаць адзнакамі паўн.-влр. групы (гл. карту № 10). Трохі набліжаецца яна да ізоглёсы воўк.

Вядомыя нам ужо два адказы з Себеск. пав.—з Магільнянск. вол. і з в. Чарнеі не даюць якраз ніякіх указаньняў адносна характару існуючага ў іх гутарках г (гл. Мат блр., № 26 і № 28). Ёсьць, аднак, падставы думаць, што ў Себ. п. пануе г фрыкатыўнае, бо яго ведаюць і больш паўночныя мясцовасьці, а менавіта, Усохінская і Пятроўская воласьці Апоцкага пав., а таксама мяшчанская гутарка самой Апочкі (гл. артык. Н. Соколова „Гов. Псков. губ." у 8 вып. Тр. М. К., ст. 7).

Далей ізоглёса ідзе на ўсход з некаторым адхіленьнем на поўдзень, так што дзялянка чыгункі між станцыямі Маева—Нова-Сакольнікі аказваецца ўжо на поўначы ад ізоглёсы данай зьявы. Мы чулі ў паўночнай часьціне Невельск. пав. і каля Н.-Сакольнікаў (напр., ад жыхароў, Ст.-Сакольнікаў) гусь, гарá (або гырá), на дарóге і інш. Зазначыў існаваньне выбуховага г у паўночных пунктах Невельск. пав. і Н. Зорін, Познай свой край, III, ст. 39 [3]).

У Вяліскім пав. пануе фрыкатыўнае г; ці захапляе яно часьціну суседняга Вялікалуцкага і Таропецкага пав., сказаць нельга: у адказе з Усьцесёлава (Встеселова), якое знаходзіцца на зах. ад воз. Дзьвіньня (гл. РФВ., LXI), даны пункт застаўся нявысьветленым. У вёсках Бельскага пав. каля ст. Земцы (Мяшкі, Драгачэва, Косьціна, гл. РФВ., LXII, 198-199 і 202) таксама г фрыкатыўнае (γ).

У вядомых ужо нам ржэўскіх гутарках пераважае ўжо г; γ захоўваецца толькі ў мове старых (гл. арт. Попова ў ИОРЯСРАН., 1913, XVIII, 3-я кн., ст. 253-254 і Грінковай у ИОРЯСРАН., XXXI ст. 311) [4]). У Селішне таго-ж пав. адзначана, аднак, γ (Тр. М. К., в. 8, ст. 26). Знаходзім, нарэшце h у запісах песень, зробленых А. Шлюбскім нават у Анціпіне і Макараве.

Куды далей накіроўваецца граніца паміж выбуховым і фрыкатыўным г, покуль што сказаць цяжка. У двух адказах са Старыцкага пав. Цьвярск. губ. (Тр. М. К., в. 8, ст. 28 і 29) даны пункт прапушчаны. Па вусн. паведамленьні П. А. Дуброўскага, быццам г ужо трапляецца пад Гжацкам, на паўн. ўсх. ад Вязьмы.

Зьмяніўшы g на γ (або h), беларусы (як і украінцы) ня ўтрацілі

---

[1]) Гэтую самую клясыфікацыю прымае і Трубецкой, гл. Zeitschr f. sl. Phil. I, 1-2.

[2]) Таму выбар літары г для вызначэньня фрыкатыўн. г у „Сказках и рассказах блр.-пол." А. Сержпутоўскага можна лічыць ня зусім удалым.

[3]) У мясцовасьцях з г фрыкатыўнае г захоўваецца, аднак, у пэўных словах: багатый і некат. інш. Да вядомых у навуцы прыкладаў можна дадаць яшчэ слова Ленінград.

[4]) Сялянка з Кучына Моладатудзкай вол. зазначыла, што наha (а таксама пашоў) гавораць у 7-8 в. на поўдні ад яе вёскі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

аднак, органічнай здольнасьці да вымаўленьня выбуховага *г* (ґ). Ён застаўся ў беларускіх (і украінскіх) дыялектах у некалькіх катэгорыях прыкладаў; папершае, у запазычаных словах—ґанак, ґедз, ґандзюрыць, ґалеґаваць (рас. дружить, ад сл. colle*g*a), санаґо́ґа (=рос. хвастун, Случч.), ґуз (скула), ґрунт і інш., падругое, у выніку асыміляцыі выбуховае ґ можа зьяўляцца з *к* перад наступнымі зычнымі звонкімі: Вяліґдзень, ґ жалезу (зам. *к* жалезу) і нарэшце, у большасьці беларускіх гутарак замест *г* можна пачуць ґ пасьля папярэдняга з: мазґі, розґа, нязґра́бны [1]), плявýзґаць (рос. болтаць). Адпаведна гэтаму ў іншых дыялектах ў некаторых з гэтых слоў (а іменна ў мазґі, розґа) зьяўляецца, відавочна, пад уплывам слоў з суфіксам *-к-* злучэньне *зк*: мозкі, розка (Тураў, н. з. [2]); у выніку асыміляцыі яно можа пераходзіць у *ск*: маскі, роска (гл., напр., адк. № 22—з Нароўлі Мазырск. акр., складзены А. Крукоўскім).

У тых мясцовасьцях, дзе гавораць мазґі, розґа, побач з гэтым фрыкатыўнае *г* захоўваецца ў слове згінуць; тлумачыцца даная акалічнасьць, мусіць ня вельмі моцнай сувязьзю прыстаўкі *з* з наступным дзеясловам.

Шэраг дасьледчыкаў рашуча настойвае на тым, што ў большасьці беларускіх (і украінскіх) гутарак *г* зьяўляецца гартанным. Бязумоўна, розьніца ў адценьні *г* залежыць ад наступнага галоснага: больш глыбокае, гартаннае *h* магчыма толькі перад галоснымі задняга раду; перад іншымі-ж галоснымі артыкуляцыя можа настолькі перасунуцца ўперад, што зьяўляецца ня толькі заднянёбнае *г*, але ў некаторых мясцох нават сярэднянёбнае ‿гінуць, падобна гэтаму і ‿кінуць, ‿хітры) [3]).

У цэлым шэрагу гутарак Менскай, Слуцкай, Бабруйскай і Мазырскай акруг, нарэшце ў дыялекце самага Менску, таксама і *х* перад *а* выразна адрозьніваецца сваёй больш глыбокай артыкуляцыяй (вызначу гэты гук літарай ‿х): ‿хáта, ‿хадзí, ‿хачý, ніхáй. Параўнаць з ім можна *х* у польскіх гутарках, гл. О. Брока, Оч. физиол. славянск. речи, ст. 61.

Гэта ‿х між пасьля галоснага часам пераходзіць у звонкі гартанны: ні*h*áй, за*h*ацéў (р. р. Асіпав. Сьмілав., Койдан. і інш.).

§ 20. Прыставачныя зычныя (і галосныя) перад пачатковымі галоснымі.

Перад рознымі галоснымі ў беларускіх дыялектах могуць разьвівацца розныя протэтычныя гукі *-г* (часьцей усяго гартаннае *h*), *в* і *j*. Пад апошнімі дзьвюма літарамі мы абагульнілі розныя адценьні (пад *в* -губазубны *ʋ*, двагубны *w* і галосны ŭ [4]); пад *j*—зычны *j* і галосны i̯),

[1]) У Тураве ў сэнсе нязґрабны ўжываецца слова нязґрэйны (н. з.).

[2]) Пар. таксама Сербава, Блр.-сак., ст. 67 і А. Полевога, О яз. населения Новозыбк. у. Гомельск. г., ст. 14. Дарма, аднак, аўтар *зк* зам. *зг* у двух прыкладах мазкі, розкі абагульніў як гукавы закон.

[3]) Гартаннае *г* проф. Дурново лічыць настолькі ўласьцівай блр. гутаркам асаблівасьцю. што бярэ яе пад увагу пры высьвятленьні мяжы паміж блр. і паўн.-влр. (Диал. разыск., вып. 1, ст. 20 і інш.).

[4]) Нескладовае *у* (ў=u̯) па большасьці зьяўляецца там, дзе такі гук будзе звычайным і ў іншых становішчах, напр., паміж цьвёрдымі галоснымі (наўат. галаўа, гл. Мат. блр., ст. 213; потым Буддэ, О гов. Тульск. і Орл. губ., Сб. ОРЯСРАН., 76 т.; тое-ж мы чулі ў Тураўскім і Жыткавіцк. раёнах), далей з пачатку слоў замест *в* (ўо̀сем, ўо̀сень, ўас, ўо̀зеро, ўупілі-выпілі, Тур. і Жыткав. р. р., н. з.). Аб тым, што там і *в*> ў у канцы складоў (гадоў, галоўка), няма чаго і гаварыць. М. інш., дзякуючы зьмене *в* на ў, якое потым адпала, зьявіліся ў блр. гутарках ф. ф. азьму, азяў зам. вазьму узяў. Трохі іначай тлумачыў іх Шахматов, Оч. др. п. ист. р. яз., ст. 227-228. Таксама зьявілася, мусіць, і Аршава ў блр. дыялект.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

але там, дзе знойдзем гэта патрэбным, мы будзем адзначаць гэтыя адценьні.

Пытаньне аб прыставачных зычных ускладняецца тым, што ў блр. (які іншых славянскіх) гутарках злучнасьць усіх прыкладаў гэтых зычных становіць спадчыну розных эпох. Апроч найбольш старых *v* (в), *j*, з якіх першы разьвіваўся ў прадгісторычную эпоху прад *й*, *ū*, а другі перад мяккімі галоснымі, у славянскіх гутарках атрымоўвалася яшчэ *v* перад намесьнікамі *o* (у адных дыялектах больш пасьлядоўна, у другіх менш); у влр. гаворках (і мусіць, у суседніх усх.-блр.) разьвівалася *v* (*в*) перад пачатковым *o* з пэўнай інтонацыяй (пар. артык. проф. Долобка ў Zeitschr. f. sl. Phil., III, 1-2).

У тых цэнтральных белар. дыялектах, якія ляглі ў аснову літаратурнай мовы, найбольш пасьлядоўным зьяўляецца разьвіцьцё *в* перад пачатковым *о* (звычайна, націскным, бо ненаціскное *о* ў гэтых гутарках зьмяняецца на *а*); перад іншымі-ж галоснымі хістаньне, якое часам залежыць яшчэ ад папярэдняга галоснага. Вывучэньне пытаньня аб гэтых протэтычных галосных вымагае яшчэ новых матар'ялаў, пакуль-жа што мы абмяжуемся выяўленьнем варыянтаў протэз, пахаджэньне якіх выклікаецца ня розьніцай умоў, а розьніцай дыялектаў. Можна было-б перш за ўсё высьветліць граніцу паміж цэнтральнымі дыялектамі, у якіх пануе прыставачны галосны *в*, і паўдн.-зах. краем блр. тэрыторыі, у якой і перад *о*, *а*, *у* амаль заўсёды зьяўляецца *г* (гл. Карскага, Блр. II, I, ст. 474 475), калі-б гэта краіна была-б даступнай нашым назіраньням у даны момант. Магчымыя дагэтуль спасьцярогі выявілі выразна толькі дыялектычныя розьніцы, абумоўленыя рознымі протэзамі ў падобных словах: ён—яна—яно (або з *в:* вǒн) і гэты (або *е*ты) і г. д.

У сваім „Оп. диал. к. р. яз. в Евр." (ст. 53, ув.) укладчыкі заяўляюць, што „начальное *г* (*h*) в словах: гэтый, гэный, гэтак і др. (от того-же местоименного корня) нужно считать общебелорусским". Гэты ўвайшло і ў літаратурную блр. м., але ў сапраўднасьці ўсходняя часьціна блр. гутарак (і нават трохі бо́льшая, як заходняя) ведае ня гэты, а *е*ты, прычым у большасьці зазначаных усходніх дыялектаў пад гэтым *е* скрываецца якраз злучэньне *je*, а не *jc*. Гэта акалічнасьць, м. інш., яшчэ раз пацьвярджае існаваньне протэтычнага *j* ў блр. дыялектах.

Граніца паміж гэты і *е*ты (гл. карту № 11) на поўдні пачынаецца недалёка ад граніцы Б. С. С. Р. з Польшчай. Часьціна Тураўскага р. (Верасьніца, Малешава, Барок, н. з. у часе сёлеташняй студэнцкай экспэдыцыі ў Тураўск. р.[1]) і часьціна Жыткавіцкага р.[2]) (у Жыткавічах, н. з.) ведае гэты.

Ад Князь-Возера ізоглёса ў паўн.-заходнім кірунку ідзе ў Случчыну; у Старобіне ўжываецца, здаецца, ф. *е*ты (в. п. студ. Скалабана); далей граніца паварачвае на поўнач, так што шэраг вёсак на поўдні ад Слуцка (Квасынічы, Белічы, Чыжоўка, Цароўцы, в. п. быўш. студ. Бародзіча, Агароднікі, н. з. ад сялянкі Параскі Бародзіч[3])) аказваецца на тэрыторыі ф. з. прыставачным *г*.[4]).

---

[1]) У Тураве гэты побач з *е*ты. На самым поўдні (у Радзівілавічах) і на самым усходзе (у Азяранах і Перарове) Тураўск. р. ўжо *е*ты, в. п. удзельнікаў студэнцкай экспэдыцыі—Адзінца і Юрашкевіча.

[2]) У Ляхавічах, што знаходзяцца на беразе Князь-Возера, пераважае, аднак, *е*ты.

[3]) Па яе словах, *г*ето гаворыць нават у Пагосьце, які знаходзіцца у 15 в. на паўдн. ўсход ад апошніх вёсак.

[4]) Прычым гэта г зьяўляецца больш сярэдняпаднябенным; таму мы ужываем наступны спосаб вызначэньня: *г*еты.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Прайшоўшы недалёка на ўсходзе ад Слуцку [1]), ізоглёса пашырэньня гэты накіроўваецца на Шацак; цэлы шэраг пунктаў на захадзе ад гэтай лініі (Баслаўцы і Падлесьсе, гл. Мат. блр., ст. 87, Малышэвічы і Гулевічы, гл. мат. Ф.-Д. кам. І. Б. К., па інв. №№ 195-209, Раманава (цяпер Леніна), в. п. настаўн. Дзян. Жоглы, Старыца, якая знаходзіцца ў некалькіх вярстах на поўн. ад Грозава, в. п. студ. П. Зянюка, далей Нізок Узьдзенск. р., в. п. пісьменьніка Крапівы (Атраховіча), Прысынак, Чурылава і Пясочна таго-ж раёну, в. п. студ. Срэценскага, самая Узда, гл. Шэйна, Мат. II, ст. 89-91 і інш., ужывае форму з протэтычным *г*.

Ідучы ў тым самым паўночным кірунку, ізоглёса ўваходзіць у Самахвалав. р., які і падзяляе на дзьве няроўныя часьціны. У большай па разьмерах заходняй часьціне (з гэты) аказваюцца вёскі Пазьдзеркі, Дубінская Слаб., Кайкава, Гатава, у меншай усходняй (з *е*ты)—Дубовая, Бардзілаўка [2]).

Павярнуўшы на ўсход недалёка ад Менску, ізоглёса цікавячай нас зьявы праходзіць блізка каля граніцы паміж Сьмілавіцкім і Смалявіцкім раёнамі [3]).

Абагнуўшы Чэрвень (б. Ігумен) з паўночн. боку [4]), граніца паміж гэты і *е*ты накіроўваецца далей на ўсход. У Бярэзыні і бліжэйшых вёсках (зах. ч. Бярэзыньск. р.) гавораць гэты (Адк. № 8, наст. Бурвіча [5]), але на поўдні ад гэтага мястэчка (у Вінарове, Божыне, Міхалёве) ужываецца ф. *е*ты (н. з.). Дайшоўшы да р. Бярозы, граніца далей спускаецца трохі ўніз па гэтай рацэ, так што ў Брадзецкім с.-сав. пануе яшчэ гэты (адк. № 9, наст. Ю. Бялініовіча). Па словах-жа М. Касьпяровіча, які сёлета быў у Брадцы, там ідзе барацьба паміж гэты і *е*ты. Такая-ж прыблізна барацьба, якую трэба тлумачыць належнасьцю да пагранічнай паласы, і ў в. в. Ст.-Максімавічы і Ліпніца (адк. № 5). Ізоглёса далей ідзе прыблізна на ўсход; аб контуры яе мы маглі-б ведаць дакладней, калі-б знайшлі адказ на данае пытаньне у Мат. блр. (№ 15, в. Доўгае). Не дайшоўшы да Дняпра (у Мокрым б. Быхаўск. пав. ўжо *е*ты, гл. Мат. блр., ст. 54, ва ўзорах мовы), мяжа паварачвае на поўнач. Мы ведаем аб існаваньні гэты на паўн.-зах. ад Магілева, прыблізна на адлегласьці 40 в. (у Рагачу, Фойні, Ланькаве, Мокравічах Бялыніцк. р., в. п. студ. Скубілава) і нават яшчэ бліжэй у Навасёлках (25 в. на паўн. зах. ад Магілева, в. п. студ-кі Севярʻяновай)—наогул, у гэт. зв. Друцкай гаворцы па падзелу Раманава, гл. яго арт. у I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК [6]).

---

[1]) Мы лічым, што граніца паміж гэты і *е*ты праходзіць цераз самы Шацак або недалёка ад яго, на падставе барацьбы паміж абедзьвюма формамі ў мове данага мястэчка, гл. Мат. блр., ст. 36. У в. Скрыль (Пухав. р.), якая знаходзіцца на паўн. ўсх. ад Шацка (недалёка ад Цытвы) пашырана ўжо *е*ты (в. п. студ. Самсонікава).

[2]) Адносна 1, 2, 3. 5 і 6-й вёсак нас паведаміў самахвалавіцкі настаўнік т. Ламака, адносна 4-й (Гатава) гл. Мат. блр., ст. 31. Па словах т. Радзюка (палітпрасьветчыка ў Карпілаўцы), у Бардзілаўцы побач з *е*ты можна пачуць і гэты.

[3]) Смалявіцкія сьмілавіцкіх называюць „етаўцамі" (в. п. настаўніка Апацкага) Зразумела, што раёны. якія знаходзяцца далей на захад ад праведзенай мяжы (Койданаўскі, Заслаўскі, Астраш.-Гарадзецкі) таксама ўжываюць ф. гэты (н. з.). Дарэчы ўспомнім тут аб тым, што. наадварот, беларусы, ужываючыя гэты, атрымалі ад „етаўцаў" назвы *гэцыкі* або *гэсікі*, гл. арт. П. Кушіна „Гецыки", надрукаваны ў Москвитянине за 1843 г., ч. IV, № 8, ст. 383-412 (азнаёміцца з гэтым артыкулам даў нам магчымасьць Б. М. Ляпунов, якому і выказваем тут шчырую падзяку), а таксама Раманава „Гаворкі Магілеўск. г." (друк. ў I т. Зб. Аддз. М. і Л. І.Б.К.).

[4]) У Дамавіцкім пануе яшчэ *е*ты (н. з.).

[5]) М. інш., ён піша, што *е*ты чуваць толькі ў вёсках старавераў.

[6]) Гэта трапляецца нават за Дняпром у заходн. часьцінах Горацк. і Чавуск. павет аў, ibid.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Прайшоўшы на захадзе ад Воршы, ізоглёса накіроўваецца на Віцебск, так што ўвесь б. Сеньненскі пав., нават яго ўсходняя часьціна—Астровенская і Латыгоўская воласьці, аказваецца ў паласе гэты, як сьведчаць аб тым амаль што ўсе запісы з даных мясцовасьцяй у Блр. Сборн. Раманава. Прайшоўшы на захадзе ад Віцебску [1]), ізоглёса далей паварачвае на паўночны захад. Ідучы ў такім кірунку, яна праходзіць ніжэй ад Гарадка [2]), але вышэй ад Полацку, адрэзаўшы на карысьць тэрыторыі з гэты ня толькі Полацак з бліжэйшымі вёскамі, але і раёны Ветрынскі (Начскі с.-сав., Бабінінскі с.-сав., н. з.), Валынецкі (в. п. А. В. Багдановіча аб гутарцы в. Боркавічы) і Асьвейскі (в. п. настаўніцы Забелінай аб гутарцы в. Стрэлкі) [3]).

Магчыма, што гэта і ў Забулдычыне (каля Альбрэхтава), але ў Арлоўцы, якая знаходзіцца прыблізна ў 10 в. на паўдн. ўсход ад Полацка, ўжо ета (гл. „Мат. па вывуч. фолькл. і мовы Віцебшч.“ Шлюбскага, №№ 27, 28, 48 і інш.). У большасьці Себескага пав. пануе ўжо еты (етат). У песьні, запісанай Грыневічам у Гарбунох (5 в. ад Себежа) чытаем: „етай песенькі канец, пашла бабушка ў танец“ [4]). Етых, еэта (=ета, гл. ув. Карскага) знаходзім і ва ўзорах мовы з Магільнянск. вол.

На захадзе ад апошняй дугі, якую апісвае пасьля Менску цікавячая нас ізоглёса, скрозь пануе гэты. Мы гэты (побач з гэсі) знаходзім у самым паўднёвым—Вушацкім раёне Полацкай акр. (в. п. настаўн. Вурбана), потым у Арэхаўне (б. Лепельск. пав., гл. Мат. блр., ст. 208), далей у розных мясцох Барысаўск. акр.—у мяст. Камень Лепельск. р., в. п. студ. Кляшторнага, у Зембінск. р. (н. з.), у Пагадзіцы (14 в. на ўсход ад Барысава, н. з.), у Ігрушцы (15 в. на паўн. зах. ад ст. Бабра, в. п. студ. Курневіча), у Дакудаве, якое знаходзіцца прыблізна паміж Барысавым і Бабром (падр. адк. № 5, складзены В. Самцэвічам), у самым паўночным—Лагойскім р. Менск. акр. (в. п. студэнтаў Красуцкага і Сяўба) і інш.

З процілеглага боку праведзенай ізоглёсы амаль без выключэньняў пануе толькі еты. Пералічу ўсе вядомыя нам мясцовасьці з еты. Зразумела, што еты(й), етат мы пачуем і ў Невельск. і Вяліск. паветах (н. з.), далей у значна большай часьціне Віцебскай акр. (у Пышніках б. Курынск. вол. (гл. „Крестьянск. свадьба в Витебск. Белорусии“ В. Іванова, Зап. сев.-зап. отд. Русск. Геогр. Общ. кн. III, 1912), (у Сураск. р.) в. п. студ. Іванова і настаўн. А. Арбузова, у Лёзьне, (в. п. т. Ратамскага), а таксама ў большай часьціне Аршанскай акр. (напр., у Саве Шарынск. с.-сав. Горацк. р., запісы Васіля Кавалёва, захоўв. ў Інбелк., у Герасіменках б. Аршанск. пав., гл. Мат. блр., ст. 298 і інш.), у часьціне Магілеўскай (гл. зап. Раманава, в. п. студ. Рыбочкіна аб Благавічах каля Чавусаў) і ва ўсёй Калінінскай акр. (гл. зап. Раманава ў Блр. сб., потым зборнік песень М. Гарэцкага з Меншай Багацькаўкі, якая знаходзіцца ў 25 в. на паўн. зах. ад Амсьціслаўля, друкуецца, етый і ў Канічах Бялынкав. р., в. п. студ. Зайцава); пашырана еты ва ўсходняй часьціне Менск. акр. (у Чэрвенск. р.: напр., у Клінку, н. з., у Горках, в. п. Ул. Юркевіча, у Шасьцівалку, 4 в. на ўсх. ад Горак, в. п. М. Касьпяровіча), у Сьмілав. р., вялікі шэраг розных запісаў, у Пухавіцк. р., таксама і ва ўсходн. часьц-

---

[1]) Вёскі навокал Віцебску (Зубакі б. Шчэрбінск. вол.—на Сеньненскай дарозе, Баравое Бараўлянск. с.-сов.) ужываюць ужо ф. еты (н. з.).

[2]) У запісах Раманава з розных месц Гарад. пав. (напр., з Казьянск. вол., гл. Блр. Сб. VI, ст. 150 і інш.) мы чытаем ужо ета і т. п.

[3]) Па яе словах у Стрэлках часьцей гэтат.

[4]) У Чарнеі, якая знаходзіцца таксама ў некалькіх вярстах ад Себежа (у іншы бок), аднак, ўжо, гэтат, гл. Мат. блр., № 28.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ціне Слуцк. акр. (у б. Жыцінскай вол., гл. Сербава, Белоруссы-сакуны, у Любані, в. п. студ. Лаўрова), далей ва ўсёй Бабруйск. акр. (н. з. з Асіпавіцк., Сьвіслацк., Бабруйск., Буда-Кашалёўск., Глуск. і інш. раёнаў, цэлы шэраг в. п. і інш. крыніц) і ў значнай часьціне Мазырск. акр. (н. з. з Капаткевіцк., Каленкавіцк., Слабадзк., Ельск., Нараўлянскага раёнаў, адносна Петрыкава гл. даволі добры запіс у II т. Мат. для изуч. б. и яз. русск. населен. с.-з. кр. Шэйна (№ 83, хоць ён, як шмат іншых запісаў Шэйна, таксама належыць валасному пісару), адносна еты ў Лельчыцк. р. можна доведацца з запісаў т. Крукоўскага).

Нарэшце тэрыторыя еты, етат пакрывае б. Рэчыцкі пав.[1]) (н. з.), Гомельскі п. (гл зап. Раманава, Блр. сб., О. Курило, Фонет. та деякі морфолог. особлив. гов. с. Хоробричів, зап. З. Радчэнко, зап. Салдаценка з Целяшоў Уварав. вол. і інш.), Новазыбкаўскі, Старадубскі і Сураскі і інш.

На ўсьцяжнай усх.-блр. паласе з еты трапляюцца, аднак, астравы з гэты. Гэта, галоўн. чынам, шляхоцкія вёскі. Так, напр., ва ўсходняй Случчыне і ў Бабруйшчыне шляхта гаворыць гэты, у той час як сялянства ў акружных вёсках вымаўляе еты; гл. падраб. адк. № 3 студ. Замбржыцкага з шляхоцкіх вёсак Бабруйск. акр.

Выдзяляюцца сваім гэты яшчэ Камаровічы і Запольле ў Мазырск. акр. (гл. Мат. блр., 59, а таксама зап. А. К. Сержпутоўскага) і Чыгірынка б. Быхаўск. пав. (гл. Рам., Бел. Сб., т. III), але магчыма, што тут памылка А. Сержпутоўскага, які на ўзор сваёй роднай гаворкі (в. Чудзіна) нівеляваў усе запісы з іншых мясцовасьцяй.

Дзякуючы слабасьці сваёй, j можа лёгка адпадаць; замест яго ў ролі протэзы можа зьявіцца г, і такім чынам, часам у мясцовасьці, дзе пануе еты, можна пачуць і гэты. Так, відавочна, трэба тлумачыць роўналеглыя прыклады етый-гéтый-гэтый у адк. Нікіфароўскага (гл. Мат. блр., ст. 138), прысвечан. мясцовасьці, якая знаходзіцца на ўсход ад Віцебску[2]).

Пытаньне аб усходняй граніцы еты, якое пераходзіць і на влр. дыялекты, пакідаем адчыненым. На поўдні *еты* мяжуе з *сэй, цэй;* апошнія формы можна пачуць ня толькі на поўначы ад Чарнігава (нават у Каменцы), але і ў Ст. Ёлчы і Лукаедах—у паўднёв. часьціне б. Рэчыцк. пав. (н. з.).

„Общебелорусское явление представляет приставочный *j* в jон", кажа акад. Карскі у сваіх „Белоруссах" (т. II, в. 1, ст. 379). Калі лічыць, што расійскі акадэмік мог орыентавацца на ўстаноўленай ім граніцы блр. м., тады трэба вызнаць, што, сапраўды, на тэрыторыі ўсходн. Беларусі мала ёсьць мясцовасьцяй, якія-б ведалі ф. наз. скл. гэтага займеньніка з іншымі прыставачнымі зычнымі (або галоснымі). Але-ж усё-ткі такія мясцовасьці знойдуцца. Формы *вδн* (часьцей *ўδн*= ён), *вона, воно, воны (ўона, ўоно, ўоны)* чулі мы ня толькі ў Тураўск. р. (у Тураве, Верасьніцах, Малешаве, н. з.), але і ў Жыткавіцкім р., г. зн. на поўнач ад Прыпяці (у Жыткавічах і нават у Ляхавічах, н. з.). Але недалёка на захадзе ад Петрыкава граніца паміж *ён* і *вон* (ўδн) пераразвае Прыпяць, так што ў Слабадзкім, Ельскім і Нараўлянскім р. р. мы чуем ужо *ён (jδн), яна (jена)* і г. д. (н. з.). *Ён* даходзіць таксама і да самага поўдню б. Рэчыцкага пав.; пашырана гэта ф. і ў паўночнай часьціне б. Чарнігаўск. губ. (у Каменцы, Няданчычах, Плёхаве, н. з.).

---

[1]) Вельмі падазроным зьяўляецца паведамленьне аўтара адк. № 17 (Мат. блр.,125) аб *гэты* ў Мікулічах Рэчыцк. п.; можа гэта востраў на тэрыторыі еты, але хутчэй за ўсё яно проста не адпавядае рачавіснасьці.

[2]) Там, дзе кажуць еты, можна пачуць і есты зам. гэсты.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Спускаючыся ў паўдн.-ўсходнѣ. кірунку, *ён* даходзіць да гутарак б. Курскай губ. (гл. розн. мейсцы працы М. Г. Халанскага „Нар. гов. Курск. г.“).

На ўсходзе *ён* вядома ў паўдн.-ўсх. гутарках б. Рослаўск. пав., да большасьці-ж вядомых нам пунктаў Калужаск. г., аднак, *ён* не даходзіць (гл. Тр. М. К., 8, № 36, але, з другога боку, № 25-а). На поўначы *ён* настолькі далёка ўваходзіць у тэрыторыю паўн.-влр. дыялектаў (гл. артык. Н. Соколова „Гов. Псковск. губ.“, Тр. М. К., 8, ст. 3, а таксама артык. Н. Грінковай „К вопр. о сицкарях“ і „К диалектол. Ленинградск. губ.“, ИОРЯСРАН., XXX, ст. 237 і 266), што калі-б мы давалі карту пашырэньня *ён*, *яна*, *яно*, давялося-б пачаць яе ад верхняй стараны чатырохкутніка [1]).

Яшчэ адна маленькая ўвага. З прыкладаў слоў з протэтычным *г* трэба выкрэсьліць слова *гарбуз*, якое прыводзіць акад. Карскі (Блр., II, 1, ст. 474), а за ім проф. Растаргуеў (Гов. вост. уездов Гом. губ. в их совр. сост., ст. 12, Сев.-белор. гов., ст. 66). У гэтым слове *г* было ўжо ў татарск. м., адкуль яно было запазычана як блр., так і укр. мовай (гл. Прэабражэнскі, Этимол. слов. русск. яз., s. v.). У мове цяперашніх крымскіх татар гэта слова гучыць нават з пачатковым *к* (гл. Одабаш і Кая. Руководство для обучения крымско-татарскому языку [3], 1926, ст. 165 і 204). Магчыма што і слова Ганна запазычана было з пачатковым г.

§ 21. Іншыя больш дробныя, а таксама менш дасьледжаныя зьявы консонантызму.

а) Значна больш уваходзіць у тэрыторыю влр. гутарак, у параўнаньні са зьменай *л* на *ў*,—зьмена *в* на *ў* пры пэўных умовах і адваротная зьмена *у* на *в* (або на *ў*) пры іншых умовах. Зьмяшэньне *в* і *у* можна знайсьці ў Пскоўшчыне (гл. арт. Соколова ў 8 в. Тр. М. К., ст. 3), нават у шэрагу мейсц Ноўгародзк. губ. (гл. РФВ., LXI, в. 1) і іншых паўн.—і паўдн.-влр. губ. [2]). Ведаем мы аб яе існаваньні і на ўсх. ад Вьязмы (н. з.).

М. інш., на тэрыторыі Мяшчоўск. пав. Кал. г. граніцай паміж гутаркамі, ведаючымі зьмену *в* на *у*, і гутаркамі, няведаючымі гэтага пераходу, можа служыць р. Угра (гл. Дурново, Диал. к. Кал. г., Сб. ОРЯСРАН., 76, ст. 5). Гэтым пакуль што мы абмяжуем нашы ўвагі аб зьмяшэньні *в* і *у*.

б) У артыкуле Раманава аб гутарках б. Магілеўскай губ., які цяпер друкуецца ў I т. Зборн. Аддз. М. і Літ. Інбелкульту, мы знаходзім увагу аб тым, што ў паўднёвых магілеўскіх дыялектах *ж* зьмяняецца на *г* [3]). Падобную зьяву мы знайшлі ў Жыткавіцк. р.: *уге* (зам. ужэ), *ген*—зам. жэн—(гене́ коня, вугені іх у поле), ска́геце (=ска́жаце) [4]). Але мы не адважваемся такую невялікую колькасьць прыкладаў з *г* зам. *ж* абагульніць як гукавы закон, хоць тут скрозь *г* перад *е*. У слове ска́геце *г* магло зьявіцца пазьней, пасьля выпаду *ж* (у блр. гутарках вельмі пашыраны формы *каў*, *ка̀эш* зам. *кажу*, *ка̀жэш*, і нават ку-у 1 ас. адз. л., *куць*—у 3 ас. мн. л.). Такі-ж процэс мог адбыц-

[1]) Між інш., *j* зьяўляецца ў ф. ф. гэтага займ. з пачатковым *i*: jім, jіх і г. д. (гл. зап. Буддэ ў 76 т. Сб. ОРЯСРАН., напр., на 18 ст., потым А. Шлюбскага ў Мат. па выв. ф. і м. Віцебшч.).

[2]) Гл. Опыт диал. к. р. яз. в Евр., ст. 29; пар. таксама проф. Богородіцкі, Кр. оч. диал. и ист. р. яз. (доп. ко 2-му изд. „Общ. курса русск. гр.“), ст. 308.

[3]) З вельмі нязначнай колькасьці прыкладаў Раманава трэба яшчэ выкінуць магом з *г* нефонэтычнага пахаджэньня.

[4]) *Угэ*, *кагэ* знайшоў І. А. Сербаў і ў гутарцы вічынскіх палян (на Цне, у заходн. Беларусі) гл. запісы ў яго „Вічынскіх палянах“ (друкуецца, ст. 33-35).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ца і ў слове ужэ (ужо), тожа вельмі ўжывальным. Што ж датычыцца слова *ген*—зам. *жэн*—, дык тут *г*, відавочна, зьявілася ў выніку контамінацыі з дзеяслов. *гнаць* або з *ганіць*.

в) На крайнім усходзе тэрыторыі, якая зьяўляецца прадметам нашага вывучэньня, трапляюцца гутаркі, у якіх *к* перад глухімі выбуховымі зьмяняецца на *х*: *х* таму (зам. к таму), *х* Пятру, та*х*-та [1]). У лік прыкладаў мы ня ўнесьлі займ. *хто*, уладаючага на славянскім усходзе сваёй вельмі шырокай ізоглёсай. У некаторых з дыялектаў, ведаючых зазначаную зьмену, *к* (мусіць, праз стадыю *г*, г. зн. *г* выбуховага) перад звонкімі выбуховымі зычнымі пераходзіць у *г* фрыкатыўнае: *h* брату (або *γ* брату).

г) Бязумоўна, спорадычны характэр мае зьмена *н* на *м* пасьля папярэдняга *ў*, вядомая нам пакуль што ў двух прыкладах: ваўма́ (у сэнсе „хваля", Сьвіслач Бабруйск. акр., н. з.) і каўме́р (у Ельскім р. Мазырск. акр., н. з.). Між інш., апошняя форма зьяўляецца перахадовай ад блр. *каўнер* (запазычана з польск. м.) к укр. *комір*. Дакладней аб гэтым гл. ў нашым артыкуле „З лінгвістичних розкопин на Білорусі", які друкуецца ў Зборн. на пашану акад. Багалія (Зап. І-ф. В. УАН., XIII-XVI).

д, е, ж) Бязумоўна, нельга назваць дробнымі наступныя тры зьявы консонантызму, дакладнага ізоглёсаваньня якіх, аднак, з розных прычын мы пакуль што яшчэ не даем. Маю на ўвазе, паперш., афрыкату *дж*<*dj*, падруг., шыпячую вымову зьмякчоных сычачых і, нарэшце, ацьвярдзеньне *л* перад наступнымі зычнымі.

Афрыката *дж*<*dj*. Наўпрэкі акад. Сабалеўскаму (Лекц. по ист. р. яз., ст. 141) і акад. Карскаму (Блр. II, 1, ст. 486 і наст., а таксама „Русская диалектология", 1924, ст. 95-96), мы блр. і укр. *дж* ў такіх выпадках, як *хаджу* (укр. *ходжу*) лічым не пазьнейшай зьявай, а спадчынай прадгісторычнай, гэтак званай праславянскай эпохі [2]). Наадварот, прыклады з *ж* замест чаканага дж (галоўным чынам ня ў дзеясловах) зьявіліся, па нашай думцы, пазьней.

Хаджу, *сяджу* не захапляе, аднак, усёй Беларусі. На поўначы (гл. наш артыкул „Да характарыстыкі паўночна-беларускіх дыялектаў", ст. 7) і на ўсходзе (Смаленшчына) афрыката спрошчваецца на фрыкатыўны гук *ж*. У некаторых гутарках злучэньне *ждж*, відавочна, у выніку дысыміляцыі пераходзіць у *жд*: прыежджалі (Тураўскі р., б. Рэчыцкі пав., н. з.). Цікава, як зьявілася ў паўднёвых гутарках прыслоўе *спрэжда* (=раней)? Чуў я яго ў Бабруйшчыне і ў б. Рэчыцк. пав.

Шыпячае вымаўленьне зьмякчаных сычачых.

Базуючыся на паведамленьні невядомага аўтара аднаго рукапісу Бодянскага, акад. Карскі (Блр. II, I, ст. 454 і 457) кажа аб існаваньні шыпячай вымовы сычачых перад мяккімі галоснымі ў аднэй смаленскай гутарцы. У рачавіснасьці, аднак, гэтую фонэтычную зьяву, якую, між інш., нябожчык Шахматов адносіў да „ляшских особенностей" (Очерк др. пер. ист. р. яз., ст. 315-316), можна спаткаць у цэлым шэрагу іншых мейсц Беларусі (параўн. у Карскага той самы том на 15 стар.). Усё, сьвітка, сем, сяло, шэсьць (=шэсьць), памыўся, сёлета, зіма, дзякуй, дзьверы, хочь, віцебскі (=віцебскі) і інш. чулі мы у Вяліск. пав., у Сьмілавіцкім, Койданаўскім і інш. ра-

[1]) Такую зьмену сёлета мы адзначылі ў Рослаўскім і ў Вяземскім паветах Смаленскай губ.

[2]) Дакладней аб гэтым у маім „Н[illegible] історії української мови", 1927, ст. 28-29.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ёнах Менскай акр., у Асіпавіцк., Сьвіслацкім р. р. Бабр. акр., у Слуцкай акр., нарэшце ў паўночн. Чарнігаўшчыне. Радзей гэтая рыса трапляецца ў Мазыршчыне (у Тураўск. р. яна прабілася ў размове ня больш 2,3 раз) і ў б. Рэчыцкім пав. У апошнім (напр., у Крупейках) мы чулі ты*жджэ*нь; але тут дж ня мае нічога агульнага з разгледжанай асаблівасьцю; яно зьявілася з *д* у выніку асыміляцыі яго папярэдняму *ж* (пар. укр. *тиждень*). Адваротная асыміляцыя можа даць ты*здз*ень (Тураў, н. з.).

Наадварот, цікавячая нас фонэтычная зьява даволі далёка пашыраецца на поўнач (гл., напр., артык. Н. Соколова, Гов. Псковск. губ., Тр. М. К., в. 8, ст. 7, а таксама „Опыт. диалектолог. карты р. яз. в Европе", ст. 38), а ў некаторых мясцох і на ўсход (гл. Буддэ, О гов. Тульск. і Орл. г., Сб.ОРЯСРАН, т. 76, ст. 107 і інш.)[1].

М. інш., у выніку разгледжанай фонэтычнай асаблівасьці шмат мясцовых назваў зьмянілася ў народным вымаўленьні: Прата*с*евічы перарабіліся ў Прата*ш*эвічы (Асіпав. р.), Гарба*ц*евічы ў Гарба*ч*эвічы.

Ацьвярдзеньне *л* перад наступнымі зычнымі

Таксама распаўсюджана па ўсёй Беларусі. Аб яго існаваньні гавораць як этнографічныя матар'ялы (Раманава, Добравольскага), так і адказы на програмы (гл. Карскага, Блр. II, I, ст. 396—397). З новых прац А. В. Пруссак (Мат. для из. влр. гов., в. X, Сб. ОРЯСРАН., т. XCIX, № 2, ст. 15) і П. А. Растаргуева (Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 11) можна бачыць, што даная зьява заходзіць далёка на паўночны ўсход—у Новазыбк., Старадубскі, Сураскі і нават Бранскі павет. Яе можна знайсьці нарэшце ў Трубчаўскім (у Радуціне) і Пуцівельскім (у Козіне) паветах, побач з іншымі блр. рысамі: ба*л*шэй, бо*л*на (гл. Дурново, Диалект. разыскания в обл. влр. говор., в. 2, ст. 33—34)[2].

Ацьвярдзеньне *л* не праводзіцца заўсёды: у адным слове *л* можа ацьвярдзець (сі*л*на, во*л*нась(ць), суцэ*л*ны), а побач з гэтым у другім слове, у залежнасьці ад характару наступнай зычнай, можа застацца мяккае *л* (бо*л*ьшы, па*л*ьцы). Між інш., *л* цьвёрдае ў слове пі*л*наваць (з пільнаваць) у некаторых менскіх гутарках замяняецца часам праз *д*: пі*д*наваць. Як і тут, так і ў слове правіднa (зам. правільна) гэта *д* трэба лічыць вынікам якой-небудзь контамінацыі, а не фонэтычнага процэсу.

з) Тут мы да-рэчы ўспомнім яшчэ аб *л* сярэднім, характэрным, м. інш., для значнай колькасьці украінскіх гутарак[3]). Цалкам зразумела, што яго і знаходзім мы на поўдні цікавячай нас тэрыторыі. Чулі яго мы ў Тураўскім і Нараўлянскім р. р., а таксама ў Лукаедах б. Рэчыцк. пав.: kolú[4]), bylú, daleko, selénэ, malécенькі і інш. З прыведзеных прыкладаў відаць, што ў зазначаных гутарках, як і ў большасьці украінскіх дыялектаў з *л* сярэднім, гэты гук зьяўляецца і перад наступным зычным: тȣlкі, бȣlшиі. Нейкая сувязь сярэдняга *л* з этнографічнай бліз-

---

[1]) Зусім іншы характар мае „шепелеватость" у „сялянскіх" гутарках Курск. губ. Там зьмешваюцца друг з другам і цьвёрдыя *з* і *ж*, *с* і *ш*, а таксама замест *ц* зьяўляецца *с*, гл. Халанскага,, Нар. гов. Курск г., ст. 35 і наст., Зеленіна, Влр. гов., ст. 143 і наст. М. інш.. падрабязны агляд розных выпадкаў мены шыпячых і сьвісьцячых дае проф. А. М. Селішчев у „Диялектолог. оч. Сибири", 1921, ст. 190 і наст.

[2]) Ёсьць астравы і на влр. тэрыторыі, пар., напр., Оп. диал. к. р. яз., ст. 20. Дакладней аб дыспаляталізацыі *л* у арт. Я. Станкевіча, друк. ў I т. Зб. Аддз. М. і Л. І. Б. К.

[3]) Ёсьць востраў з *l* (сярэднім) у влр. дыялект., гл. Селішчева, Диал. оч. Сибири, ст. 184—185.

[4]) Праз *l* вызначаю гэта *л* сярэдняе. М. інш.. пасьля *l* зьмянілася і вымаўленьне наступнага галоснага: замест *і* зьяўаяецца бо́льш нізкі і больш задні гук *и*.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

касьцю данай гаворкі да украінскіх пацьвярджаецца яшчэ фактам існаваньня гэтага *л* ў тых якраз дыялектах Жыздрынскага і Ліхвінскага паветаў, у якіх захоўваюцца цьвёрдыя зычныя перад *е*, *і* (*и*). Першыя запісы гэтага *л* з апошніх гутарак знаходзім яшчэ ў Шахматова (гл. Дурново, Диал. к. Кал. г., Сб. ОРЯСРАН., т. 76, ст. 21). Аднак, сярэдняе *л* можна знайсьці і ў матар'ялах з Тульскай губ. (гл. дасьледваньне проф. Буддэ ў тым самым 76 т. Сб. ОРЯСРАН., ст. 15 і наст., 102 і інш.).

і) Успамянем яшчэ аб некаторых процэсах асыміляцыі прогрэсыўнай (дн> нн: сяго*ньн*і, а*нн*а зам. сягодні, адна), рэгрэсыўнай (шч> шш: яшшо, рошша, шшюка=шчука, галоўным чынам, на ўсходзе; больш пашырана слова таварыш<товарищь; сь*ц*>сьс'> с': злось, злосьсі, вол(ь)нась, шэсь), дысыміляцыі (сьс́> сь*ц*: баісьця (=баішся) і інш., дзе няма цеканьня—сьс́> сь*т* [1]); дц, тц> цц> йц: айца, малайца; чц> цц> йц: на рэ*й*цы, сустракаецца, напр., у Фэдэроўскага). Апошнюю зьяву, якая зьвязвае блр. м. з польскай, акад. Карскі ў сваей „Русской диалектол." (1924, ст. 97) залічыў да агульна-беларуск. асаблівасьцяй. Цікава было-б, аднак, прасачыць ўсходнія межы гэтай рысы.

З заходу і поўдню ідзе на ўсход зьмяшэньне прыназоўнікаў і прыставак *из* і *съ*

к) Злучэньні *кы, гы*, (рук*ы*, наг*ы*), якія трапляюцца ў блр. гав., мы ня можам лічыць фонэтычнымі па пахаджэньні, бо ў каранёх яны, здаецца, ніколі не зьяўляюцца.

§ 22. Націск

Навуковае дасьледваньне блр. націску цяпер, калі акцэнтолёгічныя пытаньні прыцягваюць да сябе столькі ўвагі, павінна зрабіцца чарговай задачай для беларускага мовазнаўства. У блр. мове шмат цікавых прыкладаў пераносу націску, потым дыялектычных варыянтаў. На гэтым цяпер я спыняцца ня буду. Скажу толькі аб націску ў він. скл. адз. л. ж. р. такіх слоў, як вада́, нага́, галава́. Адзнакаю блр. гутарак лічаць націск на канчатку ў такіх словах: ваду́, нагу́, галаву́. Але як паўночная, так і паўднёвая граніцы гэтай зьявы, ляжаць на поўначы ад тых ліній, па якіх праводзяць звычайна межы блр. мовы. З аднаго боку, блр. націск—гару́, раку́ (таксама, як і іншыя прыклады: бы́ла, пі́ла, а таксама нікóга, нічóга) мы знойдзем у гэтак званых ср.-влр. гутарках з блр. напластаваньнем (Оп. диал. к. р. яз., ст. 38 і 98—99), але з другога боку, кажуць вóду нóгу, ня толькі ў Тураўскім р., але і на поўначы ад Прыпяці (н. з.); зе́млю, нóгу і інш. знаходзім і ў запісах Сержпутоўскага з Вялікага Рожына, Лучыц і інш. (гл. Сказки и расск. белорусов-полещуков, 1911, ст. 1, 7; пар. таксама Мат. блр., № 10).

Далёка заходзіць такі націск у ф. жан. р. (гару́, ваду́) і на ўсход (гл. арт. Чэрнышова аб мяшчоўскіх гутарках у 5 в. Мат. для из. влр. гов., ст. 235, а таксама адк. з Мяшчоўск. пав. ў XI в. тых-жа матар'ялаў, ст. 56).

---

[1]) Карскі (Блр. II, 1, ст. 457—458) гаворыць аб існаваньньні гэтай асаблівасьці ў віцебскіх і смаленскіх гутарках. Чулі мы яе і ў Смыку-слабадзе Асіпавіцк р. Бабруйск. акр.; С. М. Нэкрашэвіч адзначыў яе ў Пакалічах Парыцк. р.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

III.

Морфолёгія.

А. Скланеньне.

§ 23. Агульныя асаблівасьці ў скланеньні назоўнікаў.

Такімі агульнымі асаблівасьцямі ў скланеньні назоўнікаў зьяўляецца захаваньне ў значнай колькасьці гутарак астаткаў форм парнага ліку і клічнага склону, потым некаторыя адхіленьні ад іншых славянскіх моў у групаваньні слоў па катэгорыях граматычнага роду, нарэшце сьляды зьмякчэньня заднянёбных перад *ѣ*.

З формаў парнага ліку прадаўжаюць сваё існаваньне ў блр. дыялектах наступныя: а) наз.—він. скл. жан. і ніяк. р. р. (дзьве хаце, дзьве сяле; гэтыя-ж ф. ф. зьўляюцца і пры *тры, чатыры*), а можа яшчэ, калі-б згадзіліся з Огіенкам, і ф.ф. таго-ж скл. мужч. р. [1]); б) ф. ф. творн. скл. ад назваў некаторых рэчаў, галоўн. чынам, парных: плячыма, вачыма, вушыма, дзьвярыма; кажуць і грашыма, в) нарэшце, формы родн.—месн. скл.—з ваччу, у ваччу (з *въочию*), з ушшу, у вушшу; трапляюцца яны часам і ў літаратурнай мове, напр., у Цішкі Гартнага (гл. мой артыкул аб яго мове, Полымя за 1926 г., № 5).

Сачыць за географіяй форм парнага ліку вельмі цяжка, бо як архаічныя формы, яны зьнікаюць ня толькі ў краінах, паўзьмежных з влр. мясцовасьцямі, амаль зусім ня ведаючымі парнага ліку [2]),—і ў цэнтральных блр. дыялектах можна побач з *дзьве назе* пачуць і *дзьве нагі* (а часам—нóгі). Апроч таго, ізоглёсаваць трэба было-б кожны з астаткаў парнага л. (ёсьць, напр., дыялекты, ведаючыя *плячыма, вачыма* побач з *дзьве нагі*), і нават кожны з прыкладаў: *грашыма*, напр., пашырана не ва ўсіх гутарках, у якіх ужываюцца ф. ф. *плячыма* і г. д. Гэткім чынам, давялося-б даць атлас, падобны прыблізна да атласу Тэньера, прысьвечанага парнаму ліку ў славенскай мове. Гэта, бясспрэчна, цікава, бо дае матар'ял для вывадаў аб шляхох зьніканьня пэўнай прадгістарычнай зьявы, але мы лічым, што для дыялектолёгіі значна больш значэньня мае вывучэньне лёсу якога-небудзь новага процэсу.

---

[1]) Зап. Наук. Товар., VI. Такія звароты, як *два (тры* і *чатыры) сыны*, ён лічыць спадчынай парн. л. асноў на—*й*. Словы *вочы, вушы* таксама астаткі парн. л.

[2]) Часам, але вельмі рэдка, ф ф. парн. л. трапляюцца і ў влр. гутарках, напр., пуцівельскіх влр., гл Соболевск., Л. по ист. р. яз., ст. 208.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Тое самае прыблізна трэба сказаць аб зьнікаючых формах клічнага склону, але тут неабходна дадаць, што побач са спадчынай ранейшых асноў на—о,—u і—ā (*браце, пане, Яне, сынку, дзе́духно, матко*) у цэнтральных і паўднёвых дыялектах, у дыялектах усходніх ужываюцца новаўтвораныя скарочаныя формы ў сэнсе клічнага склону: *мам, тат, баб, Дунь* (гл. Карскага, Русск. диалектол., ст. 102, Мат. блр., № 18—з Віцебшчыны, П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 15) [1]).

Між інш., зьніканьню клічнага склону ў непаўдн.-блр. дыялектах дапамагае адна чыста фонэтычная зьява (якая ў влр. і блр. можа выклікаць і зьнікненьне ніяк. р.. гор(ь)кая ма́сла). Маю на ўвазе аканьне, пад уплывам якога ф. ф. клічн. скл. шматлікіх асноў на—ā перастаюць адрозьнівацца ад ф. ф. наз. скл.: ма́тка; ой, Лявоніха, ты жонка мая!

Што датычыцца адхіленьняў у групаваньні слоў па родах—варта зазначыць, што шмат якімі з іх блр. гутаркі яднаюцца з украінскімі: мужч. р. пыл, жаль, боль, цэп, палын, сабака, жан. р. па́ра і інш.

Падобна формам парнага ліку і клічнага склону, зьмякчэньне заднянёбных перад рэфлексамі быўшага ъ становіць таксама спадчыну прадгістарычнай зьмены. Вось некалькі прыкладаў: на беразе (дыял. на беразі), на дарозе (—дарозі), на страсе́, у вусе (у ву́сі), на рацэ, на малацэ (дыял.—*цы*). Накрэсьлім прыблізную граніцу пашырэньня такіх ф. ф. як руцэ, назе (гл. карту № 12). Хоць у № 28 у Мат. блр. зазначана існаваньне каля Себежу ф. ф. з памякчэньнем заднянёбных, але цяпер, трэба думаць, тут яны зьнікаюць: у аднэй песьні, запісанай Грыневічам у Гарбунох (пад Себежам) чытаем: етай песенькі канец, пашла бабушка ў танец [2]). На поўдні далей ф. ф. з памякчэньнем ужо больш пашыраны, напр., у Асьвейскім р. (в. п. настаўніцы Забелінай), у Боркавічах (в. п. А. В. Багдановіча); пераважаюць яны і ў запісах Нікіфароўскага з Ігумена-Абаленскага, Блр. песни „частушки", ст. 64 і н. Далей даволі шырокая пагранічная паласа (з ужываньнем абедзьвюх катэгорый ф. ф.) праходзіць на поўдні ад Себеск. п. (у Мат. блр., № 26. з Магільнянск. вол., як відаць з прыкладаў, ф. ф. без зьмякчэньня; такія-ж ф. ф. нават у Забулдычыне, гл. А. Шлюбскага, Матар., ст. 91, 154 і інш., магчыма, аднак, што тут хістаньне), бязумоўна, на поўдні і ад Невеля (гл. наш артыкул „Да характар. паўн.-блр. дыял.", ст. 8). У Гарадокскім пав., здаецца, хістаньне: на беразі, на лаўцы, але па бярэзінкі, у сказкі, гл. Рам. Блр. Сб., VI, ст. 150 і наст., 163 і наст. [3]) Далей пагранічная паласа пракладзе сабе шлях на поўн. ад Віцебску: у Бабінічах таксама хістаньне: мамінькі, на горушкі, але ў дарозі, Шлюбскі, Мат. для выв. ф. і м. Віц., ст. 84, 85 і 127. Хістаньне і ў Пышніках б. Курынск. вол., але ф. ф. без зьмякчэньня тут значна пераважаюць [4]). Накіроўваючыся на Смаленск, граніца пройдзе на поўдні і ад Сураск. р. (в. п. настаўн. А. М. Арбузова з Пудаці, студ. Іванова з вёскі Стрыга), на поўдні ад Кашавічаў (шэраг запісаў А. Шлюбскага ў Матар.) нарэшце на поўдні і ад Інкава (гл. Добр., См. Сб., I, ст. 173, 200 і інш.), але на поўначы ад Лёзны (в. п. т. Ратамскага, загадчыка Віцебск.

---

[1]) Апошнія ф. ф. вядомы і ў влр. гутарках. Адносна пытаньня аб клічным скл. гл. яшчэ проф. Обнорскага, Die Form des Vokativs im Russischen, Zeitschr. f. slav. Phil. I, 1—2, ст. 102 і наст.

[2]) Няма гэтых ф. ф. нават у Глембочыне (у 15 в. на поўдні ад Себежу), в. п. таго-ж Грыневіча.

[3]) Аднак, у запісах Нікіфароўскага з Рубашкіна Бескатаўскай вол. (Белор. песни „частушки, 1911, ст. 5 і наст.) знаходзім толькі формы без зьмякчэньня.

[4]) Гл. В. В. Іванова, Крестьянск. свадьба в Витебской Белоруссии, Зап. Сев.-Зап. Отд. Русс. Географ. Общ., кн. 3, 1912, ст. 265—294. Прыкл. са зьмякчэньн.: дарозі, сірьмязі; апошні прыклад рыфмуецца са словам зьвязі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Буд. Працаўн. Асьветы) і ад Гарасімёнак (Мат. блр., № 32). Адхіліўшыся недалёка ад Смаленску яшчэ трохі на поўдзень[1]), граніца пройдзе паміж Амсьціслаўлем (у зборніку песень М. Гарэцкага на... *ряцэ*, на клады*ццы*, на вярсе, на версі, матцы і інш., ст. 8, 10, 23, 45; гл. таксама падр. адк. № 4, складзены Бялькевічам, § 105), Клімавіцкім р. (гл. запісы Раманава з Ціманава, якое знаходзіцца ў некалькіх вярстах ад Клімавічаў (Блр. Сб., III), Акуліцкай і суседнімі валасьцямі[2]) (гл. арт. Карскага „Нов. Сборн.", прысьвеч. Ламанскаму, а таксама арт. Пруссак у Х-м вып. Мат. для из. влр. гов., ст. 16) і Радуціным (каля Трубчаўску, гл. Дурново, Диал. разыск., I, вып. 2, ст. 34), з аднаго боку, і Бярдзібкамі Ельн. пав. (Добр., См. Сб., I, ст. 172, 337: у ліхарадкі, у Пітярбургі і інш.), Леташнікамі (шэраг запісаў Добравольскага ў См. Сб.[3]), Сешчанскай вол. (Радзічамі, Коханавым, н. з.) Рослаўск. пав. і большасьцю вёсак Бранск. і Трубчаўск. паветаў, з другога (гл. Дурново, id., ст. 33—35). На паўдн. зах. ад гэтай пагранічнай паласы пануюць ф. ф. са зьмякчэньнем заднянёбных, напр., у Арэхаўне (гл. Мат. блр., № 27), у Сеньненск. пав. (Рам., Блр. Сб., III), у Краснапольлі (падр. адк. № 1), у быўшых Мглінскім, Сураскім і Старадубскім паветах (гл. дасьледваньне П. А. Растаргуева, Северско-блр. говор, ст. 50-51, а таксама А. К. Сержпутоўскага, Отч. о поездке в Гом. г. в 1926 г., ст. 4, 10 і інш.). Наадварот, на паўн. усх. ад граніцы чуваць ф. ф. без зьмякчэньня; у Парэцкім і Бельскім пав. (сёлеташнія зап. А. Шлюбскага з Ілаўкі, Акатова, Шчуч'я, Анціпіна і інш.), у Вяземск. пав. (н. з.), у Дарагабуск. і Духаўшчынск. пав. (Добр., См. Сб.). Але на абодвых бакох, бязумоўна, трапляюцца астравы (пар., напр., Зеленіна, Влр. гов., ст. 214, Халанск., Нар. гов. Курск. г., ст. 29 і інш.).

Пераходзім цяпер да разгляду паасобных склонаў.

§ 24. Назоўны склон адзін. ліку.

Як і ў украінскіх гутарках, так і ў блр. вядомы словы мужч. р. з канчаткам —*о* пад націскам (Пятро́, браткó), якое бяз націску пераходзіць у *а:* ба́цька (у акаючых дыялектах).

Захоўваюцца, як у тэй самай укр. м., такія формы наз. скл. быўшых консонантычных асноў, як пара*ся*, цяля (гэта *я* з—*ам*—належала ўласна да асновы). У часьціне гутарак, а за імі і ў літаратурнай блр. мове, пад уплывам слоў ніяк. р. на —*о* зьявіліся нова-ўтварэньні пара*сё*, цял*ё* (гл. Карскі, Блр., II, 2, ст. 15). Лічыць іх, аднак, нельга агульна-блр. зьявай. Мы ведаем, што прынамсі ў паўднёв. дыялектах—мазырскіх (напр., у Тураве), у рэчыцкіх (Дзяражня, 7 в. ад Рэчыцы, н. з.) і нават у бабруйскіх (у Васілеўцы Парыцк. р.) ужываюцца формы цел*я*, п⁰/ар/⁰ася (у Тураве аканьня няма, у Дзяражні ёсьць).

Канчатковае *і* ў слове мац*і*, уласна кажучы, таксама ўваходзіла раней у склад асновы.

§ 25. Родны склон адзін. л.

Што датычыцца слоў мужч. р., дык у гэтым склоне, як вядома, яны могуць мець два канчаткі —*а* (з асноў на —*о*) і —*у* (з асноў на

[1]) У часьціне Смал. пав. (напр., у Мядзьведаўцы, гл. Добр., См. Сб., I, ст. 113 і інш.) яшчэ жывуць ф. ф. з памякчэньнем задняпаднябенных.

[2]) Але Хадзілавічы Фошнянск. вол., аб якіх гаворыць Пруссак, відавочна ўжо становіць востраў.

[3]) Адносна Леташнікаў гл. яшчэ Растаргуева, Сев.-блр. гов., ст. 180.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

—*й*),—апошні, галоўным чынам, у не—асабовых назвах [1]). Назіраньні над пашырэньнем першай і другой формы асаблівага значэньня для дыялектолёгіі ня мае, бо падобнае зьмяшэньне спадчыны абедзьвюх асноў у даным склоне ведаюць і іншыя славянскія мовы, як усходнія, так і няўсходнія. Можна было-б, праўда, зрабіць вывад аб перавазе падобных форм у блр. м., але для гэтага неабходна было-б зрабіць статыстычны падлік паасобных прыкладаў у паасобных гутарках.

З прыкладаў родн. скл. адз. л. лічым яшчэ вартымі ўвагі дыялектолёга ф. ф. на—*е* (дакладней, поліфтонг ѣ=і.. е) у мяккіх асновах жан. р. на —*а:* зя/емле або зя/емлі̂е, ся/ем'е (=ся/емъје). Акад. Карскі гаворыць аб існаваньні зазначаных форм у Горадзеншчыне (Русск. диалектол., 1924, ст. 103), але мы іх чулі і ў Мазыршчыне (у Тураўскім і Жыткавіцк. р. р.). Праўда, дзе поліфтонгічнае вымаўленьне рэфлексаў быўшага *ѣ* набліжаецца да *і*, там і лёгка прыняць за гэты монофтонг той „дыфтонг", або лепш поліфтонг, які чуваць у канчатку родн. скл. слова ***зямля***.

Між інш., нічога агульнага з разгледжанымі формамі ня маюць такія-ж прыклады ў паўн.-блр. дыялектычнай краіне. Там яны стаяць у сувязі з агульным пераблытаньнем родн. скл. адз. л. жан. р. з дав.—месн.; побач з такімі выразамі, як *бяз руке*, *мала зямле*, у Себеск. п. (гл. Мат. блр., № 28), у Вяліскім (гл. Да характ. паўн.-блр. дыял., ст. 12), у Бельск. пав. (гл. Добр., См. Сб. I, ст. 5), у Ржэўскім (гл. арт. Н. Грінковай, ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 312) і ў інш. мясцох кажуць *к сястры, на вады, па Дзьвіны.*

Па аналёгіі з мяккімі асновамі канчатак —*э* зьяўляецца і ў цьвёрдых асновах; хустка сястрэ (Карскі, Русск. диал., ст. 103).

§ 26. Давальны склон адзін. л.

Што датычыцца гэтага скл., дык тут неабходна зрабіць толькі наступную ўвагу. У паўдн.-зах. дыялектах Карскі (Блр., II, 2, ст. 166) знайшоў формы дав. скл. адз. л. з канчаткамі —*ові* (без націску —*аві)*, —*еві*, характэрныя для значнай колькасьці украінскіх гаворак (у якіх мы маем—ові, —еві ‖ —ови, —еви).

Успамянёных формаў у даступных нашым назіраньням мазырскіх і рэчыцкіх гутарках мы не маглі, аднак, адшукаць. Стаіць гэта, па нашай думцы, у сувязі з тым, што ў бліжэйшых паўн.-укр. дыялектах, відавочна, таксама адсутнічаюць формы на —*ові*, —*еві* [2]), пар. В. М. Ганцова, Діялектол. класифік. укр. говорів, 1923, ст. 31, а таксама Міхальчука, Тр. Этн.—Ст. Эксп., т. VII, ст. 475, 489 і 499.

Тым-жа горадзенскім дыялектам вядомы рэдкія ф. ф. дав. скл. мужч. р. адз. л. на —*ей*, —*эй:* мужык*ей*, вал*эй*, гл. Карскага, Блр. II, 2, ст. 166, яшчэ Зам. по блр. нар., РФВ., 1916, LXXVI, в. 1, ст. 138.

§ 27. Іншыя склоны адзін. л.

Апошнія тры склоны адз. л. не становяць ужо такога інтарэсу для дыялектолёга, і таму мы адносна іх абмяжуемся кароткімі заўважаньнямі.

Папершае, трэба зазначыць, што ў часьціне блр. дыялектаў, згодна з украінскай мовай, у сэнсе вінав. скл. адз. л. можа зьяўляцца

[1]) Вельмі рэдка —у заходзіць у родны скл. ніяк. р.: с полюшку, гл. Шлюбскага, Мат. па выв. ф. і м. Віц., ст. 145, № 199.

[2]) Мяккасьць *в* у гэтых канчатках у укр. м іншага пахаджэньня.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

форма родн. скл. (на—*а*, але ніколі на—*у*) ня толькі ад назваў асобаў, але таксама і ад назваў няжывых рэчаў: *палез на дуба, знайшоў грыба* і інш.

Падругое, у творным скл. адз. л. жан. р. назоўнікаў з быўш. аснов. на—*а* (а таксама прыметнікаў і тых займеньнікаў і лічэбнікаў, якія зьмяняюцца па родах) мы назіраем ужываньне ф. ф. дзьвюх катэгорый—скарочаных (рукóй, бáбай, цíхай, маéй і г. д.) і нескарочаных (рукóю, бáбаю і г. д.). Апошнія ф. ф. пераважаюць, асабліва ў цэнтральных і паўднёвых гутарках. У паўдн. гутарках ад слоў усіх трох р. р. ужываюцца ф. ф. на -*ем*,—*эм*, а не на—*ём*,—*ом*: канéм, нажэм, душэю, яйцэм. Успамінаем мы аб іх тут, бо лічым гэтыя ф.ф. вынікам морфолёгічнай аналёгіі.

Далей вартымі ўвагі зьяўляюцца варыянты творн. скл. быўшых асноў на—*і*; побач з ноччу[1]), кроўю ўжываюцца новаутварэньні ночаю (-й), крывёю (-й).

Нарэшце, некалькі слоў аб месным скл. адз. л. Як у родн. скл., так і ў гэтым склоне ў словах м. р. зьяўляюцца два канчаткі— -*е* (=*і*, *ы*) і *у*, што становіць вынік успамяненага вышэй зьмяшэньня асноў на—ŏ і на—й. Канчатак—*у* пераважна ўжываецца ў словах з цяперашнімі асновамі на—*к*: у Менску, у садочку і ў назвах асоб з цяперашнімі асновамі на *р, ж, ш, ч, ц*: пры пісару, пры мужу. Радзей трапляюцца прыклады месн. скл. м. р. на—*у* ад слоў з цяперашнімі асновамі на-*г,-х*: на працягу, у пуху. Часам канчатак—*у* прымаюць і словы ніяк. р. з такімі-ж асновамі: у войску, у вуху.

Адрозьненьне варыянтаў —*е* (*э*) і —*і* (—*ы*) ва ўсіх трох родах зьвязана, галоўным чынам, з ранейшай належнасьцю да цьвёрдых ці да мяккіх асноў. Першы варыянт адзначае словы з быўшымі цьвёрдымі асновамі (пры сыне, на беразе, галаве[2]), на галаве, руцэ, вадзе, на вакне, у вусе), у той час як у канчатках—*і* (—*ы*) прадаўжае сваё існаваньне той канчатак—*і*, які быў адзнакай асноў на—*ja*,—*'a*,—*jo*,—*'o* (на кані, на зямлі, у полі); што-ж датычыцца—*ы*, дык ён вынікае з ранейшага—*і* ў сувязі з ацьвярдзеньнем папярэдніх зычных (*ж, ч, ш, ц, р*): на нажы, у канцы, на мяжы, на моры, на сонцы і інш.. Апроч таго,—*ы* мае месца і ў словах з *р* спрадвеку цьвёрдым (у бары, на гары), а таксама пасьля *ц* новага пахаджэньня (з *к*: дзéўцы, на лáўцы[3]) і г. д.).

Ад разгледжаных варыянтаў, якія пры зазначаных умовах увайшлі і ў норму літаратурнай мовы[4]), у гутарках сустракаюцца адхіленьні розьнага тыпу. Вельмі пашыраны ў дыялектах формы з—*і* зам.—*е* (ненаціскнога): на бéразі, у лéсі, у хáцí, якія можна тлумачыць як морфолёгічнай аналёгіяй, так і чыста фонэтычна—як вынік „іканьня". Трапляюцца потым у гаворках выпадкі з—*э* зам.—*ы* (на гарэ) і, наадварот, з—*ы* зам.—*э* (на рацы).

§ 28. Назоўны (і вінавальны) склоны множн. л.

Формы множн. л. назоўнікаў зьяўляюцца больш цікавымі для дыялектолёга, і ў сувязі з гэтым мы іх дакладней ізоглёсуем, а некаторыя з гэтых формаў мы картографуем.

Блр. дыялекты (разам з украінскімі і іншымі славянскімі) адрозь-

---

[1]) Высьвятленьне другога *ч* належыць тут ужо да фонэтыкі.

[2]) Усе гэтыя заўважаньні адносна месн. скл. адз. л. ўсіх трох радоў датычацца і дав. скл. адз. л. жан. р.

[3]) *Э* пасьля *ц* з *к* у слов. жан. р. зьяўляецца пад націскам: руцэ, на рацэ.

[4]) Гл. Я. Лёсіка, Грамат. блр. мовы. Морфолёгія, 1927, ст. 70-73, 86-87 і 99-101.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

нівалі ад вялікарускіх, між інш., на падставе адсутнасьці ў іх ф. ф. множн. л. мужч. р. на—*а*,—*я*. Але, відавочна, на гэтай аднэй асаблівасьці нельга базавацца пры азначэньні граніц блр. м.; папершае, таму, што граніца гэтай зьявы ня зусім выразная, падруг., у сувязі з яе бясспрэчнымі адхіленьнямі ў абодва бакі ад тэй лініі, па якой праводзілі граніцу паміж блр. і влр. мовамі. Так, напр., зазначаны ф. ф. на—*а* у Магільнянск. вол. Себеск. пав. (гл. Мат. блр., ст. 205), у Бельскім пав. Смаленск. губ. (гл. Добр., См. Сб., т. I, ст. 5)[1]), але, з другога боку, ф. ф. на—*ы* трапляюцца ў Пскоўск. губ. (гл. Тр. М. К., в. 8, арт. Соколова, ст. 3), у Ржэўск. пав. (ИОРЯСРАН., XXXI, ст. 313), далёка заходзяць і на ўсход—у Калужаск. і Арлоўск. губ. (гл. хоць-бы Дурново, Диал. разыск., в. 1, ст. 18-20 і в. 2 ст. 29 і наст.).

Асаблівай увагі заслугоўвае другі канчатак (*-э*, *-е* або ы̯э, *ѣ*=i̯е) тых-жа назоўнікаў мужч. р., які амаль заўсёды зьяўляецца і ў словах жан. р., прычым у абодвых родах ён мае месца пад націскам. Гэтую цікавую дыялектычную зьяву блр. дыялектаў мы дакладна праізоглёсуем, прысьвеціўшы ёй паасобную карту (№ 13). Як відаць з яе, цікавячая нас асаблівасьць належыць да ліку зьяў астраўнога характару. Азначаючы ў агульных рысах, мы можам аднесьці гэтыя астравы да паўдн.-зах. часьціны блр. этнографічнай тэрыторыі. Дзеля таго, што, кажучы прыблізна, у тых самых паўдн.-зах. гутарках захоўваюцца і дыфтонгі, канчаткі *-е*, *-э*, якія выніклі з *ѣ*, гучаць вельмі часта, як *ѣ* (-i̯е), ы̯э: ваўкi̯е, жанкi̯е, паны̯э. Але з прычыны таго, што ізоглёсы гэтых абедзьвюх зьяў усё-ткі не супадаюць, мы прыклады ўсе лічым магчымым перадаваць бяз дыфтонгаў.

Адзін з найбольшых астравоў з ваўк*е*, лясэ ляжыць за цяперашняй граніцай БССР з Польшчай, захапляючы зах. часьц. б. Менск. пав., Наваградзкі пав. і паўн.-зах. куток б. Слуцкага пав. (гл. Карскага, Блр., II, 1, ст. 243-244, а таксама Мат. блр., №№ 19, 23, 25, 29, потым Малевіча, Блр. народн. песни, Сб. ОРЯСРАН., т. 82, розн. №№). Праз пісьменьнікаў з гэтага, гал. чын. востраву, ф. ф. ваўк*е*, панэ ўвайшлі на пэўны час нават у блр. літаратурную мову. Іх знаходзім у „Нашай Ніве“, ужываў іх у ранейшых творах і Якуб Колас, родам з Мікалаеўшчыны пад Стоўбцамі[2]).

Відавочна, працягам зазначанага вострава зьяўляецца мясцовасьць у раёне Узьдзенскім, у якім некаторыя вёскі—Касьцяшы[3]) (в. п. студ. Срэценскага), Магільна (в. п. т. Тумiловiча), Нізок (в. п. Атраховiча—Крапівы) ведаюць ф. ф. наз. він. мн. л. на *-э*, *-е*[4]), але іншыя вёскі побач з зазначанымі ўжо ня маюць гэтай асаблівасьці (напр., Пясочна, Прысынак, Чурылава). На поўдзень ад зазначаных мясцовасьцяй, г. зн. ва ўсёй Слуцкай акрузе (напр., у Старыцы на поўн. ад Слуцку, в. п. студ. П. А. Зянюка, у Цімкавічах, в. п. т. Марука, у Падлесьсі і Баслаўцох, Мат. блр., 88), апроч паўн.-ўсх. яе кутка, ф. ф. на *-е*, *-э* ня чуваць; толькі, як я даведаўся ад некалькіх асоб, востраў з цікавячай нас зьявай становіць гутарка Гарадзішча, якое знаходзіцца ў некалькіх вярстах на поўн. ад Слуцку. Няма яе і на ўсходзе—у Шацкім р. (адк. на прогр. ў Мат. блр., ст. 39, праверaны в. п. настаўн. С. Гурыновiча) і на паўн. усходзе—у Самахва-

---

[2]) Іх часам знойдзем і ў цэнтры блр. тэрыторыі, гл. Сербава, Блр.-сакуны, ст. 98.

[2]) Гл. наш артыкул у зборн. „Якуб Колас у літаратурн. крытыцы“ 1926, ст. 135-136.

[3]) Жыхары суседняй вёскі Пясочна, якая, як і Касьцяшы, знаходзіцца на беразе Нёмна, сьмяючыся з данэй моўнай асаблівасьці касьцяшоўцаў, склалі песьню: „Касьцяшэ—галышэ, на пясочку сядзяць, на Пясочну глядзяць“.

[4]) Ведала яе і Узда, гл. Шэйна, Мат. I, 1887, ст. 251.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лавіцкім р. (шэраг крыніц)[1]). Гэткім чынам, разгледжаны невялікі востраў ня зьвязаны з другім, найбольшым востравам з ф. ф. ваўке, лясэ, на тэрыторыі БССР.

Крайнюю паўднёвую часьціну гэтага вострава становіць б. Жыцінская вол. (у паўн.-усходн. кутку цяперашняй Слуцк. акр.; аб пашырэньні ў гэтай вол. данай морфолёгічнай адзнакі гл. Сербава, Блр.—сакуны, ст. 98), крайнім паўночным пунктам яго, здаецца, зьяўляецца Дамавіцкае (н. з.); на захадзе-ж яна пачынаецца каля Цытвы[2]) ў вёсках Роўнапольле і Скрыль (з першай запісы ў фольклёрн. матар'ялах ІБК, з другой в. п. студ. Самсонікава), на крайнім-жа ўсходзе даходзіць да краю Сьвіслацкага р. (да вёсак Віркаў, н. з., Асавоў і Люціна, в. п. настаўніка Сьвіслацкай сямігодкі т. Бахты), які ляжыць на левым беразе Бярозы.

Зазначаны востраў (з выгінам на поўдні сваёй граніцы) добра вывучаны намі ў адносінах да цікавячай нас асаблівасьці, і таму мы зможам падаць дакладны сьпіс шмат якіх залюднёных пунктаў з данай зьявай, аб якіх мы маглі даведацца тым ці іншым шляхам. Большасьць з гэтых пунктаў не папала на карту, дзякуючы невялічкаму разьмеру яе. Пералічваем гэтыя пункты.

Ваўке, лясэ мы чулі на поўн. ад б. Жыцінск. вол.—у Мязовічах і Крынках, потым у Пярэжыры, у Дукоры, Дукарцы, у Клінку, у Турцы, у Волме; ёсьць гэтая рыса і ў Турыне (в. п. студ. Вераскоўскага) і інш. вёсках Пухавіцк. р., далей каля Чэрвеня (б. Ігуменя), нарэшце ў Якшычах і далей на ўсход (ужо за Бярозай)—у Міраслаўцы, Максімовічах (гл. адк. № 12, які мы атрымалі ад настаўн. Пятрова). Трапляецца цікавячая нас асаблівасьць і ў шмат іншых пунктах (але не ва ўсіх) Сьвіслацк. р.—у Сьвіслачы (н. з.), у Брыцалавічах (в. п. наст. Бахты), у Касьсі, Татаркавічах і Колпчы (у апошняй некаторыя старыя людзі, з дакл. доцэнта Воўк-Левановіча; друк. ў I т. Зб. Аддз. М. і Л.) Успамянуўшы яшчэ аб тым, што за Бярозай ваўке, лясэ ўжываюцца ў Бацэвічах (в. п. доцэнта Дружчыца) і ў блізкай да яе в. Бёрда (гл. Мат, блр., ст. 117), скажам некалькі слоў аб дузе на поўдні гэтага вострава. На значнай адлегласьці яна прыблізна супадае з паўночнай граніцай Асіпавіцкага р., з якога толькі крайнія паўднёвы, заходні і ўсходні пункты (Нова-Тарасавічы[3]), адк. № 20, Вярхі на граніцы з Пухавіцк. р., в. п. настаўн. Арла і, здаецца, Гарожжа на ўсходзе) ведаюць цікавячую нас зьяву.

Назаву цяпер некаторыя пункты па-за межамі гэтага вострава. Няма разгледжаных формаў на ўсх. у Доўгім (гл. Мат. блр., ст. 116), на поўн. ў м. Бярэзыні (адк. № 8) і суседніх вёсках—Вінарове, Божыне (н. з.), у Смалявічах, Чарніцах і шэрагу іншых мясцовасьцяй на поўн. ад Сьмілавічаў (в. п. наст. Апацкага), далей у Каралішчавічах (в. 15 на паўдн. ўсход ад Менску) і шэрагу суседніх вёсак, залюднёных беларусамі-католікамі, у Гатаве (Мат. блр., 32). Аб паласе (у Самахвал. і Шацк. р. р.), аддзяляючай разгледжаныя астравы, мы ўжо гаварылі. Ёсьць перарыў паміж другім і трэцім (няўсьцяжным) востравам, які ляжыць на поўдні ад Асіпавічаў—Бабруйску. Аб адсутнасьці ф. ф. ваўке, лясэ, жанке ў Асіпавіцк. р. мы ўжо казалі, няма

[1]) Насельніцтва Самахвалавіцкага раёну, пышаючыся чыстатой сваёй мовы, жыхароў суседняга Сьмілавіцкага р. за іх „нячыстую" гутарку, з ф. ф. ваўке, лясэ, называюць пагардліва *райдунамі* („райдунэ").

[2]) Аб існаваньні блінэ, парабке ў Цытве гл. Шэйна, Мат., II. ст. 146, 167 і інш.

[3]) Жыхары Нова-Тарасавічаў, якія гадоў 25 назад перасяліліся з Новаградчыны, апрача гэтай асаблівасьці (ваўке, лясэ), адрозьніваюцца ад суседніх вёсак і іншымі рысамі (ф. ф. будзем, гэты). Як мы часта назіралі, за 25-30 г. г. гаворка перасяленцаў яшчэ не ўсьпявае асьмілявацца атачаючым гаворкам.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

іх і ў шэрагу вёсак на поўн. ад Глуску—у Кнышох (в. п. наст. Мішура), у Жэлвінцы, Калюзе, у Дуброве (в. п. студ. Барнавіцкага і інш.).

На трэйцім востраве ф. ф. наз.-він. скл. мн. л. на *-е, -э* пашыраны ў меншай меры, і таму мы зафарбавалі яго няўсьцяжнай фарбай. Вядома нам існаваньне зазначаных ф. ф. у наступных вёсках гэтага востраву—у Брожы і Ласёх (20 в. на паўдн. паўдн.-зах. ад Бабруйску, н. з.), у Пятровічах і Мачулкох (у 5-6 в. на паўн. зах. ад Брожы, в. п. доц. Азбукіна), у Зяленкавічах, а часам і ў Зубарэвічах—на паўдн. ўсход ад Глуску (адк. № 4), у Качай-балоце і Раманішчах, Слабодцы і Казлоўцы Парыцк. р. (в. п. С. М. Некрашэвіча[1])), яшчэ далей на поўдзень у Гадунох, нават у Валасовічах і Крукавічах (ужо на поўн. Азарыцк, р., в. п. студ. Адзінца). Крайнія паўдн.-зах пункты гэтага востраву—Слаўкавічы (н. з.) і нават Камаровічы і Запольле (у пэўных прыкладах, Мат. блр., ст. 62, пар., аднак, з друг. б., запісы Сержпутоўскага ў яго „Сказках“).

У паўднёв. часьціне цікавячая нас асаблівасьць трапляецца значна радзей; яе мы ня знойдзем у Халопенічах, у Карпілаўцы (н. з.) і ў інш. Можа ў некаторых мясцох зьнікненьне гэтых ф. ф. стаіць у сувязі з набліжэньнем рэфлексаў *ѣ* (асабліва ў канцы слоў) да *і*.

У адк. на прогр. з Камаровічаў і Запольля (якому пярэчаць, м. інш., запісы Сержпутоўскага[2]) мы чытаем: „В имен. множ. употребляется окончание ыэ в словах: жанцыэ, косцыэ, грабцыэ. хлопцыэ, молойцыэ“, але зараз-жа пасьля гэтага знаходзім прыклады „сваты,паны“. Гэта дае нам падставу зрабіць вывад аб існаваньні гутарак, у якіх ф. ф. на ыэ, *э* маюць месца толькі ў назоўніках з цяперашнімі асновамі на *-ц-*. Вывад гэты можа знайсьці падтрыманьне у адным прыкладзе косцэ пры сваты, паны ў адк. № 4 з Магілеўск. губ., ў прыкл. жанцэ ў № 18 у Мат. блр. і яшчэ ў двух словах—хлопцэ, стрэльцэ, з Меляшковічаў Мазырск. пав., гл. Шэйна, Мат., І ст. 95. Чулі мы два прыклады (купцэ, зайцэ) ад аднаго старога ў Будзе Кашалёўскай.

Канчаючы агляд пытаньня аб ваўке, лясэ, мы ўспамянём яшчэ аб іншых маленькіх астравох, якіх мы не зьмясьцілі на карце. Існуюць разгледжаныя формы ў Кавалёўцы Стрэшынск. р. (ужо за Бярозай), нарэшце ў Мікулічах (каля Брагіна), гл. Мат. блр., ст. 127, дзе запісана жанкэ[3]).

У кірунку на поўдзень трэці востраў паступова пераходзіць у дыялектычную краіну, ня ведаючую ф. ф. ваўке, жанке, і бясспрэчнай зьяўляецца ўжо адсутнасьць такіх ф. ф. на лініі Князь-Возера—Капаткевічы—Азарычы (шэраг крыніц). Заходняя часьціна БССР ведае такія ф. ф., як панове, братове, лугаве (апошні прыклад запісалі мы ад аднэй сялянкі з Случчыны); яны ўсьцяжнай паласой праз Заходнюю Беларусь пераходзяць у польскую мову[4]).

Астаткам першапачатковай ф. наз. скл. мн. л. мужч. р. зьяўляюцца рэдкія прыклады—суседзі, чэрці, гоні, а таксама словы са сьля-

---

[1]) С. М. Некрашэвіч паведаміў нас аб існаваньні ф. ф. ваўке, лясэ і на левым беразе Бярозы (у Добравольшчыне, Пакалічах, Панкратавічах); здаецца, яны даходзяць да Побалава. Назіраньні С. М. Некрашэвіча рыхтуюцца да друку. Чулі мы ад студэнтаў аб існаваньні такіх ф. ф. у Радушы.

[2]) Магчыма, што ў даным разе, як ў некаторых іншых, памыляецца Сержпутоўскі, які нівэлявaў мову ўсіх сваіх запісаў, хоць ясна, што гутарка Чудзіна, Вял. Рожына і Мазалёў ня можа быць тожсамай з гутаркай вельмі далёкіх ад іх Камаровічаў і Запольля.

[3]) І гэта паведамленьне таксама выклікае зьдзіўленьне. Нам ужо даводзілася зазначаць, што гутарка Мікулічаў б. Рэчыцк. п. неяк вылучаецца з атачаючых дыялектаў.

[4]) Трапляюцца яны і ў Усходн. Беларусі. Апроч вядомых прыкладаў, прывяду прыклад *грибовя* з запісаў В. Іванова, гл. Зап. с.-з. отд. Р. Геогр. О-ва, кн. 3-я. 1912, ст. 278.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

дамі быўшага зьмякчэньня заднянёбных: кадуцы, суроцы (гл. Карскага Зам. по блр. нар., РФВ., LXXVI, в. 1).

Адзнакай наз.—він. скл. мн. л. ніяк. р. ў цэнтральных і паўночных гутарках і ў літаратурн. мове зьяўляецца канчатак -*ы* (вокны, варбты, сёлы), пасьля мяккіх асноў і *к*—*і* (палі, яблыкі), але ў значнай часьціне паўднёвых гутарак жывуць ф. ф. ніяк. р. мн. л. на -*а*. (гл. карту № 14). Граніца ці лепш сказаць, пагранічная паласа паміж абедзьвюма дыялектычнымі краінамі праходзіць, з аднаго боку, на поўдзень ад Гатава (у 14-15 в. на поўдз. ад Менску, гл. Мат. блр. № 7), далей, перарэзаўшы б. Жыцінскую вол., у якой хістаньне ў адносінах да зазначаных ф. ф. (Сербаў, Блр.-сак., ст. 98-99), пройдзе таксама на поўдні ад Асіпавіцк. р. (н. з.) і далей на поўдні ад Брожы і Ласёў (20 в. на поўдз. ад Бабруйску, н. з.). Зазначаная дзялянка ізоглёсы аказваецца, з другога боку, на поўначы ад Шацку (гл. Мат. блр., № 8), ад Слаўкавічаў з блізкай да яе в. Парэчча (в. п. студ. Адзінца), ад блізкіх да Слаўкавічаў Ляскавічаў (в. п. студ. Позьняка), ад Карпілаўкі (н. з [1])), нарэшце на поўначы ад Качай-балота і суседніх вёсак Парыцк. р., у якіх, па словах С. М. Некрашэвіча, пануе ф. мн. л. н. р. на -*а*.

Ідучы далей у паўдн.-ўсходн. кірунку, цікавячая нас мяжа перарэжа б. Рэчыцкі пав. ніжэй ад самай Рэчыцы (н. з. з бліжэйшых вёсак—Дзяражні і Броннага), але вышэй ад Мікулічаў каля Брагіна (Мат. блр., ст. 127) і ад Лоева (н. з. з Лоева і з суседняй вёскі Крупейкі).

Нарэшце ізоглёса пройдзе ніжэй ад б. Гомельск. пав. і нават ад Дзятлавіцкай вол. (гл. Блр. Сб. Раманава, т. I і інш., а таксама Гомельск. нар. песни, З. Радчэнко [2]), потым ад Новазыбкаўск. і Старадубск. паветаў (гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 16-17, а таксама Сев.-блр. гов., ст. 89-90).

На поўн. ад праведзенай намі прыблізна граніцы пануе ўсюды -*ы* (гл. Мат. блр. № 9—з Мокрага б. Быхаўск. п., № 15—з Доўгага і шэраг інш. крыніц), —на поўдні -*а* (Мат. блр. № 12—з Баслаўцоў і Падлесься каля Слуцку, № 10—з Камаровічаў і Запольля, шэраг нашых запісаў і інш. крыніц [3]).

§ 29. Родны (і вінавальны) скл. множн. л.

Тут гаварыць многа не даводзіцца. Канчатак -*оў*, -*аў* (спадчына быўш. асн. на -й-) ужываецца ня толькі ў словах мужч. р. [4]), але ў ніяк. і жан. р. р.: пісьмаў, словаў, ягнятаў (але і пісем, слоў, ягнят), хатаў, бабаў, шляхтаў, кучаў (але і хат, куч). Ад слоў жан. р. з быўш. асн. на -*і*- таксама трапляюцца ф. ф. на -*аў* (рэчаў), але тут часьцей -*эй*

---

[1]) У Карпілаўцы мы запісалі, м. інш., наступны урывак з вясельнай песьні: „Адчыняй, маці, варота, везом чорта з балота".

[2]) Але вышэй ад Харобрычаў (гл. О. Курило, Фонет. та деякі морфол. особлив. гов. с. Хоробричів, ст. 77 і ув. 36-я на 106 стар.) і тым больш ад Сосьніцы; у Гуце Студзянецк., аднак, якая прыблізна на ўсх. ад Харобрычаў, ф. вароты, гл. Тр. М. К., в. 9, ст. 171-172.

[3]) Распадзел (ня зусім дакладны) адказаў з Мат. блр. паміж абедзьвюма ф. ф. гл. ў Карскага, Блр., II, 2. ст. 187-188.

[4]) Вельмі рэдка, толькі ў некаторых гутарках (гл., напр. у адк. з Гайшына, Мат. блр., № 16) можна пачуць ад пэўных слоў ф. ф. без зазначанага канчатку: глаз, салдат, аршын, рог, мяшчан. Аднак, дзён часьцей, як днёў.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(мышэй). Апошні канчатак часта зьяўляецца і ў слов. м. р. з мяккімі асновамі (коняй), але кажуць і канёў [1]).

Цягаценьне блр. дыялектаў да канчатку *-оў, -аў* (з *-овъ*) у словах ніяк. і жан. р. р. нельга лічыць выключнаю ўласьцівасьцю адных толькі блр. гаворак: у влр. гутарках пашыраны такія прыклады, як мест*ов*, дел*ов* (Соболевскі, Лекц. по ист. р. яз., ст. 174), у ўкраінскіх трапляюцца ф. ф. на *-ів* (з *-овъ*) у слов. жан. р.: баб*ів*, хат*ів*.

Вінавальнаму скл. мн. л. мы не прысьвяцілі паасобнага §, бо ў формальных адносінах ф. ф. гэтага скл. супадаюць або з назоўн. або з родн. скл. таго-ж ліку. Пытаньне-ж аб тым, пры якіх умовах зьяўляецца іменна тая, а ня іншая ф., уваходзіць у компэтэнцыю сынтаксу.

§ 30. Давальны і месны скл. множн. л.

Ф. ф. зазначаных склонаў у словах жан. р., аднолькавыя з влр. і украінск., не патрабуюць асаблівых заўважаньняў, затое-ж ф. ф. мужч. і ніяк. р. р. гэтых склонаў належаць да ліку зьяў, якія цяжка паддаюцца ізоглёсаваньню, бо абедзьве пары канчаткаў зазначаных склонаў—архаічныя *—ом, —ох* і пазьнейшыя *—ам, —ах*, якія ўтварыліся пад уплывам ф. ф. жан. р., вядуць паміж сабою барацьбу на даволі значнай прасторы (гл. карту № 15) [2]). У прыблізных рысах можна сказаць, што гэта пагранічная паласа перарэзвае Беларусь з паўн. зах. на паўдн. ўсход. Вось прыблізныя граніцы гэтай пагранічнай паласы, ведаючай абедзьве пары канчаткаў. Амаль выключна ф. ф. на *—ом, —ох* ужываюцца на поўдні ад лініі Лагойск—Зембін (в. 25 на паўн. зах. ад Барысава, н. з.)—Ігрушка (в. п. студ. Курневіча)—і на зах. ад лініі Рагач, Фойня (в. п. студ. Скубілава)—Буда-Кашалёва (н. з.); гл. Мат. блр. № 7 з Гатава, № 8 з Шацка, № 12 з Падлесься і Баслаўцоў, № 10 з Камаровічаў і Запольля, шэраг нашых запісаў з Зембінск., Астраш.-Гарадзецк., Заслаўск., Койданаўск., Сьмілавіцк. р. р. Менск. акр., у шэрагу мясцовасьцяй Бабруйск. і Мазырск. акр., у б. Рэчыцк. пав.; аднак, усё-ткі і тут часам хістаньне, пар. Сербава, Блр.-сак., ст. 100, Мат. блр., № 17—з Мікулічаў.

Але на поўначы і на ўсходзе ад праведзенай лініі, бязумоўна хістаньне будзе значна большае. Аб ім сьведчаць, паперш., Мат. блр., № 9—з Мокрага Быхаўск. п. (панáм і панàм), падруг., запісы розныя, як ранейшыя (напр., Раманава ў III і інш. т. т. Блр. Сб.), так і цяперашнія (напр., Васіля Кавалёва з Савы Аршанск. акр.: пан*ом*, але дзід*ам*; захо́ўваюцца ў Фолькл.—Дыялект. Каміс. Інбелкульту; у падр. адк. № 4 (з вёсак каля Амсьціслаўля: Шыркі, Белы Мох і інш.) Я. Бялькевіча знаходзім брат*ом*, дзяд*ом* пры сын*ам*; брата́*м* пры брато́*м* чулі і мы ў Будзе-Кашалёўскай). На хістаньне, здаецца, можа паказваць і тая акалічнасьць, што аб існаваньні ф. ф. на *—ом, —ох* гавораць крыніцы з больш паўночных і больш усходніх мясцовасьцяй (напр., Мат. блр., № 28—з Чарнеі Себеск. пав. і № 32 з Герасіменак Аршанск. пав., каля граніцы БССР з РСФСР), у той час, як больш паўднёвыя і больш заходнія мясцовасьці ведаюць *—ам, —ах*

[1]) Відавочна, ранейшы канчатак *-ий* ляжыць у аснове ф. ф. кон*і*, грош*ы*. няма ў яго ні кон*і*, ні грош*ы*, без капейкі грошы. Але магчыма, што гэтая зьява чыста сынтаксычн. парадку, падобна да рас. зваротаў, як „вот тебе сто рублей—деньгі", гл. дакладней Шахматова, Синтакс. рýсск. яз., 1925, ст. 281, а таксама нашы „Асноўн. пыт. мовазн.", 1926,ст. 85.

[2]) Звычайна, тут ідзе размова аб выпадках з націскным канчаткам, бо ненаціскное *—ом* у выніку аканьня зьменіцца на *—ам*; у такім разе памылкай будзе рабіць вывад (гл. Карскага, Блр. II, 2, ст. 194-197) на падставе ўсіх прыкладаў (з націскн. і ненаціскн. канчаткамі) аб перавазе *ам* над *ом*.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(напр. розныя раёны Полацк. і Магілеўск. акр., н. з., в. п. і інш. крыніцы: Мат. блр. №27 (з Арэхаўны), запісы Шэйна, напр., з Мсьціжаск. вол., Мат., II, нарэшце, падр. адк. № 5—з Дакудава Крупск. р., складзены В. Самцэвічам), але гэтая супярэчнасьць зьявілася можа і вынікам таго, што тут параўноўваліся розначасныя матар'ялы. Цалкам магчыма, што цяпер і ў Чарнеі Себ. п. і ў Герасіменках ужываюць ф. ф. на *—ам, —ах* пад націскам[1]). Бясспрэчна ва ўсякім разе тое, што чым далей на поўнач і на ўсход, тым усё больш пераважваюць апошнія ф. ф. Іх значна больш, напр., у запісах Раманава з Сеньненск. п. (гл., напр., Блр. Сб., III, ст. 67 і наст., 78 ст., 244 і наст. і інш.), і таму нельга сеньненскую гутарку ў гэтых адносінах ставіць на адну дошку з друцкай гутаркай тэй-жа цьвёрдаэрай падмовы і з гутаркамі мяккаэрымі Магілеўск. губ., як гэта зрабіў у сваім артыкуле[2]) Раманаў, відавочна не падлічыўшы прыклады ў сваіх уласных запісах.

Бясспрэчным трэба лічыць і той факт, што недзе на поўначы і на ўсх. мы зможам папасьці ў паласу панаваньня ф. ф. на—*ам, —ах*. У такой паласе ляжыць Невельскі, Вяліскі паветы (гл. наш артык. „Да характ. паўн.-блр. дыял.“, 1926, ст. 9, запісы Шлюбскага ў Мат. па вывуч. ф. і м. Віцебшч. і інш. крыніцы), Гарадоцкі пав., Рам., Блр. Сб., VI, мясцовасьці на ўсх. ад Віцебску (гл. Мат. блр., № 18, в. п. Ратамскага з Лёзны), нарэшце ўся Смаленшчына (гл. зап. Добравольскага ў См. Сб. і артык. В. М. Попова ў ИОРЯСРАН., XVIII, кн. 3, ст. 269-270[3]). Адсюль, са Смаленшчыны паласа *—ам, —ах* спускаецца ў паўдн.-зах. кірунку, адрэзваючы, такім чынам, на сваю карысьць паўдн.-ўсходн. куток этнографічнай тэрыторыі Беларусі. Трэба думаць, што гэтыя ф. ф. жывуць відавочна, у Сураскім, Старадубскім і Новазыбкаўск. пав.[4]).

Ф. ф. на *—ам, —ах* адзначаюць і Гомельскі пав.,—большую (паўднёвую) часьціну паўднёв. гутаркі цьвёрдаэрай падмовы Магілеўск. г. па Раманаву, гл. его арт. у I т. Зборн. Аддз. Мовы і Літар. Інбелкульту, ст. 134, друкуецца; адсюль яны праз суседнія пав. Чарнігаўшчыны пераходзяць на тэрыторыю Украіны; *—ам, —ах*, напр., маем у Харобрычах (гл. О. Курило, Фонет. та деякі морфол. особлив. гов. с. Хоробричів, ст. 76-77). Але ў кірунку на захад паласа з *—ам, —ах* не даходзіць да Дняпра: *—ȣм, —ȣх*, блізкае да *—ум, —ух* (з—*омъ, —охъ*) чулі мы на захадзе ад Чарнігава—у Плёхаве і ў Няданчычах, і, відавочна, данымі з паўн.-заходн. кутка б. Чарнігаўск. г. абумоўлена паведамленьне нябожчыка Міхальчука аб тым, што ў „Северском поднаречии“ дав. скл. мн. л. назоўнікаў на *—ум, —юм:* серпум, канюм (аб *—ум* <*омъ* гл. вышэй), гл. Тр. Этн.-Ст. Эксп. т. VII, ст. 491[5]). Магчыма, што *—ом, ох* і ў Дзятлавіцк. вол., гл. зборн. З. Радчэнко, ст. VIII. Паўднёвай граніцы паласы, ведаючай *—ом, —ох*, нам ня ўдалася азначыць; відавочна, яна праходзіць ніжэй ад граніцы БССР з УССР., бо ўсюды, дзе мы ня бывалі ў Мазыршчыне

---

[1]) Нарэшце хістаньнем выклікаюцца і супярэчнасьці паміж рознымі крыніцамі: падр. адк. № 1 А. Шашалевіча з Краснапольля і суседніх вёсак (у тым ліку і з Маластоўкі) гаворыць аб ф. ф. на *—ам, —ах*, у запісах-жа Раманава з Маластоўкі знаходзім ф. на *—ох* і на іх пасылаецца і Растаргуеў у Сев. блр. гов.

[2]) Друк. ў I т. Зборн. Аддз. м. і літ. ІБК., ст. 140 і інш.

[3]) Ф. ф. на *—ам* чулі мы аднойчы ў цягнікў ад сялян з Бараўца, цяпер. Смаленск. пав. (на поўн. ад Амсьціслаўля).

[4]) Гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 14, а таксама Сев.-блр. гов., ст. 85 і 87; у працы-ж А. Полевога (О яз. нас. Новоз. у. Гом. г., ст. 19 і 20) даволі няпэўнае заўважаньне: дав. і месны скл. мн. л. мае ў зазначаным пав. тыя-ж канчаткі, што і ў блр. і рас. мовах.

[5]) З самага адказу на прогр. (на ст. 538-539) відаць, што *—ум, —юм* існавала іменна ў Гарадні.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

і ў Рэчыцк. пав., мы ня чулі *—ам, —ах* пад націскам. Умоўна на карце мы правялі тут ізоглёсу па гэтай паўднёвай граніцы БССР[1]).

Мы разглядалі ф. ф. дав. і месн. скл. мн. л. як роўналеглыя зьявы, хоць з гэтага не павінна выцякаць, што тэрыторыяльныя суадносіны паміж абедзьвюма парамі ф. ф. супадаюць. Відаць з усяго, што ф. ф. дав. на *—ом* трохі больш пашыраны, як ф. ф. месн. скл. на *—ох*, гл., напр., запісы Раманава з Нісімкавічаў, у якіх пры по*пом* маем намастыр*ах* (Блр. Сб., III, ст. 358), з Новасёлак Карм.вол. і інш.

Усё вышэй сказанае датычыцца цяперашніх цьвёрдых асноў (з асн. на —ŏ— і на —ŭ—); у такіх-жа словах, як людзі, лапці, ф. ф. на *—ём, —ёх* (*'ом, 'ох*) маюць значна большае распаўсюджаньне ў параўнаньні з ф. ф. на *—ом, —ох*. Людз*ём*, у лапц*ёх*, на людз*ёх* чулі мы ў Невельск. і Вяліск. паветах (Да хар. паўн.-блр. дыялектаў, ст. 9). Адзначыла і Н. П. Грінкова існаваньне ф. ф. лаптёх, людёх у ржэўскіх гутарках, гл. ИОРЯСРАН. т. XXXI, ст. 312. Граніцы ф. ф. на *—ом, —ох* н. р. (пляч*ом*, на пляч*ох*), павінны быць дасьледжаны паасобна.

§ 31. Творны скл. множн. л.

Тут перш за ўсё цікава існаваньне ў паўн.-блр. дыялектычнай кріане ф. ф. гэтага скл. ў назоўн. (а таксама займеньнікаў асабовых 1 і 2 асоб: з нам, з вам, а часам і прыметнікаў) на *—ам*, якія, зьявіўшыся ў выніку адпадзеньня канчатковага *і*, супалі з ф. дав. скл. мн. л. Зазначаныя ф. ф. зьвязваюць паўн.-блр. гаворкі з даволі значнай тэрыторыяй суседніх паўн.-влр. дыялектаў (гл. карту № 16).

Прыблізная граніца цікавячай нас зьявы праходзіць недалёка ад паўднёвай мяжы Асьвейскага р. (аб існаваньні ў гэтым р. ф. ф. з рук*ам*, з наг*ам* мы даведаліся ад наст. Забелінай), далей на поўдні ад Забулдычына, каля возера Расона (у Мат. па вывуч. ф. і м. Віцебшч. Шлюбскага чытаем: таўкач*ам*, пан*ам* у сэнсе творн. скл. мн. л., ст. 169-170). Але ў Валынецкім р. (в. п. А. В. Багдановіча), у вёсках на поўн. ад Полацку (н. з.) данай зьявы ўжо не знаходзім. Спусьціўшыся далей у паўдн.-усходн. кірунку, ізоглёса ф. ф. з рук*ам* вельмі блізка падыходзіць да Гарадка. У вёсках у некалькіх в. в. на поўнач ад яго (запісы Раманава з Казьянск. і Выраўлянск. вал., Блр. Сб., VI, 150 і н., 163 і н., 312, в. п. загадчыка Мазырск. Акрана т. Ермакова) падобныя ф. ф. трапляюцца, але ў запісах з самага Гарадка ў V-м в. Блр. Сб. Раманава (ст. 58) чытаем ужо: вётк*ами* не махаць. Ад Гарадка мяжа ідзе некаторы час прыблізна проста на ўсход, так што на поўначы ад яе аказваюцца Мяжанскі р. (гл., напр., запісы Дразьдзецкага з Паташэнскага С.-Сав., якія захоўваюцца ў Ф.-Д. Кам. пад № 77: пайду за кан*ям*, называюць нас пастушк*ам*), потым Пудаць і Запольле Сураскага р. (знаходзяцца на поўнач ад Суражу, в. п. настаўн. Пудацькай шк. т. Арбузова). На поўдзень ад дзялянкі Гарадок-Сураж скарочаныя ф. ф. творн. мн. л. на *—ам* не трапляюцца, гл. адк. Нікіфароўскага аб гутарцы мясцовасьцяй, якія ляжаць на ўсход ад Віцебску, Мат. блр., ст. 146, запісы Шлюбскага з Янавічаў у Мат. па выв. ф. і м. Віцебшч., в. п. студ. Іванова аб вёсцы Стрыга, якая ляжыць у некалькіх в. в. на паўдн. ўсх. ад Суражу. Пасьля Суражу граніца паміж рук*амі* і рук*ам* на некаторай адлегласьці ідзе трохі на поўдні ад р. Касплі[2]) і гэткім шляхам даходзіць да Парэчча (цяпер.

[1]) Але ў запісах Кравчэнка з Оўруцк. п. ф. ф. — *ом, —ох* ужо няма, Тр. О-ва исслед. Волыни, V, ст. 108, 114, 132 і інш.

[2]) На паўдн. зах. ад ракі Касплі ўжо ўжываюцца ф. ф. на *—амі*, гл. зап. з Інкава, Добр., См. Сб., I, ст. 180; пар. таксама адк. з Мамошак; РФВ. LXII, ст. 200-201, але ў Кащавічах ёсьць ф. ф. на *—ам* (зап. Шлюбскага).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дзямідаў). Паступова змяншаючыся, ф. ф. *з рукам* цягнуцца і на поўдзень ад Парэчча; даволі пашырана іх ужыванне ў Акатаве, якое знаходзіцца ў 20 в. на паўдн. усход. ад Парэчча (зап. А. Шлюбскага ў часе сёлеташн. экспэдыц. або іначай адк. № 18).

Ад верхавін Касплі ізоглёса паварачвае на поўнач (з невялікім адхіленьнем на ўсх.); пройдзе яна на ўсх. ад Слабадзкой вол. (на паўн. ўсх. ад Парэчча, гл. Тр. М. К., РФВ., LXII, ст. 200-201 і 208); далей, адхіліўшыся яшчэ больш на ўсход, граніца прарэжа сабе шлях на поўдні ад лініі Шчуч'е—Белы, паміж якімі ляжыць вёска Чычаты (гл. запісы А. Шлюбскага ў адк. № 18, а таксама адк. з Гарадзкой вол. Бельск. пав. ў Тр. М. К., ibid., ст. 198-199). На поўдні ад гэтай лініі—у Прачыстым, у Скачкове Духаўшчынск. пав. пануе ўжо *з рукамі* (гл. зап. Добравольскага ў См. Сб., напр., у I т., ст. 310 і наст., таксама зап. з Шылавічаў, з Берасьнёва, потым Тр. М. К., ibid., ст. 198-199).

І далей па шляху Белы-Ржэва (у Анціпіне, у Макараве [1]) і інш.) А. Шлюбскі ўсюды адзначаў існаваньне ф. тв. мн. л. на *—ам* (гл. адк. № 18); але ўжо ў Сычэўск. пав. (гл. зап. з Хоцькава, Добр., См., Сб. IV, ст. 465 і інш.) канчатак *—амі* (шапка са пірамі). Вось з гэтай прычыны апошнюю дзялянку ізоглёсы мы прыблізна правялі паміж Ржэвай і Сычэўкай.

На поўначы ад праведзенай мяжы мы ўсюды пачуем ф. *з рукам* (у Себеск. п., гл. Мат. блр., № 26 з Магільн. вол. і № 28 з Чарнеі, у Невельск. і Вяліск. пав., гл. наш арт. „Да характ. паўн.-блр. дыял.", у паўночн. часьціне б. Гарадоцк. пав.—у Руднянск. і Халамерскім сельсаветах, гл. адк. № 3, у паўночн. часьціне Бельскага пав.—каля ст. Земцы ў вёсках Драгачэва, Мяшкі і Косьціна, гл. РФВ., LXII, ст. 198-199 і 202, у Панікольскай вол., гл. Шэйна, Мат., I, ч. 1, ст. 120 і т. II, ст. 521-522, у Шоптаве, гл. Добр., См. Сб, I, ст. 541: з етым деньгам і інш.).

Трэба думаць, што ф. тв. скл. мн. л. на *—ам* існуе і ў апісаных Н. П. Грінковай ржэўск. гутарках. Хоць аб іх не ўспамінае яна (пар. таксама адк. з Селішны ў 8 вып. Тр. М. К.), але відавочна, гэта пытаньне проста засталося па-за полем увагі дасьледчыцы; пар. арт. В. М. Попова ў 3 кн. XVIII т. ИОРЯСРАН, ст. 269-270 [2]).

Ф. ф. на *—ам* знойдзем мы і далей у Пскоўск. губ. (гл. арт. Н. Соколова ў тым-жа 8-м вып. Тр. М. К., ст. 3, яшчэ зап. Успенскага з Марыпчэлак Вялікалуцк. п. ў Жив. Стар. за 1898 г., в. 1, перадрук. ў Хр. по влр. диал., Дурн. і Ушак.ст. 141—143), у Ленінградзкай (гл. арт. Н. П. Грінковай у ИОРЯСРАН., т. XXX, ст. 265-266) і ў іншых паўн.-влр. дыялектах (гл. Оп. диал. к. р. яз., ст. 25 і 26).

З астравоў па-за разгледжанай усьцяжнай паласой з ф. ф. на *—ам*, здаецца, найбольшым зьяўляюцца мясцовасьці ў Новазыбкаўск. пав.—Ст. і Н. Юравічы, Сераўка, Баранаўка і інш., гл. Ант. Полевой, О яз. насел. Новозыбк. у. Гом. г., ст. 20. Прыблізнай лініяй гэты востраў накрэсьлены ў нас на карце. Галоўн. чынам, на тэрыторыі быўш. Магілеўск. губ. трапляюцца ф. ф. творн. скл. мн. л. на *—амы, —мы* (гл. запісы Раманава ў Блр. Сб. з Чыгірынкі б. Быхаўск. п., т. III, ст. 92 і наст., 307 (з дзяцьмы, братамы, рукамы), з Высокаўск. вол. Арш. п., VI, ст. 363 (потпругамы), нават Дзятлавіцк. Гом. п., V, ст. 102 (косамы), потым Мат. блр., ст. 120—з Гайшына Бых. п., нарэшце Карскага, Блр. II, 2, ст. 203-204 і 227-228). Трапляюцца гэтыя

[1]) Але ў запісах песьняў з гэтых вёсак знаходзім часьцей ф. ф. на *—амі*. Магчыма, што там хістаньне і ў самой мове.

[2]) Мы самі ў цягніку чулі гэтыя ф. ф. ад сялянкі з Кучына Моладатудзкай вол.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ф. ф. часам у іншых мясцох, гл. Сербава, Блр.-сак., 100; ужываюцца яны ў Курнавічах Заслаўск. р., гл. яшчэ запісы Халанск. ў Нар. говор., Курск. губ., Растаргуева, Гов. вост. у. у Гом. г., ст. 14. Ад асноў на -і- захаваўся канчатак *—мі*, які зьяўляецца ня толькі ў словах з ранейшай асновай на -і- (гасьцмі, касьцьмі), але па аналёгіі і ў іншых асновах (каньмі, грашмі, сьлязьмі).

Часам у сэнсе тв. скл. мн. л. ужываюцца ф. ф. на *—ама*: за грыбама, Ляцкі, Чт. в Общ. ист. и др. р. за 1898 г., III, Карскі, Блр., II, 2, 204. Пачулі мы адзін раз у Сьвіслацк. р. за пчалы*ма*. Гэты канчатак належыць таксама да сьлядоў парн. л.

§ 32. Займеньнікі.

У ф. ф. займеньнікаў заслугоўваюць перш за ўсё ўвагі ф. ф. *шчо, шшо*[1]) ў паўдн. дыял. (у Тураве, Жыткавічах, Ст. Ёлчы, н. з., у Гомельшчыне, гл. арт. Раманава аб магілеўскіх гаворках, I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК., ст. 129), потым адзнакі ў асновах асабовых займ.: блр. гутаркі, як украінскія і большасьць влр., для дав.-месн. скл. ад ты, себе (сябе) ужывае асн. *тоб—, соб—* (*таб-е, саб-е*). Што-ж датычыцца канчаткаў, трэба адзначыць, што на блр. этнографічнай тэрыторыі пануюць ф. ф. родн.-він. адз. л. мяне, цябе, сябе (< мене, тебе, себе).

Усе іншыя пытаньні (напр., аб варыянтах мною || мной і г. д.), або аб ф. ф. творн. скл. мн. л. з нам, з вам) ужо высьвятляліся або ў галіне фонэтыкі або ў §§, прысьвечаных скланеньню назоўнікаў.

Таксама будзе перанесена ў аддзел аб прыметніках разгляд некаторых асаблівасьцяй у скланеньні займеньнікаў, якія зьмяняюцца па родах, тут-жа мы абмяжуемся толькі некаторымі заўважаньнямі па поваду гэтай катэгорыі займеньнікаў.

Скажам, паперш., аб тым, што адпаведна цэнтральн. і паўднёв. ф. гэт*ы* або ет*ы* (для жан.-ніяк. гэта(я)—ета(я), гэта(е)—ета(е), якая увайшла і ў блр. літаратурн. м., у паўн. і ўсходн. дыялектах мы сустракаем для мужч. р. ф. гэт*ат*—гэт*ыт* або ét*ат*—ét*ыт* (падкрэсьленыя *а, ы* ў выніку пэўных тыпаў аканьня зьявіліся з *о*).

Побач з т*ой* мы назіраем у больш паўночных гутарках (гл. Мат. блр., № 27, 32, зап. А. Шлюбскага ў Мат. па выв. ф. і м. Віцебшч., Карскі, Блр., II, 2) ужываньне ф. ф. *тэй* і *тый*, якія, відавочна зьяўляюцца новаўтварэньнем па аналёгіі прыметнікаў. У паўдн. гутарках чуем ф. ніяк. р. адз. л. *тэ*.

У родн. скл. маяго, тваяго, сваяго, у іншых дыялектах майго, твайго, свайго і нарэшце маго, тваго, сваго. Адносна альтэрнац. з *в* зам. *г* гл. у § аб прыметніках. У ф. жан. р. таго-ж скл. мы маем т*ае*, т*аё* і ў некаторых гутарках т*ыя*, нарэшце т*аей* і вельмі пашыран. *тэй*. У паўднёв. дыялектах (напр., у Тураўшчыне) можна пачуць ф. творн. скл. т*оею*, одн*оею*. Адносна розных варыянтаў ф. месн. скл. адз. л. мужч. і ніяк. р. р. (у тым—у том) размова будзе ў адддз. аб прыметн. Ад мой, твой, свой у мн. л. ма*е*, тва*е*, сва*е* (*е* < *ѣ*) амаль па усёй Беларусі.

Цяпер некалькі заўважаньняў адносна ён, яна, яно. Адносна паўднёв. варыянтаў з прыставачным *в* (або *ў*) мы ўжо казалі ў аддзеле фонэтыкі. Характэрным для ўсіх, здаецца, блр. гутарак трэба лічыць адсутнасьць выпадкаў з пачатковым *н* (*н*яго, *н*іх і т. п., гл. Карскі, Блр. II, 2, ст. 277). Значна больш пашыраны на блр. этнографічнай тэры-

[1]) Акад. Карскі аб іх, здаецца, не ўспамінае, гл. Блр. II, 2, ст. 286-287. Між інш., у акад. Соболевскага (Опыт русск. диал., 1897, ст. 77) знаходзім указаньне на існаваньне *шчо* і ў паўночн. гаворках (у Баброўцы Ржэўск. пав.).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

торыі ф. ф. дав.-месн., тв. скл. жан. р. *—ёй, ёю* (*—й*) у параўнаньні з *ей, ею*. Ф. мн. л. наз. скл. яны́ (як і адны́, гэты́) становіць новаўтварэньне. Чуў я і ф. *янэ*.

Што датычыцца ф. ф. займ ўвесь (< весь), уся, усё, дык тут трэба, паперш., адзначыць, што побач з больш пашыранымі, здаецца, варыянтамі ф. ф. творн. скл. адз. л. і рознымі скл. мн. л. з *і* пасьля *с* (гл. Карскі, Блр. II, 2, ст. 288, Мат. блр., №№ 7, 9, 18, 27, А. Полевой, О яз. нас. Ново-зыбк. у., ст. 21), мы маем варыянты, у якіх адбіваецца ранейшае *ѣ* (усем або усі́м, усе—усі́е і г. д., пар. Мат. блр., №№ 10, 17, Сербава, Блр.-сак., ст. 110). У некаторых мясцох (напр., у Шацку і ў Падлесьсі, Мат. блр., №№ 8, 12) хістаньне: пры ф. наз. він. скл. мн. л. *усе* ў інш. склонах ф. ф. з *і*. Гэта зьмяшэньне абедзьвюх катэгорый прынята і ў норме літаратурнай мовы, Лёсік, Грамат. блр. м., Морфолёг., 1927, ст. 132.

У родн. скл. жан. р. адз. л. побач з *усяе* існуюць варыянты *усяё, усёй*.

§ 33. Прыметнікі.

Розныя выпадкі ў ф. ф. наз. скл. адз. л. (малады—малады́й, маладэ́й маладая—маладаа—малада і г. д.) высьветлены ўжо ў аддзеле фонэтыкі [1]). Тут трэба будзе зрабіць некалькі ўваг аб родн. скл. адз. л. Ф. м. і н. р. р. прыметнікаў і адпаведных займеньнік. і лічэбнікаў з канчаткам *—о́во* (*—о́ва*), для мяккіх *—е́во*, пачынаюць зьяўляцца на крайнім усходзе і поўначы цікавячага нас чатырохкутніка. Амаль ва ўсёй Смаленск. губ. пануе ф. з *г* [2]) (гл. Тр. М. К., РФВ., LXII, ст. 198 і наст.), тое самае і ў паўночных пав. б. Віцебскай губ. —Себескім, Невельскім, Вяліскім, гл. Мат. блр., № 26 і 28 і інш. крыніцы, але ў Пскоўск. губ., апроч некаторых мясцовасьцяй, ужо чуваць *—ова*, гл. РФВ., LXI, в. I, ст. 16 і наст., яшчэ арт. Н. Соколова ў 8 в. Тр. М. К. Той самы канчатак і ў ржэўскіх гутарках, гл. арт. Н. П. Грінковай у ИОРЯСРАН., т. XXXI, ст. 313-314. „Кагоканьне" вельмі пашырана і ў влр. дыялектах, і дзеля таго ф. родн. скл. адз. л. прыметн. мужч. і ніяк. р. р. ні ў якай меры ня можа служыць крытэрыем пры азначэньні граніц паміж блр. і влр. мовамі.

Ф. ф. родн. скл. адз. л. жан. р. прыметнікаў ужываюцца з наступнымі канчаткамі: *—о́е*, які можа скарачацца ў *—о́й* (або ў выніку аканьня зьмяняецца на *—оя*), бяз націску *—ае* (*—ай, —ая*). Радзей трапляюцца больш архаічныя ф. ф. данага скл. на *—ыя, —ія* (як бяз націску, так і пад націскам: ці́хія вады, з чужы́я староны), гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 18, падраб. адказ А. Шашалевіча на нашу дыялектолёг. прогр., § 122. Гэта *—ыя* вынікла з *—ыѣ*, гл. Карскага, Блр. II, ст. 313, а таксама наш арт. „З лінгвістичн. розкопін на Беларусі", які друк. ў зборн., прысьвеч. акад. Багалію.

Канчатак *—оі* ў паўднёв. гутарках магчыма стаіць у сувязі з набліжэньнем намесьніка *ѣ* да *і*.

Нарэшце, падобна наз. скл. м. р., родн. скл. жан. р. ў пэўных гутарках можа канчацца на *—эй:* маладэ́й жанчыны.

---

[1]) Захаваліся ў блр. гутарках іменныя ф. ф. прыметнікаў, але яны ўжываюцца, галоўн. чын., у ролі выказьнікаў (ён спрыцен і т. п.), радзей (у народных песьнях) у ролі эпітэтаў (сінь васілёчак); гэтыя ф. ф. могуць зьяўляцца і ў ускосных склонах. Ня трэба, м. інш., іменныя ф. ф. прыметн. блытаць са сьцягнутымі, якія зьяўляюцца ў выніку выпадзеньня *j*.

[2]) Ф. ф. з *—оза* часьцей трапляюцца ў усходніх часьцінах гэтай губ.; прыятныва ў Красназабор'і Рослаўск. п. запісаў Костылев яшчэ ў 1884 г. (РФВ. за гэты год, № 3)

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Гэты самы канчатак —*эй* зьяўляецца таксама і ў дав—месн. скл. У вапошнім склоне ў паўднёвых гутарках зам. —*ой* часта чуецца —*уй*: у нов*уй* хаце/*і*. Гэта —*уй* нельга абагульніваць як гукавы закон; як і *у* ў ф. месн. скл. адз. л. м. р. (у стар*ум* домі), так і тут „дыфтонг" зам. старога *о* ў зачыненым складзе ўспрыймаецца як *у*; пар. заўважаньне Міхальчука (Тр. Этн.-Ст. Эксп., VII, ст. 491) аб тым, што дав. скл. мн. л. назоўнікаў у „северском поднаречии" мае канчатак —*ум*, —*юм*: серп*ум*, кан*юм*.

У ф. він. скл. мы маем дыялектызмы ў прыметн. жан. р. Асабліва пашыраны на Беларусі ф. гэтага скл. жан. р. на —*аю*, —*яю* зам. —*ую*, —*юю* ў тых выпадках, калі націск ня падае на канчатак. Да ранейшых даных (гл. Мат. блр., №№ 7, 9, 12, 16, 17, 26—з Гатава б. Менск. пав., з Мокрага Быхаўск., Баслаўцоў і Падлесься Слуцк. п., Гайшына Быхаўск., Мікулічаў Рэчыцк., Магільнянск. вол. Себ. п.) мы можам дадаць аб тым, што падобныя ф. ф. (япо́ньськ*аю* вайну, чырво́н*аю* шапачку) чулі яшчэ ў Сьвіслацкім р. Бабруйск. акр., у паўночн. часьціне Астрашыцка-Гарадзецкага р. (у вёсках Лысая Гара, Сухая Гара). Гэты канчатак він. скл. —*аю* (—*яю*), які, відавочна, зьявіўся пад уплывам *а* ў наз. скл. адз. л. (пар. Карскі, Блр., II, 2, ст. 315), можа далей на глебе пэўнага тыпу аканьня-яканьня перайсьці ў —*ыю*, —*ію*. Такое —*ыю* і адзначыў А. Шашалевіч у Краснапольск. р., гл. падр. адк. № 1, § 120. Прыклад сподн*ію*, часам побач з мо́кр*аю*, мы знаходзім у некаторых з вышэйуспамянёных адказаў у Мат. блр. (у №№ 9, 16, 26).

Дакладней спынімся на ф. месн. скл. адз. л. прыметн. мужч. і ніяк. р. р. Этымалёгічнае адрозьненьне дыялектычных варыянтаў гэтага скло́ну (старой ф. на —*ом*, —*ем* і новай на —*ым*, —*ім*, якая па пахаджэньні становіць ф. творн. скл.) лепш рабіць па прыкладах з націскнымі канчаткамі (у глухі́*м*, —о́*м* лесе і да т. п.), бо пры адсутнасьці націску на канчатку —*ым*, —*ім* можа атрымацца і фонэтычным шляхам з —*ом*, —*ем*.

Ф. ф. зазначанага скл. прыметнікаў і адпаведных займеньнікаў і лічэбнікаў на —*ым*, —*ім*, якія ўвайшлі, між інш., і ў літаратурную блр. мову, апроч Заходняй Беларусі, пашыраны ў большай па разьмерах паўн.-ўсходняй часьціне Ўсходняй Беларусі, адкуль пераходзяць і на суседнія влр. мясцовасьці (гл. Н. Соколова, Гов. Псковск. губ., ст. 3 ў Тр. М. К., в. 8) [1]). Прыблізная граніца паміж абедзьвюма ф. ф. (гл. карту № 17), перасекшы граніцу з Польшчай недзе недалёка ад Менску, на паўднёвым захадзе ад яго, праходзіць далей на поўдні ад Гатава (Мат. блр., № 7: на чужы́*м*), ад Астрашыцка-Гарадзецк. р. (гл. адк. № 6, потым нашы запісы з Лысай Гары і суседніх вёсак), ад Смалявічаў (в. п. наст. Апацкага), нарэшце на поўдні ад мяст. Бярэзыні (адк. № 8), але, з другога боку, на поўначы ад Койданаўск. (н. з.) і нават ад Узьдзенск. р. (в. п. Атраховіча), ад Крупіц Самахвалавіцк. р. (в. п.), ад Дукоры, Дукаркі, Клінка і інш. вёсак Сьмілавіцк. р., далей на поўн. ад Асіпавіцкага (шэраг нашых запісаў з Асіпавічаў, Лапічаў, Смыка-Слабады і інш. вёсак гэтага р.) і нарэшце на поўн. ад Сьвіслацк. р. (н. з. з Сьвіслачы, Холуя, Вязычына, Віркава, адк. № 12—наст. А. Пятрова з Каменічаў і Міраслаўкі).

За Бярозай пачынаюцца мясцовасьці, аб якіх у нас менш вядомасьцяй. Апроч таго, у некаторых мясцох даволі шырокай будзе пераходная паласа, у якой ужываюцца абедзьве катэгорыі формаў. Здаецца, хістаньне адзначае гутарку Ліпніцы б. Брадзецк. вол. (гл. Шэй-

[1]) Пар. яшчэ Соболевская, Лекц. по ист. р. яз[4], ст. 204, а таксама Селішчева, Диалектол. очерк Сибири, ст. 92.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

на, Мат. для из. б. и яз. р. нас. с.-з. кр. II, №№ 20, 22 і 39), але на падставе ф. панéнчын*ум* можна зрабіць вывад аб тым, што тут панаваў канч. *—ом,* які бяз націску і пераходзіў у *—ум.* Хістаньне, відавочна, і ў Азяранах б. Рагачэўск. п., гл. Рам., Блр. Сб., III, ст. 328: у яком—сь, але ў друг*ім* (ст. 330), у як*ім* (ст. 336), а таксама ў Доўгім, гл. Мат. блр., № 15. Апошнія ф. ф. (на *—ім*), трэба думаць, больш пашыраны ў Чыгірынцы (гл. Рам., Блр. Сб. III, ст. 306). У пераходную паласу мы ўнесьлі і м. Гайшын, у запісах з якога знаходзім у Раманава часта ф. ф. на *—ом,* у той час як у № 16 у Мат. блр. Карскага чытаем: на сівы́м. Пераходную паласу на поўдні мы даводзім да Буды Кашалёўскай, у якой нам удалася адзначыць 1 прыкл. на *—ым* і 1 на *—ом.* Бясспрэчным цалкам зьяўляецца для нас існаваньне ў Краснапольскім р. ф. ф. на *—ым, —ім* пад націскам, гл. падр. адк. (А. Шашалевіча) № 1. Чым далей на ўсход, тым усё горш стае справа з высьвятленьнем ізоглёсы ф. ф. на *—ы́м, —ім,* бо, паперш., такія ф. ф. трапляюцца ў мове нячаста, падругое., большасьць дасьледчыкаў, асабліва расійскіх, ня цікавілася гэтым пытаньнем, якое мае большы інтарэс для беларусоў, якія ўвялі ф. на *—ым, —ім* у літаратурную мову. Правялі мы граніцу трошкі ніжэй ад Рослаўля, але вышэй ад Радзічаў Сешчанскай вол., у якой сёлета мы запісалі наступныя прыклады: у *маём доміку, у том, на том, на ём.* Больш паўночныя часьціны Смаленшчыны мы зафарбавалі зноў штрыхоўкаю, бо аб ужываньні абедзьвюх ф. ф. сьведчаць запісы Добравольскага (гл., напр., запісы з Бярдзібяк Ельнінск. п. ў I ч. См. Сб.—ва ўсём, у адн*ом,* але ў маім, адн*ім,* ст. 199, 346, 547 і інш.). У Смаленск. пав. больш пераважаюць ужо ф. ф. на *—ы́м, ім,* гл. зап. у IV ч. таго-ж Сборн. Як далёка на ўсход заходзіць хоць-бы гэтая пераходная паласа, сказаць амаль зусім нельга, бо адказу на цікавячае нас пытаньне мы ня знойдзем ні ў арт. А. В. Пруссак аб гутарках Бранск. пав. (Мат. для из. влр. гов., X), ні ў дасьледв. проф. Буддэ 75 т. Сб. ў ОРЯСРАН., ні ў „Зам. о гов. некотор. сел. Брянск. у Орл. г." Голановаў РФВ. за 1914, № 2, нарэшцэ ні ў адказах на блр. і влр. програмы па Калужаск. г. (гл., напр., Мат. для из. влр. гов., XI). Ведаем толькі, што ф. ф. на *—ом* жывуць у Спас-Дзямянскім (гл. Ол. Брока, Гов. к зап. от Мосальска, 1916. ст. 114), потым у Ізьдзешкаўскай вол. Вяземскага п. (н. з.).

З запісаў-жа з Сычэўск. п. ў См. Сб. Добравольскага даюць некаторы матар'ял некалькі песьняў у II ч. См. Сб. Добравольск., ст. 262 і наст.: у вадн*ом,* па адн*ом.* Магчыма, што далей на поўнач ізоглёса адхіляецца трохі на ўсход і захапляе пэўную часьціну Зубцоўск. пав. (гл. Мат. для из. влр. гов., VIII, ст. 178). А можа, апошняя мясцовасьць становіць востраў.

З усяго сказанага робіцца зразумелым, што ізоглёсу данай зьявы мы прымушаны былі правесьці ня зусім дакладна, у некаторых мясцох нават умоўна, гіпотэтычна. Але бясспрэчным затое для нас зьяўляецца існаваньне на ф. ф. *—ы́м, —ім* на поўнач і на зах. ад накрэсьленай пагранічнай паласы—у Лагойскім р. (некалькі крыніц), у Зембінск. р. Барысаўск. акр. (н. з.), у б. Сеньненск. п. (зап. Раман.), у Мокрым б. Быхаўск. п. (Мат. блр., № 9), на зах. ад Амсьціcл.—у М. Багацькаўцы (гл. зборн. песьняў М. Гарэцкага, які друк.), на ўсх. ад Віцебску (адк. Нікіфароўскага № 18 ў Мат. блр.) і наогул у Віцебшчыне (зап. А. Шлюбскага), у Себеск. п. (Мат. блр., № 26), у Невельск. і Вяліскім, арт. Зоріна ў зб. „Познай свой край" і наш „Да хар. паўн.-блр. дыял.", ст. 9) [1]. З другога-ж боку на поўдні ад

[1]) З Пскоўск. губ. паасобна ўспомнім аб Марыпчэлках Вялікалуцк. п., якія знаходзяцца ў усх. ч. гэтай губ., гл. Дурново і Ушакова, Хрест. по влр. диал.,

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

праведзенай паласы мы пачуем *—óм, —éм* (якім не пад націскам часта адпавядаюць канчаткі *—ум, —юм)*; гэтыя *—ом, —ем,* звычайна, могуць зьмяняцца на дыфтонгі. Пералічу мясцовасьці і пункты, у якіх жывуць апошнія групы канчаткаў: Шацак (Мат. блр., № 8), б. Жыцінск. вол. (Сербаў, Блр.-сак., ст. 106 і наст., ст. 116), Случчына (шэраг н. з.), Камаровічы і Запольле (Мат. блр., № 10), Слаўкавічы, Карпідаўка, Капаткевічы і наогул Мазыршчына (шэраг крыніц), б. Рэчыцкі п. (Ст. Ёлча, Броннае, н. з.). Як відаць з запісаў Раманава ў V т. Блр. Сб. (ст. 10, 45, 54-55, 57, 72, і інш.: у пустóм полі, на золотóм крэсьлі), ф. ф. на *—óм* значна пераважалі і ў быўш. Гомельск. пав.; зразумела, што яны павінны існаваць і далей на поўдзень, пар. О. Курило, Фонет. та деякі морфолог. особливості гов. с. Хоробричів, 1924, ст. 79.

Нарэшце, ф. ф. на *—ом, —ем,* відавочна, адзначаюць і ўсходнія пав. нядаўн. Гом. губ. (калісь-жа пав. Чарнігаўск. губ.)—Новазыбкаўскі, Старадубскі, Сураскі, гл. П. А. Растаргуева, Сев.-блр. гов., ст. 109 і А. Полевого, О яз. населен. Новозыбк. уезда Гомельск. губ., ст. 20-22, у парадыгмах склан. займ. і лічэбн. [1]).

З паўднёвых часьцін блр. этнаграфічнай тэрыторыі ф. ф. на *—ом, —ем* беспасрэдна пераходзяць на украінскія землі. Хоць у паўдн.-укр. гаворках мы ўжо пачуем у ф. данага склону *—ім,* але-ж яго этымалёгічнай асновай заяўляецца тое самае *—ом, —ем.*

Скончыўшы агляд пытаньня аб месн. скл. адз. л. мужч. і ніяк. р. р. прыметнікаў і адпаведных займеньнікаў і лічэбнікаў, мы павінны зазначыць, што, ўласна кажучы, і тут трэба сачыць паасобна за рознымі выпадкамі.

Асабліва адрозьніваюцца тэрыторыяльныя суадносіны паміж *том* і *тым.* Як можна праканацца хоць-бы з запісаў Добраволъскага ў См. Сб., ёсьць мясцовасьці, у якіх побач з *—ым, —ім* у іншых прыкладах жыве ф. *у том.* Падобнага роду злучэньне ф. ф. траплялася і нам у цэнтральных (менскіх) гутарках [2]).

У наз.-він. скл. мн. л. прыметнікаў пашыраны па этнаграфічнай тэрыторыі Беларусі канч. *—ые, —ыі* [3]) (а не *—іе, —іі*; звычайна тут ідзе размова аб цьвёрдых прыметн.: сьляпы*е* або сьляпы*і*). Гэтыя *—ые, —іе,* у якіх *—е* з *—ъ,* далей у выніку аканьня могуць зьмяняцца на *—ыя, —ія.* Акад. Карскі (Блр. II, 2, ст. 321) прыводзіць яшчэ ржэўскія ф. ф. мн. л. на *—аі* (сер*аі* гусі), якія ён лічыць влр. па паходжаньні. Можна да гэтага дадаць, што падобныя ф. ф. вядомы яшчэ ў гутарках „егунов с малор.-белорусск. примесями" (гл. Халанскага „Нар. гов. Курск. губ.", Сб. ОРЯСРАН, т. 76, в. 5, ст. 28). Гэта *а* перад *і* зам. чаканага *ы* трэба тлумачыць, па нашай думцы, таксама, як *а* ў такіх выпадках, як высóк*а*ю гару́, г. зн. уплывам назоўн. скл. адз. л. жан. р. Але магчыма, што значную ролю граюць і назоўнікавыя ф. ф. дав.-творн.-месн. склонаў мн. л. з *—а* перад канчаткам, уплыў якіх выклікае да жыцьця яшчэ такія ф. ф. ўкосных склонаў мн. л. (а таксама творн. адз. л.), як лёгк*ам* духам, сілн*ах* удараў, нізк*амы* уклон*амы,* аб існаваньні якіх, на падставе сваіх запісаў, пав-

---

ст. 142 (в друг*ім* месті), а таксама Зеленіна „Опис. р-сей Уч. Арх. Р. Геогр. О-ва", III, ст. 1156.

[1]) У разьдзеле-ж аб самых прыметніках (ст. 23) няясная ўвага: „твор. и местн падежи сходны с блр. и русск. языками".

[2]) Заўважым яшчэ, што на поўдні пачынаюць (вельмі рэдка) трапляцца выпадкі ўжываньня дав. скл. прым. м. і н. р. р. у сэнсе меснага: у зялен*аму* садзе; часам такія ф. ф. можна знайсьці ў М. Багдановіча: у суров*аму* чаканьні, гл. „Творы М. Багдановіча", т. I, ст. 62.

[3]) Уласна кажучы, *—ыі* таксама фонэтычна можна вывесьці з *—ые.*

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

даміў нябожчык Раманаў у сваім артыкуле аб гаворках Магілеўск. губ. (I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК., ст. 137, друк.). Трапляюцца часам такія ф. ф. і ў іншых запісчыкаў: горкамі слізамі, Шэйн, Мат. II, 46.

Зазначым яшчэ, што ў пэўных дыялектычных краінах у ф. ф. мн. л. можа заходзіць —*э* з ф. ф. адз. л.: старэя людзі, старэх і г. д.

Па поваду ступеняваньня прыметнікаў трэба заўважыць, што зам. пашыраных на значнай большасьці блр. дыял. канчаткаў —*шы(й), ейшы(й)* (—*эйшы(й)*) у паўн. гутарках зьяўляюцца -*ош-ый, ош-эй: прямóшэй.* У некаторых цэнтральных дыялектах трапляюцца выпадкі ужываньня звычайнай ступені прыметнікаў у сэнсе вышэйшай: у дзярэўні няма *старога* за мяне.

§ 34. Лічэбнікі.

З боку формальнага лічэбнікі становяць цэлую колекцыю розных тыпаў скланеньня. Гэтыя тыпы, аднак, не захоўваюцца паасобнымі і нязьменнымі; яны ў значнай меры зьмешваюцца ў розных гаворках. Займ. адзін—адна—адно, які калісьці скланяўся на ўзор цьвёрдых займеньнікаў, разам з гэтымі займеньнікамі адхіліўся ад першапачатковага тыпу скланеньня, падупаўшы ўплыву прыметніковага скланеньня.

Для лічэбнікаў *два—дзьве* маем у гутарках розныя канчаткі (двух—двох, двум—двом, двума—двома, двух—двох; дзьвюх—дзьвёх, дзьвюм—дзьвём, дзьвюма—дзьвёма, дзьвюх—дзьвёх). Скланеньне лічэбнікаў *два—дзьве, тры* ўплынула на скланеньне наступных лічэбнікаў і абумовіла зьяўленьне новага тыпу іх скланеньня (пяцёх, пяцём, пяцьма, пяцёх), які ў некаторых мясцох жыве побач са старым тыпам (пяці і г. д.).

Вельмі пашыраны па розных мясцовасьцях этнографічнай Беларусі, асабліва ў больш далёкіх ад гарадоў і ад чыгункі вёсках і, галоўным чын., у мове старых, ф. ф. лічэбнікаў ад 11 да 19 з *н* перад прадапошнім *ц:* адзінанцаць, двананцаць і г. д. Па думцы Карскага (Блр. II, 2, ст. 121-122) *н* перад *ц* раней зьявілася ў лічэбніку для вызначэньня 11: адзінанцаць—„под влиянием усиленного произношения *н* в *на* из *нна*"; пазьней, пад уплывам адзінанцаць гэта *н* зьявілася і ў наступных лічэбніках Мы, аднак, ня лічым, што ўражаньне ад *н* было мацнейшым у вымаўленьні лічэбніка 11, і таму ня бачым падстаў для меркаваньня аб тым, што *н* перад *ц* зьявілася раней іменна ў гэтым лічэбніку. З прычыны таго, што ў такіх ф. ф., як адзінанцаць, паміж абодвыма *н* чуваць, як здаецца нам, назаляванае *а*, лепш думаць, што пад уплывам папярэдняга *н* разьвівалася тут назалізацыя *а*, вынікам якой, у сваю чаргу, было ўтварэньне другога *н*, які разьвіваўся пры пераходзе да наступнага *ц*. Славянскія мовы ведаюць падобныя прыклады разьвіцьця назалізацыі, выкліканай папярэднім насавым зычным (пар. аб гэтым пытаньні хоць-бы артыкул Эндзелина ў РФВ. за 1912 г., № 3: „О происхождении праслав. инфинитивов па—*nǫti*") [1]).

[1]) Спыніўшыся на пытаньні аб вымаўленьні лічэбнікаў ад 11 да 19, мы, праўда парушылі гэтым сыстэму, бо яно, уласна кажучы, не адносіцца да скланеньня, але мы дазволілі сабе гэта з прычыны таго, што разгледжаная цікавая асаблівасьць зьяўляецца аднэй з характэрных адзнак блр. гаворак; калі ў нас былі-б і іншыя прыклады падобнага разьвіцьця назалізацыі, можа лепш было-б зьмясьціць гэтае пытаньне ў аддзеле фонэтыкі.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Б. Спражэньне.

1. Асабовыя формы дзеясловаў.

§ 35. Формы цяперашняга часу.

Агляд іх трэба пачаць з успаміну аб тым, што блр. гутаркі захоўваюць даволі добра стары тып спражэньня двух нетэматычных дзеясловаў: дам, ем; дасі, ясі (есі), дасьць, есьць; дамо, ямо; дасьцё; ясьцё; дадуць, ядуць і ядзяць.

Ф. ф. дасі, ясі (пар. укр. даси, їси) трапляюцца, аднак, і ў влр. гаворках (гл. Соболевскаго, Лекц. по ист. р. яз. [4], ст. 246). Мы самі іх чулі ў Вяземск. пав. (у Ізьдзешкаўск. вол.)

У некаторых (непаўднёвых) дыялектах зам. ф. ф. дамо, ямо ўжываюцца ф. ф. дадзім, ядзім; значна радзей трапляюцца дадзём, ядзём. Нарэшце, зазначу ф. дадом, якую я чуў у Дукарцы Сьмілавіцк. р. Відавочна, сваё існаваньне яна атрымала пад уплывам такіх ф. ф. як ідом, жывом (аб іх гл. ніжэй). Ужываецца і ф. ядом.

Ад дзеясл. *есмь* захавалася ў блр. дыялектах ф. 3 ас. *есьць*, якая далей падупадае ў розных гутарках шэрагу зьмен, фонэтычнага і нефонэтычнага характару: ёсьць, ёсь, ёсьцяка, ёсяка, побач з гэтым éсьцяка, éсяка.

У паўднёвых блр. гаворках (у бабруйскіх, слуцкіх, мазырскіх, рэчыцкіх і гомельскіх) дапаможны дзеяслоў мае ф. *е* (як і ў значнай большасьці украінскіх дыялектаў) Адпаведна гэтаму *е* у некаторых гаворках зьяўляецца *ё*. Шляхта (а часам пад яе ўплывам і суседняе сялянства) ужывае яшчэ ф. *ест* (пар. падр. адк. № 3). Ф. ф. 1 і 2 ас. адз. л. тэматычных дзеясловаў не выклікаюць асаблівых увагаў [1]), аб 3-й-жа асобе адз. л. давядзецца пагаварыць дакладней (гл. карту № 17).

Як вядома, у пэўных дыялектах мы назіраем ф. ф. 3 ас. некаторых катэгорый дзеясл. без канч.-*ць* (<-ть), у той час як у іншых дыялектах гэта—*ць* зьяўляецца ва ўсіх дзеясловах. Яшчэ ў I т. сваіх „Белоруссов“ ст. 193 і наст., потым у 2-м вып. II т. (ст. 341-349) акад. Карскі адсутнасьць ці прысутнасьць гэтага канчатку бярэ за аснову дыялектычнага падзелу блр. мовы Ф. ф. 3 ас. адз. л. без—*ць* (пераважна ў дзеясловах з асновамі на—*е*—) расійскі акадэмік лічыць адзнакаю паўдн.-заходн. дыялектаў, прычым самае адпадзеньне зазна-

[1]) Тут можна толькі ўспомніць, што ў выніку аналёгіі ў некаторых пэрыфэрычных гаворках зьяўляюцца такія ф. ф. 1 ас. як кáсю, вазю, сьпю ад дзеясл. касіць, вазіць, спаць.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

чнага канчатку ён абвяшчае пазьнейшай зьявай. Але ў адносінах да ф. ф. З ас. адз. л. дзеясл. блр. гутаркі трэба падзяляць не на дзьве, а на тры паласы. Такой трэйцяй, пераходнай паласой зьяўляюцца гутаркі, у якіх канчатак—*ць* у дзеясл. II-га спраж. можа адпадаць, прычым умоваю гэтага адпадзеньня зьяўляецца ненаціскнутасьць тэматычнага галоснага: нòсе або ў выніку яканьня нóся [1]). Прыводзячы прыклады з розных запісаў (напр., з „Материалов" Ляцкага: народзя, гавóра, мýся, прóся), Карскі не звараціў увагі на тую акалічнасьць, што тут адпадзеньне канч.—*ць* у дзеясл. II спр. цалкам залежыць ад таго, на што падае націск. У гэтай пераходнай паласе магчымай зьяўляецца далейшая дыфэрэнцыяцыя: таксама і ў дзеясл. I спр. можа зьяўляцца або адсутнічаць канч.—*ць* у залежнасьці ад націску. У таго самага Ляцкага знаходзім баба мéля пры бярэць. Гэтую падгрупу пераходнай паласы трэба вызнаць даволі шырокай. У другой падгрупе пры заўсёдным адкідваньні—*ць* (або—*ть*) у дзеясл. I спр., гэтае адкідваньне ў дзеясл. II спр. абумоўліваецца націскам. Такое становішча адбіваецца, здаецца, у паўднёвай гутарцы цьвёрдаэрай падмовы (гл. арт. Раманава аб гаворках Магілеўск. губ. ў I т. Зборн. Аддз. Мовы і Літ. ІБК., ст. 126). Гэтую пераходную паласу на карце мы адзначылі штрыхоўкаю; да яе аднесьлі мы гаворкі, у якіх, наогул, назіраецца непасьлядоўнае ўжываньне флекс. З ас. адз. л. (гл. карту № 18).

Паўдн.-заходняя паласа, у якой З ас. адз. л. дзеясл. I-га спраж. адрозьніваецца ад зазначанай ф. II-га спр. адсутнасьцю—*ць* (—*ть*), цягнецца даволі далёка за граніцай БССР з Польшай; яна-жа адбіваецца і ў літаратурнай мове. Працягам яе ва ўсх. Беларусі будуць наступныя мясцовасьці: Вял. Сяло, на зах. ад Менску, в. п. Шчаснага, потым Гатава (Мат. блр. № 7), далей р. р. Самахвалавіцкі, Койданаўскі (н. з., зап. Вашына зСкварцоў [2]) (Шацкі (Мат. блр., № 8 [2])), Узьдзенскі (в. п. Атраховіча-Крапівы, запісы Шэйна, Мат., II), потым Сьміл. і Чэрв. р. (н. з. з Дукаркі, Клінка, Волмы), Асіпавіцкі і Сьвіслацкі (шэраг нашых запісаў з Асіпавічаў, Лапічаў, Лучыц, Смык-Слабады, Карытны і інш. вёсак Асіпав. р., з Сьвіслачы, Холуя, Віркава і інш.—Сьвіслацк. р.), б. Жыцінская вол. (Сербаў, Блр.-сак., ст. 117), мясцовасьці на поўдзень ад Бабруйску (Брожа, Карпілаўка і інш., н. з., Качай-балота, Слабодка, в. п. С. М. Некрашэвіча). Прайшоўшы з аднаго боку, недалёка на захадзе і на поўдні ад Жлобіна, які ляжыць ужо ў пераходнай паласе (тут побáч з кажа—хóдя, сядя, улáзя, гл. Рам., Блр. Сб., III, ст. 269—270 і інш.), але, з другога боку, на поўн. і на ўсх. ад Рэчыцы (у Бронным і Дзяржні пры хóчэ, бýдзе чуваць хóдзіць, нóсіць), ізоглёса, магчыма, захопіць паўдн.-ўсходні куток б. Гомельск. пав. (а іменна, Дзятлавіцк. вол., гл. Рам., Блр. Сб., V, ст. 21, 122, 128 і інш.) На карысьць першай паласы яна, нарэшце, адрэжа мясцовасьці на зах. ад Чарнігава. Прынамсі, гэта мы можам сказаць аб Няданчычах і Плёхаве (н. з.) За вельмі нязначнымі выключэньнямі разгледжанае становішча дзеясл. канчаткаў мы ўсюды знойдзем і далей на поўдзень—у Мікулічах і Юравічах (Мат. блр., №№ 17 і 30), у Камаровічах і Запольлі (Мат. блр., № 10), у іншых вёсках Слуцкай і Мазырск. акр. (шэраг розных крыніц), у Лоеве, Ст. Ёлчы, Камарыне б. Рэчыцк. п.

---

[1]) Гэтк. чынам, тут адбываецца яшчэ прыпадабненьне канч.—*і* (уласна, па пахаджэньні тэматычн. галоснай II спраж.) канчатку I-га спраж. (—*е*). Розьніцу ў адносінах З ас. дзеясл. да канч.—*ть* (—*т*) у залежнасьці ад месца націску ўстанаўляе і проф. Селішчев, гл. яго рэцэнз. на „Оч. ист. р. яз." Дурново, ИОРЯСРАН, т. XXXII, ст. 328.

[2]) Аб належнасьці Койданава і Шацка (з суседнімі вёскамі Левановічамі, Міхалевічамі і інш.) да гэтае паласы сьведчаць таксама запісы Нікіфароўскага ў „Белар. песьнях „частушках".

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(н. з.). З паўднёв. часьцін БССР разгледжаная паласа беспасрэдна пераходзіць у суседнія мясцовасьці Украіны.

Пераходная паласа распаўсюдзілася на значнай адлегласьці. Прыклады слу́жа, но́ся, цурубо́ня, бу́дзя пры жыве́ць, цячэць, сядзіць можна пачуць на поўдні ад Заслаўя (напр., у Захарычах, 4 в. ад Заслаўля, н. з.), потым у Астрашыцка-Гарадзецк. р. (у Лысай Гары, у Сухой Гары і суседн., н. з., пар. таксама зап. А. Розэнфэльда з Мятлічына, Белар. нар. песни), далей у Смалявіцкім (у ненадрукаваных яшчэ матар'ялах І. А. Сербава, даволі ўважлівага запісчыка, з Юрава б. Барысаўск. пав., цяпер Смалявіцк. р., чытаем: выхо́дзя, пыдмета́я, але ідзе́ць), на поўн. ў цяпер Лагойскім р. (гл. Ляцкага ў Чт. в. общ. ист. и др. за 1898 г.; прыклады мы прыводзілі вышэй), у Зембінскім р. Барысаўск. акр. (н. з.), нават у крайнім паўночным яго пункце—у Мсьціжу (Шэйн, Мат. II, ст. 200, 209-210 і інш.). Гутаркі пераходнага характару ў адносінах да ф. 3 ас. адз. л. мы знойдзем на паўн. ўсходзе ад Барысава (у Пагадзіцы, н. з.), у Дакудаве Крупск. р., прыблізна пасярэдзіне паміж Бабром і Барысавым (падр. адк. № 5, складз. В. Самцэвічам), далей у Ліпніцы (гл. Шэйн, Мат. II, ст. 42 і н.). На падставе заяўленьня Раманава (Гаворкі Магілеўск. губ., I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК) мы адносім да пераходнай паласы наступныя магілеўскія гаворкі з „непасьлядоўным ужываньнем флекс. 3 ас. адз. л.": паўднёвую (займае Гомельскі пав. і амаль увесь Рагачэўскі) і друцкую (на поўн. ад паўднёвай) гаворкі цьвёрдаэрай падмовы, з мяккаэрай паласы—гаворкі „паўднёвую мяшаную" (у паўднёв. часьціне Чэрыкаўск. п., каля Сожу—у валасьцях Палужаскай, Амхініцкай, Новаельніцкай, Старынкаўск., Студзянецкай, Самашэеўск. і Краснапольскай, у заходн. часьц. Клімавіцк. п.—Забялышынскай, Бялынкавіцк., Бераскоўск., Касьцюковіцк. і Ціманаўскай[1]) вал.), і „прыдняпроўскую мяшаную" (у заходніх часьцінах Горацкага і Чавускага паветаў). Належнасьць пералічаных мясцовасьцяй да пераходнай паласы ў цяперашні час можна праверыць запісамі І. А. Сербава з Кульшычаў, падрабязным адказам (№ 1) А. Шашалевіча з Краснапольск. р. (§ 132: хо́дзіць і хо́дзя, чыта́я і чыта́іць), нарэшце нашымі запісамі з Буды Кашалёўскай; пар. яшчэ адк. з Мокрага (Мат. блр., № 9): несе́, ро́бя.

Далейшым працягам пераходнай паласы на поўдні будуць паўночныя часьціны б. Чарнігаўскай губ., гл. О. Курило, Фонет. та деякі морфол. особлив. гов. с. Хоробричів, ст. 82, потым „Свод материалов" па Чарнігаўск. губ., апрацаваны проф. Растаргуевым (Тр. М. К., в. 9). У адказах па програмах з Гараднянск., Сосьніцк,, Ноўг.-Северскага пав. знойдзем тут хістаньне (п. 8), але гэта і паказвае на належнасьць гутарак да пераходнай паласы; пар. яшчэ Міхальчука ў VII т. Тр. Этн.-Ст. Эксп. в з.-р. кр., які аднэй з адзнак „Северского поднаречия" (на ст. 490, гл. таксама ст. 538) лічыць „ф. 3 л. ед. ч. наст. врем.: хо́дитъ, хо́детъ и ходе, несе и носетъ" [2]). Канчаткі 3 ас. адз. л. на—ець,—є,—я,—а ўласьцівымі зьяўляюцца, па заяўленьні Міхальчука (на ст. 491) і „Северско-Велико-Русскому разноречию" „Северского поднаречия". Апошняе „разноречие" і займае на карце Міхальчука паветы Новазыбкаўскі, Старадубскі, Мглінскі і Сураскі, г. зн. тыя мясцовасьці, якія і зрабіліся прадметам дасьледваньня П. А. Растаргуева. Цікава, што яго назіраньні прыблізна супадаюць з тым, што гаварыў Міхальчук., гл. „Гов. вост. у. у. Гом. г. в их соврем.

[1]) Аднак, у запісах самаго Раманава з Ціманава (гл., напр., Блр. Сб. III, 120 і н.) заўсёды ўжо—ць.

[2]) З гэтага „северского поднареч." на карысьць першай паласы мы, аднак выключылі, як ужо казалі, яго заходнюю часьціну.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

сост.“, ст. 19, пар. таксама Полевого, О яз. нас. Нов. у. Гом. г., ст. 25 [1]). Як відаць з некаторых адказаў у зазначаных вышэй матар'ялах па Чарніг. губ. (Тр. М. К., в. 9, №№ 2—з Глухаўск. п. [2]), 7—з Мглінскага, 9 з Ноўг.-Северск. п.), потым з арт. Растаргуева „Да характ. блр. гав.“, які друк. ў I т. Зб. Аддз. М. і Л., № 13 [3]), далей з Мат. для из. влр. гов., VIII, ст. 231, нарэшце, з запісаў А. Сержпутоўскага (гл. Отчет о поездке в Гом. г. в 1926 г., 1926, ст. 4), на ўсход ад лініі Кралевец—Ноўгарад-Северск—Мглін канчатак—*ць*(—*ть*) пачынае панаваць ва ўсіх дзеясловах.

Ад Мгліну граніца паміж пераходнымі гаворкамі і гаворкамі, якія пасьлядоўна ўжываюць канч.—*ць* (—*ть*), накіруецца на паўн. зах.; пройдзе яна ніжэй ад Ціманава (каля Клімавічаў), ад Плешчыц (гл. арт. П. А. Растаргуева, Да характ. блр. гав., адк. на прогр. № 4, друк. ў I т. Зборн. Аддз. М. і Л. ІБК.), нарэшце на поўдні (і на зах.) ад Бабра [4]) (Рам., Блр. Сб. I, ст. 11) і ад Лепеля, з якога знаходзім запісы ў Нікіфароўскага, Белар. песни „частушки“, ст. 51 і н.[5]).

На поўн. і на ўсх. ад гэтай лініі ўсюды—*ць* (—*ть*), гл. арт. Раманава аб Магіл. гаворках, I т. Зборн. Аддз. М. і Л., ст. 139 (адносна Сеньнеск. гаворкі), потым Мат. блр., №№ 26, 27, 28, 18, 32; зап. Шлюбскага з Віцебшчыны, Добравольскага з Смаленшчыны, запісы М. Гарэцкага з М. Багацькаўкі, 25 в. на паўн. зах. ад Амсьціслаўля, падр. адк. № 4 (аб вёсках каля Амсьціслаўля: Белы Мох, Шыркі і інш.), складзены Я. Бялькевічам), н. з. з Рослаўск. пав., проф. Буддэ з Бранск. п. і шэраг інш. крыніц.

Каб скончыць з пытаньнем аб 3 ас. адз. л. дзеясл., успомнім яшчэ аб тым, што ў блр. гаворках пашырана ф. ф. 3 ас. адз. (і мн. л.) на—*ці* (—*ті*): сядзіці, будуці (у гомельск., сеньненск. дыялектах). Мы асабіста чулі такія ф. ф. ў б. Рэчыцк. пав. і ў Бабруйск. акр. М. інш., гэта—*і* часам трохі рэдукуецца, і канчатак—*ці* (—*ті*) [6]) можа ўспрыняцца як больш моцнае цеканьне.

Пераходзім цяпер да разгляду ф. ф. 1 асобы множн. ліку.

Паўднёва-блр. дыялекты адзначаюцца, як вядома, такімі формамі 1 ас. мн. л., як бу*дам*, пой*дам*, жыв*ом*, маг*óм* (і м*óгам*), ід*óм* і т. п. Ізоглёса гэтай зьявы, прыроду якой мы паспрабуем далей высьветліць, даволі вялікая, ва ўсякім разе значна большая, як ізоглёсы іншых паўднёва-блр. асаблівасьцяй (напр., саканьня, зьмены *ы* на *у* пасьля губных), гл. карту № 19. Даючы граніцу цікавячай нас морфолёгічнай адзнàкі, трэба заўважыць, што блізка каля граніцы гэтай зьявы мы бачым пераходную паласу, якая характарызуецца тым, што ў ёй падобныя ф. ф. магчымы толькі тады, калі націск падае на канчатак: і*дóм*, пакла*дóм*, жыв*óм*. У гэтай пераходнай паласе ляжыць, напр., Капыль Слуцк. акр., адкуль Цішка Гартны, што робіць зразумелымі такія прыклады ў яго мове, як прывя*дом*, успа*дом*, уця*ком*,

---

[1]) Аб далейшым працягу пераходн. паласы на украінск. тэрыторыі гл. Міхальчука, Тр. Этн.—Ст. Эксп., VII, ст. 474.

[2]) З мястэчка Варонежа Глухаўск. п. ёсьць запісы І. Абрамова (Черниговские малороссы, 1905), але параўнаньне іх з адказам у зазначаных матар. па Чарніг. губ. выклікае сумненьне адносна іх дакладнасьці.

[3]) № 13 станов. адк. з вёсак Онахава, Харабочы, Высокае і інш., якія ляжаць у 20 в. на поўн. ад Почапу.

[4]) Але на ўсх. ад Дакудава Крупск. р., гл. вышэй

[5]) Заўсёды —*ць* зьяўляецца ў 3 ас. адз. л. дзеясловаў і ў м. Камені, што ў 17 в. на паўн. ўсх. ад Лепеля, в. п. студ. Кляшторнага.

[6]) Запазычаем гэты знак у Шахматова, гл. яго „Очерк. древн. пер. ист. русск. яз.“

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

пры адсутнасьці такіх прыкладаў, як бу*дам*, пой*дам*[1]). Аб гэтых вядомых нам пераходных гутарках мы і далей успомнім, хоць з некаторых прычын на карце іх не адзначалі штрыхоўкаю.

Ф. ф. бу́*дам*, ідо́*м* ведаюць, звычайна, і пэўныя мясцовасьці (галоўн. чынам, суседнія) замежнай Беларусі і ў тым ліку радзіма Якуба Коласа—Мікалаеўшчына каля Стоўбцаў (гл. Зборн. „Якуб Колас у літаратурн. крыт.“ 1926, ст. 136-137) Належнасьць Мікалаеўшчыны да пераходнай паласы (толькі з такімі ф. ф. як ідо́м, жывбо́м) пацьвердзіў і Я. Ю. Л ё с і к. У БССР цікавячая нас ізоглёса ўваходзіць праз Узьдзенскі р., часьціна якога (паўдн.—Прысынак, Пясочна, в. п. студ. С р э ц е н с к а г а, Нізок—в. п. А т р а х о в і ч а - К р а п і в ы) ведае ф. ф. 1 ас. мн. л. з канч. *—о́м*, *—ам* і з непамякч. зычнымі прад імі. У паўночна-заходняй часьціне таго-ж раёну, як мы ў гэтым праканаліся з размоў з адным селянінам на ст. Койданава, гэтых ф. ф. мы ўжо ня сустрэнем. Цалкам зразумела, што іх ня знойдзе́м і ў Койданаўскім р. (н. з.). Далей ізоглёса перарэзвае Самахвалавіцкі р., усходняя часьціна якога (напр., Крупіцкі с.-савет, Бардзілаўка, в. п. настаўнікаў на Менскай Пэдагогічнай Конфэрэнцыі., Гатава, Мат. блр., № 7) ведае, бясспрэчна, цікавячую нас асаблівасьць. Прайшоўшы ў паўн.-ўсходнім кірунку недалёка ад Менску, яна захопіць Дукору, Дукарку, Турэц, Клінок, Волму (н. з.), потым вёскі на поўначы ад Чэрвеня, б. Ігуменя (напр., Гарадзішча, гл. фольклёрн. матар'ялы ў ІБК) і на паўн. ўсход (Дамавіцкае). Да Смалявічаў (в. п. наст. А п а ц к а г а) і да м. Бярэзыні (адк. № 8) ф. ф. бу*дам*, і*дом* не даходзяць. Але граніца іх праходзіць недалёка на поўдні ад апошняга мястэчка; паўднёвая часьціна Бярэзыньск. р. Барысаўск. акр. (напр., Брадзецкі с.-с., адк. № 9, н. з. з Вінарова, Божына, Міхалёва (бліжэйшыя ад Брадца вёскі), якія мы зрабілі ад аднэй сялянкі на Асіпавіцк. вагзале) ужывае ф. ф. на *—ом*, *—ам* з непамякчан. зычнай перад імі. Што-ж датычыцца мясцовасьцяй пасьля Бярозы, тут папершае ўзьнікае пытаньне аб Ліпніцы. Мы на падставе адк. № 5 пакінулі яе па-за мяжой тэрыторыі з ф. ф. будам, ідом, але магчыма, што гэтыя ф. ф. ў Ліпніцы яшчэ дажываюць свой век, і ґяе трэба было-б паставіць на другі бок граніцы. Прынамсі ў запісах Ш э й н а з Ліпніцы ў II т. яго „Мат. для из. быта и яз. русск. нас. с.-з. кр.“ (1893, ст. 80) чытаем: перойдам. Ідучы далей прыблізна на ўсход, граніца дойдзе да Доўгага (Мат. блр., ст. 117); адхіліўшыся потым трохі на поўдзень, ізоглёса пракладзе сабе шлях на поўдні ад Чыгірынкі (гл. Р а м., Блр. Сб. III, ст. 92-99, 304-307 і інш.), ад Гайшына (ibid. ст. 198-205, 340-345) і нават на поўдні ад Навасёлак Кармянск. вол. (ibid., ст. 154-164), але, з другога боку, на поўначы ад Азяран (ibid., ст. 322-323, 336-337 і інш.), ад Станькава (ibid., ст. 88-92, 400-403), ад Гарадца (ib.,, ст. 148-154, 181-186), нарэшце, на поўн. ад Шэрыхаўск. Буды (ibid., ст. 350-357, 410-412) і ад Нісімкавічаў (10 в. на ўсх. ад Чачэрску, Р а м., ib., ст. 228-232 і інш.).[2])

Перасекшы р. Бесядзь прыблізна на ўсходзе ад Чачэрску (мы ведаем ад студ. Ц і м а ш э н к і аб існаваньні цікавячых нас ф. ф. у Верхлічах, в. блізкай ад Балсуноў), граніца ідзе і далей у паўдн.-ўсх.-ўсходнім кірунку, але потым недзе паварачвае на поўдзень, каб абагнуць Новазыбк. пав., які ведае цікавячыя нас ф. ф.[3]).

---

[1]) Гл. „Полымя“ за 1926 г., № 5, ст. 133, а таксама зборн. „Якуб Колас у літаратурнай крытыцы“, ст. 136. Між інш., аб гэтых пераходных гутарках з *—ом* і з непамякч. зычн. прад ім мовазнаўцы, насколькі нам вядома, нічога не гавораць.

[2]) І на поўн. ад праведзенай лініі адзіночна трапляюцца ф. ф. будам, ідом.

[3]) З прыкладаў А. П о л е в о г а (О яз. насел. Новозыбк. у Гом. г., ст. 25) відаць, што ў гэтым павеце падобныя ф. ф. ўжываюцца толькі пры націскнутасьці канчатку: нясо́м, вядо́м.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Для высьвятленьня ўсходняй дзялянкі тэрыторыі з ф. ф. будам, ідом у нас ня хопіць падрабязных ведаў, і таму тут мы правялі яе трохі ўмоўна і прыблізна [1]). Але бясспрэчным ужо зьяўляецца існаваньне данай зьявы ў Харобрычах (О. Курило, Фонет. та деякі морфол. особлив. говірки с Хоробричів, 1924, ст. 81). Далей граніца праходзіць, відавочна, недалёка ад Гарадні. Ідучы ў такім паўдн.-зах. кірунку, яна даходзіць, магчыма, да вусьця Прыпяці. Ва ўсякім разе сёлета мы даведаліся аб ужываньні ф. ф. жывóм, бýдам і т. п. ў Плёхаве, у Няданчычах—на левым беразе Дняпра і ў шэрагу вёсак (Ст. Ёлча, Камарына, Лукаеды) на правым беразе тэй-жа ракі. Існаваньне ф. ф. ідóм, жывóм (дакладней, ідъм, жывъм) у Лукаедах паказвае на тое, што ў кутку паміж Прыпяцьцю і Дняпра граніца данае морфолёгічнае адзнакі праходзіць ніжэй ад граніцы паміж мяккім і цьвёрдым вымаўленьнем зубных зычных. Мы ня ведаем дакладна, ці існуюць ф. ф. ідóм ,жывом і ў В. Жарах (у некалькіх в. в. на поўдз. ад Лукаедаў); цалкам магчыма, што яны і тут жывуць, і таму мы адважыліся дацягнуць зафарбаваную на карце тэрыторыю да вусьця Прыпяці. На захадзе ад Прыпяці мы граніцу цікавячых нас ф. ф. правялі па граніцы БССР з УССР. Магчыма, што гэтыя ф. ф. ў некаторых мясцох пераходзяць за граніцу, адказаць на гэта пакуль што няма магчымасьці. Ведаем толькі, што ф. ф. бýдам (тут ужо бýдом), ідóм жывуць у Цешкаве, Вербавічах і інш. вёсках Нараўлянск. р. (гл. шэраг добрых адказаў А. Крукоўскага пад №№ 22, 25, 26, 27, а таксама адк. № 7), потым у вёсках каля Ельску і Кузьмічоў (у Дабрыні, Багучычах, Ст. Высокім, Новай Рудні і інш), у блізкіх ад Кузьмічаў вёсках б. Скараднянск. вол. (у Валоўску і Карме, гл. Карскага, Мат. для из. с.-млр. гов., а также переходн. от блр. к млр., Сб. ОРЯСРАН, т. 75), нарэшце ў Мілашэвічах (адк. № 2) і ў Глушкавічах (адк. № 17), [2]) але ў запісах В. Кравчэнкі з Оўруцк. п. гэтых ф. ф. ужо не знаходзім, гл. Тр О-ва исследов. Волыни, т. V.

На тэрыторыі, акрэсьленай разгледжанай ізоглёсай, усюды пануюць ф. ф. на *—ом*, *—ам* з непамякчан. зычнай перад імі—у Шацкім р. (Мат. блр., № 8, праверaны в. п. настаўніка С. Гурыновіча), у Жыцінск. вол. (Сербаў, Блр.-сак., ст. 117), у Асіпавіцк. і Сьмілавіцк. р. р. (н. з.), у Слуцкай акрузе (зап. А. Сержпутоўскага і шэраг інш. крыніц), у Бабруйскай і Мазырскай (нашы запісы з Брожы, Карпілаўкі, Капаткевічаў, Каленкавічаў, Скрыгалава і інш., зап. Сержпутоўскага, Мат. блр., № 10—з Камаровічаў і Запольля, падр. адк. № 2 (удзельнікаў сёлеташняй студэнцкай экспэдыцыі) з Тураўскага р. і інш. крыніцы), нарэшце ў б. Рэчыцк. пав. (Мат. блр., №№ 17 і 30, н. з. з Лоева, Крупеяк, Броннага і Дзяражні) і ў Гомельскім (гл. зап. Раманава, Блр., Сб., V, з Дзятлавіцк. вол. яшчэ маем „Гомельские народные песни" Зінаіды Радчэнко, з Целяшоў Уваравіцк. вол. зап. Салдаценкі ў ІБК). Астравы на разгледжанай усьцяжнай паласе становяць толькі некаторыя шляхоцкія вёскі. Так, напр., у шляхоцкіх вёсках Асіпавіцк. р. (у Ражнетаве, Ясінцы і інш.) шляхта ўжывае ф. ф. бýдзем, паéдзем, ідзём, у той час як атачаючае іх сялянства (якое, значыцца, было раней пад прыгонам) заўсёды кажа бýдам, паéдам і г. д. Але далей на поўдзень апошнія ф. ф. пераймае ўжо і шляхта, гл. падр. адк. № 3 (студ. Замбражыцкага) з шляхоцк. вёсак Барсукоў, Ясёнаў і Фартуноў (на паўдн.-зах. захад ад Бабруйску).

---

[1]) У апрацаваных Растаргуевым матар'ялах з Чарнігаўшчыны (Тр. М. К., в. 9) цікавячы нас пункт пакінуты без адказу.

[2]) Па-за межамі разгледжанае краіны ф. ф. *завóм, пайдóм, тком, магóм* ведаюць гутаркі „егунов с млр.-блр. примесями", гл. Халанскага. Нар. гор. Курск. г, Сб. ОРЯСРАН, LXXVI, № 5, ст. 27.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Пытаньне аб пахаджэньні разгледжаных ф. ф. вельмі цікавае. Мы рашуча закідаем супроць погляду аб іх фонэтычным пахаджэньні, які, м. інш., нядаўна выказала і О. Курило. У сваёй працы „Фонет. та деякі морфол. особл. гов. с. Хоробричів“ (на ст. 48) яна кажа: „У пслянаголошеному складі з кінцевим *т* *ӑ* взагалі ширшого, як звичайно, відтінку і часто переходить в *ӑ;* перехід цей відбувається одночасно з диспалаталізаціею попереднього шелестового, инакше бо склалася-б неможлива для хороборських артикуляційних звичок позиція палаталізованого шелестового з *а* в ненаголошеному складі“. Бясспрэчна, паважаная дасьледчыца, ня ведаючы дакладна іншых блр. дыялектаў, памылілася:падобныя „артыкуляцыйныя звычкі“ пашыраны, як мы бачылі, на вельмі вялікай прасторы. Апрбч таго, супроць тлумачэньня О. Курило ў хараборскай-жа гутарцы гавораць такія прыклады, як pl'ätъm, ńäsъm (ibid., ст. 23, 24); казаць аб немагчымай позыцыі палятавізаванага зычнага з наступным галосным (у даным разе ъ) тут нельга, бо побач з прыведзенымі прыкладамі ў дыялекце Харобрычаў (як і ў іншых блр. і укр. гаворках) можна пачуць *ut̆ъk* і т. п. (ibid). Нарэшце, думкі О. Курило нельга дапасаваць да тых тэорытычна магчымых гаворак (ужо на поўдні ад граніцы мяккага вымаўленьня зубных зычных), у якіх ф. ф. ідъм[1]), жывъм зьяўляюцца побач з агульным ацьвярдзеньнем зубных (і тым больш губных) зычных перад *е* (і *і*). Існаваньне такіх дыялектаў нам і ўдалася сёлета констатаваць у Лукаедах і ў Радзівілавічах (у апошн. вёсцы па выніках студэнцкай экспэдыцыі).

Даючы сваё тлумачэньне праведзеным ф. ф. (гл. наш артыкул „З лінгвістичних розкопин на Білорусі“, друк. ў зборн., прысьвеч. акад. Багалію), мы не пабаяліся вызнаць іх спадчынаю прадгісторычных эпох (інда-эўроп. і праславянск.), якія характарызаваліся тэматычнай галоснай *о* ў ф. 1 ас. мн. л. (у ст.-сл. м. гэта *о* захоўвалася ў ф. ф. прошл. ч. ч.). Адсутнасьць докумэнтальных даных з старых блр. помнікаў[2]) ня вельмі перашкаджае прыйманьню нашага погляду, бо краіна (паўдн.-блр.), якая ўжывае зазначаныя ф. ф., якраз амаль зусім не адбілася ў старажытнай пісьменнасьці.

Успомнім яшчэ аб тым, што паўдн.-блр. дыялекты ведаюць у ф. ф. 1 ас. мн. л. канчатак *—мо* (ужывальны ў украінск. і сербск. мовах), які ў акаючых мясцовасьцях можа зьмяняецца на *—ма*. Асабліва гэты канчатак любяць ф. ф. загадн. л.

Ф. ф. 2 ас. мн. л. значных уваг ня выклікаюць; можна сказаць толькі аб пашыранасьці націску на канчатку: *дасьцё, сьпіцё* (*ё* тут якраз і зьявілася з націскнога *—е*).

Адносна ф. ф. 3 ас. мн. л. ў дадатак да таго, што мы сказалі (аб ф. ф. консонантычных дзеясловаў, аб канчатку *—ці, —ті* побач з *—ць, —ть*), зазначым яшчэ, што адпаведна зьмяшэньню канчаткаў ф. 3 ас. адз. л. абодвых спражэньняў утварыліся ў блр. (як і ў влр.) дыялектах ф. ф. 3 ас. мн. л., як гавóруць хóдзюць, нóсюць. Гэта замена *—яць, —аць*(*—ять, —ать*) праз *—юць, —уць* (*—ють, —уть*) магчымай бывае тады, калі канчатак ненаціскны.

§ 36. Формы будучага часу.

Формы буд. ч. ад дзеяслов. закончанага трываньня выражаюцца, як вядома, формаю цяперашн. часу (зраблю, зробіш...) Для дзеясловаў-

[1]) Чаму ня *ідэм*, калі ў 2 ас. мн. л. скажуць ідзетэ.

[2]) Адзіночны прыклад на *—омъ* з помніку XVII в. падае акад. Карскі, Блр. II 2, ст. 350.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

жа незакончанага трываньня ўжываецца апісальная ф.: буду рабіць або маю рабіць. Побач з апошнімі ф. ф. ў паўднёвых дыялектах пашыраны ф.ф., якія становяць злучэньне неазначальн. ф. з дзеясл. *іму*, *імеш* і г. д.: рабіцьму (або рабіціму), рабіцьмеш, рабіцьме, рабіцьмем, рабіцьмеце, рабіцьмуць. З тэй-жа прычыны, з якой зьяўляюцца ф. ф. ідо*м*, буда*м*, вынікаюць таксама і ф. ф. будуч. ч. рабіць*м*а*м*, там-жа, дзе няма аканьня—рабіць*м*о*м*. Але магчыма і іначай тлумачыць такія ф. ф., як рабіць*м*а*м*. У Каленкавічах мы чулі ф. 2 ас. мн. л. рабіць*м*а*це*, што дае повад выводзіць зазначаныя ф. ф. з злучэньня неазнач. ф. з дзеяслов. *имамь* або *имаю*. Падобныя ф. ф. і трапляюцца ў ст.—блр. помніках (гл. К а р с к а г а, Блр. II, 2, ст. 389).

Тэрыторыю пашырэньня цікавячых нас ф. ф. можна прыблізна акрэсьліць наступнай лініяй[1]): Шацак (Мат. блр., № 8)—паўночныя пункты б. Жыцінск. вол. (С е р б а ў, Блр.-сак., ст. 118)—Асіпавічы (у мове старога пакаленьня, н. з.)—Брожа (н. з.); далей граніца паварачвае ў паўдн.-паўдн.-ўсходнім кірунку і на тэрыторыі б. Рэчыцк. пав. яна пройдзе паміж Мікулічамі, каля Брагіна (Мат. блр., № 17) і Дняпром: у вёсках на берагох яго (у Лукаедах, Камарыне, Ст. Ёлчы, Лоеве, Бронным, Дзяражні) зазначаных ф. ф. мы не знайшлі[2]). Вельмі пажадана было-б географічнае вывучэньне данае морфолёгічнае адзнакі зьвязаць з такім-жа вывучэньнем гэтай асаблівасьці на тэрыторыі Украіны.

Пашыранасьць разгледжанай зьявы ў блр. дыялектах (слуцкіх, бабруйскіх, мазырскіх і інш.) была прычынай яе ўвядзеньня ў літаратурную мову. Яе ўжываюць Цішка Гартны (гл. наш артык. у „Полымя" за № 1926 г., № 5), Гурло, Жылка, Алесь Дудар (гл. наш арт. „Увагі аб мове і стылі маладнякоўцаў", Маладняк за 1927 г., № 5, ст. 65).

Пры ўтварэньні разгледжаных ф. ф. ад дзеяслов. зваротнага стану *—ся* (а там, дзе саканьне, *—са*) ставіцца ў самым канцы: *вучыць-муся* (або *—са*).

§ 37. Формы прошлых часоў, умоўнага ладу і будучага II-га.

Усе пералічаныя ф. ф. утвараюцца за дапамогай быўшага дзеяпрыметн. прошл. ч. на *—лъ*, *—ла*, *—ло*; дзякуючы ўплыву дзеяпрыметн. мінул. ч. на *—въ*, *—въши* нефонэтычным шляхам замяняецца *л* на *ў* у ф. мужч. р. адз. л. зазначанага вышэй дзеяпрыметніка[3]): я зрабіў, ты зрабі*ла* і г. д.; запрошлы час: я бы*ў* зрабіў, ты бы*ла* зрабі*ла*...; умоўны лад: я зрабіў-*бы*, ты зрабі*ла-бы* (або—зрабіла-б) і г. д.; нарэшце, будучы II: на што я вяночак той пляла, калі ў ім ня *буду хадзіла*. Апошнія ф. ф. маюць пашырэньне ў заходніх гаворках (у Горадзеншчыне). Запэўняць-жа, што яны наогул існуюць „у тых-жа дыялектах, дзе ёсьць будучы складаны час з *іму*" (гл. Л ё с і к а, Грамат. блр. м. Морфолёгія, ст. 44), мы ня маем права: трэба раней (калі зьявіцца магчымасьць) дасьледзіць географію данае морфолёгічнае адзнакі.

§ 38. Формы загаднага ладу.

З ф. ф. гэтага ладу захаваліся ў блр. дыялектах ф. ф. 2 ас. адз. л. (нясі, хвалі, кінь, пі, мый) і 1 і 2 ас. мн. л. (нясем, хвалем, кіньма, піма, мыйма; нясеце, хвалеце, кіньце, піце, мыйце). Гэткім чынам, як і украінскія гаворкі, так і пэўная часьціна беларускіх (якая і адбі-

[1]) Іх ведаюць і блр. гаворкі, якія знаходзяцца пад Польшчай, напр. горадзенскія.

[2]) Таму мы іх ня знойдзем і на ўсходзе ад Дняпра, гл. Тр. Этн.-Ст. Эксп. в. з.-р. кр., VII, ст. 491 і 539; няма іх і ў Гарнастайпалі пры вусьці Прыпяці, ib., ст. 540.

[3]) Дакладней аб гэтым у нашым „Нарысі істор. укр. м.", ст. 34-35 і 79.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

лася ў літаратурнай мове) адзначаюцца перанясеньнем -*ѣ*-, якое стаяла прад канчаткамі множн. л., з дзеясловаў I-га і II-га клясаў на дзеясловы наступных класаў: ня толькі бярэце, укр. беріть, але і хвалеце, укр. хваліть. У влр. гаворках процэс быў адваротны: пад уплывам *хвалите* зьявілася *берите* (аб гэтым пытаньні гл. акад. Соболевскага, Лекц. по ист. р. яз. [4], ст. 252-253). Апошні процэс пашырыўся і на значную часьціну дыялектаў Усходняй Беларусі. Граніца паміж хадз*і*це і хадз*е*це прыблізна праходзіць каля Менску (у Захарычах і Каменцы Заслаўск. р., у Астрашыцка-Гарадзецк. р., у Дукарцы Сьмілав. р., у Клінку і Волме Чэрвеньск. —*іце,* усё н. з.); далей яна перарэзвае Асіпавіцк. р., паўднёвая часьціна якога (Карытна, Ст. Тарасавічы) ведае ўжо ф. хадз*е*це (уласна кажучы, хадзіеце, бо тут захоўваецца поліфтонг з *ѣ*). Гэтыя ф. ф., у якіх адбіваецца *ѣ*, пануюць у Самахвалавічах (зап. Сербава) у Койданаве (н. з.), у Шацку (Мат. блр., № 8), у б. Жыцінск. вол. (Сербаў, Блр.-сак., ст. 119), у Брожы (н. з.) і, зразумела, далей на поўдзень [1]) (шэраг крыніц). Наадварот, на поўн. ад праведзенай лініі пачуем усюды хадз*і*це—у Сьмалявічах (в. п. наст. Апацкага), у цяперашнім Лагойск. р. (гл. Ляцкага „Мат. для из. яз. и творч. блр.“ у Чтен. в Общ. ист. и др. росс. за 1898 г., кн. III-я, ст. 59: Чэрці, ідз*і*ця табаку церці), у Зембінск. р. (н. з.). Ад Брожы граніца спускаецца ў паўдн.-ўсходнім кірунку. Прайшоўшы недзе на поўдні ад Качай-балота і Слабодкі (в. п. С. М. Некрашэвіча), потым па паўночнай часьціне б. Рэчыцк. пав., яна далей пройдзе на поўдні ад б. Гомельск. пав.: у запісах Раманава з гэтага пав. (гл. Блр. Сб., V) пануюць ф. ф. на —*іте*, але ў Харобрычах ужо zav*ѣt'ä* (гл. О. Курило, Фон. та деякі морф. особл. гов. с. Хоробричів., ст. 82). Далей сачыць за географіяй цікавячых нас ф. ф. мы ня можам, бо ў крыніцах нашых ведаў аб гэтых мясцовасьцях (гл. П. А. Растаргуева, Гов. вост. у. у. Гом. г., ст. 19, яго-ж „Свод материалов“ па Чарнігаўск. губ., Тр. М. К., в. 9, А. Полевого, О яз. нас. Новоз. у. Гом. г., ст. 26) мы не заўсёды знаходзім адказ на данае пытаньне; але з прыкладаў у Сев.-блр. гов. (ст. 117) можна зрабіць вывад аб існаваньні ў дасьледжаных Растаргуевым мясцовасьцях ф. ф. на —*іце*. Бясспрэчным зьяўляецца, аднак, існаваньне ф. ф. на —*і*це (*і*те) на поўн. і на паўн. усх. ад Рэчыцк. і Гомельск. паветаў: у Азяранах, Навасёлках Карм. вол., у Гайшыне (Рам. Блр. Сб. III), у Мокрым б. Быхаўск. п. (Мат. блр., № 9), у Краснапольск. р. (падр. адк. № 1 А. Шашалевіча, § 137), каля Амсьціслаўля (падр. адк. № 4 Я. Бялькевіча), у Касьцюковічах Клімавіцк. акр., гл. Зеленіна, Описан. р-сей Учен. Арх. Русск. Геогр. О-ва, 2 в., 1915, ст. 702—705: сгукн*і*ця, нарэшце, у Віцебшчыне і Смаленшчыне (шэраг крыніц). Ф. ф. 1 ас. мн. на —*ем* (<—*ѣмъ*) больш пашыраны ў параўнаньні з ф. ф. 2 ас. на —*еце:* ёсьць гутаркі (напр., у Шацку, Мат. блр., № 8, у Мокрым № 9 Асіпавіцк. і Сьмілавіцк. р. р. і інш.), дзе побач з кас*і*це, хадз*і*це скажуць кас*е́*м, хадз*е́*м.

Ф. ф. 3 ас. адз. і мн. л. заг. л. выражаюцца апісальным спосабам: няхай ён зробіць і т. п. Паводле такога тыпу часам утвараюцца і ф. ф. 2 ас. мн. л.: няхай-бы вы зрабілі, хай-бы вы пасядзелі (падр. адк. № 1, § 137). Адзін прыклад падобнай ф. знайшлі мы ў Цішкі Гартнага (хай-бы вы... прыселі, гл. наш артыкул у 5-м № „Полымя“ за 1926 , ст. 133). Мы асабіста чулі падобныя звароты нават у Менску.

---

[1]) Гэтыя канчаткі —*ѣмъ*, —*ѣте* могуць у паўднёв. гутарках, у якіх рэфлекс *ѣ* набліжаецца да *і*, зьмяніцца ў кірунку да —*ім*, —*іте* (—*іце*), але морфолёгічна гэтыя вынікі адрозьніваюцца ад паўн.-ўсх. блр. і влр. ф. ф. на —*ім*, —*іте* (—*іце*).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Уплывам адпаведных ф. ф. цяперашн. (і будучага) часоў, выкліканы ф. ф. загадн. л. (ад дзеясл. з асновамі на *к, г*) з *ч, жс* перад канчаткамі: пя*ч*ы, пя*чэ*це, памаж*ы* і г. д.

§ 39. Канчаткі дзеясловаў зваротнага стану.

Тыя цэнтральныя гаворкі, якія адбіліся і ў літаратурнай мове, не скарачаюць канчатку *—ся* (гл. Лёсіка, Грам. блр. м., Морфолёгія, 1927, ст. 31); на ўсходзе-ж і на поўначы можна часьцей пачуць такія прыклады, як усхапі*сь*, памыла*сь* (гл. падр. адк. №№ 1 і 4).

У некаторых блр. дыялектах зам. *ся* можна пачуць *—сі* (напр., у сеньненскіх), але найбольш пашыранай зьменай канчатку дзеяслов. зваротага ст. зьяўляецца гэтак званае саканьне ці зьмена *—ся* на *—са*. Ня трэба шукаць фонэтычнай прычыны гэтага процесу; у іншых катэгорыях *—ся* застаецца нязьменным, і таму мы, у процілегласьць акад. Карскаму, лічым лепшым адвесьці яго разгляду месца ня ў фонэтыцы, а ў морфолёгіі. Апроч таго, як дапускае сам Карскі (Блр. II, 1, ст. 458-459), прычынай данай зьявы быў, відавочна, уплыў з боку дзеясловаў з канчаткам *—ца, —цца* [1]),—гэткім чынам, адбыўся процэс чыста морфолёгічнага парадку.

Саканьне пашырана і ў Заходняй Беларусі—у Горадзеншчыне, Наваградчыне; у БССР яно ўваходзіць якраз (гл. карту № 20) на захадзе ад Слуцку; пар. Мат. блр., № 5—з Грыцевічаў б. Слуцк. пав., якія знаходзяцца ў 50 в. на зах. ад гэтага гораду. Паступова падымаючыся на поўнач, ізоглёса саканьня пройдзе на поўн. ад вёсак Вірабейчы, Слаўкава, Сухаўчыцы, Перавоз, Леніна (Раманава), ад Падлесься і Баслаўцоў, але на поўдні ад Цімкавічаў і Капыля (в. п. настаўніка скрыгалаўск. школы Д. А. Жоглы, потым Я. Марука і іншых студэнтаў-случчан). Чым далей, тым граніца ўсё больш паварачвае на поўнач; пасьля Баслаўцоў яна пройдзе на ўсходзе ад Грозава, Яўсеевічаў, Волгавічаў і Старыцы (на вялікай карце БССР надруков. Старына), але на захадзе ад вёсак Трухановічы, Падлужжа, Камень, Карачэўшчына (в. п. студ. П. А. Зянюка і інш. студэнтаў са Случчыны). Павярнуўшы потым зноў на паўн. ўсход, ізоглёса адрэжа паўдн.-ўсходні куток Шацкага р. (вёскі Кабылічы, Гарэлец і Пясчанку, в. п. студ. А. Самсонікава), пасьля чаго пачне спускацца на паўдн. ўсх., захапіўшы ня толькі ўсе вёскі б. Жыцінск. вол., дасьледжаныя І. А. Сербавым (гл. Блр.-сакуны), але некаторыя пункты на паўн. усходзе ад яе—пад самым Асіпавіцкім р. (Мязовічы [2]) і Крынкі). Перарэзаўшы чыгунку недзе паміж Фалічамі, дзе сакаюць, і Асіпавічамі, ізоглёса пройдзе недалёка на поўначы ад Глуску (у Калюзе яшчэ сакаюць, у Жэлвінцы ўжо гэтая зьява адсутнічае); далей яна пракладзе сабе шлях паміж наступнымі пунктамі—Брожай (н. з.), Качай-балотам і суседнімі вёскамі (в. п. С. М. Некрашэвіча) і Азарычамі (в. п. т. Кулакова), з аднаго боку, і Зубарэвічамі (адк. № 4), Шковай (в. п.), Карпілаўкай і Капаткевічамі (н. з.), з другога. Ахапіўшы потым некалькі вёсак на поўн. ад Каленкавічаў, ізоглёса ўпіраецца недалёка на поўн. ад Юравічаў у Прыпяць. Далей граніцай саканьня на некаторай адлегласьці служыць Прыпяць [3]), аднак, яна не даходзіць

---

[1]) А гэтыя канчаткі *—ца, —цца* з *—ця* (*<—ться*) ужо фонэтычным шляхам, у выніку аццьвярдзеньня *ц*.

[2]) Адна дзяўчына з Асіпавічаў, прыйшоўшы да сваёй цёткі, паведаміла яе: „выхаджу замуж у самае *сакуньнё*—у Мязовічы".

[3]) Аб адсутнасьці саканьня па ўсх. ад Дняпра нас паведаміў інспэктор Рэчыцкага Акрана т. Пруднік, а таксама і настаўнікі на конфэрэнцыі ў Рэчыцы.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

да граніцы БССР з УССР; не захапляе саканьне шэрагу вёсак у паўдн.-зах. часьціне Нараўлянск. р. (адк. А. Крукоўскага № 22, 25—27) [1]).

На поўдні цікавячую нас зьяву мы ня толькі знойдзем каля Кузьмічоў (н. з.), потым у б. Скарадн. вол. (гл. Шэйна, Мат. I, 1, 44 і наст., потым Сб. ОРЯСРАН, т. 75), нарэшце ў Радзівілавічах (в. п. аўтараў падр. адк. № 2), але і на поўдні ад Кузьмічоў—ужо на тэрыторыі УССР. Сёлета мы знайшлі саканьне ў вёсках каля ст. Беражэст (у Ласкаўцох, Лычманох, Калосьніках) і нават пад самым Оўручам (у Пясчаніцы, 10 в. на паўн. зах.). Трапляюцца яны, відавочна, і ў іншых мясцох Оўруцк. пав., гл. ў Міхальчука характарыстыку „Собственно-Полешского или Средне-Полешского поднаречия", Тр. Этн. - Ст. Экст., VII, ст. 493, а таксама і запісы В. Кравчэнкі з Оўруцк. п.— нават з тых яго валасьцей (Народыцк. і Лугінскай), якія знаходзяцца на паўдн. усх. і на паўдн. зах. ад Оўруча, гл. V т. Тр. О-ва исслед. Волыни.

На акрэсьленай ізоглёсай тэрыторыі саканьне ўсюды пашырана (шэраг крыніц); выняткі становяць толькі шляхоцкія вёскі, у якіх ужываюцца дзеясл. зваротн. ст. з канчаткам *—се*. Прычынай зьяўленьня гэтага *—се*, можа, служыць ня толькі „еканьне", але яшчэ ўплыў польск. м. Шляхоцкіх вёсак, аднак, вельмі значная меншасьць, і таму мы не адзначылі іх на карце.

У сакаючых гутарках ф. н. р. канч. на *—со:* по чём плацілосо? Заўважым яшчэ, што канчаткі *—са*, *—со* на поўдні могуць скарачацца: зрабілас.

Выказваючы свае думкі па поваду тэорыі хваляў, акад. Карскі (Блр., II, в. 3, ст. 281), між інш., зазначае, што „частица *—са* (=сѧ)", пашыраная ў паўдн.-зах. часьціне Беларусі, „после большого перерыва возрождается в литературном московском произношении". Трапляецца саканьне і ў мяшчанскіх влр. гаворках, гл. Дурново, Диал. карта Кал. г., ст. 7, а таксама Мат. для изуч. влр. гов., в. XI, 1922, ст. 48.

§ 40. 2. Неасабовыя формы дзеясловаў.

Формы неазначальнага ладу маюць у блр. гаворках два канчаткі *—ць* (*—ть*) і *—ці* (*—ті*). Ад дзеясл. з асновамі на заднянёбны магчымы такія варыянты: бе*ч*, ле*ч*; бе*хчы* (або бе*гчы*), ле*хчы* і пазьнейшыя новаўтварэньні: бе*хці*, се*кці*. У значнай часьціне блр. гаворак пашыраны ф. ф. ласкальнага інфінітыву (вядомыя і ў укр. м.): спаткі і т. п.

З ф. ф. дзеяслоўн. прыметнікаў блр. гаворкі захавалі добра дзеясл. прыметн. залежн. стану на *—ны (й)*, *—ная*, *—нае* і *—ты (й)*, *—тая*, *—тае*. Формы дзеяслоўн. прыметн. дзейн. ст. перасталі зьмяняцца і зрабіліся дзеяпрыслоўямі: нясу́*чы*, про́с*ячы* (або про́с*ючы*), сказаў*шы*, зрабіў*шы*. Блізка к влр. тэрыторыі зьяўляюцца ф. ф. дзеяпрысл. цяп. ч. на *мшы*: —вы́пі*мшы* [2]). На поўн. пашыраны ф. ф. прышодшы, ушодшы; па аналёгіі з імі ўтвараюцца ф. і ад дзеясл. ехаць: прые́хадшы і інш. Чулі мы іх у Вяліск., Невельск. і Вяземск. паветах.

Астаткамі старых ф. ф. мужч. і ніяк. р. р. дзеясл. прым. трэба лічыць прыклады *мога* і *загадзя*.

---

[1]) Адк. з Цешкава (№ 7) сьведчыць аб саканьні ў гэтай вёсцы, але, як зазначыў А. Крукоўскі, аўтар адк. № 7 памыліўся.

[2]) Прыклады, як купёмшы, можна знайсьці і ў зборніку песень М. Гарэцкага.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

IV.

Вывады.

1. Цяпер мы ўжо a posteriori з упэўненасьцю можам сказаць, што граніцы моўных зьяў выбраную намі для дасьледваньня тэрыторыю перарэзваюць у самых рознастайных кірунках. Не супадаюць як ізоглёсы тых зьяў, якія лічылі агульна-беларускімі (напр. мяккага вымаўленьня зычных перад *е, і* і аканьня—на поўдні, ізоглёсы захаваньня *ы* перад ётам і зьмены *л* на *ў*—на ўсходзе і г. д.), так і граніцы тых асаблівасьцяй, на падставе якіх рабілі далейшы дыялектычны падзел блр. гаворак (гл. карты).

2. З зазначанага з відавочнасьцю выцякае перш за ўсё немагчымасьць і нават непатрэбнасьць дыялектолёгічнай клясыфікацыі блр. мовы. Што-ж датычыцца высьвятленьня граніц самой блр. мовы, дык тут трохі справа палягчаецца тэй базай, якой можна трымацца пры іх азначэньні,—а іменна, існаваньнем літаратурных моваў, з якімі і трэба параўноўваць цікавячыя нас гаворкі. Пры паездках па пэрыфэрычных дыялектах дасьледчык, як я праканаўся, можа вырабіць у сабе здольнасьць амаль што інстынктыўна выбіраць для размоў з сялянамі якраз тую мову, якая бліжэй падыходзіць да іх гаворкі—беларускую ці украінскую, беларускую ці расійскую і г. д.

3. Таксама a posteriori мы праканаліся, што пры пераходзе ад аднэй дыялектычнай групы да другой часта замены аднэй зьявы адпаведнай іншай грае значна большую ролю, як замена цэлага шэрагу іншых зьяў. Так, напр., пры паступовым набліжэньні да украінскай этнографічнай тэрыторыі слух уражае ня столькі замена аканьня на оканьне і ня столькі зьяўленьне цьвёрдых губных зычных перад *е, и* (*і*), сколькі замена мяккага вымаўленьня зубных зычных на цьвёрдае перад гэтымі галоснымі. Тлумачыцца гэта, папершае, тым, што ад зьяў консонантызму значна мацнейшае ўражаньне, чымсі ад зьяў вокалізму (з прычыны чаго і ў самім нават народзе ўтвараюцца такія назвы, як *цыкуны, сакуны, етаўцы* або-ж *гэсікі, гэцыкі, кагоканьне* і т. п.; зьявы консонантызму лепш перадавалі ў запісах і этнографы), падруг., тым, што зубныя зычныя часьцей трапляюцца ў мове, як губ-

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

ныя. Пры азначэньні мяжы з влр. мовай можна было-б у першую чаргу кіравацца тым, ці зьмяняецца ў данай гутарцы *л* на *ў*. Пры высьвятленьні паўночнай граніцы давялося-б зьвярнуць яшчэ ўвагу на вымаўленьне *г*.

4. Лепшым вывадам з лінгвістычна-географічнага вывучэньня Беларусі была-б, зразумела, карта самой блр. мовы. Зьдзейсьніць, аднак, гэтую задачу ў даны момант нам прашкаджае ня толькі адсутнасьць неабходных ведаў аб Заходняй Беларусі, але яшчэ і другая вельмі важная акалічнасьць. У VIII т. Roczn. Slawist. (1918, ст. 60 і наст.) польскі лінгвісты Н і ч, у сувязі з адным заяўленьнем А. М э й э, цалкам правільна заўважае, што „słownik jest rzeczą ważną dla określania djalektów". Ясна, што для аканчальнага высьвятленьня граніц блр. м. неабходна будзе прадпрыняць таксама і географічнае вывучэньне яе слоўніка (а таксама сынтаксу і словаўтварэньня). Паасобныя словы маюць свае даволі рознастайныя граніцы.

5. Даныя гісторыі мовы ў злучэньні з паказаньнямі дыялектолёгіі могуць даць каштоўны матар'ял для вырашэньня пытаньняў аб руху тых ці іншых зьяў. Так мы даведаліся аб тым, што граніца цоканьня раней праходзіла ніжэй на поўдзень ад цяперашняй граніцы гэтай асаблівасьці. Але зроблены пачатак у справе лінгвістычна-географічнага вывучэньня Беларусі яшчэ большую магчымасьць дасьць у будычыні сачыць за тым, як будуць перасоўвацца ізоглёсы ўжо дасьледжаных зьяў.

6. Некаторыя цікавыя вывады адносна ўмоў, уплываючых на рух пэўных ізоглёсаў, ужо цяпер можна зрабіць. Як мы бачым з картаў зьмены *ы* на *у* пасьля губных і саканьня, часам у некаторых мясцох зьявы ўпінаюцца ў раку (першая ў Дняпро, другая ў Прыпяць). Спыніла Прыпяць (а таксама Дзясна) на некаторай адлегласьці і рух аканьня. На тэрыторыі Асіпавіцкага р. граніцай зьмены *а* на *о* служыць Сьвіслач.

Другі чыньнік, які можа стрымаць перасоўваньне моўнае зьявы, гэта—вялікі горад. Як відаць з карт пашырэньня *гэты, гэтат*, ф. ф. месн. скл. прыметнікаў на *—ім, —ым* і дзеясл. 1 ас. мн. л. на *—ом, —ам*, некаторыя ізоглёсы праходзяць на паўднёв. усходзе недалёка ад Менску.

Цалкам магчымая рэчь, што некаторыя асаблівасьці ў адным месце могуць пашырацца, у той час як у другім граніцы іх могуць адступаць назад. Знадворны выгляд карты пашырэньня *гэты, гэтат* дае повад думаць, што на паўн. усходзе яно пашыраецца, прычым тут яго рух затрымаў Віцебск, на паўднёвых-жа дзялянках даная ф. адступіла пад націскам ф. *еты*, якая ў сваім руху дайшла амаль што да Менску [1]).

Што датычыцца астравоў, яны могуць быць падвойнага пахаджэньня: або яны (як, напр., астравы на карце пашырэньня ф. ф. ваўк*е*, лясэ) зьяўляюцца ў выніку няроўнамернага зьніканьня якой-небудзь

[1]) М. іш., і з карт француск. і іншых атласаў мы бачым, што і там рака. горад граюць такую-ж ролю.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

архаічнай адзнакі, або-ж яны ўтвараюцца ў выніку самастойнага, незалежнага разьвіцьця пэўнае зьявы ў якім-небудзь зусім іншым месьце (напр., паўднёвы востраў на карце пашырэньня ф. ф. творн. скл. множн. л. рук*ам*, дрыв*ам*).

7. Граніцы моўных зьяў ня супадаюць, але ёсьць, аднак, пэўная роўналегласьць паміж накаторымі з іх: мы бачым, што часьціна гэтых ізоглёсаў выбраную намі тэрыторыю перарэзвае ў кірунку з паўн. захаду на паўдн. ўсход. І на картах нямецкіх вучоных граніцы часта становяць пучок ліній, маючых аднолькавы кірунак, гл. Жырмунская „Проблемы немецкой диалектографии в связи с историческим краеведением" (Этнография, 1927, № 1, ст. 143).

8. Вывучэньне географіі паасобных зьяў фонэтыкі і морфолёгіі часта зводзіцца к ізоглёсаваньню пэўнай, можа вельмі абмежаванай катэгорыі слоў. Так, напр., існаваньне ў гаворцы слоў м*ы*ю, кр*ы*ю, в*ы*ю яшчэ нельга формуляваць як захаваньне *ы* перад ётам і ётавымі галоснымі, калі побач з гэтым чуваць ужо ш*э*я, злэ*й* або злo*й* і г. д. Магчыма, што ў такой гаворцы і ніколі *ы* не зьяўлялася ў такім становішчы, наведзеныя-ж прыклады выкліканы зусім іншай прычынай, напр., уплывам іншых форм: м*ы*ць, м*ы*ў, м*ы*ла і г. д.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Ergebnisse.

1) Wir können schon jetzt a posteriori mit Sicherheit behaupten, dass sich die Grenzen der Spracherscheinungen auf dem von uns als Untersuchungsfeld gewählten Territorium in verschiedenen Richtungen kreuzen. Die Isoglossen derjenigen Erscheinungen, die für allgemein-weissrussisch gehalten wurden, fallen nicht ineinder (z. B. die weiche Aussprache der Konsonanten vor *e, i* und der *o—a* Vandel im Süden und Isoglossen der *ѣ*—Beibehaltung vor *Jot* und des Vechsels von *л* in *ў* im Osten usw.), ebenso die Grenzen derjenigen Besonderheiten, auf deren Grundlage die weitere Einteilung der weisssussischen Mundarten aufgebaut wurde (s. Karte).

2) Hieraus folgt mit Augenscheinlichkeit, dass es unmöglich und sogar zwecklos erscheint, die weissrussische Sprache dialektologisch zu klassifizieren. Was die Feststellung der weissrussischen Sprachgrenzen überhaupt anbetrifft, so ist hier die Grenzbestimmung etwas erleichtert durch das Vorhandensein einer Grundlage in den bestehenden Literatursprachen, mit denen die uns interessierenden Mundarten verglichen und ihre Grenzen bestimmt werden müssen. Bei Reisen durch Gebiete der peripherischen Dialekte kann der Sprachforscher in sich die Fähigkeit entwickeln, wovon ich mich selbst überzeugt habe, beinahe instinktiv für den Umgang mit den Bauern diejenige Mundart einzuschalten, die dem betr. Jdiom am nächsten steht, weissrussisch oder ukrainisch, weissrussisch oder russisch usw.

Ebenso haben wir uns a posteriori davon überzeugt, dass beim Übergang von einer Dialektgruppe zur andern der Ausfall einer Erscheinung und ihr Ersatz durch eine andere eine bedeutend grössere Rolle spielt als der Ersatz einer Reihe anderer entsprechender Erscheinungen. Wenn wir uns allmählich dem ethnographisch ukrainischen Gebiet nähern, so fällt dem Ohre nicht so sehr der Erzatz der „Akanje“ durch „Okanje“ auf, nicht so sehr das Auftreten harter Lippenlaute vor *e, u* (*i*), als vielmehr der Ersatz der weichen Aussprache der Zahnlaute vor den genannten Vokalen durch eine harte. Das erklärt sich erstens damit, dass Erscheinungen des Konsonantismus einen bedeutend stärkeren Eindruck machen

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

als solche des Vokalismus, (infolgedessen sich sogar im Volke sebslt derartige Ausdrücke bilden wie *цыкуны, сакуны, етаўцы* oder *гэсікі, гэцыкі, кагоканьне* u. a. Die Erscheinungen des Konsonantismus haben Ethnographen besser in ihren Niederschriften wiedergegeben), zweitens damit, dass Zahnlaute öfter in der Sprache auftreten als Lippenlaute. Bei der Grenzfeststellung gegen die grossrussische Sprache könnte man sich in erster Linie danach richten, ob in betr. Mundart *л* durch *ў* ersetzt wird. Bei der Aufklärung der Nordgrenze müsste noch die Aussprache des *г* in Betracht gezogen werden.

4) Das beste Resultat einer linguistisch-geographischen Erforschung von Weissrussland wäre selbstverständlich die Karte des weissrussischen Sprachgebiets selbst. Der Durchführung dieser Aufgabe aber stehen gegenwärtig nicht nur der Mangel an den erforderlichen Kenntnissen der Verhältnisse im Westen Weissrusslands, sondern noch ein anderer, ausserordentlich wichtiger Umstand als Hindernisse im Wege. Jm VIII. B. der „Roczn. Slawist." (1918, Seite 60 ff.) bemerkt der polnische linguist Nitsch im Zusammenhang mit einer Angabe von A. Meillet ganz richtig., dass „słownik jest rzecrą ważną dla określania djalektów". Es ist klar, dass zur endgiltigen Aufklärung der Grenzen des weissrussischen Sprachgebiets gleichzeitig eine äusserst genaue geographische Erforschung des Wortvorrats (auch des Syntax und Wortbildung) durchgeführt werden muss. Einzelne Worte haben ziemlich verschiedene Gebrauchsgebiete.

5) Die Tatsachen der Sprachgeschichte können in Verbindung mit den Ergebnissen der Dialektforschung wertvolles Material zur Lösung von Fragen über die Bewegung dieser oder jener Erscheinung liefern. So haben wir festgestellt, dass früher die Grenze des Wandels von *ч* in *ц* im Vergleich zum heutigen Stand dieser eigentümlichen Erscheinung mehr südlich verlief. Der in der geographisch-linguistischen Erforschung Weissrusslands gemachte Anfang wird in Zukunft noch weitere Möglichkeiten an die Hand geben, die ferneren Verschiebungen in den Isoglossen der bereits festgelegten Erscheinungen zu verfolgen.

6) Einige interessante Rückschlüsse auf die Bedingungen, welche den Verlauf der festgestellten Isoglossen beeinflusst haben, lassen sich schon jetzt ziehen. Wie wir aus den Karten sehen, so trifft der Wandel von *ы* in *у* nach Lippenlauten und der Wandel von *—ся* in *—ца* bei Werb. refl., manchmal an einigen Stellen dieser sprachlichen Erscheinungen auf einen Fluss (die erste Isoglosse auf den Dnjepr, die zweite auf die Pripjatj). Sowohl Pripjatj als auch Djesna haben stellenweise die Bewegung der „Akanje" unterbrochen. Im Rayon Assipowitschy ist die Grenze des a-o Wandels der Fluss Swislatsch.

Ein anderer Faktor, welche das Vordringen einer sprachlichen Erscheinung aufhalten kann, ist die Grossstadt. Wie aus den Karten über die Verbreitung der Formen *гэты, гэтат*, über die Bildung des loc. bei Adjektiven auf *—ым, —ім*, und die Bildung der 1. pers. plur. des Verbs auf *—ом, ам* ersichtlich ist, verlaufen einige Isoglossen im Süd-Osten unweit Minsk.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Es ist durchaus möglich, dass sich einige Eigentümlichkeiten an einer Stelle weiter verbreiten, während an anderer Stelle ihre Grenzen zurückweichen können. Dem äusseren Eindruck nach gibt die Verbreitungskarte von *гэты* und *гэтат* Veranlassung zu der Annahme, dass sich diese Erscheinung in Nord-Ost entschieden ausbreitet, wobei hier ihr Vordringen durch die Stadt Witebsk aufgehalten worden ist. In den südlichen Strichen ist dagegen diese Erscheinung unter Vordringen der Form *еты* zurückgewichen, wobei die letztere in ihrer Bewegung fast bis Minsk vorgeschritten ist [1]).

Was die Inseln betrifft, so können sie zweifachen Ursprungs sein; entweder entstehen sie durch ungleichmässige fortschreitendes Schwinden einer charakteristischen, veralteten Sprachbesonderheit (wie z. B. die Inseln auf der Verbreitungskarte der Formen *ваўке*, *лясэ*), oder sie bilden sich als Resultat einer selbstständigen, unabhängigen Entwicklung einer bestimmten Erscheinung an irgendeinem andern Orte (z. B. die südliche Insel auf der Verbreitungskarte der pluralen Instrumentalformen *рукам*, *дрывам)*.

7) Die Grenzen der sprachlichen Erscheinungen zusammen nicht fallen, aber besteht ein gewisser Parallelismus zwischen einigen von Isoglossen: wir sehen, dass ein Teil dieser Grenzen in dem uns gewählten Territorium in der Richtung vom Nord-Westen nach Süd-Osten verlaufen. Vergl. „Liniengürtel" auf den Karten der deutschen Gelehrten (s. vom Žirmunskij „Проблемы немецкой диалектографии в связи с историческим краеведением", Этнография, 1927, № 1, s. 143).

8) Le Erforschung der Geograpnie der einzelnen Erscheinungen der Laut-und Formenlehre sich verwandelt oft in die Isoglossierung der bestimten einer sehr beschränkten Zahl von Wörter. So z. B., Vorhandensein im Dialekte der Wörter *мыю*, *выю*, *крыю* u. s. w, kann man noch nicht erklären als *ы*--Beibehaltung vor Jot und jotierten Vokalen, wenn man daneben *шэя*, *злэй* oder *злой* hört. Es ist möglich, dass in solcher Mundart *ы* niemals in dieser Stellung sich entwickelte, die erwähnten aber Beispiele erschienen infolge anderer Gründe, z. B. unter dem Einflusse der Formen *мыць*, *мыў*, *мыла* u. s. w.

---

[1]) U. and. aus dem französischen und anderen Atlasen wir sehen, dass dort der Fluss oder die Grossstadt auch solche Rolle spielen.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

Дадаткі і папраўкі.

(Дадатак I).

1) У студзені месяцы гэтага году, калі была надрукована ўжо амаль што палова маёй працы, нам удалося зрабіць дыялектолёгічную паездку ў быўшыя Вялікалуцкі і Таропецкі паветы [1]) Пскоўскай губ., аб чым і ўспамінаем тут у дадатак да пералічаных на 11 стар. мясцовасьцяй, у якіх мы пабывалі. У часе гэтай апошняй паездкі мы, па-перш., спыніліся ў самых Вялікіх Луках, дзе зрабілі назіраньні на базары, а таксама атрымалі шэраг зьвестак і матар'ялаў ад настаўнікаў мясцовага Пэдтэхнікуму—Н. І. Богоявленскага [2]) і І. І. Королінскага, падруг., праехалі па вёсках вёрст пятнаццаць ад ст. Таропа ў паўднёвым кірунку, зрабіўшы галоўныя запісы ў Пяцівусаве. Вынікі гэтай паездкі адбіліся ў адпаведных картах, а ў даным месцы мы лічым неабходным, у дадатак да пэўных старонак нашай кніжкі, зазначыць наступнае.

Да стар. 27. Вымаўленьне мыю, крыю, сапраўды, пакрывае прыблізна ўвесь Вялікалуцкі пав.; яно адзначае і Лосеўскую вол., цэнтр якой знаходзіцца ў $2^1/_2$ в. ад Марыпчэлак. Толькі з *ы* зазначаныя словы чулі мы і на лініі Ст. Таропа-Пяцівусава.

Да стар. 30. Да прыведзеных на гэтай стар. прыкладаў *ы* на месцы ненаціскн. *у* можна дадаць яшчэ хытарá (наз. скл. мн. л.) і рыкавá, якія мы чулі ў Пяцівусаве і Ільлінск. хутарох б. Таропецкага пав.

Да стар. 37. У дасьледжаных мясцовасьцях ёсьць і дзеканьне, і цеканьне. Адзін з вучняў Богоявленскага (гл. адк. № 24) запісаў нават палцынник (відавочна, запісчык напісаў так пад уплывам выпадкаў з цьвёрдасьцю старога ц).

Да стар. 41 і наст. Праканаліся мы і ў тым, што цоканьня няма ў значна большых часьцінах б. Вялікалуцкага і б. Таропецкага паветаў. Па словах Н. І Богоявленскага і І. І. Королінскага, цоканьне трапляецца толькі ў паўночнай часьціне Вялікалуцкага пав., у паселішчах гэт. зв. „астраўнёў", г. зн. высяленцаў з Астровенскага (і Апоцкага) паветаў. У Ільінскай-жа воласьці (самай паўночнай) суседняга Вяліскага пав., як мы праканаліся ў Таропе з размоў з адным селянінам з Ільіна, цоканьне (і чоканьне) ужо вельмі пашырана.

Да стар. 45. У мове таго-ж селяніна мяняецца і *л* на *ў* у пэўных становішчах (воўк, пашоў), у той час, як у дасьледжаных намі мясцовасьцях б. б. Вялікалуцкага і Таропецкага паветаў *л* пры гэтых умовах застаецца нязьменным. І толькі ў паўднёвай часьціне Вялікалуцк. п.

---

[1]) Пасьля новага раёнаваньня абодва паветы аднесены к Вялікалуцкай акрузе.

[2]) Н І. Богоявленскі (які між. інш. скончыў Іст.—Філ. Фак. Ленінградзк. Унівэрсытэту) ветла перадаў нам некалькі запісаў, зробленых яго слухачамі, якія пад агульным № 24 мы і ўнесьлі ў матар'ялы Дыялектолёгічнай (б. Фолькл.-Дыялектолёг.) Камісіі ІБК.

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

(у Кулебяках, Волкаве, каля мяжы з Невельск. п.) зьяўляецца ўжо, як засьведчыў настаўнік Каролінскі, зазначаная зьмена.

Да стар. 51. Нарэшце, не пачулі мы ў дасьледжаных мясцовасьцях і фрыкатыўнага *г* (ні *h*, ані *ɣ*) [1]).

2) У часе друкаваньня нашай працы атрымалі мы вельмі каштоўную кніжку проф. М. Дурново „Введение в историю русского языка Ч. I. Источники" (1927), у якой асабліва цікавай для нас зьяўляецца III-я карта („Диалектологическая карта белорусских говоров"). На ёй аўтар правёў межы галоўных зьяў, па большасьці на падставе папярэдніх досьледаў Карскага, Голанава. Праведзеныя граніцы, аднак, ня зусім адпавядаюць рачавіснасьці (напр., мяжа цоканьня, якое, як бачылі мы, пашырана на поўначы беларускай этнографічнай тэрыторыі ня ўсьцяжнай паласой, а астравамі), але тут мы ня робім закідаў, бо давялося-б для гэтага цалкам паўтарыць адпаведныя §§ нашай працы. Значна правільнейшымі зьяўляюцца дадзеныя на гэтай карце граніцы розных тыпаў аканьня і яканьня, якія ў значнай меры становяць вынікі ўласных досьледаў проф. Дурново.

Даволі шырокая паласа дысыміляцыйнага яканьня беларускага тыпу на поўначы мяжуе з моцным яканьнем Пскоўскага тыпу. З свайго боку можам заўважыць, што граніца паміж гэтымі абодвыма тыпамі яканьня праведзена даволі дакладна; мы ў часе апошняй паездкі мелі магчымасьць праканацца ў існаваньні моцнага яканьня ў б. Вялікалуцкім і Таропецкім паветах. Такі-ж тып яканьня адзначае і гаворку Макарава Ржэўск. пав., гл. адк. № 18 (А. Шлюбскага).

На ўсходзе дысыміляцыйнае яканьне беларускага тыпу мяжуе з дысыміляцыйным яканьнем Суджанскага тыпу (у Сычэўскім, Вяземскім і Масальскім паветах). Здаецца, аднак, што гэтую паласу яканьня Суджанскага тыпу трохі трэба адсунуць з паўднёв. захаду. Сёлета ў Сешчанскай воласьці Рослаўскага пав. побач з *нясу́*, *яшшо́* (= яшчэ), пыднясі, Пятру́, вядру́, *яны́* і *ні°льзя́*, *нима́*, *зі°мля́* мы чулі *ті́ ле́га*, *мі°не́*, *ді°ре́ўня*.

На паўднёвым захадзе тэрыторыя дысыміляцыйнага яканьня на карце проф. Дурново выходзіць за межы дысыміляцыйнага аканьня, [2]) з чым мы цалкам згаджаемся (гл. 17 стар. нашай працы). Што-ж датычыцца далейшай паласы моцнага яканьня (цэнтральна-беларускага тыпу), мы лічым неабходным зменшыць яе за конт паўднёвай (і апошняй) паласы еканьня: яна, як мы бачылі, значна больш пашырана на поўн. Сам-жа проф. Дурново ў сваіх „Диалектол. разыскан." (вып. 2, ст. 15, ув. 5) кажа на падставе працы Сержпутоўскага, што ў паўдн.-зах. часьціне Слуцк. пав. пануе еканьне, але з запісаў таго-ж Сержпутоўскага мы даведваемся аб еканьні і на поўдзень, і на паўднёвы ўсход ад Слуцку (аб гэтым гл. дакладней 18 стар. нашай працы). Трэба таксама адсунуць на поўдзень і паўднёвую граніцу екаючай паласы.

Адно яшчэ заўважаньне выклікае новая кніжка проф. Дурново. Зазначыўшы на 153 стар., што граніцы зьяў абедзьвюх падмоў беларускай мовы (паўночнай і паўднёвай) не супадаюць, проф. Дурново,

---

[1]) Цікавай зьяўляецца для параўнаньня кароткая характарыстыка гаворкі парахвіі Вяза Вялікалуцк. п., зробленая І. Златінскім (Д. К. Зеленін, Описан. рукопис. Учен. Арх. Русск. Геогр. О-ва, III, ст. 1156), адносна якой проф. Зеленін, м. інш., заўважвае: „статья полезная"; пры цоканьні (?) і *мыю*, *ныю* ў гэтай гаворцы мы, аднак, тут не знаходзім зьмены *л* на *ў*.

[2]) У першы раз азначэньне мяжы паміж дысыміляцыйным яканьнем і яканьнем моцным (на Беларусі) проф. Дурново даў у 2 вып. „Диалектологич. разысканий (ст. 21-22).

Центральная научная библиотека НАН Беларуси – http://csl.bas-net.by/

аднак, далей настойвае на тым, што ўсё-ткі „границы между с.-б.-р. и ю.-б.-р. более отчетливы, чем между различными группами говоров с.-в.-р. и ю.-в.-р.". Гэтую акалічнасьць паважаны лінгвісты тлумачыць, паперш., тым, што перасяленьні ня гралі вялікай ролі на беларускай тэрыторыі, падруг., большай аднастайнасьцю беларускага сялянства ў соцыяльных адносінах. Мы-ж лічым, што апошнія чыньнікі сваім вынікам мелі выразнасьць граніц паасобных зьяў, выразнай-жа граніцы паміж падмовамі няма. Повад к думцы аб падзеле беларускіх гаворак на дзьве падмовы, гадаем мы, дала тая акалічнасьць, што значная часьціна зьяў паўднёвых (лепш казаць: паўдн.-заходніх) часта адпавядае пэўным зьявам паўночнай паласы (лепш: паўн.-ўсходняй); ёсьць, як мы самі казалі ў вывадах, на тэрыторыі беларускіх гаворак некалькі прыблізна роўналеглых ізоглёс, якія праходзяць з паўн. зах. на паўдн. ўсх., але гэты факт яшчэ не азначае супадзеньня.

3. *Да стар. 57-58.* Таксама, ужо пасьля таго, як былі надрукованы зазначаныя старонкі, нам удалося азнаёміцца з артыкулам акад. Карскага, надрукованым у Revue des études slaves, т. VII, 1-2 (1927). У ім акад. Карскі на падставе прыкладаў *уге* і *каге* ў запісах Шэйна з Дзякавічаў б. Мазырск. пав. кажа аб адпаведнай зьмене *ж* перад *е*. Сам акад. Карскі ня чуў таго гука, які зьяўляецца замест *ж*, з прычыны чаго ён і выказаў ня зусім правільную здогадку аб тым, што ў Дзякавічах „on prononce dans les formes indiquées non pas un γ sonore, mais un son proche de j" (ст. 23). Прыклад *Логойскъ* нічога не даводзіць, бо ў апошнім слове *й* (j) мог зьявіцца з *с* у выніку дысыміляцыі (а *с* у сваю чаргу з *ж* у выніку асыміляцыі; пар. шлях зьяўленьня *й* у слове малайца).

У заключэньне мы яшчэ раз лічым неабходным зазначыць, што хоць нам, апроч прыведзеных у Карскага прыкладаў, вядомы быў і трэці прыклад (ген-зам. *жэн-*), аднак, у даны момант, пакуль ня будзе новых фактаў, мы не адважваемся даць дакладнае формуляваньне ўмоў зьяўленьня *г* у зазначаных прыкладах.

4. Лічым сваім абавязкам выказаць шчырую падзяку старшыні Мазырскага Акруговага Таварыства Краязнаўства і Інспектору Акрана А. Крукоўскаму, які па нашай просьбе зрабіў паездку па Нараўлянскаму раёну. Яго лісты на нашы запытаньні (№№ 22 і 25-29), якія ён нам ветла прысылаў амаль з кожнай вёскі гэтага раёну, мы амаль што поўнасьцю пасьпелі выкарыстаць у неабходных мясцох праца, а таксама і для картаў. Тут-жа застаецца дадаць толькі наступнае. Апроч успамянутых на 36 стар. нашай працы Ясянца і хут. Дубровы, цьвёрдыя зубныя зычныя (звычайна, і губныя) перад галоснымі *е*, *і* (*и*) пераважаюць, здаецца, і ў Белых Сароках (гл. адк. № 29). Вось прыклады з запісаў А. Крукоўскага: нъэбі, зэ/ерне, зэ/емелька, зэ/елёнэ [1]). Трапляюцца выпадкі з цьвёрдымі зубнымі і ў Вуглох, якія знаходзяцца на зах. ад Белых Сарок (гл. адк. № 27: осы/іна, знаетэ/е, нэ/ебо).

З таго-ж адк. № 27 з Вуглоў даведваемся аб тым, што там няма зьмены *ы* на *у* пасьля губных, у Белых-жа Сароках і ў Даўлядах (гл. адк. № 28 і 29) хістаньне. Вось з гэтай прычыны на карце № 4 ізоглёса на дзялянцы паміж чыгункай і Прыпяцьцю праходзіць трохі вышэй ад політычнай граніцы БССР з УССР.

